Леапольд

# РОДЗЕВІЧ

# ТВОРЫ



Леапольд

**РОДЗЕВІЧ**



1895 — 1938

# Леапольд
# РОДЗЕВІЧ

# ТВОРЫ



Драматургія
Проза
Паэзія
Публіцыстыка
Лісты

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2008

УДК 821.161.3-8
ББК 84(4Беи)
Р60

Укладанне, прадмова і каментарыі
Віктара Яцухны

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ISBN 978-985-02-1025-8

© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2008

## З кагорты адраджэнцаў

Час у сваім імклівым бегу даволі часта бывае няўдзячным у адносінах да мастакоў і іх творчай спадчыны. Такіх фактаў у гісторыі нашай нацыянальнай літаратуры больш чым дастаткова. Не выключэнне — і фігура вядомага беларускага пісьменніка-адраджэнца, аднаго з нашаніўцаў, дзеяча заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху Леапольда Родзевіча.

Леапольд Іванавіч Родзевіч нарадзіўся 12 чэрвеня 1895 г. у фальварку Кур'янаўшчына Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер — Лагойскі раён Мінскай вобласці) у сям'і збяднелага шляхціца. Родзевічы мелі чатыры валокі зямлі, але не абраблялі яе ўсю самі, а здавалі ў арэнду «запашнікам», як у тутэйшых мясцінах называлі арандатараў. Лёля (так ласкава называла Леапольда маці) рос пятым, апошнім, дзіцём у сям'і. Перад ім у Яна і Гелены (у дзявоцтве Яноўскай) Родзевічаў нарадзіліся Яніна, Ядвіга, Чэслаў і Марыя. Сям'я была каталіцкая, мела шмат польскіх кніг, але разам з тым не цуралася беларускай мовы і сваёй роднай культуры. Леапольд, як падае са слоў старэйшай сястры пісьменніка Яніны вядомая польская даследчыца беларускай і польскай палітычнай гісторыі А. Бергман[1], меў з дзяцінства скрытны характар, любіў адзіноту і па гэтай прычыне часта хаваўся ад сям'і, каб пабыць сам-насам. З задавальненнем чытаў, добра маляваў, любіў забаўляць малых дзетак і мог гадзінамі слухаць песні, казкі, розныя гісторыі, што спявалі і расказвалі маці з бабуляй. Леапольд вельмі любіў сваю маці, быў падобны на яе з выгляду. Любай матулі ён прысвяціў свой першы паэтычны зборнік.

Першай сур'ёзнай жыццёвай прыступкай стала для Л. Родзевіча паспяховае заканчэнне пачатковай школы ў мястэчку Крайск (адсюль, відаць, і адзін са шматлікіх яго псеўданімаў — Крайскі). Затым будучы пісьменнік падаўся

[1] Bergman A. Leopold Rodziewicz (1895—1938). Zarys biografii politycznej // Przegląd historyczny. T. LXX. 1979. Zesz. 3. S. 435.

ў Вілейку, дзе працягваў вучобу ў гарадскім вучылішчы. Там, дарэчы, ужо займаўся і старэйшы брат Л. Родзевіча — Чэслаў. Вучнем Л. Родзевіч быў здольным, цікавіўся ўсім, хоць больш схіляўся да навук гуманітарных у адрозненне ад Чэслава, які цягнуўся да тэхнікі і прыродазнаўства.

У 1910 г. пятнаццацігадовы Леапольд прыязджае ў Вільню, дзе ў гэты час ужо знаходзіліся Ядвіга і Чэслаў. Матэрыяльная падтрымка бацькоў была не дастатковай, каб цалкам задаволіць жыццёвыя патрэбы маладых Родзевічаў, таму Леапольд, як і Ядвіга (Чэслаў вучыўся ў хіміка-тэхнічным тэхнікуме і атрымліваў сякую-такую стыпендыю), вымушаны быў пайсці працаваць. Каля трох месяцаў у якасці рабочага ён працуе на цукеркавай фабрыцы «Вікторыя», затым уладкоўваецца чарцёжнікам пры зямельнай камісіі Сялянскага банка. Праз некаторы час здае экзамены на атэстат сталасці.

Віленскае грамадска-культурнае жыццё адразу ж захапіла маладога Л. Родзевіча. Яго самога ці разам з братам Чэславам часта можна было сустрэць у рэдакцыі «Нашай нівы» (у гэтай газеце ён з 1911 г. пачаў рэгулярна змяшчаць свае допісы і творы), у таварыстве беларускіх культурнікаў і літаратараў, на вечарынах-прадстаўленнях і іншых мерапрыемствах, што ладзіліся нацыянальна свядомай беларускай інтэлігенцыяй. П. Мядзёлка ў сваіх успамінах піша, што Л. Родзевіча ў кампаніі М. Гарэцкага і З. Бядулі можна было часта бачыць у цукерні «Зялёны Штраль», якая была адным з месцаў сустрэч і гутарак беларускай творчай інтэлігенцыі[1]. Трое Родзевічаў — Чэслаў, Ядвіга і Леапольд — становяцца членамі калектыву І. Буйніцкага.

Несумненна, што ўражанні ад першых беларускіх вечарын-прадстаўленняў, у якіх Л. Родзевіч браў актыўны ўдзел, развілі ў ім цікавасць да тэатра, пэўным чынам падштурхнулі да напісання сцэнічных твораў. Першай ластаўкай стала п'еса «Блуднікі» (1912), якая засведчыла, што ў літаратуру прыйшоў малады і таленавіты пісьменнік-драматург.

Наступная поўнаметражная драма Л. Родзевіча (у 1914 г. у «Нашай ніве» быў змешчаны аднаактовы абразок-замалёўка пісьменніка «Марцовы снег») «Пакрыўджаныя» (1916) — твор, цікавы па сваёй праблематыцы і даволі своеасаблівы па вобразна-выяўленчых сродках, агульнай танальнасці,— пацвердзіла, што аўтар яе валодае самабытным драматургічным талентам.

---

[1] Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. Мінск, 1974. С. 74.

Зазначым, што за час свайго першага знаходжання ў Вільні Л. Родзевіч вырас і ўзмужнеў не толькі як пісьменнік. Адбылося яшчэ і цэласнае станаўленне яго асобы, выпрацаваліся пэўныя грамадска-палітычныя погляды, якія потым самым непасрэдным чынам паўплываюць на яго далейшую творчую і грамадска-палітычную дзейнасць.

Удзелу ў Першай сусветнай вайне Л. Родзевіч не прымаў па прычыне хваробы. Яму аперыравалі страваход і з мэтай далейшага лячэння Леапольд напярэдадні ці адразу пасля кастрычніцкіх падзей выехаў на Паўночны Каўказ, у Георгіеўск, дзе жыла сястра Яніна. Працаваў некаторы час у кандытарскім кааператыве. З прыходам белых быў мабілізаваны ў іх войска, адкуль неўзабаве ўцёк і накіраваўся ў Мінск. Там у гэты час гаспадарылі жаўнеры Пілсудскага. Месяцы з два Л. Родзевіч працаваў пісарам у Беларускай вайсковай камісіі, рэшту часу — у гарадской бібліятэцы. Актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці не прымаў, але многа пісаў. У газеце «Беларусь» і некаторых іншых перыядычных выданнях 1919—1920 гг., у альманахах і зборніках гэтага часу было змешчана каля паўтара дзесятка драматычных твораў Л. Родзевіча. Гэта класічныя беларускія вадэвілі «Збянтэжаны Саўка», «Пасланец», «Конскі партрэт», драматургічныя абразкі «У кавалёвай хаце», «Калыханка», «На шляху да сонца», «Сказ аб гуслях», «Стараста», драматызаваныя апавяданні «На рацэ зімой», «Разбітая ваза», «Змяркание», «Беларуская казка». Амаль усе з названых твораў з'явіліся непасрэдным водгукам аўтара на драматычныя падзеі 1919—1920 гг. на Беларусі, калі ў пэўнай ступені вырашалася яе будучыня. Вядома, пісаліся ў гэты складаны і неспакойны час і вершы, якія ўвайшлі пазней у зборнік «Беларусь».

1921 г. у жыцці Л. Родзевіча з'явіўся ў пэўным сэнсе пераломным. Пасля ўсталявання савецкай улады ў Мінску ён прыязджае ў родныя мясціны і некаторы час працуе там настаўнікам мясцовай сямігодкі. Як толькі быў заключаны Рыжскі мір, Л. Родзевіч з родных мясцін, якія засталіся пад Саветамі, накіроўваецца ў Вільню, дзе адразу ж актыўна ўключаецца ў беларускае грамадска-палітычнае і культурнае жыццё. Зроблены Л. Родзевічам выбар не на карысць савецкага Мінска, дзе застаўся яго старэйшы брат Чэслаў, быў абумоўлены хутчэй за ўсё тым, што Леапольд не прымаў савецка-польскай дамовы, варожа адносіўся да абодвух

«гістарычных» прэтэндэнтаў (тэрмін А. Ліса[1]) на беларускія землі. Менавіта такую пазіцыю адразу пасля свайго ўтварэння (крыху пазней гэтая пазіцыя перацерпіць істотныя змены) заняла Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА), адным з духоўных лідэраў якой якраз і з'яўляўся Л. Родзевіч. Крыху забягаючы наперад, адзначым, што з цягам часу ў негатыўных ці, скажам так, не надта прыязных адносінах Л. Родзевіча да бальшавікоў (а што яны мелі месца, у гэтым не прыходзіцца сумнявацца; дадзены факт канстатуе не толькі грамадска-палітычная дзейнасць пісьменніка, але і яго мастацкая творчасць, хоць бы тая ж камедыя «П.С.Х.») адбылося істотнае «пацяпленне», і асабліва пасля таго, як у БССР была распачата беларусізацыя. А затым Л. Родзевіч і зусім пяройдзе на бальшавіцкія пазіцыі.

У Вільні Л. Родзевіч далучаецца да рэдагавання і выдання газет «Беларускі звон», «Наша будучыня», «Наш сцяг», удзельнічае ў заснаванні БРА, працуе ў так званай «драматычнай майстэрні», прымае самы актыўны ўдзел у мерапрыемствах, звязаных з выбарамі ў польскі сейм у 1922 г., наладзіўшы пры гэтым сувязь з віленскім камуністычным падполлем, якое крыху пазней, у канцы 1923 г., дапаможа яму з прычыны пастаянных паліцэйскіх праследаванняў пакінуць Вільню і перабрацца ў Мінск.

Другі віленскі перыяд, нягледзячы на шэраг не надта прыемных момантаў, звязаных з матэрыяльнымі нястачамі, пэўнымі неладамі са здароўем, агульнай жыццёвай неўладкаванасцю, пастаяннымі паліцэйскімі праследаваннямі (у пачатку 1922 г. пісьменнік за нейкі газетны матэрыял нават адседзеў некалькі тыдняў у Лукішках), быў для Л. Родзевіча ў цэлым даволі плённым. За гэты час ён вырас як палітычны дзеяч, а ранейшую літаратурную рэпутацыю яшчэ больш памножыў і стала замацаваў за сабой. Л. Родзевіч стаў вядомым і ўплывовым беларускім літаратарам, вакол якога пачалі гуртавацца лепшыя пісьменніцкія сілы. Ён, можна сказаць, замяніў сабою М. Гарэцкага, якога польскія ўлады выслалі з Вільні ў пачатку 1922 г. Драматычныя творы пісьменніка, яго вершы, апавяданні, публіцыстычныя артыкулы рэгулярна з'яўляюцца на старонках заходнебеларускай перыёдыкі. У 1922 г. у Вільні пабачыў свет першы паэтычны зборнік Л. Родзевіча пад назвай «Беларусь». Годам раней былі

[1] Ліс А. Маладнаёмы твор добра знаёмага драматурга // Тэатральная Беларусь. 1993. №4. С. 15.

надрукаваны ў Мінску «Пакрыўджаныя». Асобным выданнем выйшла аднаактоўка «П.С.Х.», за якую пісьменнік атрымаў прэмію Беларускага грамадзянскага сходу ў Вільні. З самага лепшага боку характарызуе Л. Родзевіча і той факт, што ён клапаціўся аб выданні твораў маладых, пачынаючых аўтараў. У прыватнасці, менавіта дзякуючы яго клопатам і старанням у 1923 г. у Вільні былі надрукаваны паэтычныя зборнікі «Строма» У. Дубоўкі, «Уяўленне» і «На ростані» У. Жылкі.

У Мінску Л. Родзевіч доўга не затрымаўся. У хуткім часе ён быў накіраваны ў Маскву на вучобу. Там, у Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцей Захаду, Л. Родзевіч, не будучы яшчэ фармальна камуністам (пагадняльная канферэнцыя паміж БРА і КПЗБ адбылася толькі ў снежні 1923 г.), пачынае грунтоўна знаёміцца з самым папулярным вучэннем і ідэалогіяй XX стагоддзя. «Смакую і паважаю марксізм. Паглядай, браце, і ты ў гэты бок»,— раіць ён У. Жылку. Не пакідае Л. Родзевіч і творчасці. Піша вершы, апавяданні (дарэчы, адно з іх пад назвай «Пакой № 184» адлюстроўвае заняткі і быт тагачасных маскоўскіх студэнтаў, да якіх можна было залічваць і Л. Родзевіча), друкуецца ў альманахах і зборніках. Сустракаецца з беларускімі літаратарамі, і асабліва часта з У. Дубоўкам.

Летам 1924 г. Л. Родзевіч вяртаецца ў Мінск, адкуль яго адразу ж накіроўваюць на падпольную работу ў Заходнюю Беларусь. Родзевіча абіраюць першым сакратаром Гродзенскага акружкама КПЗБ, акрамя таго, кааптуюць у склад ЦК КПЗБ, тым самым ліквідоўваючы пэўную несправядлівасць у дачыненні да яго як да аднаго з арганізатараў і духоўных лідэраў БРА. Аднак сакратаром акружкама быць доўга Л. Родзевічу не давялося, бо яго як прафесійнага журналіста накіроўваюць на працу ў Цэнтральную рэдакцыю КПЗБ у Вільні. Вільня даўно ўжо стала для Л. Родзевіча родным горадам, аднак на гэты раз яму па канспіратыўных прычынах прыйшлося знаходзіцца тут у пэўнай ізаляцыі ад тутэйшага беларускага інтэлігенцкага асяродку. Пайшла праца над артыкуламі, дакументамі, адозвамі, тлумачэннямі тэкстаў і г. д. Родзевіч-пісьменнік паступова ператвараецца ў палітычнага функцыянера. Займацца літаратурай, вядома, не перастаў, аднак сапраўдная творчасць пачала пакрысе адыходзіць на задні план.

З 1926 г. і да самага арышту Л. Родзевіч жыве і працуе ў Мінску. Асноўнай з'яўлялася праца ў замежнай рэдакцыі ЦК КПЗБ; акрамя таго, на грамадскіх пачатках ён узначальвае

Камісію па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Акадэміі навук БССР. Л. Родзевіч становіцца фактычным кіраўніком рэдакцыі, рэдагуе цэнтральныя друкаваныя органы КПЗБ «Бальшавік», «Чырвоны сцяг» і іншыя, рэгулярна змяшчаючы ў іх і свае матэрыялы адпаведнага характару і зместу пад псеўданімамі Сталевіч, Ігнат, Антось, Васіль, Васіль Бедны, Васіль Касагар. Публіцыстычныя артыкулы, а часам і апавяданні, вершы Л. Родзевіча на заходнебеларускую тэматыку даволі часта друкуе перыёдыка Савецкай Беларусі. Пачынаючы з 1924 г., Л. Родзевіч удзельнічае ва ўсіх партыйных форумах КПЗБ, выступае на іх з дакладамі і паведамленнямі, бярэ ўдзел у дыскусіях. Зазначым, што ў апараце ЦК КПЗБ даволі высока цанілі Л. Родзевіча як спецыяліста па пытаннях заходнебеларускай культуры, друку, аграрнай палітыкі. Разам з тым і яму прыйшлося выпраўляць уласныя светапоглядныя «памылкі», каяцца ў неіснуючых грахах, нават у пэўным сэнсе закрэсліць сваё юнацтва: «У цягнік, які імчыць па сацыялістычнаму шляху, нельга ўлезці з нашаніўскім багажом. Кампартыя, якая кіруе гэтым цягнікам, рашуча выкідвае нашаніўскі, *буржуазны баласт* пад колы цягніка»[1].

Хацелася б асобна спыніцца на трох момантах, звязаных з асабістым жыццём Л. Родзевіча ў 1924—1933 гг. Думаецца, яны дадуць магчымасць па-сапраўднаму зразумець і асэнсаваць перыпетыі складанага, пакручастага і наогул трагічнага лёсу гэтага таленавітага, прыгожага душой і сэрцам чалавека, патрыёта сваёй роднай зямлі, Бацькаўшчыны, Беларусі, дапамогуць больш глыбока зразумець яго творчасць.

У 1924 г. у Гродне Л. Родзевіч пазнаёміўся з маладой і прыгожай работніцай тытунёвай фабрыкі Ф. Язерскай. Жэня — такі быў яе партыйны псеўданім — стала ў 1926 г. жонкай Л. Родзевіча. Ён, відаць, моцна кахаў яе, быў пэўны час вельмі шчаслівы, бо нават узяў псеўданім Жэневіч, удзельнічаючы ў рабоце IV з'езда КПП летам 1927 г. Але шчасце, на жаль, было нядоўгім: Жэня паехала вучыцца ў Маскву і праз некаторы час выйшла там другі раз замуж. На чуллівую і ўражлівую душу пісьменніка гэта наклала моцны адбітак.

Асабліва цяжкім у плане асабістага жыцця стаў для Л. Родзевіча 1929 г. У гэтым годзе ў Мінску ў бальніцы памерла ад рака яго маці, якую Леапольд вельмі моцна любіў. Маці пісьменніка пахавалі ў в. Хадакі, недалёка ад Кур'янаўшчыны.

---

[1] Родзевіч Л. Беларускі нацыянал-фашызм. Яго вытокі, тэорыя і практыка. Мінск, 1930. С. 41.

Велізарнай стратай для Л. Родзевіча стала нечаканая і ўвогуле недарэчная смерць яго самага блізкага сябра яшчэ з часоў заснавання БРА, члена ЦК КПЗБ Арсеня Канчэўскага (брата Ігната Канчэўскага). Летам 1931 г. А. Канчэўскі, яго жонка, таксама актывістка КПЗБ, і Л. Родзевіч адпачывалі ў Геленджыку. Аднойчы Арсень заплыў далёка ў мора і назад не вярнуўся. Разам з жонкай сябра Леапольд прывёз у Мінск яго цела.

Па прыездзе ў 1926 г. у Мінск Л. Родзевіч атрымаў у пэўным сэнсе тое, аб чым даўно марыў: наладжаны быт і спрыяльныя ўмовы для творчасці, у тым ліку і адзіноту, абумоўленую патрэбамі канспірацыі. Але гэтая адзінота перарасла з цягам часу ў ізаляцыю, бо сустракацца з ім маглі толькі, як правіла, людзі з апарату ЦК КПЗБ, і то не ўсе. Нявялічкім акенцам у свет з'яўляліся брат Чэслаў, які працаваў у Народным камісарыяце земляробства, і яго сям'я. Але гэта было ўсяго толькі акенца, і не болей. Такім чынам, Л. Родзевіч, слынны літаратар, адзін з нашаніўцаў і пачынальнікаў заходнебеларускай літаратуры, у другой палове 1920-х гг., пазбаўлены жывых кантактаў з сябрамі па пяру, з людзьмі, з рэальным жыццём увогуле, паволі пачынаў знікаць з літаратуры. Менавіта з літаратуры вялікай, сапраўднай, бо пісаць ён не перастаў. Доказ гэтаму — выданне ў 1928—1930 гг. Белдзяржвыдавецтвам пад сапраўдным прозвішчам аўтара двух зборнікаў апавяданняў «Рэвалюцыйным шляхам» і «Вогнішча барацьбы» агульным памерам каля дзевяці друкаваных аркушаў. Акрамя таго, у 1923 г. выдавецтвам ЦК КПЗБ для распаўсюджвання ў Заходняй Беларусі быў выпушчаны паэтычны зборнік Л. Родзевіча. Дарэчы, гэты зборнік адмыслова выдалі з мэтай маскіроўкі сапраўднага прозвішча аўтара і характару змешчаных у ім твораў. Зборнік меў дзве вокладкі. На першай, верхняй, вокладцы на польскай мове было напісана: «Адам Хмель. Беларуская народная песня. Адбітак з IV тома 1 часткі Матэрыялаў і прац мовазнаўчай камісіі Акадэміі навук у Кракаве. 1928 год». На другой, ніжняй, вокладцы, якая змяшчалася пад першай, на беларускай мове стаяла: «Л. Родзевіч. На паняволеных гонях». Напісана, як бачна, многа. Але амаль усё, што пісалася пасля таго, як Л. Родзевіч стаў прафесійным рэвалюцыянерам, пазначана пячаткай пэўнай спрошчанасці, схематызму, засацыялагізаванасці. Толькі з'яўленне раз-пораз той ці іншай мастацкай дэталі, пэўныя стылёвыя адметнасці сведчылі пра тое, што аўтар, нягледзячы на зададзенасць галоўнай думкі твора, яго

ідэі, усё-такі добра валодае сакрэтамі пісьменніцкага майстэрства.

У пачатку 1933 г. быў арыштаваны старэйшы брат Л. Родзевіча Чэслаў і высланы з сям'ёй у Саратаў. Самому Леапольду засталося чакаць нядоўга: у хуткім часе ён быў адхілены ад кіраўніцтва Камісіяй па вывучэнні Заходняй Беларусі пры АН БССР, а дзесьці ў сярэдзіне 1933 г. (дакладная дата невядома) арыштаваны і высланы за межы Беларусі. Знаходзіўся ў Саратаве, жыў у сям'і старэйшага брата. На жыццё зарабляў працай у лясніцтве. У 1938 г. Л. Родзевіч быў паўторна арыштаваны. У гэтым жа годзе яго жыццё абарвалася. Пасмяротна рэабілітаваны Л. Родзевіч у 1956 г.

Самае каштоўнае ў пісьменніцкай спадчыне Леапольда Родзевіча — яго драматургія. Менавіта дзякуючы ў першую чаргу сваім драматургічным творам Л. Родзевіч пакінуў значны і глыбокі след у беларускай літаратуры.

Драматургічным дэбютам Л. Родзевіча стала трохактовая драма «Блуднікі»[1]. У студзені 1913 г. Я. Купала прадставіў у Аддзел драматычнай цэнзуры Галоўнага ўпраўлення па справах друку ў Санкт-Пецярбургу рукапіс гэтага твора з просьбаю дазволіць яго пастаноўку. П'еса была падпісана не сапраўдным прозвішчам аўтара, а псеўданімам Мікула Грымот. Праз некаторы час цэнзар даў сваё заключэнне. Перадаўшы ў самым пачатку гэтага заключэння фабулу твора, ён далей зазначыў наступнае: «Гэта нескладаны змест драмы, які не ўяўляў бы сабою нічога нецэнзурнага, калі б не тэндэнцыя драмы, якая зводзіцца да таго, што ўсе няшчасці, гора, пакуты, няўдачы сялян зыходзяць ад дваран. Прыгажуню Анэту спакусіў пан, пагуляў з ёю і пакінуў, тады як без яго яна магла б выйсці замуж і зажыць сумленным сялянскім жыццём. Юзюка ўгаварыў ісці на фабрыку пан, і калі там яго машына памяла і ён стаў непрыгодным да працы, ніхто яму не працягнуў рукі дапамогі. На стар. 28-й Юзюк скардзіцца: «А як выдумаеце: хто тут вінава-

[1] Акрамя гэтай п'есы ў Л. Родзевіча ёсць яшчэ і аднаактовы твор з такой самай назвай. Дарэчы, для пісьменніка дадзеная асаблівасць з'яўляецца ў пэўнай ступені заканамернай. Як прыклад — наяўнасць дзвюх празаічных «Беларускіх казак».

ты? Хто навучыў нас любіць раскошу, гулячае, распуснае жыццё, пагарджаць нашымі беднымі братамі, не паважаць усё святое?.. Хто загубіў маю сям'ю, хто п'е кроў маю? Хто прывёў мяне сюды ў бруд, бяздонне?» і г. д. Адказ на гэта падразумяваецца — пан, той жа пан, які загубіў і яго сястру, яго бацьку-п'яніцу і многіх другіх...

З прычыны выкладзенага я прапанаваў бы не дазволіць п'есу да пастаноўкі, якая нацкоўвае адно саслоўе на другое, тым больш што яна напісана беларускай гаворкай, разлічана на гледачоў-сялян»[1].

Цэнзарскае заключэнне можа служыць своеасаблівай рэцэнзіяй на п'есу «Блуднікі». У якасці цэнтральных, дамінуючых выступаюць у ёй сацыяльна-класавыя матывы. Гэта падкрэсліваецца ўсімі, хто так ці інакш звяртаўся да аналізу твора. Яго галоўных герояў падштурхоўваў да блуду, пэўным чынам прымушаў ступіць на гэтую слізкую сцежку тагачасны грамадска-палітычны лад з яго надзвычай моцным класавым і маёмасным расслаеннем. Разам з тым, думаецца, нельга так ужо і абсалютызаваць дадзены фактар, бо аўтар, разглядаючы Юзюка і Анэту як ахвяр несправядлівага грамадска-палітычнага ладу, зусім не ідэалізуе іх, асабліва Юзюка (успомнім яго паводзіны ў першым акце).

«Блуднікі» як першы, у многім вучнёўскі твор Л. Родзевіча (аўтару пасля заканчэння работы над ім споўнілася ўсяго толькі семнаццаць гадоў), вядома, не пазбаўлены недахопаў. Як слушна зазначае А. Семяновіч, «драматургічнае дзеянне ў п'есе, асабліва ў першым акце, развіваецца вельмі марудна... Не зусім пераканаўча раскрываюцца ў драме мастацкія характары. Так, змена поглядаў галоўнага героя Юзюка адбываецца неяк раптоўна, драматург не паказвае тых псіхалагічных перажыванняў, унутранай барацьбы, у выніку якіх ён прыходзіць да пэўных высноў»[2].

На вялікі жаль, «Блуднікі» не змаглі істотным чынам паўплываць на тагачасны літаратурны працэс. Забароненая царскай цэнзурай п'еса каля 50 гадоў праляжала ў архіве і ўпершыню была надрукавана толькі ў 1960 г.

Не адразу пасля напісання была апублікавана і п'еса «Пакрыўджаныя». У гэтай драме аўтар паказаў прыгоннага мастака-разьбяра, які марна спадзяецца сваёй нялёгкай

---

[1] Цыт. па кн.: Семяновіч А. А. Гісторыя беларускай драматургіі: XIX — пач. XX ст. Мінск, 1985. С. 147—148.

[2] Тамсама. С. 155.

творчай працай здабыць волю сабе і сваёй дачцэ. «Пакрыўджаныя» — твор рамантычны, напоўнены адпаведнай сімволікай. Л. Родзевіч таксама надзвычай плённа выкарыстаў у гэтай п'есе элементы і традыцыі вусна-паэтычнай народнай творчасці, арганічна і ўмела ўплёўшы ўсё гэта ў мастацкую тканіну твора. Нейкай першароднасцю, паганскай сілай вее ад герояў драмы. Наогул, нельга не пагадзіцца з А. Лісам, які сцвярджае, што п'еса Л. Родзевіча «Пакрыўджаныя» «па сацыяльнай праблеме, пакладзенай у аснову твора, псіхалагічнай глыбіні і мастацкай пластыцы вобразаў не ўступае «Раскіданаму гняздэ» Янкі Купалы»[1].

Як зазначыў вядомы даследчык беларускай драматургіі С. Лаўшук, «драма «Пакрыўджаныя» яскрава сведчыць, што перыяд драматургічнага вучнёўства Л. Родзевіча не зацягнуўся, што ён вельмі хутка рос у прафесійных адносінах. Звяртае на сябе ўвагу ўменне маладога пісьменніка надаваць дзеі вастрыню, займальнасць, заглыбленасць. Ды і характарыстыка персанажаў, індывідуальная, псіхалагічная, вызначаецца сталасцю, майстэрствам»[2].

Драматургічная спадчына Л. Родзевіча вызначаецца адной даволі цікавай асаблівасцю: толькі дзве з васемнаццаці вядомых нам п'ес з'яўляюцца шматактовымі, «поўнаметражнымі», астатнія — аднаактовыя. Такую прыхільнасць пісьменніка да малой драматычнай формы вытлумачыць увогуле няцяжка. Бадай, Л. Родзевіча прыцягвалі ў ёй сцісласць і скандэнсаванасць мастацкай структуры, што ў сваю чаргу патрабавала ад аўтара вельмі ашчаднага адбору выяўленчых сродкаў і прыносіла, такім чынам, пэўнае задавальненне, бо мабілізоўвала ўсе творчыя сілы. Многае тлумачыцца таксама жаданнем Л. Родзевіча даць для шматлікіх тэатральных калектываў, што ўзніклі на хвалі нацыянальнага Адраджэння, нескладаныя ў плане сцэнічнай рэалізацыі (невялікая колькасць акцёраў, мінімум дэкарацый) творы. І, урэшце, не апошнюю ролю адыграла арыентацыя драматурга на традыцыі беларускай народнай тэатральнай культуры, творы якой грунтуюцца пераважна на малых формах. Наогул выкарыстанне Л. Родзевічам малой драматычнай формы было надзвычай плённым. У ёй пісьменнік выступіў сапраўдным майстрам.

---

[1] Ліс А. Малазнаёмы твор добра знаёмага драматурга. С. 15.

[2] Лаўшук С. С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пач. 30-х гг.). Мінск, 1984. С. 22.

Упершыню да малой драматычнай формы Л. Родзевіч звярнуўся ў 1914 г., напісаўшы невялічкі абразок-замалёўку «Марцовы снег», які змясціла «Наша ніва». Колькі ў гэтым творы замілаванасці і захаплення жыццём, маладосцю, каханнем!

Як вядома, меладрама разам з сацыяльна-бытавой камедыяй займала пануючае месца ў беларускай драматургіі перадрэвалюцыйных і першых паслярэвалюцыйных гадоў. Родзевіч-драматург якраз і пачынаецца з меладрамы («Блуднікі»). Да гэтага жанру ён звяртаўся і пазней. Так, у сакавіку — чэрвені 1920 г. у газеце «Беларусь» былі змешчаны абразкі Л. Родзевіча «Блуднікі», «Калыханка», «На шляху да сонца». Творы аб'яднаны не толькі часам напісання, але і шэрагам агульных ідэйна-мастацкіх асаблівасцей. Сюды неабходна аднесці і абмалёўку рэчаіснасці пераважна змрочнымі фарбамі, і вывядзенне ў якасці галоўных персанажаў людзей пакрыўджаных, абяздоленых, і трагічную развязку дзеяння.

Вельмі блізкая па сваёй танальнасці да згаданых абразкоў аднаактоўка «У кавалёвай хаце». Галоўная гераіня твора — маладая дзяўчына Анеля — кідаецца з адчаю ў студню, бо нават у думках не можа вынесці маючую адбыцца разлуку з любым, якога не прызнаюць мачыха з бацькам, а яе самую збіраюцца выдаць замуж за крыху дурнаватага, але ў той жа час заможнага маладога хутараніна.

Уласна драмы ў «малой» драматургіі Л. Родзевіча прадстаўлены, акрамя засацыялагізаванага і залішне агітацыйнага абразка «Кавалі», такімі цікавымі і арыгінальнымі творамі, як «Сказ аб гуслях» і «Досвіткі». Адной з асаблівасцей гэтых твораў, як, дарэчы, і некаторых іншых (абразкі «Блуднікі», «На шляху да сонца») з'яўляецца наяўнасць у, безумоўна, дамінуючай над усім у творы і цэментуючай яго драматургічнай тканіне ўласна празаічных элементаў. Наогул цеснае спалучэнне і ўзаемаперапляценне, плённы сінтэз у творах эпічна-празаічных і ўласна драматургічных элементаў пры несумненнай перавазе апошніх над першымі — адна з характэрных прыкмет беларускай драматургіі пачатку XX ст. Самы яскравы прыклад дзеля пацвярджэння і падмацавання сказанага — «Антон» М. Гарэцкага.

У часы іншаземнай інтэрвенцыі і Грамадзянскай вайны, калі захопнікі-чужынцы тапталі беларускія палеткі, рабавалі насельніцтва, калі Беларусь каторы ўжо раз за даволі кароткі тэрмін аказвалася ў коле чыіхсьці

ваенна-палітычных інтарэсаў і амбіцый, Л. Родзевіча як сапраўднага патрыёта, адданага сына сваёй зямлі вельмі хвалявалі наступныя пытанні: чаму такі горкі лёс Бацькаўшчыны? Што будзе з ёю далей і што трэба рабіць для вызвалення і адраджэння роднай старонкі? Якія ўвогуле роля і месца інтэлігенцыі, асабліва творчай, у гэтай справе і барацьбе? Усе гэтыя пытанні і былі пастаўлены ў п'есе «Сказ аб гуслях».

Вядома, Л. Родзевіч у сваіх хваляваннях і турботах быў не адзінокі. Узяць хоць бы таго ж Янку Купалу, трывожныя роздумы якога выліліся ў вершах «Жыды», «Годзе...», «На прызбе», шэрагу іншых твораў. Дарэчы, многія з іх упершыню ўбачылі свет у газеце «Беларусь», дзе якраз і быў змешчаны «Сказ аб гуслях». Таму, відаць, невыпадкова, што абразок быў прысвечаны «чарадзею беларускай лірыкі — Янку Купалу».

Дзеянне ў «Сказе аб гуслях» адбываецца на Полацкай зямлі ў часы глыбокай старажытнасці. Пачынаецца твор невялічкім, але надзвычай вобразным празаічным уступам, у якім аўтар малюе жудасную карціну, што ўтварылася пасля вялікага пабоішча. Сярод разбурэнняў, пажараў, безлічы загінуўшых і іх неад'емных спадарожнікаў-груганоў блукае поўны адчаю і скрухі Гусляр. Гора яго невымернае: вораг усё разбурыў, патаптаў нівы, палеткі, сенажаці, пазабіваў родзічаў і супляменнікаў, а ацалелых пагнаў у палон. Акрамя таго, паламаў яшчэ і гуслі. А разам з гуслямі знікла песня, што «па сцежках, між красак і дубоў цяністых... хадзіла, у бляск сонца прыбрана, край адгукаўся рэхам галасістым, а рэха чуў Ільмень, Царград мураваны. І веча ў Полацку песняй гардзілася, і гэтай жа песняй старонка малілася». А наогул, ці ёсць падставы бедаваць Гусляру аб сваім інструменце, калі навокал такія разбурэнні і незлічоныя чалавечыя ахвяры і страты?! Л. Родзевіч сцвярджае: так, ёсць, бо сапраўдны мастак сваёй творчасцю будзіць народ, заклікае да барацьбы за лепшую долю, да вызвалення краіны ад захопнікаўчужынцаў. Сапраўдны мастак — неад'емная частка духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу народа. Творчасць мастака ўбірае ў сябе ўсе беды, турботы, думкі, мары, імкненні, спадзяванні, якімі жыве народ. «Я — гэта ўсё, што вы бачыце, увесь край,— усклікае Гусляр,— а ўвесь край — гэта я. Яго радасць — мая радасць, яго гора — маё гора». Палымянае слова мастака здольна зрабіць амаль

немагчымае. Так і песня Гусляра, якую ён зайграў на адрамантаваных гуслях, «ажывіла, прабудзіла Ламізялеза, Вярнігору, Вырвідуба і іншых — яны падымаюцца, хватаюцца за аружжа і пяюць:

Гэй, схамяніцеся ад сну —
Пара, пара нам уставаць!
Ад ворага ліхога след,
След помсты просіць нас».

Песня-покліч на гэтым не скончылася. Апошнія два слупкі праясняюць сутнасць асноўнай праблематыкі твора і яго канфлікту:

А ты, гультай, забаўку кінь,
Найшоў калі і дзе іграць.
Жыццё — змаганне, дык за край
І за жыццё у бітву йдзём.
Адняць трэ гуслі у яго
І даць атручаныя стрэлы,
Лук пруткі...

Якія актуальныя гэтыя радкі па сваім змястоўна-праблемным напаўненні для нас, беларусаў! Як пераклікаюцца яны з усёй сумна-трагічнай гісторыяй адносін нашага народа да сваіх мастакоў, творцаў, да сваёй нацыянальнай інтэлігенцыі! Вядома, гэта не віна нашага народа, а яго бяда...

«Сказ аб гуслях», нягледзячы на сціплыя памеры, з'яўляецца творам шматпраблемным і шматаспектным. Наогул вартае здзіўлення і захаплення ўменне Л. Родзевіча вельмі ўдала, па-майстэрску звязваць, сплятаць у адзін непарыўны вузел-клубок у адносна невялікім творы цэлы шэраг надзвычай важных праблем, якія не трацяць з цягам часу сваю актуальнасць! Возьмем для прыкладу словы гусляра, кінутыя ім у адчаі «вучням Хрыста» Пятру і Іллі, якіх ён прыняў першапачаткова за новых захопнікаў і рабаўнікоў: «...Сюды які толькі дурань-прыблуда, чужак-пустадомак не ўспаўзе, кожны хоча гаспадарыць, каб яму ўсяго, чаго ён ні жадае. І вось пасля яго гаспадаркі пасеўнае поле лесам зарастае, вёскі пажарышчам пужаюць, гарадзішчы зруйнаваны, а людзі дзічэюць па лясах, балотах...» І зноў, як бачна, самая непасрэдная апеляцыя да нашай гісторыі, а дзесьці і да сучаснасці, пераклічка з імі.

Некаторымі момантамі сваёй праблематыкі пераклікаюцца са «Сказам аб гуслях» драматычныя сцэны «Досвіткі».

«Міру, міру»,— просяць, заклікаюць, патрабуюць знясіленыя вайной і разбурэннямі беларускія сяляне. Тым болей што да гэтай вайны яны не маюць ніякага дачынення. «...Вось я, думаю сабе,— кажа адзін з мужыкоў,— туляюся па ямах, як забойца, кінуў гаспадарку, сям'ю... І за што, і нашто?..» Рознамасныя захопнікі, якія наваднілі Беларусь, вядуць, па словах тых жа сялян, вайну не столькі паміж сабою, колькі з іх курамі ды парасятамі. А яны, мясцовыя жыхары, хочуць проста і спакойна жыць на сваёй зямлі, абрабляць яе, гадаваць дзяцей, радавацца сонцу. Дзе ж і якія шляхі да гэтага мірнага і спакойнага жыцця?

Вакол гэтага пытання якраз і разгортваецца асноўны канфлікт п'есы «Досвіткі». Ён тут унутраны, глыбока псіхалагічны, пралягае праз душы і розумы герояў. Сялянская маса (грамада) выступае ў творы неаднароднай. Некаторыя з сялян (а іх большасць) з прычыны ўласнай неадукаванасці, забітасці моўчкі пераносяць пакуты ці сцішана наракаюць на лёс. Іншыя спрабуюць задумацца над сваім становішчам і прычынамі, якія прывялі да гэтага: «Хто нам вораг?.. Каб жа мы зналі, мо гуртам, грамадой далі б яму рады... Але кожны думае па-свойму, у кожнага іншы вораг, кожны сам сабе і ўсім вораг». На жаль, такіх адзінкі, але і яны таксама нейкія інертныя, нерашучыя. І толькі маладзіца з суседняй, спаленай акупантамі вёскі, заклікае сялян да змагання, да барацьбы з захопнікамі, усяляк сарамаціць землякоў за баязлівасць і нерашучасць. І, трэба сказаць, дабіваецца пэўных зрухаў у іх свядомасці.

Даволі цікавым у плане закладзенай аўтарам ідэйна-сэнсавай нагрузкі з'яўляецца ў «Досвітках» вобраз вучыцеля. Ён — нястомны і апантаны працаўнік на ніве нацыянальнага Адраджэння. Свае веды, а таксама веру ў тое, што Беларусь нарэшце ўваскрэсне, а яе народ даб'ецца росквіту матэрыяльнай і духоўнай культуры, настаўнік перадае дзецям і дарослым. Сяляне шануюць і паважаюць вучыцеля, асабліва за тое, што не кінуў іх у гадзіну ліхалецця. Аўтар сімпатызуе гэтаму вобразу, але разам з тым бязлітасна выкрывае пэўную ілюзорнасць поглядаў вучыцеля наконт шляхоў набыцця народам Беларусі сапраўднай волі і незалежнасці.

Камедыйныя жанры ў «малой» драматургіі Л. Родзевіча прадстаўлены такімі творамі, як «Збянтэжаны Саўка», «Конскі партрэт», «Пасланец», «Стараста», «Драбніца жыц-

ця», «На Каляды», «П.С.Х.», «Багаты і бедны», «Падласая красуня»[1].

Дарэчы, зварот Л. Родзевіча пасля ўласна драмы да камедыі не з'яўляецца якойсьці нечаканасцю. Як зазначае С. Лаўшук, «калі ўлічыць, наколькі актыўна выкарыстоўваў Л. Родзевіч паэтыку фальклору (а ў вусна-паэтычнай творчасці амаль кожнага народа камедыйная плынь заўсёды вельмі значная), то ўсё робіцца зразумелым. Не прыйсці да камедыі драматург не мог, логіка яго мастацкай эвалюцыі непазбежна вяла да гэтага»[2].

Сярод камедый Л. Родзевіча найбольшую вядомасць набыў вадэвіль «Збянтэжаны Саўка», які стаў сапраўдным народным творам. Мабыць, няма такога кутка на Беларусі, дзе б ён не ставіўся мясцовымі прафесійнымі і аматарскімі калектывамі. Сакрэт папулярнасці «Збянтэжанага Саўкі» ў тым, што аўтар, узяўшы за аснову вядомы фальклорны сюжэт, вельмі ўдала апрацаваў яго. Зрабіўшы акцэнтацыю на выяўленне чыста сітуацыйнага, знешняга камізму, драматург таксама паклапаціўся і аб наданні персанажам даволі глыбокіх індывідуальных характарыстык, і ў першую чаргу моўных. Саўка і Магрэта то перакідваюцца трапнымі рэплікамі, то высвятляюць паміж сабой адносіны з дапамогай крыху даўгаватых, але ні ў якім разе не нудных дыялогаў, насычаных сакавітымі бытавымі словамі і выразамі. Спецыфічны беларускі гумар, што пранізвае ўсю п'есу, у спалучэнні са шматлікімі, удала падабранымі камічнымі сітуацыямі робяць твор надзвычай цікавым і прыцягальным.

Вялікую прыхільнасць сярод аматараў тэатральнага мастацтва, і асабліва сярод заходнебеларускіх, мела п'еса Л. Родзевіча «Конскі партрэт». Камедыйная палітра гэтага твора надзвычай шырокая: гумар тут цесна суседнічае з іроніяй, сатырай і нават гратэскам, маюць месца таксама фарсавыя элементы.

Сапраўды майстэрскім выкарыстаннем і апрацоўкай сюжэта вядомай казкі пра зламаны сцізорык вызначаецца вадэвіль Л. Родзевіча «Пасланец». Дасціпны і ўвішны пасланец з бляскам спраўляецца з ускладзенай на яго місіяй і шчасліва вяртаецца назад, у двор да сваёй пані.

---

[1] На жаль, тэксты апошніх дзвюх п'ес (а яны дакладна былі ў Л. Родзевіча і, па ўспамінах сучаснікаў, з'яўляліся надзвычай цікавымі і арыгінальнымі) нам не ўдалося адшукаць і змясціць у гэтым выданні.

[2] Лаўшук С. С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пач. 30-х гг.). С. 36.

Аднаактоўка Л. Родзевіча «П.С.Х.» з шэрагу яго камедыйных твораў (ды і не толькі камедыйных) вылучаецца сваёй тэматыкай і праблематыкай. Галоўныя героі гэтага твора — селянін (гаспадар) і яго жонка (гаспадыня). Гаспадар, «камуністы» і «арацер», як іранічна называе яго жонка, бегаючы па сходках, зусім запусціў уласную гаспадарку, адбіўся ад сям'і, а хату ператварыў у нейкі клуб. «Усе суседзі жывуць, як людзі, а мы, як на папасе,— проста рукі ападаюць,— гаворыць гаспадыня, наракаючы на мужа.— Ох, няма ў цябе нічога святога. Поўзаеш ты, як крот, точышся, куды не трэба, як жук. Ты толькі падумай: ці ж мы на тое будавалі гэтую хатачку, каб у ёй панаваў безлад і папасвалася розная нечысць. Верабей, і той будуе сабе гняздзечка, бароніцца і дзетак гадуе, а тут... сэрца толькі крывёй абліваецца». Аўтар іранізуе над сваім героем. Іншы раз гэтая іронія набывае адценні, блізкія да саркастычных:

«Гаспадар. ... Вось скажы ты мне, сарока-белабока, што такое калакціў?

Гаспадыня. Дурань ты!

Гаспадар. У дурня ўсё дурное. Слухай жа: калакціў — гэта такая машына, зробленая з людзей. І калі яе пусціць у равок, рэвалюцыйны, значыць, камітэт, дык яна наробіць такі тарарах, што ажно ўвесь свет вушы падыме...

Гаспадыня. І калі ва ўсім свеце будзе такі парадак, як у нас у хаце, і калі ў жываце кожнага будзе вурчэць ад галаду, як у мяне, дык гэта будзе не свет, а пекла.

Гаспадар. Калакціў што хочаш зробіць: з неба пекла і з пекла неба. Праз яго мы, паднявольныя, працоўныя, загаспадарым на ўсім свеце, запануем над панамі і дазволім сабе аддыхнуць, бо ўжо годзі напрацаваліся. Вось як!»

Побач з іроніяй і сарказмам выкарыстоўваецца часам і гратэскавае завастрэнне. Мае месца і буфанада. Гэта характэрна для мізансцэн з чырвонаармейцам і кітайцам у цэнтры. Бабнік і гуляка чырвоаармеец, які размаўляе ў творы па-руску (гэта зроблена Л. Родзевічам спецыяльна, дзеля найбольшага прыбліжэння да рэальнасці), ніякага ўяўлення не мае аб тым, што ёсць такі народ — беларусы — са сваёй уласнай мовай, гісторыяй, культурай, звычаямі. Разам з кітайцам, які ў яго на пабягушках, чырвонаармеец ледзь не кожнага прымае за буржуя і тут жа чыніць над ім самасуд, прыгаворваючы да расстрэлу. Менавіта за вобразы чырвонаармейца і кітайца, а таксама за вобраз нягеглага і малаадукаванага вясковага камуніста-«арацера» п'еса

«П. С. Х.» была заключана на доўгія часы ў спецхран. Цікава, што пастаноўка гэтага твора была забаронена і польскімі ўладамі.

Творчыя набыткі Л. Родзевіча ў паэзіі і прозе больш сціплыя ў параўнанні з драматургічнымі. Разам з тым і тут пісьменнік зарэкамендаваў сябе таленавітым і арыгінальным мастаком, аўтарам са сваёй індывідуальнай, непаўторнай манерай пісьма. Л. Родзевічам былі ўнесены пэўныя навацыі ў жанрава-стылёвую палітру беларускай паэзіі і прозы, у сістэму вобразаў-персанажаў і лірычных герояў. Ім таксама істотна пашыраны ідэйна-тэматычны дыяпазон нацыянальнага прыгожага пісьменства. Вядома, на гэтым шляху мелі месца і пэўныя выдаткі, творчыя пралікі, недапрацоўкі. Асабліва яскрава гэта наглядаецца ў творчасці другой паловы 20-х — пачатку 30-х гг., калі з-пад пяра аўтара пачалі выходзіць схематычныя, засацыялагізаваныя апавяданні і вершы з гіпертрафіраваным рэвалюцыйным пафасам. Але ці адзін толькі Л. Родзевіч грашыў гэтым у той надзвычай складаны і своеасаблівы час?!

«Ён заслужыў добры ўспамін аб сабе...». Менавіта такі загаловак даў Я. Хаўратовіч свайму невялічкаму артыкулу аб Л. Родзевічу, змешчанаму ў вераснёўскім нумары часопіса «Полымя» за 1965 год, калі надзвычай сціпла адзначалася 70-годдзе з дня нараджэння пісьменніка. Думаецца, што і сапраўды гэты таленавіты і арыгінальны мастак, адданы патрыёт сваёй Радзімы — Беларусі — павінен заняць сваё пачэснае месца ў пантэоне выдатных дзеячаў нацыянальнай культуры і ва ўдзячнай памяці нашчадкаў.

*Віктар Яцухна*

# Ігра́ каласістая[1]

*Эскіз*

Чалавек нараджаецца, каб запаліць у Сусвеце зорку ці пакінуць на зямлі след.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Леапольд Іванавіч Родзевіч (Лёля) нарадзіўся 12 чэрвеня 1895 года на хутары ў Кур'янаўшчыне, тады Вілейскага павета Віленскай губерні. Ад маёй вёскі Задроздзе, а калі лічыць ад маёй канцавой хаты — можа, за паўвярсты праз балота.

Хата наша з добрага часанага сасновага бярвення з трысценем і варыўнёй, крытая саломай (згарэла ў сорак чацвёртым годзе летам, спалілі немцы ў апошнюю блакаду), стаяла ў канцы вёскі па дарозе з Сушкава ў Леснікі. Калі ісці ў Леснікі, у Ваўкаўні ля лесу, дзе хавалі на зіму ў ямы бульбу, трэба было ў вілах узяць правей. Левы ж тор выводзіў лесам у Агульніцу, далей у Бярэзавец і праз Каралінскую пасеку вёў да ракі Віліі, за якой была Польшча.

Гэта — на паўночны бок Кур'янаўшчыны.

Калі скіравацъ на поўдзень, мінаючы справа грэблю і вёску Сушкава, падацца праз аселіцу ў канцы гарода і перайсці ўброд нашу рэчку Дроздку (адсюль і Задроздзе), якая да нашай вёскі называлася Жоглаўкай, а далей, павіляўшы па балотах і па лесе, ужо Дроздкай упадала ў Вілію, і падняцца высокім берагам на Выганчык, ладны кавалак логу між крыніц,— выходзіш на Крайскі бок. Крайскі бок — і тады, калі нарадзіўся Родзевіч, і пазней, аж да нашых 60-х гадоў,— пракаветнае балота са старымі вольхамі, елкамі — гэта далей, пад Рэпішча-пушчу,— а тут, за Выганчыкам, травяністая твань з нізенькімі бярозкамі, ніцай лазой, гадзюкамі і вужамі, усё ў куп'і, парослым ліставатым вобаратнікам, журавіннікам, чаротам, асакой, рабінкай і мохам.

[1] Друкуецца па кн.: Пташнікаў І. Тартак. Мінск: Маст. літ., 2000 (з прысвячэннем Арсену Лісу).

Ступіш пасля Выганчыка нагой, адразу правальваешся ў балота аж па калена, калышучы і выцягваючы наверх руды торф з бурбалкамі і праціўным рэзкім сырым пахам, ад якога круцілася ў галаве і блажыла. Па балоце было не прайсці, і на ім ляжалі кладкі. Па два ці тры альховыя бярвенцы, слізкія пад нагамі, як бог ведае што, не ступіць, каб не зляцець у твань, гарбаціліся праз увесь Крайскі бок да самай Кур'янаўшчыны,— якраз да першага Саду, дзе некалі і стаяла хата Леапольда Родзевіча.

Кур'янаўшчына — гектараў пяць воранай зямлі — была акружана вясковымі палямі і сенажацямі — лагамі і лажкамі — з усіх бакоў. З паўночнага захаду падыходзіла вёска Задроздзе са сваім Выганчыкам, на паўднёвы захад, калі пакінуць справа могілкі — Сушкава з Дваром і Малінаўкай, на паўднёвы ўсход — Хадакі, адкуль была родам маці Лёлі — Леапольда Гелена Яноўская, як пішуць. (Відаць, Гілена, бо Гелен у нас не было ні тады, ні цяпер. Толькі Гілена.)

Далей гэтых вёсак на поўдні быў Крайск, дзе і канчаў пачатковую школу Лёля. Мястэчка тады вялікае, на нейкую частку яўрэйскае, з карчмой, крамамі, кузняй, майстэрнямі, смалакуркай, царквой... Яно стаяла якраз на тракце Барысаў — Зембін — Плешчаніцы — Вілейка — Даўгынава (у нас — толькі Даўгынава, а не Даўгінава)... Ва ўсіх гэтых мястэчках асядалі тады яўрэі — балаголы і рамеснікі. З Крайска добра быў відаць касцёл у Альковічах,— ягоны высокі шпіль у пагодныя дні можна было бачыць і з Кур'янаўшчыны — доўгай і тонкай, як дзіда, чорнай іголкай у небе.

Блізка Кур'янаўшчыны былі яшчэ вёскі Рагозіна, Грыневічы, Дзераўно, Краснаволле, Мяжанка, Стрый, Будзенічы, Баброва,— гэта па другі бок ракі Дроздкі. Па гэты бок — паўночны — Леснікі, Пагост, Жызнава, Даўгынава, Буслава...

Гэта тыя вёскі, якія ўпершыню пачуў і праз якія ўжо напэўна выходзіў з хутара ў «вялікі свет» малады Лёля з братам Чэсем, сёстрамі Янінай, Ядвіняй (у нас толькі Ядвіня, а не Ядвіга) і Марыляй (у нас толькі Марыля, а не Марыя, як цяпер пішуць)...

А, можа, і сыходзіў з дому адзін — ведаем, што ён быў скрытны і любіў адзіноту.

Кур'янаўшчына складалася як бы з двух хутароў-забудоў і двух садоў — недалёкіх адзін ад аднаго, можа, сажняў за сто—дзвесце.

Калі тут першыя пасяліліся гаспадары, адзін ці адразу двое — невядома. І хто быў той першы Кур'ян ці Кур'яновіч, што асеў у гэтым баку, даўшы назву Кур'янаўшчыне, ніхто не ведае. За маёй памяццю, дакладней, за памяццю маці — тут, у Кур'янаўшчыне, жылі два гаспадары.

Першы ад нас, ад Задроздзя, Родзевіч, другі, ад Хадакоў — Таразэвіч.

Сады — вярней тое, што ад іх асталося,— і цяпер яшчэ завуцца: Родзевічаў і Таразэвічаў.

Калі праз кладкі міналі балота з нізкарослым бярэзнікам, альшэўнікам і ніцай лазой, выходзілі на лажок з высокай летам мурожнай травой, з сажалкай, абсаджанай старымі ўжо вербамі. Вербы зрасліся ўверсе, і адной кронай хавалі ад сонца застаялую, пароспую альдравандай і лопухам ваду. Сажалка некалі, відаць, была запруджана для рыбы; пасля ў ёй пад восень мачылі каноплі на пяньку.

Кур'янаўскія сады я добра помню недзе з 1937 года, калі праз балота мы, хлапчукамі, дасягалі летам да іх. Ішлі збіраць падалкі — яблыкі і грушы, што ляжалі на зямлі. Атрасаць іх, залезшы на дрэва, нам у Родзевічавым садзе не даваў ужо новы тут гаспадар — стары Антось Ляшковіч. Мы збіралі дулі на зямлі — сочныя, жоўтыя, доўгія. Імі была ўсыпана ўся трава. Не ступіць... І стары Антось Ляшковіч дазваляў нам збіраць іх — хоць усе.

Калі і як памяняліся тут гаспадары — невядома. І ніхто ўжо са старых жыхароў дакладна не помніць. Кожны гаворыць сваё і рознае.

У Родзевічавай хаце ўжо ў тыя гады — за маёй памяццю — жыў Антось Ляшковіч. У Таразэвічавай — Андрэй Бохан. Адны кажуць, што гэта былі ранейшыя Родзевічавы арандатары Кур'янаўшчыны. Другія — што ўвесь абшар з пабудовамі быў імі куплены. Трэція — што Ляшковіча і Бохана як беззямельных і бедных пасялілі тут пасля рэвалюцыі. Людзей тых, хто быў сведкаю ўсяго гэтага, ужо амаль няма. Ды і трэба мець пад старасць добрую памяць, каб усё гэта помніць...

Можа, і ляжыць дзе ў архіве купчая ці іншая якая «грамата» на Кур'янаўшчыну, але мне нічога такога не траплялася.

Ехаць у Кур'янаўшчыну з нашага Задроздзя трэба было пракаветнай грэбляй, вузкай дарогай амаль з вярсту, загачанай на балоце альшэўнікам, бярэзнікам, карчамі і каменнем. Паабапал грэблі гнілі канавы са стаячай цвілой вадой, усягды засыпаныя лісцем. Калі ў канаву правальвалася карова — не кожную ратавалі.

Канавы двума ручаямі — адзін на Выганчыку, другі на Зурэччы — сцякалі ўжо ля моста ў Драздку. Ля вёскі праз Драздку ляжаў мост — два доўгія сасновыя бярны ўпоперак ракі — а па іх удоўж дробны сасновы кругляк. Калёсы на мосце трасло, і ў вячэрняй цішыні іхні ляскат быў чуваць аж у Кур'янаўшчыне...

І ў другім канцы грэблі пад Сушкавам быў мост, але меншы: там з Кур'янаўшчыны цякла невялічкая рачулка, з каменнем на дне, курмялямі, жабамі і гадзюкамі — пераплывалі, высунуўшы з вады галаву, з аднаго боку ракі на другі.

За маленькім мастком перад Сушкавам дарога па калдобінах паварочвала налева, на лажок, парослы дзяцельніцай, мятліцай — гэта дзе вышэй, а ніжэй да балота — асакой, рабінкай, аерам, хвашчом, высокім, аж у пояс. Удоўж рачулкі дарога выводзіла на пагорак да старой рабіны і праз першы і другі сады вяла на Хадакі. Яна праходзіла ля самай Родзевічавай хаты, пад акном...

І цяпер там ляжаць вялізныя каменні ад фундамента, за якія восямі чапляюцца калёсы, і расце састарэлая, але вечна жывая ірга каласістая. У нашым баку яе завуць — загранічныя ягады. Высокая, метраў пяці, кусты, як вішаннік, лісце цёмна-зялёнае, увосень чырвона-аранжавае, расла яна пад акном у Родзевіча, адтуль, дзе сонца, ад Хадакоў. З пахнючым белым цветам — цвіце ў маі, гронкамі, з чорна-чырвонымі спелымі ягадамі — спеюць яны ўжо ў ліпені,— буйней рабіны, з прэсна-салодкім смакам. Загранічныя ягады паявіліся ў нашым баку ў адных Родзевічаў у Кур'янаўшчыне.

І цяпер яны там.

Сады — і першы Родзевічаў і другі Таразэвічаў — вымерзлі зімой у саракавым годзе — у фінскую вайну. Не выстаялі ў саракаградусны мароз ні яблыні, ні грушы, ні слівы, ні вішні. Не адышлі і пасля, нават атожылле не

пусцілі. Счарнелі, ссохлі... Трашчалі на ветры адмерлым суччам, крышыліся і падалі на зямлю. Людзі плакалі, гледзячы на іх...

Цэлымі засталіся толькі загранічныя ягады, грушыдзічкі, рабіны і ліпы.

Ліпы раслі ля аднаго і другога котлішчаў, акружаючы і Родзевічаў і Таразэвічаў сады вялікімі квадратамі з алеямі, як і па ўсёй тады Беларусі ля вялікіх і маленькіх маёнткаў. І прыгажосць, і мёд, і зацішак ад ветру, і летні, такі патрэбны расяністы цень у самую гарачыню, калі і зямля нагрэта, як неба, калі сохне на Кур'янаўшчыне ячмень і на лажках ля балота гарыць торф.

І ў адным і ў другім садзе стаялі тады вялікія, з трысценем, хаты, і яшчэ большыя пуні. Ля іх — хлявы і свіронкі. І ля адной, Родзевічавай, і ля другой, Таразэвічавай сяліб у канцы лажкоў, пад балота, былі сажалкі — да сучаснай меліярацыі іх яшчэ можна было пазнаць: невысокія апалыя беражніцы, парослыя дзяцельніцай, лопухам і палыном.

Сама Кур'янаўшчына — вораная зямля — пачыналася ад Крайскага боку — балота і, пакідаючы справа Сушкава, цягнулася аж пад Хадакі, пад Асавок. Асавок быў ужо, лічы, логам, парослым сіўцом, пад'ядлоўцам, бярэзнікам і лазой...

Зямля добрая была толькі каля саміх хат, далей, пачынаючы ад Крыжа — Кур'янаўшчыну-поле перасякалі дзве дарогі, і на крыжаватцы пад трыма елкамі стаяў сасновы крыж — зямля была благая, супясчаная, камяністая, парослая пырнікам, рудзікам і каткамі. Пад Хадакі выворваўся жоўты пясок. Таразэвічаў сад сціскалі чарнабыльнік і палын. І лаза... Драбналістая, на выгляд прывялая, сухая, яна ўчэпіста трымалася за неўрадлівую Кур'янаўскую зямлю. Расла ля гародаў, ля дарог, ля сцежак, ля валуноў і на вялікіх крушнях камення, на якіх грэліся летам вёрткія шэранькія яшчаркі.

Ці не сядзеў дзе на валуне ля крушні камення побач з бацяном малы Лёля, збегшы з дому?..

Быў скрытны, паўторымся, задумлівы, адзінокі і шукаў яшчэ большую адзіноту і на так ужо адзінокім Кур'янаўскім хутары...

Вясна ў Кур'янаўшчыне пачыналася з вялікага сонца. Раніцай яно, чырвонае і блізкае,— адступілася ўжо на ўсход па замглёным небе ад Хадакоў, над якімі вісела ўсю зіму, адбеглася аж на Рэпішча-пушчу і пачынала там іграць праз калючыя далёкія яловыя дзіды...

Снег, за апошнія дні добра пад'едзены сонцам, ападаў, на полі пад Асаўком паяўляліся першыя ладныя чорныя праталіны; з начы яшчэ снег сцінаўся марозам, шэрань — каня ўтрымае. На сажалках з-пад лёду паяўлялася днём вада, хаваючы зімні снег і скоўваючы яго пасля чыстым-чыстым лёдам,— і дрэвы ў інеі, і сонца, выплыўшы з-за лесу, відаць у ім, як у люстэрку.

За тыдзень падтае і снег на полі і лёд у сажалках, але нанач усё яшчэ ціснe мароз. Аднойчы вечарам сонца над Сушкавам хаваецца ў доўгія сінія палосы. Дым з коміна сцелецца ў садзе па зямлі...

З начы ўзнімаецца бура, нарывае дождж, і снег увачавідкі знікае і з поля, і з балота. Зямля пад сонцам чарсцвее, і загараецца на балоце падпаленая некім высахлая за зіму трава.

Недзе тады, усягды такім часам, прылятаюць на задраздзянскія тры сасны, што ў канцы вёскі, бацяны. Доўга кружаць угары над Кур'янаўшчынай — аж цэлы дзень, тады, намарыўшыся, апускаюцца надвечар на гняздо — надоўга, на ўсё лета...

На дрэвы ў сад прылятаюць шпакі — ад іхняга ранішняга спеву аж кружыцца галава; на балоце кігікаюць кнігаўкі, галяшачы на ўвесь свет.

На сухім месцы ля Таразэвічавага саду лезуць з зямлі пралескі і сон — раней за траву.

Пасля першыя, раней нават за вішні, зацвіталі ў садзе пад акном заграНічныя ягады — ірга каласістая. Нібы чакаючы яе, адразу пакрываліся густой малочнай беллю яблыні, грушы, слівы. На лажку ля сажалак, як бы ўсё роўна сюды перакінуўся з саду цвет, укрывалася белым чарэмха. Пачынаючы ад сажалак, яна расла ля рачулкі па берагах да самай грэблі, і цяпер густы белы вір, віляючы разам з ракой, плыў з Кур'янаўшчыны да мастка і далей пад Сушкава і на Зурэчча...

Зелянела ўсё наўкола раптоўна, у адзін, здавалася, дзень, і ў сад разам са шпакамі прылятаў салавей...

Адчыняй вокны і слухай вясну, не сыходзячы з месца...

Зарыкалі пад Асаўком выгнаныя ў поле каровы; па мастку заляскаталі калёсы, засвісталі, як салаўі, пугі ля вушэй у коней.

Зямля прасіла плуга, і чалавек адгукаўся, як мог...

Лета ў Кур'янаўшчыне пачынала зацвітаць ліпавым цветам. Ліпы ў алеях, зімой сухія, чэрствыя і разгатыя, цяпер высіліся стагамі зялёнага сена; кроны спляліся, і не відаць праз лісце сонца; толькі пчолы, як усё роўна сетачкамі, абселі іх і цяжка калышуцца на жаўтаватых суквеццях,— напіліся так, што дай бог не зваліцца на зямлю... А тыя, што падаюць, паўзуць тады па траве і па белых галоўках дзяцельніцы ў вуллі, што хаткамі ў радок стаяць пасярод не зачэпленага яшчэ касой саду.

Сад набрыняў пахам дзяцельніцы, укропу, кміну, агурочніку і — ліпавага цвету. Аж, здаецца, зрывае нос...

Ціхім сонечным днём пах ліпы з садоў плыў аж у Асавок і за горку ў Сушкава.

Пасля ліп у Кур'янаўшчыне на полі цвіла грэчка. Шырока, ад Крыжа аж да Асаўка, зямлю ўсё роўна як засыпала снегам — нібыта ён выпаў, як выпадае ранняй вясной у зазімак.

І над грэчкай звінелі пчолы. І тады здавалася, што і сады, і гароды, і лог, і Асавок,— уся Кур'янаўшчына і ўся зямля звініць адным густым пчаліным звонам...

Недзе ў гэтым летнім міжцвецці ў Кур'янаўшчыне пачыналі касіць лагі. У балота — у асаку і хвошч — адразу не лезлі, пакідалі на восень, рэзалі мурог: дзяцельніцу, мятліцу і сівец.

Сена, адзвінеўшы косамі, разбівалі раніцай пасля сябе мужчыны, пераходзілі ў Асавок на сівец, і пасля паяўляліся жанчыны з граблямі. Белыя і чырвоныя хусткі, нажуткі; галасы, смех, вэрхал...

Мурог на добрым сонцы сохне скора, але яго не паложыш адразу ў пуню, што за садам,— мяккаваты; не пакінеш і нязграблены, бо можа трапіць пад дождж.

З паўдня грукала над Хадакамі, парыла, і на лажках пачалі расці копы — заўтра растрасецца і дасушыцца...

Ляжыш у капе, паклаўшы галаву на далоні, і глядзіш угару — на растапыраны блакітны васілёк неба...

Пад нізам шапаціць, злягаючыся, мятліца, коле ў шыю. На твар падаюць прывялыя галоўкі дзяцельніцы і скачуць конікі — капа свежая, мяккая, хутка асядае пад табой...

Сонца звярнула з паўдня і, гарачае, хаваецца ў цёмныя тулягі, што плывуць з Сушкава, з захаду, нізка, над самым садам...

Угары над імі ў сіняй праталіне між белымі воблакамі — бацян. Адзінокі, ціхі, спакойны, ледзь кратаецца... Губляецца з воч, тады зноў ловіш яго ніжэй, на белым воблаку — кружыць і кружыць, беручы з ветрам на ўсход. Падлятае да Хадакоў, адтуль зноўку кіруе на Асавок, на Сушкава і губляецца на цёмным тулягу, які пачынаюць паласаваць сваімі белымі грудзьмі ластаўкі, як маланкі...

Робіцца ціха; капа мяккая, як падушка ў ложку, і густа пахне ліпавым цветам з саду...

Зноў паяўляецца ўгары бусел, апускаецца з белым воблакам на лог і накрывае млявым распараным перапялёстым крылом вочы...

Усё змаўкае, толькі пахне ліпавы цвет і палын...

Пасля пачынае пахнуць багуном, гарачым, распараным, і смалістай хвояй... Гэта ўжо ў Ліпніках, у лесе за Задроздзем, пад самай Віліёй, дзе ўся зямля пад высокімі соснамі ўсыпана чарніцамі. Трэба згінацца і згінацца, скубучы буйныя чорныя ягады ў конаўку... У лесе няма чым дыхаць ад сухой гарачыні, пачынае кружыцца галава і верне пот. Сцяло ў грудзях — ні ўсхліпнуць... І шуміць несціхана гарачы лес...

Прачынаешся ўжо тады, калі цябе разам з капой падхопіць бура і коціць логам да сажалкі...

Сады пад ветрам гнуцца аж да зямлі, раскатая ліпа ў Таразэвічавым садзе ля крушні камення развальваецца надвае і падае на зямлю: адно рала па адзін бок дарогі, другое — па друті. Ля Асаўка сіва ад пяску, як ад дыму — не відаць свету... Копы на лажку як карова языком злізала,— вісіць толькі ўгары растрэсеная доўгая мятліца, яе гоніць у белы свет верх бярэзніку на балоце...

Вецер збівае з ног, не дае ўстаць і ўсё коціць па калючай пасля касы зямлі... Здаецца, ён пагоніць зараз і каменне з крушні сюды, на лог да сажалкі.

Рыкае скаціна; угары бура ганяе белую хустку, сарваную ў некага з галавы...

Нарэшце нізкія сівыя хмары адгукаюцца на ўсё перуном, неба над Асаўком рассякае надвае доўгая ў дзве

паласы маланка, і зямлю адразу сячэ град... Буйны, па бабіне, аж трэба закрываць шчокі...

Бура аціхае гэтак жа знянацку, як і пачалася... Вылівень мые яшчэ зямлю з гадзіну, тады паволі аціхае і ён. Крайскі бок — балота — загараецца сіне-чырвонай радугай, блізка, хоць руку да яе працягні.

Лажок чысты ад коп. Толькі ад зямлі падымаецца цёплая сівая пара...

З ліп у садзе капае вада, буйнымі кроплямі; яна блішчыць і на зямлі ў траве, як на балоце.

Пад вечар зноў робіцца ціха, як нічога і не было — толькі растрэсенае сена па ўсім лажку яшчэ дыміцца парай.

Пара падымаецца, збіраючыся ў клубы, ля рэчкі, ля мастка. Над Паграбішчам за Задроздзем выплыла з цёмнай паласы вялікае чырвонае сонца,— якраз за рабінай у канцы саду.

Пад нагамі лужы, у іх плаваюць галоўкі дзяцельніцы і лісце — спарышамі.

Садзіцца сонца, пакідаючы пасля сябе туман і чорную буйную машку на чырвоным акраўку неба...

Лета з Кур'янаўшчыны пачыналі звозіць мужчыны на вазах з жытнімі снапамі, уціснутымі парубнём, з-пад якога пырскалі ў вочы зярняты.

Жніवеньскае аціхлае маркотнае поле блішчэла пад спакойным сонцам жоўтым іржышчам і бугрылася мэдлікамі, сярод якіх хадзілі, пры ляцеўшы з задраздзянскага гнязда, ужо маладыя бацяны і няўмела хадзілі па калючым іржышчы і гэтак жа няўмела падымаліся ў лёт, доўга прабягаючы па загонах.

На зжатым лепш відаць корм, чымся ў балоце на Крайскім баку, не зачэпленым касой. Яго пакідаюць да маразоў, тады рудую асаку і рабінку рэжуць па самым лёдзе,— звон ад касы чуваць аж у Кур'янаўшчыне ў садзе.

Песні жней, што рассыпаліся аж на Сушкоўскім полі, гамана і смех возчыкаў з пугамі ў руках, ржанне коней, клёкат бусла, ляскатанне калёс па загонах,— усё зліваецца ў адзін летні блаславёны гул на зямлі — гул радасці ад ураджаю, якога чакалі цэлы год...

Снапы вязуць у Кур'янаўшчыне ў вялікую пуню, прыкладаюць адразу, і зноў калёсы па дарозе вядуць сваю адвечную на зямлі песню,— што рэхам адгукаецца ў Асаўку і пад Хадакамі. Рэха варочаецца бразгатам,

грукам, скрыпам і ржаннем назад у Кур'янаўшчыну, каб асесці нанач на Крайскім баку пад Задроздзем.

З цямном нязвезеныя снапы — мэдлікі з крывымі шапкамі — хавае белы туман, зліваючыся з белымі хусткамі на галовах у позніх жней; пазней — і кучкі жней хаваюцца ў тумане...

У Кур'янаўшчыне надыходзяць ціхія цёплыя жнівеньскія дні, з ядранымі зорамі ў небе, з малочным туманам і густой расой на зямлі,— не ступіць нагой.

На лагах пачынаюць сцяліць лён.

У садзе абіраюць белы наліў і падпіраюць адмысловымі калочкамі з ляшчэўніка, прынесенага з Асаўка, дзе за арэшнікам не прабіцца, абструтваюць іх набела і — пад голле маладых яшчэ антонавак, штрыфеля, папяровак, ранетак, цыганак... Адны грушы-дулі не трэба падпіраць: яны павырасталі вышэй стрэх — асталіся яшчэ старыя, спрадвечныя. Блішчаць толькі ўгары налітыя плады жоўтымі бакамі, хаваючы сабой лісце. Іх даставаць трэба толькі паставіўшы драбіну...

І кратаюць у гэту пару малады мёд.

З Асаўка, з бярэзніку, носяць кошыкамі маладыя баравікі, крамяныя, на высокіх тоўстых ножках; жоўтагаловыя чашчавікі, якія цяжка адрозніць ад падасінавікаў; і з Рэпішча, з пушчы, мяшкамі рыжыкі. Набяруць мех па завязку, ускінуць на плячо і пайшлі...

На Крайскім баку павылазілі аж на кладкі дурніцы і журавіны,— ідучы, чапляешся нагамі. Баішся ступаць на ягады і яшчэ на змей, што тут жа скручваюцца, каб пагрэцца на сонцы. А над усёй Кур'янаўшчынай — чыстае высокае блакітнае неба з белымі ціхімі зажуранымі воблакамі,— лета яшчэ не хоча саступаць нікому...

Але аднойчы раніцай па засыпанай альховым лісцем грэблі з Сушкава праз Задроздзе на Леснікі прайшла настаўніца, маладая жанчына, адна, не баючыся ні далёкай дарогі, ні лесу...

Настаўніца прыносіць з сабой восень...

Шпакі на ржышчы пералятаюць з загона на загон, чародкамі, нібы маленькія хмаркі. І дзеці ў вёсках збіраюцца чародкамі, як шпакі...

Пад вечар над Крайскім бокам высока над зямлёй ляцяць на поўдзень першыя няроўныя клінкі гусей, падаючы адзінокі сумны голас...

Кажуць, перавярні на зямлі камень — і зблытаеш у небе жураваў. Яны сёлета рана — будзе і ранняя зіма — ляцяць здалёку, з поўначы; змораныя, выбіраюць для начлегу не балота, а лажок. Курлычуць, кружачы над Крайскім бокам, зніжаюцца, блытаючыся, б'юцца крылямі аб высокія азяроды з гарохам і бульбеўнікам ля саду і падаюць на зямлю пад бліскучыя вербы ля сажалкі.

Ужо сеюць на перааранымпапары пад Асаўком з сявень на зіму жыта і абіраюць у садзе яблыкі...

За ападкамі не ступіць на зямлю; кошыкі з антонаўкамі толькі на плечы і з плеч, на плечы і з плеч... Не перанасіць... У пуні засыпаны ўвесь свабодны памост.

Пачынаюць капаць бульбу, каб заспець да зацяжных халодных дажджоў, калі абкладвае Кур'янаўшчыну імжой на цэлы тыдзень — не вылазь з хаты.

Выбрана бульба, спарадкаваны яблыкі, уцеплены вуллі, замочана «пянька» — канаплі ў сажалках, абкапаны на зіму прызбы і на таку пачынаюць грукаць цапы. Малоцяць у два, у тры, а то і ў чатыры цапы. Роўны густы перастук ад іх чуваць па ўсёй Кур'янаўшчыне, нібы гэта б'юць не па рассцеленых снапах на таку, а ўсю зямлю, паспелую за лета, малоцяць цапамі...

У садзе шэра і пуста; застаюцца толькі гарэць чырвоным агнём рабіны, і трашчаць прарэзлівымі галасамі на гасця сарокі, гладкія, з доўгімі-доўгімі вострымі хвастамі. Такія сарокі толькі ў Кур'янаўшчыне...

Паляць згрэбленае пад яблынямі сухое лісце — дым збіраецца на балоце пад Задроздзем паласой, як туман.

Паявіліся першыя гілі і сініцы; на Крайскім баку на балоце заблішчэў цененькі лядок. З начы ціскануў мароз, і адразу на заінелую рунь пад Хадакі на груду выгналі перапялёстую скаціну...

Гарыць у Асаўку яркі агонь — пастухі паляць сасновыя карчы; брэшуць сабакі і бляюць авечкі. Рассыпаюцца па ўсёй руні — не ўстояць на месцы. Пад Асаўком адзываецца стары груган — сядзіць на самым версе на елцы.

Пасля зноў цішыня да звону ў вушах; у прыродзе спакой і задуменне,— зямля няспешна чакае снегу.

Зіма доўгая і халодная, як і ўсе ранейшыя, яшчэ больш суровая, з марозам, з высокімі гурбамі — замятае аж па стрэхі разам з вокнамі і хавае з воч высокі куст заграпічных ягад, толькі ідаць з-пад гурбы цёмнае галлё — дубчыкамі,— якое, залезшы наверх, на гурбу, зґрызаюць зайцы.

Маразы калючыя, замуравалі надоўга падвойныя вокны; вецер паўночны, зайшоў з Задроздзя і мяце каторыя ўжо суткі, замятаючы ўсё начыста на двары.

Раніцай без шуфля на ганак не выходзь.

Ноччу на ядранае неба выплывае з-за гурбаў ля паркана круглы месяц; праз адталую проці печы шыбіну ідаць ваўкі: падыходзяць з Асаўка аж да саду, садзяцца на заднія лапы і доўга і нудна выюць. Пасля перабягаюць садам бліжэй — ціснуцца да жытла.

Грукае ў хлеве рагамі аб сцяну спалоханая скаціна і ціхенька скуголіць, забіўшыся некуды ў кут, сабака.

Ваўкі выюць і ў Ліпніках за Задроздзем, і ў Ваўкаўні пад Леснікамі, і ў Асаўку ля Хадакоў.

На кані, запрэжаным у сані, у Даўгынава на базар праз Ліпнікі і не выязджай — ваўкі бягуць следам, а то, як сарваўшыся, пускаюцца даганяць.

Хай пачакаюць недашытыя ў Даўгынаўскага шаўцаяўрэя касцюмчыкі для Лёлі і Чэся...

Скрыпяць дзверы ў хаце і ў хлеве, скрыпіць на двары снег пад нагамі, скрыпяць палазы, скрыпіць сучча ў садзе пад ветрам на марозе... А ноччу «страляюць» вуглы і платы. На ліпах адскоквае кара...

І пахне ўсюды і ноччу і днём мяккім едкаватым дымком — у печы без аддухі палаюць сухія альховыя дровы з Крайскага боку.

Калі з начы аціхае вецер, калючае, вялікае чырвонае сонца ўзыходзіць з сіняй смугі недзе зусім блізка — за Хадакамі. Густы-густы іней пакрывае і Крайскае балота, і Асавок, і сады,— і тады ўсё зліваецца ў адну бліскучую яркую шэрань.

І калі верхняе падвойнае акно, што ў хаце проці печы, добра адтае раніцай ад цяпла з чалесніка, у шэрай ранішняй цішыні за другім акном ідаць, як павісае на двары ўгары адна вялікая — зорачкай — чырвоная на сонцы сняжынка...

Адкуль яна?

Плыве ціхенька ўдоўж акна дваром, не хочучы падаць на зямлю. Так і хаваецца з вачэй, не ўпаўшы.

Б'ецца ў пададталую шыбіну чырвонымі грудкамі гіль. Раз, другі... Просіцца ў хату. Не паспееш адчыніць дзверы, як ён, падбіты марозам, падае мёртвым на двор — на снег пад ногі.

І відаць аж з саду, як далёка на Крайскім баку на балоце ружовым агнём гарыць каліна. І на самых кладках, і далей пад Верх-возера і пад Выганчык.

І гарыць так усю зіму. Яе так многа, што з ёй не спраўляюцца ні людзі, ні сарокі...

Гарыць да самай вясны.

Яе гэты раз прыносяць здалёку на крыллі бацяны. Яшчэ на снег на Крайскім баку,— на толькі што першыя праталіны... І ходзяць яны белыя па белым снезе, высака падымаючы ногі. І гінуць...

Пасля ўжо, праз які тыдзень-другі, з-за Сушкава паўзуць нізкія чорныя хмары. Шалее моцны вецер, зносячы стрэхі і ломячы дрэвы.

Позняя вясна... Дачакацца б хутчэй цяпла і бацянам і чалавеку.

І першы гром сёлета грыміць на голы лес, яшчэ са снегам. Не к дабру...

Недзе пасля 1938 года, у той самы час, калі не стала Леапольда Родзевіча, не стала і ягонай хаты ў Кур'янаўшчыне.

Хату Родзевіча, дзе ў той час жыў Антось Ляшковіч з жонкай Юлькай, дочкамі Анцяй, Таняй і Манькай, перавезлі ў маю вёску Задроздзе і паставілі ў нашым канцы праз вуліцу — якраз насупраць нашай. Бліжэй да фермы, дзе пачыналіся Ліпнікі, за якімі рака Вілія ўжо была падзелена пасярод калком — на савецкі бок і на польскі.

Хату з часанага бярвення перасыпалі, вокны пакінулі старыя, прыкінулі да яе новы трысцень, накрылі «траской» — сасновай гонтай, якую рэзаў на станку на конях Кірык з Сушкава,— у нашым баку тады вялікі майстар.

Хата, пастарэлая за свой век, і цяпер стаіць «жывая-здаровая», і жыве ў ёй адзінокая Юльчына дачка Таня. Па бацьку Ляшковіч, па мужу Кабак.

Перасыпаную Родзевічаву хату ад нашай аддзялялі чатыры старыя таполі (тофелі) і вуліца. Наша хата згарэла ў вайну, бо стаяла блізка да лесу, значыць, была партызанская.

Андрэя Бохана з сям'ёй, што жыў у Таразэвічавай хаце, таксама «ссялілі з хутара» — перавезлі калгасам з Кур'янаўшчыны і «забудавалі» побач з намі па адзін бок вуліцы бліжэй да Ваўкаўні.

І Ляшковіч і Бохан павінны былі жыць не дзе хацелі, а ў сацыялістычнай задраздзянскай грумадзе — у нашым калгасе імя Сямёна Міхайлавіча Будзённага, а не недзе там за Крайскім балотам у Кур'янаўшчыне. Кур'янаўшчына ўся адышла пад наш калгас.

Немцы ў вайну спалілі і Боханаву хату, на год раней, чымся нашу. Тады яна была сама бліжэй ад лесу.

На месцы Родзевічавай хаты ў вайну ў Кур'янаўшчыне пабудаваўся Валодзя Якубёнчык з нашага Задроздзя, каваль. Падняў на старым Родзевічавым фундаменце новую добрую хату, паставіў новыя хлеў і пуню, збудаваў кузню,— усё, як след. Чалавек думаў жыць...

Спалілі немцы ў апошнюю блакаду, у 1944 годзе. У той жа дзень, у які спалілі і нашу хату.

Хутары вы, хутары... Пры Прышчэпаве вас «наразалі» — выдзялялі, толькі бяры далёкі ад вёсак кавалак зямлі; пры Сталіне зносілі ў калгасы — усе да аднаго; пры Гітлеры ў акупацыю — палілі...

Кур'янаўшчына тады гарэла цэлы дзень. Полымя пад ветрам лізала, як карова языком, і хату, і хлявы, і сухія дрэвы ў садзе, якія пасля маразоў у фінскую вайну ўжо не пааджывалі.

Уцалеўшы ў тыя маразы, разам з Якубёнчыкавай хатай згарэлі да самай зямлі і загранічныя ягады...

На месцы першай нашай спаленай хаты мы ў 1947 годзе, купіўшы ў калгасе за дзвесце рублёў зруб, пабудавалі другую. Дагэтуль яна, далёка не новая, ліпіць да пары і жывуць у ёй чужыя людзі.

Так і стаяць цяпер састарэлыя хаты — і некалішняя Родзевічава і некалішняя наша — у канцы Задроздзя, дажываючы свой век. Адна супроць адной. Цераз вуліцу. З вокнамі на Крайскі бок, за рэчку — на поўдзень, на Кур'янаўшчыну... Праз акно цяпер улетку можна ўбачыць далёкае жоўтае жытняе поле ў Асаўку...

Лёля ў старажытнасці ў нашым баку, у Прывіллі, была паганская багіня любові.

Маці, нібы ад самой зямлі і прыроды, дала сыну такое імя. Маці, на якую ён, Лёля, быў сам падобны (сын, падобны на маці,— шчаслівы),— на жанчыну-багіню, Гілену Яноўскую з Хадакоў. Якую больш за ўсіх любіў, якой прысвячаў напісанае самім, якая любіла і яго і якая была пахавана недалёка ад яго Кур'янаўшчыны на Хадацкіх могілках.

І яму, Лёлю — Леапольду, нібы самім жыццём было наканавана любіць і маці, і сваю Кур'янаўшчыну, дзе нарадзіўся, і тых людзей, сярод якіх рос і жыў: задраздзян, сушкаўцаў, хадачан, краснавольцаў, грынеўцаў, рагазян і ўсіх у Крайску, дзе вучыўся ў пачатковай школе, чыю мову ён слухаў і ведаў і пра якіх думаў і пісаў, ён — Абарыген Крайскі...

Пасля ўжо былі Вілейка, Вільня, Гродна, Мінск, Саратаў... Жыццё і буры... І невядома якая смерць...

Уцёкшы пасля лютаўскай рэвалюцыі з рускага войска, куды быў мабілізаваны, у час ваеннага міжбур'я — нямецкай і польскай акупацыі Беларусі,— ён хацеў недзе ў 1920 годзе, хоць ненадоўга, зноў зачапіцца за родную Кур'янаўшчыну, але гэта было, мусіць, апошні раз. Не прайшло і месяца, як яго зноў пацягнула Вільня і, відаць, назаўсёды.

Але Кур'янаўшчына ўсягды была з ім, як і ў кожнага чалавека свая любая сцежка да сваёй хаты — Радзімы. На ёй ён прыкмячаў тыя «зярняты», з якіх пасля выраслі і «Збянтэжаны Саўка», і «Пасланец», і «Конскі партрэт», і «П. С. Х.», і «Блуднікі», і «Пакрыўджаныя», і «У кавалёвай хаце», і «Гаротнік», і «Жабрак», і ўсё тое, што лілося з душы ў вершах...

І Кур'янаўшчына, і Крайскае балота, і шмат што ў нашым наваколлі змянілася ў пачатку 60-х гадоў, калі меліярацыя аж ад Рэпішча-пушчы і недзе да самай Віліі зрабіла нашу раку Дроздку магістральнай — прамой пад струну — і з дробнымі слязьмі на дне ад былой добрай старой ракі.

І Крайскі бок у кірунку да ракі парэзалі глыбокія канавы з белым пяском на дне і мізэрнай, як і ў рацэ, вадзіцай — напіцца вераб'ю. Такія ж канавы і паабапал

падсыпанай вышэй грэблі. І ў іх недзе на дне скупа блішчыць блакітненькае неба...

Крайскі бок высыхае летам на сонцы, і з паўночным ветрам тарфяныя буры засыпаюць мяккім пылам і Сады ў Кур'янаўшчыне, і Асавок...

І на Крайскім балоце, і на Зурэччы, і на Паграбішчы, дзе некалі шумела асака, цяпер шуміць збуялы ячмень...

Сама Кур'янаўшчына ад Лажкоў да Асаўка заворваецца калгасным плугам пад жыта, ячмень, авёс і бульбу. У Родзевічавым садзе падняты і былыя гароды і само котлішча пад азімае жыта. Ляжаць толькі ля дарогі вялізныя валуны ад фундамента,— не змаглі вывернуць трактарамі,— і з-пад іх растуць, ідучы буйна ў атожылкі, заграмічныя ягады — ірга каласістая. Яе шарпаюць і калёсы, і трактары, і камбайны, а яна кусціцца, лезе ўверх, густа чырванеючы сёлета круглымі ягадамі, падобнымі на вішні... Усё, што асталося ад саду. За ёй была некалі прызба і вокны Родзевічавай хаты...

Выжыла ірга каласістая і жыве, як выжыла і жыве і цяпер і ў Крайску, і ў Сушкаве, і ў Задроздзі Родзевічава мова з яго «рабача́ямі», «бра́згам», «туляга́мі», «безгало́ўем», «баязе́нем», «па́дшпаркам», «руда́ўкай», «шля́кам» і іншымі, іншымі нашымі ласкавымі і амаль забытымі беларускімі словамі...

Адгэтуль, з Родзевічавага саду, з-пад старасвецкіх ачарсцвелых ліп, відаць далёкі, на рэдкасць прыгожы прасцяг зямлі — некалі Вілейскай, пасля Плешчаніцкай, цяпер Лагойскай...

Высака ў белым асмужаным жнівеньскім небе над Асаўком проці Саду стаіць сонца — на паўдні. За сіняй смугой — Задроздзе і Сушкава,— вёскі сціснуліся шэрымі хатамі, як усохліся. Затое справа ад Саду за двума калгаснымі кароўнікамі разрасліся вясковыя могілкі... Ля могілак відаць жоўтая палявая дарога паўз Сушкава — на Крайск і на Вілейку...

У той бок, дзе ў Альковічах за Крайскам відаць востры шпіль ад касцёла, ідзе чалавек — здалёку не пазнаць. Мінае Сушкава, пойдзе праз Лаўкі на Крайск...

Некалі гэта была і Лёлева дарога ў школу.

У 1946—1948 гадах, ходзячы аж за пяць кіламетраў, у пяты, шосты і сёмы класы Крайскай няпоўнай сярэдняй

школы, я хадзіў па тых жа сцежках, тых жа калдобінах і каменні, што і Лёля Родзевіч... Я насіў з Грыневіч, дзе пасля вайны, быў Крайскі сельсавет і школа, у Затады, дроздзе пошту — бег на Лаўкі, ідучы са школы.

У Асаўку пад Хадакамі аціхае трактар, што шумеў з самай раніцы — сеюць жыта — і над усёй Кур'янаўшчынай, над якой вісяць два вялікія жоўтыя тулягі, хаваючы сабой белую вузкую палоску ад самалёта, робіцца ціха — да звону ў вушах...

Над Садам дробненькім крыллем стрыгуць неба сінія ластаўкі.

А ў Садзе — кінь толькі на яго вокам,— ля дарогі на Хадакі пад старымі ліпамі ля колішняй прызбы чырванее ад ягад ірга каласістая...

Як і сто гадоў назад...

*1996* *Іван Пташнікаў*

# Драматургія



# Блуднікі

*Драма ў трох дзеях*

## ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

### АСОБЫ

Шлёма, шынкар у вёсцы.
Андрэй, селянін той вёскі.
Юзюк, сын Андрэя.
Анэта, дачка Андрэя.
Цыпрук, салдат, прыехаўшы дамоў з войска.
Антось, вясковы хлапец.
Янук, сын суседняга шляхціца.
Хайка, жонка Шлёмы; двое іх дзяцей...

Карчма. З левай стараны ў куце печ. Каля печы пры сцяне шырокі стары ложак, на каторым ляжаць падушкі. Тут жа каля ложка дзверы. З правай стараны ў куце камода, а на ёй шафачка. Каля камоды стары стаячы гадзіннік. Паміж двух акон стаіць малы столік, а кругом яго табурэты і крэслы. У сярэдняй сцяне дзверы, абапал вокны, у каторых не хапае шыб і замест іх устаўлены шчыльна адна пры адной лучыны, а дзе заторкнута і анучай. На вокнах стаяць вазонікі ў розных чарапках. Пасярод хаты вялікі стол з перакрыжаванымі нагамі, кругом даўгія нефарбаваныя зэдлі. Над сталом невялікая вісячая лямпа, убраная розных красак паперай. Сцены брудныя, закопчаныя і абвешаны ўсялякім дамовым хламам. Над малым столікам вісіць люстра і густа навешаны без ладу фатаграфіі, а вокны, што каля яго, маюць кароценькія паркалёвыя фіраначкі. Пры печы зэдаль, на каторым стаяць вёдры і гаршкі, а вышэй паліца з талеркамі і лыжкамі. Каля печы нацягнуты шнур, на ім сушацца анучы. На падлозе смецце, коркі і мокра. Андрэй сядзіць за вялікім сталом, а Шлёма з павагай ходзіць па хаце.

Андрэй. Дык ты кажаш, што табе належыць два рублі. Ні больш ні менш.

Шлёма. Ну, дык а як жа? А ты думаў скольки?

Андрэй. Шмат, шмат...

Шлёма. Як шмат? Палічы сам, калі Шлёму не верыш. Што ж, можа, скажаш *(пералічвае на пальцах)*, у нядзелю не быў або ў аўторак, сераду?..

Андрэй *(перарываючы)*. Ну быў, быў, дык што з таго? Усё роўна не зразумею! Вось вазьмі лепш паперку і палічым удвух.

Шлёма *(вынімае з шафкі кусок паперы і аловак. Падсядае да Андрэя)*. Ох-хо-хо-хо! Андрэй, чаму ты такі дурны! Вось слухай. У нядзелю быў?

Андрэй. Быў.

Шлёма. Запішам: быў.

Андрэй. Паляруш цябе ведае, што ты тут чырыкаеш...

Шлёма. Ну дык а як будзе?

Андрэй. Як? Вазьмі ды пастаў вось гэтак палку! Зразумеў?

Шлёма. Ага! Зразумеў! На табе палку. Цяпер — у панядзелак быў?

Андрэй. Хавай Божа. У панядзелак не быў.

Шлёма. Ну, добра. Замецім гэта другой палкай. Так?

Андрэй. Ды няўжо ж як!

Шлёма. У аўторак і сераду быў?

Андрэй. Так, быў.

Шлёма *(слюнькаючы аловак)*. Ага! Значыць, на табе яшчэ дзве палкі, бачыш?

Андрэй. Пэўна што! Не сляпы...

Шлёма *(лічыць на паперы)*. І ўсяго будзе: раз, два, тры, чатыры дні, зразумеў? *(Андрэй ківае галавой.)* Ну дык добра. Цяпер усякі дзень...

Андрэй. Ну, годзе, ужо годзе. Як я бачу, Шлёма, ты за мяне разумней. Я дык слухаў, слухаў і з розуму збіўся, а ён і на паперцы пачыркаў, і злічыў; усё гэта яму як піць даць... Ну, а цяпер дай пляшку піўца, хай і чацвер будзе з палкай.

Шлёма тым часам занёс на месца паперу і стаў, задумаўшыся.

Чаго ты стаіш, як замарожаны?

Шлёма. Гм... піўца то я не пажалею... А ці ты, Андрэй, грошы маеш?

Андрэй. Чаму?

Шлёма. А два рублі?

Андрэй. А які ж ты дурны. Ці не баішся, можа? Гэта ж ведаеш, што сваю сядзібу маю, дачка вун у дварэ служыць, ды і сынок, дзякаваць Богу...

Шлёма. Ды не аб тым... Але ты мне шмат вінават.

Андрэй. Ну, годзе, годзе. Цяпер, бачыш, ні шыша не маю, а вось праз некалькі дзён у дачкі вазьму. Не бядуй, будзь пэўны!

Шлёма. Ну, глядзі. *(Падае піва.)*

Андрэй *(п'е, гаворачы)*. Вось ведаеш, Шлёма, не спадзяваўся я, што пад старасць буду мець такую пацеху з дачкі. Адным словам — золата дзяўчына: і мне памагае, і сама, як паненка, ходзіць. Вось нядаўна паніч ёй купіў дужа пекны андарак. Кажуць, што па аршаўскай модзе пашыты. Ніводнай закладкі няма.

Шлёма. Ніводнай... Фі-і-і-і... То, мусіць, нейкія штаны, а не андарак.

Андрэй. Дурны ты. Дзе ж ты бачыў, каб баба штаны насіла? Я ж табе выразна кажу, што андарак. Мне-то перш быў не даспадобы. Ну, але, кажуць, пекны; хай будзе пекны. Кажуць, што надта дарагі, бо модны.

Шлёма. Ды ўжо ж так: калі мода, дык мода. Але дзе нашым вясковым дзяўчатам дзяржацца аршаўскай моды.

Андрэй. Зноў таксама завёў... Мая ж дачка не вясковая: служыць у дварэ, значыцца, не вясковая. Яна цяпер такая паненка, што ого-го-го-го!

Шлёма. Чуў я, чуў шмат. Толькі не злуйся, Андрэй. *(Падыходзіць да Андрэя і шэпча.)* На вёсцы дужа брыдка кажуць на тваю дачку.

Андрэй. Хто брыдка кажа, хто? Плюнь таму ў вочы! Усе яны брэшуць праз зайздрасць. Чаму мне ў вочы не скажуць, га? Бо баяцца... Бачаць, што мае дзеткі выбіліся ў свет, дык і брэшуць... Хлеба прасіць у іх не будзем, а што яны ляпаюць, дык тфу! на іх.

Шлёма. Слухай, Андрэй, можа, і ляпаюць... Ты ведаеш, што Шлёмы дзела — старана, і я табе кажу тое, што чуў.

Андрэй. Што чуў, што, кажы?!

Шлёма *(наліваючы піва)*. Ну, Андрэй, выпі і выкінь з галавы сваю дур. *(Андрэй п'е, Шлёма, пачакаўшы.)* Ці праўда, што твой сын у горадзе шмат грошай зарабіў?

Андрэй *(як бы спрасоння)*. А... ты пра Юзюка? Ён-то хлапец спрытны. Хоць мне дык нічога не памагае. Ну, але і за яго стыдацца не трэба. Паехаў у горад, набраў грошай, як смецця, гожа адзеўся: боты, капялюш, гадзіннік; а вось нядаўна купіў жарабца і раз'язджае па кірмашах, як той паніч, ажно верыць не хочацца, што гэта мой сын.

Шлёма. Фарсісты кавалер.

Андрэй. Ды ўжо ж.

Шлёма. Ну, а што ён рабіў у горадзе?

Андрэй. А Бог яго ведае. Ці ж ты з ім разгаворышся. Яму кажы, а ён дагары.

Уваходзіць Юзюк у чорным адзеўшыся, у кацялку.

А вось і ты, Юзюк, дзе ж ты быў?

Юзюк. Чорта з жабай жаніў. (*Прайшоўся па хаце, сеў за меншы стол і зняў кацялок.)* Жыд, падай водкі і добрай закускі.

Шлёма падае.

Андрэй *(падыходзіць да Юзюка, бярэ кацялок)*. А... Які цвёрды, як з бляхі. Вось, ведаеш, Шлёма, добра агуркі паліваць.

Юзюк *(вырываючы)*. Эх, старына, старына. Зубы ўжо з'еў, а не знае кацялка. Пагледзеў бы паноў — яны такія носяць...

Андрэй. Што мне глядзець на іх. Цікавей конскія зубы, як панская мода. *(Адышоўся.)*

Юзюк. Вось цемната дык цемната. Затое ж вы і гінеце ў беднаце, качаецеся ў балоце, што не зважаеце на паноў... Хто ў вас суддзі, начальнікі, ксяндзы, папы, аграномы... Усё паны... вучоныя. Яны толькі могуць вас, цёмных, вясці да багатага жыцця.

Андрэй *(падпіўшы)*. А, дык, значыцца, па-твойму, усякі пан добры?

Ю з ю к. Не іначай.

А н д р э й. Го-го... Хай ён глыне тое, што зробіць за суткі, дык лопне на макавыя часткі.

Ю з ю к *(глядзіць, што яшчэ не ўсё пададзена).* Сруль, ці мне гэта доўга трэба чакаць? *(Глядзіць на гадзіннік.)*

Ш л ё м а. Я, паночку, не Сруль, а Шлёма.

Ю з ю к. Не адзін чорт, не кіём, дык палкай.

А н д р э й. Абач, Юзя, сколькі ты заплаціў за свой гадзіннік?

Ю з ю к. Столькі, сколькі ён варты.

А н д р э й. Чаму ты такі злосны? *(Не дачакаўшыся адказу, падыходзіць да акна.)* Хадзі, Шлёма, паглядзі, які жарабец у майго сына.

Ш л ё м а *(зацікаўлена прыглядаецца).* А пекна кабыла, пекна.

Ю з ю к. Жарабец, а не кабыла; задам стаіць, а пазнаць не можаш.

Ш л ё м а *(сам да сябе).* Пазнаць не можаш! *(Голасна.)* Калі я яго зусім не віджу.

А н д р э й. Э, сляпы ты, Шлёма, як я бачу. Ну, але будзь здароў. Пара ўжо дамоў. Ды што ты тут прыглядаешся. Пойдзем на двор, там лепш прыгледзішся. *(Сланяючыся, выходзіць.)*

Ш л ё м а. А, праўда, праўда, і ў зубы паглядзім. *(Выходзіць, а пасля варочаецца.)* Хайке, а Хайке, кумагэр. *(Выходзіць.)*

Праз другія дзверы выходзіць Х а й к а з панчохай у руках; стогнучы, села на ложак.

Ю з ю к *(п'е і закусвае).* Якое гэта шчасце, калі кішэня пузатая. Тады дарога ўсюды адкрыта: ні пан, ні ўраднік... Ха-ха, што я кажу ўраднік — сам спраўнік не страшны. Вось так толькі выстаў белахвосціцу, дык яны, як маланкай спаліць, лістом перад табой. А гаручка на ваш карк! Пакуль не знюхаюць, што грошы...

Хайка закашлялася.

*(Угледзеўшы яе.)* Ух! ты каргель стары — так спужаць. Вось уплялася ў панчоху, як кот у агуркі. Ды

што яна там робіць, блаха больш кашляе, як яна наробіць... Эй! слухай, жыдоўка, чаму ў гэтай старане так нудна?

Хайка. Як гэта нудна? Хто працуе, таму не нудна.

Юзюк. Ці ў вас на вёсцы ёсць прыгожыя дзяўчаты?

Хайка. Чаму няма? Для пекных хлопцаў знойдуцца і прыгожыя дзяўчаты.

Юзюк. Тфу! Згінь ты, прападзі! Рэзгіны гнілыя. Вось і разгаварыся з нехрышчонай косткай. Эх, нуда, нуда. Вось скарэй бы папасці ў горад — там жыццё: і вочы наглядзяцца, і цела накорміш, і сам на людзей смахіваеш.

Тут праз тыя дзверы, адкуль выйшла Хайка, выбегла яе дачка, лет дзесяць, жуючы бручку, і, згледзеўшы Юзюка, скрывіўшыся, глядзіць на яго.

Хайка. Авэк, кіндэр.

Дачка хутка выбягае.

Юзюк. Што праўда, усяго бывае. Ох, і трудна там прыходзіцца... Ну, але затое сюды як прыйдзеш, фі-і-і... дык цябе тут графам і вучоным зробяць, і давай малпаваць: Юзюк, кажуць, так капялюш носіць, а так гаворыць, а гэтак штаны надзяе, і пайшлі знімаць мерку... А ў мяне сэрца так і расце, так і радуецца, а колькі гордасці, хвалы... Ды і што гаварыць. Паеду, канешне, паеду, а то тут паміж гэтага мужычча змарнееш, усё забудзеш. *(Падыходзіць да люстра, кланяецца на ўсялякія манеры.)* Маё ніжайшае пачценіе. Адзье. *(Звоніць у шклянку.)* Гарсон!

Хайка. Шлёма, кумагэр, Шлёма.

Уваходзіць Шлёма.

Юзюк. Сколькі?

Шлёма. Пяць злоты.

Юзюк. Палучай. Адзье. *(Выходзіць, свішчучы марш.)*

Шлёма *(здзіўлены)*. Што ён сказаў? Гм... *(Хавае грошы.)* Ага, зверху дык размаляваны, а ў сяродку чэрві кішаць.

Хайка, стогнучы, выходзіць у сваю каморку.

Ну, але каб не Андрэй і не яго дзеткі, ці мой Шлёма меў бы столькі грошай? Хе-хе!.. Ну, а яшчэ не ўсё, яшчэ вексялёў вось такі шмуток, ды і я яшчэ не памёр. Пажыву, калі Бог пазволіць... Можа, яшчэ адзін такі Андрэй знойдзецца? Ды іх то тут многа ёсць, толькі трэба доўга карміць, і будуць нясціся... Хе-хе-хе!

Паўза.

*(Прыбірае са сталоў. Уздыхае.)* Многа канавак трэба пераскочыць, многа ёсць калючак!.. Ну, але папалам з бядой можна жыць. *(Пачакаўшы.)* Кажуць, што Шлёма благі, грошы многа мае, людзей крыўдзіць... Ой-ёй-ёй, халерынка на ваш галава. А каб Шлёма не меў грошы, дык дзе бы ён быў? Або лізаў бы вашы ногі, або косці яго валяліся бы на шуметніку. А цяпер ха-ха! *(Трасе грошы ў кішэні.)* Вось, сіла... мур... Цяпер Шлёма і добры, і благі. Кожны чалавек мае права жыць так, як яму падабаецца, а Шлёма хоць і чалавек, а папляцецца па вузенечкай сцежачцы, як кот па жэрдцы, а калі трохі сышоў, дык ага! цю! жыд! пархі куды лезеш, асадзі назад! Ну, але куды? Назад ужо не паспееш. Памінай, як звалі. *(Цяжка ўздыхае.)* Так... Але! Благі Шлёма? Хай сабе благі. Але ён жыд. Ён мае сэрца жыдоўскае. Ён не прап'е свае грошы, як вы. У яго ёсць дзеткі, якія паплятуцца той самай сцежкай, і ён добра гэта ведае, добра помніць.

Анэта *(пытае праз дзверы.)* Шлёма, ці тут таты не было?

Шлёма. А, паненачка. Як маецеся? Тата быў, але толькі што выйшаў. Зайдзіце, зайдзіце, калі ласка. Так даўно не бачыліся. Што ў вас чуваць? Як вы пахарашэлі. Відаць, добра служыць?

Анэта. У... у... Я ўжо і забылася, калі я служыла! Што праўда, у дварэ, але не служу болей.

Шлёма. А што ж гэта ваш тата казаў, што вы там служыцё?

Анэта. Мала што тата казаў. Што ён ведае? Ён толькі знае, як грошы ўзяць ды прапіць іх. А ў хаце

дык усё ўверх дном. Пахавалі маму і ўсё з ёй разам... Цяпер, калі зайдзеш часам у хату, дык ажно жутка робіцца. Так усюды запушчана, разваліўшыся, пуста... Пярвей думала, брат прыедзе, возьмецца за гаспадарку, усё ўпарадкуе... Ажно дачакала: той сахі, як чорта, баіцца, а ўсё толькі носіцца, як пятух абскублены.

Шлёма *(як бы насміхаючыся).* Э, што вам там да гаспадаркі. Плюньце на ўсё, вы цяпер такая паненка...

Анэта. Так. Шлёма, ты кажаш, што я паненка, але мне не верыцца; мне ўсё здаецца, што гэта сон. Усе людзі кажуць, што ён мяне ашукае... Ах, Божа, што я кажу! Людзі горш сабак брэшуць... Ён мяне не кіне, не ашукае. Янук так мяне любіць... Шлёма, дзе ваша жонка? Што ў вас чуваць? Паглядзі, Шлёма, як табе даспадобы мой андарак?

Шлёма. А чаму ж, прыгожы, прыгожы.

Анэта. Гэта ж усё яго... яго... Ты знаеш?

Шлёма. Знаю, але.

Анэта. Ён дужа добры. Такі прыхільны, усякі дзень што-небудзь падорыць, і ўсякі дзень я яго мацней люблю!

Шлёма *(таямніча).* Анэтка, табе без яго лепей было б.

Анэта. Што ты, Шлёма, што ты? Мне трэба ганарыцца ды радавацца. Дзе ж я столькі шчасця пабачу, калі не пры ім?

Шлёма *(грозіць пальцам).* Ой-ёй-ёй, асцярожна...

Анэта. А ідзі ты, ідзі. Хваліся лепш, што чуваць?

Шлёма. Дрэнна чуваць, дрэнна. Што ў нас, у бедных жыдоў, добрага пачуць. Поўзаеш вось так па зямлі, як той чарвяк, і ўсё думаеш, як перакаратаць заўтрашні дзень.

Анэта. Ай, Шлёма, маніш, як лапці пляцеш! Я ж чула, што ў цябе шмат грошай!

Шлёма. Халерынка таму на галаву, хто кажа, што ў мяне грошы. У мяне куска хлеба часам няма, а не тое, каб грошы... П'юць, ядуць, ды ўсё гэткае-такое, і не толькі каб доўг плаціць мне, а яшчэ казкі выдумваюць!

А н э т а. Ціха, чаго ты раскрычаўся. Я ў цябе не ем і не п'ю.

Ш л ё м а. А я да вас нічога не маю. Хай Бог дае, каб усе такія былі... Але хоць бы ваш бацька...

А н э т а. А колькі ён табе вінаваты?

Ш л ё м а. Ой, многа, многа...

Анэта. Ну, колькі?

Ш л ё м а. На днях выпіў на тры рублі ды там стары доўг...

А н э т а. Ой, гэты тата, што ён сабе думае. *(Да Шлёмы.)* Стары доўг — дык як сабе хочаш, а тры рублі я заплачу. *(Плаціць.)*

Ш л ё м а. Хай Бог множыць вашы грошы. Каб не вы, мае дзеткі галадалі б. Якая вы добрая паненка. Хай бы той паніч хутчэй жаніўся з вамі.

А н э т а *(уздыхнуўшы)*. А ці ён у вас даўно быў?

Ш л ё м а. Хто? Паніч?

Анэта. Ну ён жа, ён.

Ш л ё м а. Подаўна. Але вось сягоння абяцаўся зайсці пагукаць аб адным інтарэсе.

А н э т а. А... то, можа, я яго дачакаюся.

У гэты час у дзвярах паказваецца Я н у к.

Ш л ё м а. А вось і паніч, лёгкі на ўспамін.

Я н у к *(убачыўшы Анэту)*. Я зараз... я праз момант... Я... *(Выходзіць, засаромеўшыся.)*

А н э т а *(трывожна)*. Чаму гэта ён не варочаецца?

Ш л ё м а. Як бы каго застыдаўся. Я схаджу пагляджу, можа, яму што трэба памагчы. *(Выходзіць.)*

А н э т а. Памагчы... *(Задумаўшыся, а пасля трывожным голасам.)* Ці ж гэта праўда, што людзі кажуць. Ці ж ты мяне кінеш?.. Янук! Янук!.. *(Выходзіць.)*

Праз нейкі час уваходзяць Ш л ё м а, А н т о с ь і Ц ы п р у к у салдацкім адзенні, здаровы хлапец.

Ц ы п р у к. Вось маліна, вось ягадка!.. Толькі чаму яна так маркотна. *(Глядзіць у акно.)* Вось дзе дзяўчына, люба паглядзець! Шыйка кругленькая, ручкі як точаныя, а ножкі, а стан! Палавіну бы жыцця ад-

даў!.. Чакай, душачка, чакай, хіба ж смерць мне перашкодзіць, хіба ж скрозь зямлю правалюся, але ты будзеш мая!

Антось. Ну, Цыпрук, годзе масляніць, хадзі лепш вып'ем.

Цыпрук *(садзіцца за стол)*. Вып'ем, братка, вып'ем, за здароўе душачкі. Шлёма, хутчэй, хутчэй! Вось толькі маркотна... Але прыгожа, анцік-маліна... Як ружачка!.. Шлёма, яна ў цябе была, аб чым гукала?

Шлёма *(падаючы водку)*. Ну, што яна будзе гукаць? Вядома, дзяўчына, пагукала аб тым, аб сім ды і пайшла. А што так маркотна, дык не дзівота!

Антось. А то чаму?

Шлёма. Бо змарнее.

Цыпрук. Яна змарнее? Чаму?

Шлёма. Ну, змарнее, бо паніч яе ашукае, вось і ўсё.

Антось. Ашукае?

Цыпрук. Ха-ха-ха, што ашукае, дык для мяне гэта лепей. Ну, шчаслівы сягоння дзень, далібог. Чы не воўк дарогу перабег? Пі, Антось, пі да ўмору. Будзеш піць і піць, бо мне сягоння так весела. *(Смяецца.)*

Антось. А мне не надта весела... Вось трэба было б жыта паляшыць...

Шлёма, усё прыгатаваўшы, выйшаў у каморку.

Цыпрук. Кінь пустое! Пасля паляшыш. *(Бярэ чарку.)* Ну, за здароўе Анэткі.

Антось. Ці не ўлюбіўся ты ў яе?

Цыпрук. Па вушы, па вушы. Дужа прыгожая дзяўчына. Але вось скажы, як пахарашэла. Даўней, памятаю, глядзець на яе не хацеў, а цяпер дык вось як сэрца заварушылася.

Антось. Ну? Можа, жаніцца думаеш?

Цыпрук. Хто, я? *(Смяецца.)* Які ж ты дурны. Я жаніцца буду? Ды яшчэ на каханцы нейкага шляхтуна. А ці ведаеш ты, Антось, чаму яна так маркотна?

Антось. Не.

Цыпрук. Вось відзіш. А я ведаю. Добра ведаю, што тамака паперы нячыстыя.

Антось. Не разумею. Як гэта нячыстыя, хто ж іх запэцкаў?

Цыпрук. Хай ты згары! Вось і гавары з свіннёй пацеры. Ну як табе сказаць? Ну, вось Шлёма нядаўна гукаў, што ваш тутэйшы паніч скрыўдзіць Анэту. Зразумеў?

Антось. Ага. Гэта-то я зразумеў. *(Са злосці.)* Ну, гэты паніч крыўдзіць вясковых хлопцаў, ой, крыўдзіць. Без ніякай жаласці. Слухай, Цыпрук, ты праўду кажаш?

Цыпрук. Вядома, праўду. Ужо я, брат, на гэтым не промах.

Антось. Калі так, дык вось я яму што! *(Трасе кулаком.)*

Цыпрук. Го-го-го, які ты адважны.

Антось. А ты мне не паможаш?

Цыпрук. Не, брат, дзякуй. Баюся такіх манёўраў.

Антось. Ну, ужо гэтага не спадзяваўся з цябе. Я перш думаў, што ты дружны хлопец, ажно —ануча з цябе, гной. Тфу!

Цыпрук. Эх, дзярэўня ты, дзярэўня. Сляпы ты, Антось, як шчанё, сляпы.

Антось. Хай сабе сляпы. А я гэтаму шляхтуну выганю панскую навычку, адрачэцца ён ад нашых дзяўчат.

Цыпрук. Выганяй, брат, выганяй. Мне гэта на руку.

Антось. І выганю.

Цыпрук. Ну, добра, выганіш. Але ты падумаў, што табе за карысць з таго? Засадзяць у турму, папяньчаць там гадкі два-тры, і выйдзеш адтуль жабраком ды калекай.

Антось. І тут не лепш турмы. А яму не дарую. Адрачэцца ён.

Цыпрук. Ну, ну, гэта ты толькі так кажаш. А ведаеш, што з панічом не жарты. Усё-такі ён і пан, і грошы за яго, і суд, і ўсялякае начальства. Нам, мужыкам, трэба слухаць пана, як салдаты афіцэра.

Антось. А гэта ж чаму?

Цыпрук. Таму, што трэба слухаць, ды і ўсё.

Антось. Ага, значыць, па-твойму, паніча не чапаць?

Цыпрук. Як добраму сябру раджу. Не чапай.

Антось. Чаму?

Цыпрук. Таму, што яны нам не раўня.

Антось. Ой, гэта шчырая праўда: яны нам не раўня. Так, так... Яны людзі, і мы людзі, але розніца ёсць. О-хо-хо! Цяжка жыць на свеце, але хочацца.

Паўза.

Цыпрук. Вып'ем, брат.

Антось. Давай.

Цыпрук. Ну, яшчэ.

Антось. Давай.

Цыпрук. Эй, Шлёма!

Шлёма ўваходзіць.

Падай яшчэ. *(Да Антося.)* Пі. Будзем праганяць благія думкі.

Шлёма ставіць водку, выходзіць.

Антось. Дзякуй. Не хачу.

Цыпрук. Пі, цэрбер, як гэта заве мяне афіцэр.

Антось. Як кажа, цэбар?

Цыпрук *(рагоча)*. Цэбар, кажа... ото ж рассмяшыў. Цэрбер, а не цэбар.

Антось. Што гэта такое?

Цыпрук. А барабан яго ведае! Пі!

Антось. Ды я-то п'ю, але ты чаму не п'еш?

Цыпрук. На табе, на другую...

Антось. Ну, вот так, цяпер і я вып'ю.

Цыпрук *(налівае)*. Ану яшчэ!

Антось. А ідзі ты к чорту! Я ўжо і так набухторыўся, як жлукта.

Цыпрук. Як цэбар. Ха-ха... Ну!

Антось. Не хачу.

Цыпрук. Пі, а то дрэнна будзе.

Антось. Ды ад цябе ўсяго можна спадзявацца. *(П'е.)* Гаручка цябе ведае, скуль у цябе такая сіла?

Цыпрук. О-го-го! Ты, брат, маёй сілы яшчэ не пробаваў. Я раз, помню, на манёўрах гармату на плечы і папёр. Ажно ахнуў цэлы полк.

Антось. То не жарт. Медзвядзёва сіла.

Цыпрук. Ну, а цяпер вып'ем за здароўе душачкі.

Антось. Якой душачкі?

Цыпрук. За здароўе Андрэевай дачкі. *(П'е.)*

Антось. А ты ўсё аб ёй. А ведаеш што, Цыпрук, хоць я і п'яны, але мне здаецца, што ты не лепшы за паніча.

Цыпрук. Ого-го. А ведаеш, я хацеў бы быць панічом. *(Звярнуў галаву ўбок.)*

Антось *(не слухаючы Цыпрука).* Брыдка, не гадзіцца крыўдзіць дзяўчыну, а тым болей сірату.

Цыпрук. А бацьку чорт на форму схапіў? *(Жартам.)*

Антось. Што з гэтага бацькі, калі ён з рання да вечара ў Шлёмы сядзіць.

Цыпрук. Я таму не вінават.

Антось. Грэх, брыдка ашукваць сірату.

Цыпрук. Ну годзе ўжо, годзе. Гарбатага дамавіна пераробіць. Пі, а то растрашчаўся, як той барабан.

Антось. Не хачу.

Цыпрук. Пі, нашы дзяды пілі...

Антось. Ці мала што было. Я чуў, што нашы дзяды сырое мяса елі.

Цыпрук. Ну што ж ты сябра не паддзержыш. Пі, кажу.

Абодва смяюцца.

Антось. Хай ты згары. *(П'е.)*

Адзін свішча, другі пачынае пець.

Абач, Цыпрук, абяцаеш?

Цыпрук. Каго, што?

Антось. Не чапай Анэты. Благі ты... Знаю я цябе... Вось бачыш, у мяне такое сэрца... Любіў калісь я Анэту, але нячыстая сіла звярнула да яе паніча; ве-

даеш, нячыстая моц гэта, што панам прыслужвае. Не люблю Анэты, але шкадую, не люблю... абяцаеш?

Цыпрук. Ага! Вось як! Абяцаю, братка, у самыя губкі пацалаваць.

Антось. Вось, люблю... *(Строга.)* Што, што ты сказаў?..

Цыпрук. Нічога. Шлёма-а!

Уваходзіць Шлёма.

Падай яшчэ...

Антось. Годзе... Цыпрук, годзе. Чорт для цябе асобны кацёл прыгатуе. Годзе, Шлёма, хай будзе до!

Цыпрук. Не слухай, не слухай, падай і скажы, колькі належыць.

Шлёма *(падае і лічыць)*. Дзесяць злоты.

Цыпрук. Маніш, жыд. Менш. На восем злоты і маўчы.

Шлёма *(упаўголаса)*. Халерынка на твая галава. Каб ты на дохтара аддаў.

Цыпрук. Што-о-о-о?

Шлёма. Я... я ўжо нічога... я сам да сябе. (*Выходзіць і час ад часу злосна выглядае праз дзверы.)*

Антось *(зусім п'яны)*. Кінь! Дзяўчыну кінь... чарку водкі... падай.

Цыпрук *(п'е і дае Антосю)*. Ага, абласаваўся! Пазнаў смак! На!..

Антось *(п'е)*. Жыта ляжыць... За здароўе... на пагібель Анэта... Нячыстая моц... *(Пачынае пець.)*

Цыпрук прытопвае і свішча.

Хоць локаць недалёка,—
Хоць ты лопні, не ўкусіш;
Хоць Анэта чарнавока,
Але кінуць яе мусіш...

Цыпрук. Ого-го-го! Дурак, брат. Не такіх я дзяўчат зводзіў... Але што з табой ужо гаманіць. Хадзем дахаты.

Антось. Калі ты Анэту... я цябе ў попел сатру...

Ц ы п р у к. Ну, ра-ды, строй-ся! Па-ды-май-ся!

А н т о с ь. Я ўжо пайшоў. *(Валіцца з тапчана.)*

Ц ы п р у к. Людцы, ратуйце! Памёр.

Убягаюць Ш л ё м а, Х а й к а і д в о е д з я ц е й. Цыпрук залівацца смехам. Х а й к а выпіхвае д з я ц е й і сама выходзіць.

Ш л ё м а *(у дзвярах)*. Ну, ідзі ўжо, ідзі.

Ц ы п р у к. Што? *(Паварачваецца да дзвярэй.)*

Шлёма хаваецца.

Я табе ўсе цыцалі паабрываю.

Ш л ё м а *(дзвярмі дражніць)*. Цыцалі, цыцалі...

Ц ы п р у к *(да Антося, які храпе і мармыча)*. Антось, а, Антось. Ха-ха-ха! Вось як набраўся, як жлукта. Ха-ха-ха!..

А н т о с ь *(лежачы)*. Што-о-о-о?..

Ц ы п р у к. Не хочаш, каб я табе сваю сілу паказаў?..

А н т о с ь. Ой-ёй-ёй!.. Не... не...

Ц ы п р у к бярэ за плечы і, хістаючыся, выносіць.

Уй, Цыпрук, не біся, браток. Твая Анэта... не біся.

Цыпрук голасна рагоча.

Х а й к а. Уй, ты галыш, а два злоты скруціў!

Ш л ё м а. Ідзі, ідзі ў балота, разбойнік!

З а с л о н а

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

### А С О Б Ы

А н э т а.
А н д р э й.
Я н у к.
Ц ы п р у к.
Вясковыя б а б ы і х л о п ц ы.

З аднаго боку старая яблыня; пад яблыняй вялікі камень. З другога боку віддаць хаты і другая будова. Напроціў кусты, за

кустамі відаць плот. На сцэне нікога няма. Чуць чуваць нейкі спеў, каторы ўсё чутнее. Скора выходзіць, спяваючы, А н э т а, апранутая ў вясковае адзенне, босая.

А н э т а *(пяе)*

Прыляцелі гусі з далёкага броду,
Селі на Дунаі, скалацілі воду.
Бадай тыя гусі ды марна прапалі,
Як мы любіліся, цяпер перасталі.

*(Затыкае канцы фартуха за пояс і збірае траву, а праз які момант садзіцца на камень пад яблыняй. Уздыхаючы).* Не, я ўжо не работніца. Цяпер не магу так працаваць, як даўней, хоць яшчэ, папраўдзе, зусім маладая. Дзяўчаты ў маіх гадах дык і крэпкія, і здаровыя, як рэпачкі на пагляд, а я — дваццаць чатыры гады, а здаецца, так старая, так многа перажыла. Ох, Янук, звіхнуў ты маё жыццё, навек звіхнуў. Спачатку чаго ты мне не абяцаў? Залатыя горы. А цяпер праз цябе я асаромленая, стыдаюся вочы падняць на людзей. Што мне цяпер рабіць, як жыць, як каратаць, нічога не ведаю... Ой, Янук, Янучок, любіла ж я цябе, як нікога на свеце, ой, любіла, а за што ты мяне прагнаў, чаго цяпер лезеш, за што мяне мучаеш, за што мяне ўцягнуў у такі грэх. *(Пачынае плакаць.)* Ой, Божухна, даруй мне цяжкія грахі... Я не вінавата... Дзіцятка ты маё, згінула марна, анёлак бязвінны. *(Нейкі час плача, а пасля сядзіць, задумалася.)*

Я н у к, цікаючыся, падыходзіць да Анэты і крычыць на вуха.

Я н у к. Не пужайся!

А н э т а. Тфу! Ой-ой! Хто гэта? *(Падскаквае.)* А я думала... Ажно гэта ты, паніч, а я толькі што аб вас думала, і мне так сумна зрабілася на сэрцы, што я ажно заплакала.

Я н у к. Каму ж болей плакаць, калі не вам, бабам? Ну, але як ты сягоння хараша выглядаеш. Так і ахвота пацалаваць.

А н э т а. Кіньце, кіньце. Слухала я гэту брахню тры гады, наслухала сабе бяды. Дзе ні павярніся,

дык людзі пальцамі так і выторкваюць, і пагарджаюць, і смяюцца... Тарчыш цяпер, як калок сярод поля, і жыццё не міла.

Я н у к. Выторкваюць, і пагарджаюць, і смяюцца, ха-ха! Дык што ж тут дзіўнага, грошы не маеш, дык і смяюцца. Думаеш, ты або я лепшыя? Вось пярвей, пакуль ты сядзела ў нас, дык кожны думаў, што будзеш паня багатая; вось табе і завідвалі, і шанавалі, і не відзелі тваіх грахоў, ну, а цяпер дзела ясна...

А н э т а. Што ясна, як ясна? Нашто ты мяне выгнаў?

Я н у к. Тр-р-р. Стоп машына. Дурненькая ты, альбо ж я цябе выгнаў. Падумай сабе. То ж выгнала цябе мая шляхецкая блакітная кроў, ганьба бацькоў, а ты ведаеш майго бацьку. Ох, гэта гнілы корч, яму хоць у лоб страляй, ён усё па-свойму.

А н э т а. Ох, доля ж мая, доля.

Я н у к. А ты думаеш — мая лепшая? Вось цяпер мушу бегаць, як ганчак па полі, каб цябе дзе зымаць. Тфу, ну і расскрыпелася, як нямазаныя калёсы. Анэтка, а-у. *(Падстаўляе палец да твару.)*

Анэта адварачвае галаву і ўдараецца ў палец. Янук рагоча.

А н э т а. Адступіцеся. Не лезьце. Мне цяпер не да смеху. Не чапайце.

Я н у к. Го-го-го! Адступіцеся, не чапайце. Замнога ты захацела. Хто ж мне цябе заменіць? У цэлай вёсцы не знойдзецца такой дзяўчыны. Ого, Анэта, жартуеш, мая кветка. Знаў я цілёсенька дзяўчат, ну але куды ім да цябе. Ну чаго ты насупонілася, як бы ўрадніка згледзеўшы. Паднімі свае ясныя вочкі... Ну але прыгожая ты цяпер дык прыгожая. Слухай, Анэтка, як шаную сваіх бацькоў, так я цябе люблю. Ну паглядзі, засмейся, развесялі мяне, чаго ты маўчыш, як матылёк? Чаму ты такая маркотная?

А н э т а. Бо закрыўджаная. *(Пачынае ціха плакаць.)*

Я н у к. Як ты закрыўджана? Хто пасмеў цябе закрыўдзіць? Кажы, я яго ў зямлю ўганю...

А н э т а. Трэба было б перш так зрабіць, я шчаслівейшая была б.

Я н у к. Гм... *(Кашляе.)* Як гэта? Што ты кажаш?.. Ну, годзе, Анэтка, годзе. Не плач. Як я бачу, ты на мяне сярдуеш. Ты сама ведаеш, што я табе не раўня, што я з табой жаніцца не магу. На тое на свеце ёсць шляхта, купцы, мужыкі, мяшчане, ды і чорт іх там палічыць усіх, а што мы з табой трошкі пагуляем, падурэем, дык на тое маладосць наша, трэба карыстаць. Ну, не плач, не плач. *(Абнімае.)* А то мне сумна стала. Кажы, што хочаш: грошы, адзежы, цукерак?..

А н э т а. Нічога не хачу.

Я н у к. Ну дык чаго ты хочаш?

Паўза.

Ага, здагадаўся, здагадаўся. Ты ўсё, мусіць, пра гэта дзіцё?

А н э т а. Т-с-с-с.

Я н у к. Нікагусенькі, нікога няма. Слухай, Анэтка, не маркоцься, пагуляем мы з табой. Ці помніш, як ты мяне цалавала? Як нам было тады добра, весела, праўда? А? Дык рухавей жа! Ты ведаеш, што я на ўсё гатоў, другім разам я табе памагу, выручу, вер мне на слова.

А н э т а. Як гэта, што ты кажаш? Я не разумею.

Я н у к. Анэтка, на руку прысягну, што хочаш зраблю, бо я цябе люблю, я цябе выручу, маё ты сонейка, памагу, як Бог на небе.

А н э т а. Янучок, скажы ясней, ты мяне развесяліў, што ты абяцаеш?

Я н у к. А ты мяне развесяліла, мая зорка. *(Абнімае і цалуе.)*

У гэты час чуваць п'яны голас.

А н э т а. Ой, нехта ідзе.

Янук адскаквае.

Я н у к. Хоць бы ж та мяне не ўвідзеў... Перашкодзіў п'яніца...

А н э т а. Янучок, скажы.

Я н у к *(ідзе, пасля варочаецца)*. Як будзе другое дзіцё *(смяецца)*, дык я яго задушу. Ха-ха!.. Разумееш? Не ты, а я. *(Выходзіць.)*

Анэта якісь час стаіць, аслупянеўшы. Уваходзіць Андрэй, п'яны, абарваны, увесь у гразі.

Андрэй *(заікаючыся)*. Шлёма, чарку падай... Дзеткі мае... Го-го, хай знаюць хам'ё, што я іх бацька.

Анэта. Тата, не саром сябе і дзяцей, ідзі лепш дамоў ды ляж спаць.

Андрэй. А значыцца, хто ты такая? Чарку, вось чарку выпі. *(Робіць знак, што налівае; падыходзіць да Анэты і тут жа абнімае яе.)*

Анэта *(вырываецца, але відзіць, што не дасць рады, пачынае крычаць.)* Пусці, пусці! Ён без памяці. Задушыць... Ратуйце!

З-за кустоў выбягае Цыпрук і пачынае бараніць. Убягае некалькі баб і маладых хлапцоў.

Адна з баб. Тфу! Я думала, што тут сапраўды якая бяда. *(Выходзіць.)*

Другая баба. От ведама бадзячка. Пойдзем.

Выходзяць, хлапцы застаюцца.

Цыпрук. Ха-ха-ха! Бадай цябе мядзведзь стопча, хай цябе паляруш, дачкі сваёй не пазнаў. Вось насмактаўся. Ну, пайшоў. А то я цябе заганю туды, дзе Сідар коз пасе.

Андрэй. А, значыць, ты Шлёма?

Цыпрук. Але. Я такі Шлёма, як ты цвярозы.

Андрэй. Ага, дзеткі мае. Го-го... Дзеткі. Шлёма, чаркі, закускі.

Цыпрук. Ну, шагам арш! Цырыманіяльным маршам. А вось табе і закуска. *(Падпіхвае каленкам.)*

Паднімаецца хохат сярод хлапцоў.

Хлопцы. Дзяржыся, Андрэй! Вушы паадвальваюцца. Дзяржыся!

Андрэй выходзіць, за ім хлопцы. Анэта ў гэты час папраўляе вопраткі, пасля хоча ісці за Андрэем.

Цыпрук *(заступае дарогу)*. Куды ж гэта сама? Ці ж то мне не падзякуеш за абарону? Каб каго дык, далібог, не пабараніў бы, а вас, такую красотку. Ого...

Анэта варочаецца, грызе канец фартуха, а пасля пачынае плакаць.

Чаго ж вы плачаце? Можа, ён вас дзе ўдарыў?

Анэта. Нідзе.

Цыпрук. Дык чаго ж плачаце?

Анэта. Так сабе.

Цыпрук. Ну, міленькая, калі так сабе плакаць, дык шкада ж слёз. Бо іх не надта шмат у чалавека, каб марна траціць.

Анэта. Хваціць на мой век, нядоўга мне ўжо жыць.

Цыпрук. Ха-ха-ха! Ці не сорамна табе так казаць? Ужо каму-каму, але не вам. Дзяўчына, як зязюлечка. На ўсю вёску пякней. Хлопцы ў ваколіцы вар'яцеюць за чароўную Анэтку, а тут казаць такое глупства. Фі, мая ты... брыдка, дужа брыдка.

Анэта. Калі цяжка жыць. Але вы лепш ідзіце з Богам. Мне трэба траву збіраць, ужо і так замарудзілася. *(Падторквае фартух, пачынае збіраць.)*

Цыпрук. Не, дайце ўжо палюбавацца на вас. *(Садзіцца на камень.)* Так, так. А ведаеце, што каб я быў на вашым месцы, дык не гнуўся бы і не ламаў касцей над гэтым дрэнствам, а зажыў бы па-панску, як гэта кажуць, на шырокую нагу.

Анэта. А няхай Бог крые і ратуе ад усякага панства, сваім ворагам гэтага не зычу.

Цыпрук. Байкі, байкі. Вы яшчэ не бачылі, як людзі жывуць. Хоць, праўда, чуў, казалі, што паніч...

Анэта. Хто, што казаў? Кажыце.

Цыпрук. Чаго вы спужаліся, нічога страшнага не казалі. Усяго толькі тое, што гэтага, што быццам паніч меўся з вамі жаніцца. Ну, але гэта ясна, што нічога падобнага быць не можа.

Анэта. А хто гэта казаў? Чаму быць не можа?

Цыпрук. А таму, мая птушачка, што паніч вас ашуквае. Вось на маіх вачах ён вас з двара выгнаў...

Анэта. Не ён, а бацька яго.

Цыпрук. Усё роўна. Я ведаю, што ён хутка Анэтку зусім кіне. Гэта ўсе, як у барабан б'юць.

Анэта. Ай, не кажыце так, не кажыце аб ім, бо я на сябе рукі налажу. Я слухаць гэтага не магу.

Цыпрук. Ага, вось я гэта ведаў! Але што ж зрабіць, калі трэба слухаць, трэба добра прыслухацца, бо інакш паніч, гэты лахундра, вас загубіць. Я гавару гэта дзеля таго, што жалею вас, мне сэрца баліць, гледзячы на вас, Анэтка, бо ты ж сірата, цябе ніхто не прыгалубіць, ты бяздольная, усе стараюцца скарыстаць з тваёй красы і маладосці, смяюцца, высмейваюць, капаюць ямы, пхнуць у пропасць, кідаюць каменне. У цябе няма прыяцеляў. Усе ворагі. Ты верыш панічу і прымаеш усё за жарт, а табе я скажу, што скора настане той час, калі ён табе скажа: «Абрыдла ты мне, ідзі сабе к чорту». І ты пойдзеш уся ў гразі. А ад цябе ўцякаюць людзі.

Анэта пачынае плакаць.

Дык помні, Анэтка, маё добрае сэрца і не плач, бо плач нічога не дапаможа. Табе трэба чалавека, каторы здолеў прагнаць усіх ворагаў тваіх і сапраўды ды шчыра палюбіў бы цябе. А гэтым чалавекам магу быць толькі я. *(Хоча абняць.)*

Анэта *(вырываецца)*. Не чапайце мяне, не чапайце! Божухна, мой Божа, як жа мне цяжка жыць!

Тут чуваць здалёку голас п'янага Андрэя.

Цыпрук. Во, чуеш? Гэта ж твая смерць. Не я буду, калі ён цябе не задушыць. Толькі вось гэта мая сіла цябе абароніць. *(Хоча абняць.)*

Анэта *(вырываецца)*. Не лезьце, не чапайце!

Цыпрук *(са злосцю)*. Я не горшы за паніча; ён цалаваў твае губкі, дык і я маю права на іх.

Анэта. Ён не цалаваў.

Цыпрук. Ой... ой... якая нявінная. А хто ж гэта нядаўна на гэтым месцы быў?

Анэта. Не быў, не быў.

Цыпрук. Быў і штосьці казаў.

Анэта *(кідаецца да Цыпрука)*. Ані слова! Маўчы!

Цыпрук. Ха-ха-ха... можа, забароніш? Вось, пайду зараз ды на цэлую вёску разнясу.

А н э т а. Ёй-ёй-ёй, што ж гэта будзе... Не, не, маўчы, у мяне дваццаць рублёў ёсць, дам табе, толькі маўчы...

Ц ы п р у к. Ды ў цябе больш ёсць.

А н э т а. Усё, што маю, да іголачкі аддам, толькі маўчы.

Ц ы п р у к. Гм... добра. Астаў свае скарбы да другога разу. Я буду маўчаць. Ты цяпер знаеш, што я цябе магу выратаваць, калі паслухаеш мяне, і магу загубіць, калі адкажаш. Данясу ў паліцыю, буду крычаць на ўвесь свет, што ты гэткая ды такая, што душагубка, і тады цябе не толькі паніч і людзі адракуцца, але і сабакі будуць абмінаць.

А н э т а. Т-с-с-с. Браточак, даражэнькі, не рэж майго сэрца! Маўчы!

Ц ы п р у к. Не, не, буду маўчаць. Добра. Я не такі чалавек, каб цябе, маю дарагую, закрыўдзіць. Не, будзь спакойна, я цябе ашчасліўлю, бо люблю, бо гіну за табой; мне не жыць без цябе. Вось паедзем у горад, мая ты малінка, там будуць грошы. Ой, будуць. Я знаю адну вельмі багатую паню, у яе многа-многа дзяўчат... Ой, будуць грошы, толькі паедзем, мая ты дарагая.

А н э т а. Юзюк пісаў, што яму там надта трудна, я баюся ў горад.

Ц ы п р у к. Праўда, усякія там ёсць людзі. Ёсць такія, што гінуць з голаду, ёсць і такія, што птушынага малака не хватае. Ну, але, кажу, што грошы будуць, значыць, будуць. Ты кажаш — «баюся». Тут трэба горш баяцца. Хутка разнясуць па вёсцы аб тваім граху, і што ты тады зробіш? Састарэешся, апусцішся; пойдзеш у людзі ласкі прасіць. Дык едзем? А?

А н э т а *(цяжка ўздыхаючы)*. Божухна мой, скуль жа столькі напасці на маю галоўку. *(Да Цыпрука.)* А ці ты будзеш маўчаць і ніколі нікому-нікому не скажаш?

Ц ы п р у к. Анэтка, я буду маўчаць. Чуеш? Да самай смерці буду маўчаць. Але што ты мне за гэта дасі?

Анэта валіцца Цыпруку ў ногі.

Не спадзяваўся. Ха-ха-ха! *(Паднімае.)* Ну, годзі, мая малінка, маё багацце. Устань. Прыгалубся. Ці ж ты мяне не любіш?

Анэта. Паедзем хутчэй адгэтуль, хутчэй! Як найдалей адгэтуль! Як найдалей!

Цыпрук. Ох, як жа я рады. Як павязло! Сотні тры ўляціць. А калі ж ты можаш ехаць?

Анэта. Не ведаю... Што хочаш рабі са мной. Ой, Божухна, дзе ж гэта я, як у пушчы... Ці гэта сон?

Цыпрук *(абнімае, цалуе).* Э, пакуль жаніцца — загаіцца. Можа, ты, Анэтка, часам грошы не маеш на дарогу?

Анэта. Ёсць... хваціць... Усё ёсць. Пайдзём, пайдзём...

Цыпрук. Ха-ха-ха... Вот жа ўдалося. *(Бярэ Анэту чуць не ў ахапку і выносіць.)* А маё ж ты багацце.

Заслона

## ДЗЕЯ ТРЭЦЯЯ

АСОБЫ

Юзюк.
1-ы дзяцюк, сябар Юзюка.
2-і дзяцюк, сябар Юзюка.
Стася — Анэта.
Гаспадыня піўной.
Работнік.
Жонка работніка.
Гарадавы.
Жабрак.
Чыноўнік.
Хлопцы і дзяўчаты.

Піўная ў горадзе. Сутарэнне. Вокны пад столлю. З аднаго старапы буфет, а з другой столікі і дзверы да другіх пакояў. Напроціў дзверы з усходцамі. Сцены мурзатыя і аблеплены рысункамі. На зямлі смецце, акуркі, мокра. За буфетам сядзіць тоўстая пажылая кабета, гэта гаспадыня. На ўсе пытанні адказвае неахвотна, як бы спрасонку. За столікам сядзяць два дзецюкі — сябры Юзюковы, п'юць і закусваюць.

1-ы дзяцюк. Пані, дайце больш хлеба.

Гаспадыня. Каго, кажаце, хлеба?

1-ы дзяцюк. Але, хлеба.

Гаспадыня. Зараз. *(Падае.)*

2-і дзяцюк. Што гэта вы самі прыслужваеце? Дзе ж дзелася Стася?

Гаспадыня. А яна зараз прыйдзе.

2-і дзяцюк. Прыгожая дзяўчына, ох, прыгожая, якіх мала. Я думаю, каб не яна, дык вам, пані, не было б з чаго жыць. Ці ж не праўда?

Гаспадыня. А не бядуйце, не турбуйцеся, гэтага дабра ёсць пропасць, не будзе яна, дык на яе месца дваццаць найшлося б.

2-і дзяцюк. Найшлося б то найшлося, ды не так даходныя. Заўсёды мае гасцей.

1-ы дзяцюк. А раскажыце, як і адкуль яна да вас папала.

Гаспадыня. Гэта ўжо мне ведаць. Пэўна, што не праз комін і не з-пад зямлі, а так, як і ўсе людзі,— праз дзверы. Зразумелі?..

2-і дзяцюк. Чаму ж не зразумець. Зразумелі.

1-ы дзяцюк. І кукіш з'елі.

Смяюцца. Тут чуваць змаганне за дзвярмі. У хату ўвальваецца работнік, гадоў 60, увесь абарваны, у гліне і пабеле. За палу работніка трымаецца яго жонка, якая цягне яго назад.

Работнік. Пусці ты мяне, нячыстая сіла! Пусці, кажу! Скуль узялася? У карчме і то за табой волі няма.

Жонка. Не пушчу, п'яніца, злодзей. Не пушчу, будзеш ты помніць жонку і дзяцей, будзеш! Разбойнік!

Работнік. Пусці, вужака!

Жонка. Забі мяне, а не пушчу.

Гаспадыня. Цішэй, цішэй, не забывайцеся.

Работнік. Не пусціш?

Жонка. Не пушчу.

Работнік. Пусціш?

Жонка. Не пушчу, кат! Грошы аддай! Дзе дзеў грошы?

Работнік. Ах ты, асіна горкая! Будзеш мяне яшчэ раз сароміць? *(Вырываецца, хапае ўслон і кідаецца да жонкі.)* Вон, а то прыб'ю!

Жонка. Бі.

Работнік. Вон!

Жонка. Бі жонку. Забі. Не бойся.

Гаспадыня. Я вам кажу, цішэй. А не то — убірайцеся туды, адкуль прыйшлі.

Работнік. Праваліся ты скрозь зямлю. *(Кідае ўслон.)*

Жонка. Ага, пажалеў, пажалеў, кат. Бо ведаеш, што каб забіў, дык загубіў бы дзяцей і сам, як сабака, здох дзе-небудзь у турме.

Работнік. Маўчы, маўчы! Вужака, грошы хацела? На, і ідзі к чорту, каб твой след прастыў.

Жонка. Ага, ага, пабаяўся. Мне грошы патрэбны, а ты хоць камянём сядзі. *(Выходзіць.)*

Работнік. Вон, вон, свіння лабатая!

1-ы дзяцюк. Ну і баба, як аса.

Работнік. А ведаеце, чыстае гора, скуль пачалося. Я дык чуць ногі валаку. То не жарт, цэльны дзень траціш здароўе над цэглай, кельмай... а тут замест адпачынку на табе — усялякі вечар тузайся з балотным стварэннем. То не жарт, лёгка сказаць, мае каралёчкі, зацягне ў хату, нож у рукі і бульбу наказуе скрабаць. Ну, і што ж зробіш, скрабеш і маўчыш, бо тут жа перад табой стаіць ведзьма з качаргой і, гаручка на яе карк, усё прымаўляе: «Скрабі, скрабі, лепш будзе смакаваць».

Дзецюкі смяюцца.

1-ы дзяцюк. Як відаць, дзядуля, баішся сваёй жонкі.

Работнік. Не. Каб так сказаць баяўся, не скажу, каралёк, бо чаго ж баяцца — такі самы чалавек. Вось часам яна бывае трошачкі-трошачкі, нямножачка. Ох, спрытна малоціць качаргой, дужа спрытна, ні адзін палкоўнік не ўстаяў бы.

2-і дзяцюк. Але ты, дзед, умееш добра баяць. Сядзь, вып'ем.

Работнік. Дзякуй, прысяду, калі пазваляеце. *(Садзіцца, да гаспадыні.)* Дайце чым-кольвек змачыць горла, хутчэй толькі.

Гаспадыня. Паспееш, паспееш. *(Стаўляе.)*

2-і дзяцюк. А чым плаціць будзеш?

Работнік. Э, не турбуйцеся, скуль узялося, што, праўда, усё прапіў, як жонка кажа, але розуму яшчэ не чапаў. А грошы ось колькі. Бачыце. *(Трасе грошы ў кішэні.)*

1-ы дзяцюк. Абач, скуль жа гэта?

2-і дзяцюк. Ты ж жонцы аддаў.

Работнік. Э!.. Зяляннё вы яшчэ, мае каралёчкі, ну і не дзівота, бо дзецюкі. А ведаеце, скуль у мяне грошы?

1-ы і 2-і дзецюкі. Ну, ну...

Работнік. Вось скуль пачалося. Як стала яна мяне трасці, дык я і падумаў: ты мяне трасі, балотнае стварэнне, а я цябе ашукаю. І як надумаў, так і стала: грошы высыпаў, а кашэль пусты аставіў.

1-ы і 2-і дзецюкі *(смяюцца)*. Ну і хіцёр жа ты.

Работнік. Ды ўжо ж, як людзі кажуць, хто з панамі не варожа, у таго свіран повен збожжа. Ну, але смагу ўжо прагнаў, цяпер вып'ем усе разам.

1-ы дзяцюк. Вып'ем, вып'ем.

2-і дзяцюк. Чаму ж не выпіць. *(П'юць.)*

Юзюк уваходзіць, аглядаючыся па ўсіх кутках. Па яго манерах відаць, што папаў сюды першы раз. Пазнаўшы сваіх сяброў, падыходзіць да аднаго з іх, б'е па карку і падае руку.

1-ы і 2-і дзецюкі. А, Юзюк. І ты сюды папаў.

Юзюк. Але, папаў неяк знянацку.

2-і дзяцюк. Ну, ты, брат, штосьці зліняў. Дзе ты быў?

Юзюк. Эх, братцы. Доўга і страшна гукаць.

Работнік. Вось я згадаў: вы, пэўне, жанаты?

Юзюк. Якога чорта жанаты.

1-ы дзяцюк. Абач, дзядуля, дай месца сябру.

Работнік. Гм... скуль узялося... Ну, пані гаспадыня, памажыце пераехаць.

Пераносяцца.

Так, так, тады і жыд нам брат, калі грошы мае шмат.

2-і дзяцюк. Ну, хваліся, што ў цябе чуваць?

Юзюк. Чуваць-то ў мяне шмат што, толькі пахваліцца няма чым. Эй, там, сівухі, сівухі!

1-ы дзяцюк. Абач, яшчэ не забыўся плакаць.

Смяюцца.

Жылося нам калісь, Юзюк, ці помніш?

Юзюк. Ох, жылося, гэта праўда. А цяпер, братцы вы мае, ходзіш, як у тумане, зямлю траціш пад нагамі, а ўсё цела, як дрэва кусок: гніе, мусіць, ці што? Усяго мяне трасе, але не ведаю, ці мне сцюдзёна, ці горача... Бр-р-р... Страшна. Згубіў здароўе, пражыў шчасце, скруціў жыццё.

2-і дзяцюк. Э, брат, ты аб чымсь блыкаеш недарэчы?

Работнік. А я вам кажу, што ён жанаты.

1-ы дзяцюк. Юзюк, ты перш не такі быў.

Юзюк. Не такі. *(П'е, а пасля хлопцы п'юць.)* Не такі, кажаш? Пэўне, што не такі. Машына перарадзіла, сцёрла мае косці... атравіла.

1-ы дзяцюк. Якая машына?

Юзюк. Не ведаеце. Машына на фабрыцы, папаў пад кола і... *(Хватаецца за бок і стогне.)* Ось тут, тут... Ох, як жа часценька баліць. Баліць.

2-і дзяцюк. Вось яно што. Паняньчыла, значыцца.

1-ы дзяцюк. Я бы то, што цябе пазнаць няможна?

Юзюк. Ты згадаў, што мяне пазнаць няможна. Я сам сябе не пазнаю, то баюся — каюся і хаваюся ў цёмны куток, і гнуся, і люблю ўсіх, то раптам набярэцца столькі гордасці і адвагі, што нікога не відзіш вышэйшым над сабой... і ўсіх тады на свеце ненавідзіш, усіх клянеш, усе каіны, звяр'ё, крывапійцы... А часам бывае, што так абрыдзе жыццё, так горка стане, што, здаецца, лепей бы, зажмурыўшы вочы, рынуўся бы вось так на ўвесь свет, ды біў бы, грыз, плакаў, смяяўся і ўсё шукаў бы крыві, крыві, і чым больш крыві, тым мне лягчэй, весялей, тым болей сілы, здароўя, адвагі... Ох, як жа тады добра, як жыць тады хочацца.

1-ы д з я ц ю к. Што з табой зрабілася?

2-і д з я ц ю к. Аб чым ты гаворыш, Юзюк?

Ю з ю к *(смяецца)*. Не разумееце. Сляпыя не відзяць сонца. Не разумееце, бо я ўжо памёр. Жыцця мне больш не ўвідзець. Бо дзе відана, каб чорнае адмыць на белым? Як не мый, як не тры, і хоць крыху змыеш, усё ж такі знак застанецца. Не вымыеш. Страціць сваю ясную, чыстую белізну.

2-і д з я ц ю к. Ат, збрыдла слухаць. *(Бярэ чарку.)* П'ём.

1-ы д з я ц ю к. Пі, Юзюк.

Ю з ю к. Вып'ю, вып'ю. Хоць і сам не ведаю нашто: бо і без водкі п'яны.

П'юць. Ад часу да часу ў гутарцы Юзюковай чуваць, што ён пераносіць боль.

1-ы д з я ц ю к. Пастой жа, я цябе развесялю. Пані, а пані, прышліце сваю Стасю.

2-і д з я ц ю к. А вось добра, што ўспомніў.

Г а с п а д ы н я выходзіць і скора выпіхвае С т а с ю. Юзюк выпівае некалькі чарак.

1-ы і 2-і д з е ц ю к і *(зглeдзеўшы Стасю)*. А, Стасюта, сюды, сюды. *(Паказваюць на Юзюка.)*

Стася падыходзіць да Юзюка і хоча абняць яго.

Ю з ю к. Вон, паскуда, блудніца, дачка антыхрыста. Вон, гной, бруд заразны. Вось лепш абмыйся ў расплаўленым волаве ды сядзь у агонь і раскажы, мая краса, у якога пана служыла, за колькі капеек прадалася? Што? Ага, насупонілася, чортава насенне. Піце хлопцы.

1-ы д з я ц ю к. Пайшоў у балота.

2-і д з я ц ю к. Ты нам не сябра.

Ю з ю к. Ха-ха-ха! На якога ражна нам сябры. Хто водку і грошы мае, той нам сябра.

1-ы дзяцюк устаў і падышоў да Стасі. 2-і дзяцюк адвярнуўся ад Юзюка задам.

Р а б о т н і к *(выпіўшы)*. А што, не мая праўда, што ён жанаты?

2-і дзяцюк. А ты, старына, маўчы, пакуль зубы цэлы.

Работнік. Дзе, маё дзіцятка, куды там, ушак жа ведаеце, што жонку маю. Скуль жа зубкі, павылятаці.

Тут Юзюк стогне, корчыцца і валіцца з зэдля.

Гаспадыня *(спакойна, але сярдзітым голасам)*. Што, што гэта вы з ім зрабілі?

1-ы і 2-і дзецюкі. А мы-то што ведаем?!

Работнік. А... вось як...

Стася. Фі, які гніляк. Гаспадыня, трэба яго вон выцягнуць, а то запаскудзіць усю хату.

Гаспадыня. Хай на яго смерць! Хай бы ён заместа сюды ў раку папаў!

1-ы і 2-і дзецюкі. Мусіць, яму гэта ад машыны.

Работнік *(глядзіць на Юзюка)*. Вось жонка, вось ведзьма, горшая за маю, горшая...

Стася *(падыходзіць да Юзюка, штурхае яго нагой)*. Ну, чучала гарохавае, прачніся.

Хлопцы смяюцца.

Гаспадыня. Мацней, Стася, мацней. Хай устае. Хай яны праваляцца такія госці.

Стася штурхае мацней.

Юзюк *(прарываючымся голасам)*. Ой... ой... мае паночкі, не чапайце... змілуйцеся...

Стася *(адыходзіць)*. Ага, цяпер змілуйцеся!

Гаспадыня. Ну, мармыча, значыць — нічагуткі. Не першыня такія.

2-і дзяцюк. Стася, хадзі ка мне.

З-за дзвярэй чуваць голас: «Эй, дзеўка, падзі сюды!»

Гаспадыня. Ідзі, ідзі.

Стася выходзіць.

Работнік. Даражэнькая пані. Колькі належыць, значыцца, з маёй асобы?

Уваходзіць, як бы баючыся, жабрак і становіцца пры парозе.

Гаспадыня. Семдзесят пяць капеек. *(Згледзеўшы жабрака).* Пайшоў, пайшоў. Нічога не дастанеш.

Жабрак нізка кланяецца некалькі разоў і зноў стаіць.

Работнік *(плаціць).* Семдзесят пяць капеек... Вось вам семдзесят пяць капеек. До! Болей сабе гэтага глупства не пазволю, не пазволю... Люблю я сваіх дзетак, ох, і люблю... Не пазволю... семдзесят пяць капеек... *(Выходзіць.)*

Праз той час жабрак дастаў хустку, развязаў вузел, высыпаў адтуль грошы сабе ў жменю і, як выйшаў работнік, падышоў да буфета, дзе знакамі стаў прасіць водкі. Гаспадыня дала яму, ён заплаціў, пайшоў у куток, адвярнуўся ад усіх задам і стаў піць з бутэлькі.

Юзюк. Што гэта... дзе я... сон... мара... А, гэта старыя песні. *(Ускоквае.)* Ікаюцца панскія прывычкі... Дарагая памятка і вечная, аж да самай дамавіны. Эх, жыццё, жыццё... Гадкае, мутнае, як сажа чорнае, як ката сумленне. Эх, хлопцы, хадзіце піць. *(Садзячыся.)* Мо водка абмые наша жыццё. Ану! Рухавей!

1-ы і 2-і дзецюкі. Да, мы-та не адказваемся. Толькі ты нас болей не пужай.

Юзюк. Нічагуткі, не пужайцеся. Усяк бывае, і жабрак пану грош кідае. *(Налівае.)* Піце. Дзе наша не прападала. Прапала вяроўка — прападай кароўка. Хоць у мяне дык наадварот, прапала кароўка — прападай вяроўка.

1-ы дзяцюк. Будзь здароў!

2-і дзяцюк. Шчасце.

Тут Стася выбягае, бярэ дзве бутэлькі піва і хутка вяртаецца.

Юзюк. Піце, піце, і я буду піць, бо зялёны змей шчыра дапамагае ў такіх выпадках. Не раз ён мяне ратаваў і не раз выратуе, але згубіць адзін раз.

Дзецюкі п'юць і даюць Юзюку.

Піце, братцы, водку піце, на мяне не зважайце, я буду піць, я скора пачну піць кроў, ды не чаркамі,

але такой меркай, што буду піць, піць і ўсё будзе хацецца. Ох, калі ж то той час настане...

Жабрак *(выпіўшы водку, паруxавеў; стаў прыслухоўвацца да гутаркі Юзюка і, як бы да сябе, хрыпатым пявучым голасам).* Не пускай сахі глыбока — пясок жоўты недалёка.

1-ы дзяцюк. Астаў, Юзя, на пасля. Добры ты хлапец, толькі нудна гаворыш.

Юзюк. На пасля, кажаш... Ха-ха-ха... Так, брацішка, і я казаў, і мы ўсе кажам: на пасля, на пасля. *(Бярэ бутэльку і абарачвае, піва льецца на зямлю.)*

1-ы і 2-і дзецюкі *(не пазваляючы).* Што ты, што ты. Звар'яцеў. Не марнуй піва.

Юзюк. Стойце, стойце, пасля. *(Стаўляе бутэльку.)* Вось, братцы, як вам шкада зафарбаванай вады, вы дрыжыцё, гатовы біцца: тут у вас няма «пасля». А гляньце назад, гляньце, колькі жыцця ўплыло, гляньце, як яно хутка плыве... чаму тут вы кажаце: «пасля, пасля», аж да самай магілы — пасля...

1-ы дзяцюк. Чаму гэта так?

2-і дзяцюк. Хто тут вінават?

Юзюк. А як вы думаеце, хто тут вінават? Хто навучыў нас любіць роскаш, гулячае, распуснае жыццё, золата і вось гэту атруту? Хто? Хто навучыў нас пагарджаць і абрываць лахманы сваіх братоў, абрымзаных і кастлявых? Хто навучыў зневажаць і таптаць усё святое, светлае, людское? *(З вялікай жаласцю.)* Хто загубіў радню маю і п'е напарсткамі кроў маю? Хто завёў мяне сюды, у рудаўку, у гной, у пропасць і пхне і смяецца пякельным рогатам?.. Ха-ха-ха! І я так умею смяяцца. Здольны з мяне вучань, ох, здольны. Навучыўся я, больш як трэба. Перавучылі, знаць, на сваю пагібель... Ох, і адамшчу я вам, аж зямелька ўскалыхнецца, зоркі пагаснуць, аж неба заслязіцца... Адамшчу, аддам жа ваш хлеб, толькі шмат бялейшы, з найлепшай мукі, аддам. Не дармо мяне вучылі.

1-ы і 2-і дзецюкі *(цяжка ўздыхаюць).* Супакойся, Юзюк, супакойся.

Гаспадыня дрэмле за буфетам.

Жабрак *(тым самым, што і перш, голасам).* Але, але, той, хто мае хлеб ад Бога, не страдае ад нікога. Але.

Юзюк *(хапаецца за бок).* Зноў пачало... Ой, як жа баліць, якія ж мукі... І за што ж гэта, Божа ты мой? Я ж кінуўся ў свет, каб пазнаць людзей. Я хацеў вучыцца, я думаў, што людзі навучаць мяне, як любіць і шанаваць іх; я хацеў сагрэць, асвяціць душу маю, жыць і карыстаць са сваёй працы і другіх карміць. Ажно дачакаў! Навучылі! Праўда. Усяго далі: замест кахання — нянавісць, замест здароўя — хваробу, замест цяпла ўпёрлі лёду кусок. Асвяцілі душу маю, асвяцілі, толькі свет гэты не грэе. Ох, які ж ён халодны!.. Бр-р-р-р... Бог не стварыў такога холаду, толькі людзі спатрафілі стварыць... Так, так, я цяпер вучоны і надта багаты, ды каму я патрэбен? Як гнілое яблыка, каторае валяецца на зямлі, каторае перакідваюць нагамі. Свіння і тая не хоча есці яго, і так яно валяецца, пакуль хто знянацку не ўступіць і не раздавіць, праклінаючы, што запэцкаў ногі, і ўсцішаючы сябе тым, што другі хто яшчэ ўлезе... Каму я патрэбен, гнілы, разваліўшыйся? Хто мне паможа акунуцца ў чыстай вадзе, хто выратуе? Не думаючы, скажу: ніхто... Праўда, меў я калісь вялікага бацьку і апекуна, справядлівага Бога, але і таго ад мяне людзі адабралі, адабралі беспаваротна... *(Апускаецца на стол і заліваецца не то смехам, не то плачам.)*

Яшчэ пярвей, пад канец гутаркі Юзюка, быў чутны слабы, сумны голас гармоніка, а як Юзюк канчаў — у піўную ўвальваюцца з гоманам п'яныя дзецюкі і дзяўчаты — усе з рабочага люду. Адзін з гармонікам пачынае іграць польку. Некаторыя смяюцца, гамоняць, другія крычаць: «Водкі!» Сябры Юзюковы, убачыўшы свежых людзей, пачуўшы музыку, пачынаюць прытопваць нагамі і пускаюцца ў танец. Выходзіць Стася з пустымі бутэлькамі. 1-ы дзяцюк, угледзеўшы яе, цягне ў танец.

Стася. Пачакай. Дайце паставіць бутэлькі. *(Стаўляе, ідзе ў танец.)*

Ідуць і другія патроху. Жабрак спачатку прытопваў, а пасля стаў круціцца з торбамі і кіямі. Увесь час чуваць свіст, песні і крыкі: «Мацней, музыкант, мацней... гой, гой! Трум-ба, трум-ба!» Юзюк толькі сядзіць, як бы нічога не чуючы, нагнуўся над сталом і схаваў галаву ў рукі. Скора апасля прыходу Стасі

праз дзверы ўбягае п'яны, раскудлачаны чыноўнік з крыкам: «Э, Стася! Дзеўка! Дзе ты?!» Але яго збіваюць з ног. Ён валіцца, паднімаецца, круціцца і зноў крычыць: «Невежды! Неблаговоспитанные! Некультурные!»

Юзюк *(паднімае галаву і пільна глядзіць на танцораў)*. Штосьці я прыпамінаю... Але што? Не, гэта сон... *(Праціраае вочы, устае і робіць некалькі крокаў, але тут жа са страшным выражэннем на твары хапаецца за бок, за грудзі, корчыцца з енкамі і ў такім палажэнні замінае танцорам.)*

Стася, якая танцуе з 1-м дзецюком, не перарываючы танца, піхае Юзюка так, што той рухнуўся, аж падлога забумчэла. Усе скачуць праз яго, топчуць яму ногі, а ён ляжыць якісь час, як замёрлы, але зараз паднімаецца, з цяжкасцю ўстае, садзіцца на зэдаль у такім самым становішчы, як і пярвей.

Гарадавы *(паказваецца ў дзвярах і працяжна гаворыць)*. Закрыць рэстаран!

Гаспадыня. Добра, добра, зараз.

Юзюк *(паднімае галаву і з вялікай цікавасцю прыглядаецца да танцораў. Але скора адварочваецца, плюе)*. Тфу! згінь ты, прападзі!.. чаго гэта чорт не выдумае... Трэба ж, так схожа...

Танцы пачынаюць суціхаць.

Гарадавы *(выходзіць)*. Хазяйка, врэмя закрываць.

Гаспадыня ківае пальцам да гарадавога, той падыходзіць да буфета, п'е і закусвае, а пасля выходзіць. Музыкант перастае іграць і прылучаецца да кампаніі, што ўжо сядзіць за столікам. Стася пачынае пець вясёлую жывую песню; некаторыя падцягваюць. Юзюк, пачуўшы знаёмую песню і знаёмы голас, хутка ўстае і надта пільна глядзіць на Стасю і, не адрываючы вачэй, хістаючыся, падыходзіць, а пасля, як звар'яцеўшы, хапіў яе за руку і стаў цягнуць на сярэдзіну хаты.

Стася. Чаго ж гэта? Ашалеў, мусіць, ці сасніў што?

Юзюк *(з балючым крыкам)*. Божухна мой! Анэта, гэта ты?

Стася *(пачуўшы сваё праўдзівае імя, адсоўваецца назад і, пазнаўшы Юзюка, крычыць)*. Юзюк, Юзюк! *(Пабегла ў свой пакой.)*

Зразумеўшы, што не ашукаўся, Юзюк хватае нож са стала, кідаецца ўслед за Анэтай. За дзвярмі чуваць голас Анэты: «Браток, пажалей, ратунку!»

Гаспадыня. Гвалту! Гвалту! (*Кідаецца ў дзверы.*) Гарадавы, гарадавы!

Юзюк выбягае ўвесь акрываўлены, вывернуў вочы, з нажом у руках і стаў, як акамянеўшы.

(*Як Юзюк выбег, хутка кідаецца ў пакой Анэты і яшчэ хутчэй адтуль варочаецца з прарэзлівым крыкам.*) Забіў, забіў!

Тут жа ўваходзіць гарадавы. Дзяўчаты і некаторыя хлопцы ўцякаюць.

(*Да гарадавога, паказваючы на Юзюка.*) Вун, вун, катаржнік. Забіў!

Гарадавы. Атвеціш, шэльма, па закону. Гаварыў закрываць. (*Падыходзіць да Юзюка, адбірае нож.*)

Юзюк (*прачынаючыся*). Нож. Дзе нож?.. крыві... адамшчы...

Гарадавы закладвае яму рукі назад.

Ха-ха-ха... пасля... пасля...

Заслона

# Марцовы снег

*Драматычны абразок*

Вуліца. За плотам дзе-нідзе марцовы снег. З хаты выбягае босая круглая дзяўчынка, Віцця; бяжыць на агарод і паспешна пачынае мыцца снегам. Па вуліцы ідзе малады хлопец, Пятрок, высвістваючы вясёлую песню.

Пятрок. Годзе, годзе красу наводзіць, і так, здаецца, як кроў з малаком... Іш ты як заўзялася! Віцця?! Не чуе! Ну то і добра!

Пераскоквае праз плот, цікуючыся, падыходзіць і цалуе Вікцю.

Вікця. Ай! А бадай цябе! Хто ж гэта?! А-а-ах, ты ласунчык — унадзіўся — адчапіся, бо я табе вушы паабрываю!

Пятрок. Не магу! Не магу! Канешне, пацалую, бо іначай растаплюся, як гэты снег на тваіх шчочках.

Вікця *(бярэ снег і трэ ім па твары Петрака)*. О-о-о, цяпер не растопішся!.. Уха-ха-ха!.. Глядзі, як ужо пабялеў.

Пятрок *(таксама бярэ снег і пачынае церці ім твар Вікці)*. Ото-то-то, ажно пара ідзе, аж кроў брызгае! О так, стой! Не ўцякай! Яшчэ!..

Ад іх гульні, крыку і смеху, поўнага радаснай маладосці і жыцця, плыве раскацістае рэха і як бы заахвочвае іх больш да гульні, каб падтрымаць гарманічнасць вясенняга настрою. Па вуліцы праходзіць пажылая кабеціна з кійком.

Кабеціна *(да сябе)*. Ы-ы-ы, а-яй-я! Во месяц-лізун! *(Стукае кійком па плоце.)* Што вы гэта робіце?!

Пятрок, Вікця. Ха-ха-ха! Пабяляем адзін другога!

Кабеціна. Стыднікі вы, стыднікі! Грэшнікі вы! Скуру пабяляеце, а душу гадзіце. Якія ў вас вочы, бязбожнікі вы!

Пятрок *(кідае на яе ком снегу)*. Разяўся, цётка, яшчэ болей, то снег язык пабеліць! Ха-ха! Во раскудахталася!

Вікця тым часам уцякла дахаты.

А-а! На табе, прапала, як дым у паветры, а ўсяму ты, цётка, вінавата, а мабыць, была калісь сама маладая і, пэўне, не аднаму хлопцу галаву закруціла?..

Кабеціна. Так, дзіцятка, была, праўда, што была, ды яшчэ якая прыгожая ды ядроная. Твар гарэў, як журавінка, стан, быццам точаны, адным словам, стройная, як сасонка. Охо-хо! Усё прайшло...

Пятрок *(адыходзячы, з кпінай)*. Бачу, бачу! Ды і цяпер, каб памылася марцовым снегам, то не ўступіла б другой маладзіцы.

К а б е ц і н а. Дай пакой, дзіцятка, што кажаш! Куды ўжо мне, дзе ўжо мне. Охо-хо! *(Адна. Глядзіць на снег, што кінуў Пятрок.)* Аднак жа марцовы снег калісь цудоўна памагаў, як жыватворная мазь. *(Аглядаецца, бярэ кусочак снегу і трэ ім па твары.)*

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

І старая бяроза, што расла тут жа, каля плота, з выпаленым дуплом, паламанымі сукамі, пукацца пачала, а там недзе высока ў бяздонным блакіце, заблытаўшыся ў залатых праменнях, пяяў жаваранак хвалебную песню вясне...

## Пакрыўджаныя

*Драма ў чатырох дзеях*

АСОБЫ

Т о д а р, старац.
У л л я н а, дачка Тодара.
П і л і п, корнік.
Ц і в у н.
А с н а ч ы.
З д а н ь  г а с п а д а р а Піліпа.

### ПРАДГУКАННЕ

І вось хай толькі прамігне цень мінуўшчыны перад намі, хай раскінецца сіні прастор аддалі ці загрукаціць рассыпаючая руіна, як у душы нашай змагаецца гармонія дзіўных перажыванняў. Няма, мінула... Час схамянуўся, й волат стаў ніц коласам, красуля-дзяўчына пахучай грэчкай, курганы натупырыліся векавымі соснамі, гарады пылам размяліся па зямельцы-маці... Няма, не вернецца... І хочацца забыцца, апынуцца ў цені мінуўшчыны. І летуціш аб тым далёкім, павабным, недаступным...

Чахне Велля, сохне й лысее, а лысіны яе ўкрываюцца мохам, дзікай травой.

І не бурклоча, не ходаецца яна з каменнямі, не йскрыцца юнацтвам: сонная, нехлямажная, ось бы немач яе апанавала.

І баюць людзі, быццам Велля тужыць па цяжкіх ад рознага дабра лайбах, тужыць па песнях асначоў, што пераклікаліся шырокім рэхам з прадвечнымі лясамі. Баюць людзі, што даўней жудка-таёмныя валатоўкі пераміргваліся з Велляй сінімі агеньчыкамі, утойваючы без ліку багаты скарб; над валатоўкамі апоўначы рухаліся нашы магутныя прашчуры-ваякі, грумкаючы сваёй важкай зброяй. Марнее, чахне Велля, бо менш стала плакаць Вялляна, бо стыгне любасць да чарнавокага Сцяпана. Ой, прыгожая дзяўчына Вялляна, як сама краса, як Ляля. І даўно ж то было, калі пайшоў на вайну яе мілы, удалы хлопец Сцяпан; ой, і не вярнуўся ж ён болей, кануў, як камень у ваду. З той пары Вялляна горка стала плакаць, так плакаць, што ад слёз яе наплыла рака Велля сіняй істужкай аж вунь куды — у мора.

Так баюць людзі.

На высокім беразе Веллі, сярод лесу, ёсць узгорак; ён палошча свае пяты ў Веллі і ўкрыты дзірваном-аблогам. Былі такія часы, калі гэты ўзгорак кожнае лета абхінаўся жывым дываном — нівамі, а прыгожым, як найбагацейшая слуцкая тканіна. Дыван гэты ткалі працавітыя ручкі красулі-дзяўчыны Улляны так зручна і ўмела, што яе збочаная, з зялёнай страхой ад моху хаціна ахарашвалася й выглядала вунь як прыгожа, быццам фантастычны палац у казцы якой.

Над нівамі калыхаўся хмельны пах і вабіў і ўгашчаў пчолак, служак божых. Ад усходу да заходу абагачваліся пчолкі, пеючы хвалебную песню Улляне, а ў багатую восень асалоджвалі яе калінавыя губкі пахучым мядком, чыстым, як бурштын.

Але ў збочанай хаціне, апроч Улляны, жыў яе строгі бацька, Тодар. Гэй, хто цікавы, праедзь уз-

доўжкі Веллю й папытай аб дзядулі Тодару — ён жыве ў кожнай хаце; кожная валатоўка, хмызняк, імшарына яго знае; кожнае возера, рэчка мае адбітак яго грозна-мудрай паставы. Які крыж, капліцу не аздобіў драўлянай фігурай дзядуля Тодар! Ох, спрыцен ён, дзядок хоць куды! Калі высеча з дубу фігуру якога святога, дык самы цвёрды грэшнік карыцца перад ёй; ён сам не раз апускаўся на калені й слязлівымі вачмі глядзеў на закончаную сваю работу. Ой, і кемны гэты дзядуля Тодар. Ён добра знае, што аб тыя каменні на рацэ, што павыторкаваў вадзянік часта-густа, разбіваюцца лайбы, а дабро тоўстым пластам укрывае дно ракі й корміць і гадуе аграмадную рыбу. Вось чаму ў збочанай хацінцы вісяць рыбалоўныя снасці, а кубел Уляны паўнюсенькі match рознай тканіны. Тодар знае, што кожны купец, праехаўшы шчасліва тыя каменні, захоча на радасці добра закусіць, выпіць і аддыхнуць мала-веля, а кожны аграблены гэтымі рачнымі разбойнікамі пажадае ўтапіць гора-горкае ў хмельным, салодкім мядку; што людзі, пазнаўшы яго й красу Уляны, шырэй разнясуць чуткі аб іх па свеце.

І пакідалі госці збочаную хаціну шчасныя, падмацаваныя любасцяй, хмелем ці мудрасцяй. І сцежка ад ракі не зарастала, а маладая Уляна з радасцю сустракала чужога чалавека.

## ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

### З'ява I

Днём у хаце. Сцены абвешаны сталярнымі і рыбалоўнымі прыладамі. У кутку стаіць драўляная фігура, недакончаная і жудкая ў сваіх грубых формах, сваім плоскім тварам; каля яе ляжаць пачатыя, а то і кончаныя фігуркі. На двары журбуе вецер.

Уляна *(перагнуўшыся цераз адчыненае акно)*. Ха-ха-ха!.. А кыш, кыш! Каб цябе, хай цябе... разбойнік ты! *(Адварочваецца.)* Уцюлюлюсіўся за грэбень і цягне, цягне, аж кроў пайшла, а курыца быццам не

бачыць, ходзіць ды «кэ-кэ-кэ...», ходзіць ды сакоча. Ах, хітрая шэльма! *(Маўчанка; у задум'і.)* Няўжо ж ты забыўся аба мне, Піліпка, саколік мой ясны. Ох, каб ты ведаў, каб ты бачыў, як я заўсёды гляджу й гнуся ў той бачок, кудой ты паехаў ад мяне; гнуся, як краска к сонцу, а сэрцайка шчыміць, жалоціцца й слёзы сыплюцца — не ўстрымаць. Прыляці, уцеха мая, птушачкай, стралой прыляці. Вочкамі сваімі тваю жытку асвячу, песняй тугу разганю... *(Прыслухоўваецца.)* Віхор вые, вые... Жудасна неяк... *(Пацягваецца.)* О-хо-хо, пацягушкі, мае душкі! Ну й аздобная я была сягоння, калі аглядала ў рацэ красу сваю, гледзячы, як жыруе рыбка. Знаць, вадзяніку спанараўнай была, бо так нешта цягам цягнула на дно ракі — адылі, спанараўнай. *(Акручваецца касой.)* Ого, то ж я хутка касой акручуся каля пояса! *(Смяецца задаволеная.)* Ох, ты мая косачка міленькая, доўжанькая, тоўсценькая, мякусенькая!.. Эх, так і будзе: не прыедзе Піліп — русалкай стану. Дадушы, праўда! *(Вынімае з скрыні посцілкі, дываны даматканыя, накрывае то адным, то другім свой ложак і пяе.)*

Нашто ты, матулька, мяне нарадзіла
Так чырвонай, як калінка,
Ды тоненькай, як былінка?
Нашто ты, матулька, часта мяне мыла,—
Бо я бела, як бярозка,
Чыстая, як горка слёзка.
Нашто ты, матулька, галоўку часала —
Мая каса, як шоўк уецца,
Аж аб пяты трэцца?

Вось шкада, што паміж гэтымі абалонкамі не пусціла я чырвонай ніткі.

Ой, чаму ж, матулька, таго не сказала,
Што зязюльчыны навокал
Пер'я растрос ясны сокал?

### З'ява II

Уваходзіць Т о д а р, моцна незадаволены. Маўчанка.

У л л я н а. Але сягоння рыба ў рацэ дык вунь як гуляла — дождж, пэўна, будзе й вецер па шчэлках вые... *(Маўчанка.)* А я сягоння дык міску разбіла, нехаця... з рук вывалілася. Нехта, мусіць, спяшыць да нас.

Т о д а р. Божухна моцны, ўзнагрдзіў ты яе ўсім, але чаму ж не даў ён волі, не даў вольнай жыткі? Згіне яна марна, занішто прападзе, як краска без сонца. Ох, чаму ж яна радзілася падданай? Гора мне, гора! Няўжо ж кожная краска, кожнае стварэнне — усе яны таксама гаротныя, паднявольныя, й хіба ж гэтае сонейка яснае, лясы, рака, увесь абшар, увесь свет ёсць паншчына, падданства... Грошы яму дай, дачку яму дай; ох, каб ты дна ў пекле не знайшоў, ты — пагібель, жывадзёр, крывапійца... смерць табе, смерць!..

У л л я н а. Татачка!

Т о д а р. Улляна! Цябе хоча ўзяць, пан хоча ўзяць, у двор цябе, у двор... О Божа! Будзеш там цацкай, уцехай, у мяккіх, пуховых руках, будзеш піць салодкае, хмельнае віно, голай танцаваць сярод азвярэўшага панства, й збэсцяць цябе, зняважаць дачку Тодара. Будзеш шчанят грудзьмі карміць, згінеш у гразі... Ох, не стрываю, не стрываю!..

У л л я н а. Татачка, супакойся! Пан жа цяпер хворы, пан цяпер не возьме.

Т о д а р. «Хворы», а каб не ўпёр у яго воўчае горла грошы, дык бы зараз узяў; заткнуў, як дзюрку тую ў печы, праз якую паўзе чад. «Хворы»!

У л л я н а. І скуль гэта напасць, безгалоўе бярэцца, хоць ты аб сцяну галавой бізся?

Т о д а р. Цівун кажа, што пан замест пацераў шэпча: «Грошы, грошы», а людзі баюць, што ён і захварэў праз грошы. Падазваў гэта мяне й кажа: «Тодар, дай мне грошы»; колькі — ды мне ўжо й не ў памяці, цераз меру шмат, ды кажа: «Й дачкі няволіць не буду, й табе дам волю». А скуль мне ўзяць столькі грошай, скуль мне іх узяць?! Эх, пракляць!

Улляна. Вось каб я ведала, колькі трэба. *(Маўчанка.)* Але ўсё роўна, у мяне ёсць грошы: гарнец, асьміна, а мо й болей, дадушы, ёсць!

Тодар. Што ты звар'яцела, дзяўчына? У яе грошы!

Улляна. Хай сабе звар'яцела, але ёсць, ёсць, кажу.

Тодар. Ат!

Улляна хоча выйсці.

Стой! Аб якіх ты грошах плявузгаеш?

Улляна. Я, татачка, пра тыя вунь валатоўкі, ведаеш, што над ракой кожны вечар сінімі агеньчыкамі цвітуць. Кажуць, што там напэўна грошы ляжаць...

Тодар з пагардай матае галавой.

Ну, сапраўдачкі там ёсць грошы.

Тодар. І ты, блазніца, хочаш паскудзіць рукі свае аб закляты скарб?

Улляна. І-і. Спаліць свянцоных зёлак, то закляцця як і не было.

Тодар. Блазніца ты!

Улляна. Ці я ведаю? Так людзі кажуць...

Тодар. Дурань ты, калі чужым розумам жывеш.

Улляна нешта хоча гаварыць.

Годзе! *(Маўчанка.)* Мазалём і праўдай дамагайся багацця. Не марнуй і хвіліны дарма, працай сябе загартуй, і не страшна табе будзе тады наша горкая доля. І жыццё беспатольнае мігам пройдзе.

Улляна *(складаючы посцілкі)*. Татачка, вось мне здаецца, што я блага зрабіла: трэба было паміж гэтымі абалонкамі чырвоную нітку пусціць. Праўда?

Маўчанка. Тодар працуе каля фігуры. Змяркаецца.

*(Кідае дываны.)* А прападайце вы пропадам! Без яго, міленькага, вы мне, як рызманы якія.

Тодар. Аб чым ты кажаш?

Улляна. Я, татачка, кажу, што ў нас курыца яйцо з'ела.

Маўчанка.

Тодар. Дык жа ты мне, дачушка, памагай, пастараемся, мо так-сяк і заробім, выкупімся... Бог бацька, кончу вось гэтую фігуру... але цёмна ўжо... прадам, яшчэ зраблю, выдам цябе замуж за добрага, вольнага, статэчнага хлопца... Ты ж як бы сірата, бо маці не маеш, а я заняты сваёй работай; жыццё тваё незавіднае — нудота. Ты ў мяне аднюсенькая... Найлепшая, дык і долю табе жадаю найлепшую; слухай мяне — у цябе маці няма... зацеплі лучыну, а то я нічога не бачу.

Улляна кінула глядзець у акно і моўчкі запаліла агонь.

Улляна!

Улляна. Я тут.

Тодар. Улляна!

Улляна. Чаго, татка?

Тодар. Чаму ў цябе кожны дзень вочы напухшы, заслезіўшыся, га? Чаму, пытаю... *(Маўчанка.)* Дрэнна. Ды ўйміся, Улляна. Напрасна губіш красу сваю, марнуеш леты маладыя: дарма жджэш, бо хоць бы й дождалася, то твой не будзе.

Улляна галосіць.

Абач, Улляна, ці ты любіш свайго бацьку?

Улляна лашчыцца.

Дачушка, сорам плакаць, а нават і грэх, бо гэтыя слязінкі так мучаць, так неміласэрна катуюць твайго бацьку. Дачушка, выбірай сабе, якога хочаш, які спанараўны; ці ж мала ў нас людзей бывае й ці ж можа хто зраўняцца з тваёй красой? *(Строга.)* Але таго аснача паднявольнага, узвей-ветра, забудзься... Ой, не, не, не, ён твой не будзе, ён падданы; чуе маё сэрца, што ён — пагібель твая.

Улляна. Татачка!

Тодар. Ён тваім не будзе.

Уляна. Родненькі!

Тодар. Прысягну на ўсё святое, што...

Уляна *(перапыняе)*. І я прысягну, што буду ждаць, а дажду — мой будзе.

Тодар. Ох, як ты мяне мучыш, як ты не разумееш маёй добрай волі. Я ўвесь век набіваў мазолі, каб здабыць сабе волю, смяяцца забыўся, думкі аб волі спаць не давалі, сушылі мяне. Я цябе гадаваў, як шчасце, надзею сваю, гінуў за табой. Ну, разважаў, з ёй даб'юся волі, яна мае збаўленне... А ты якраз наадварот: цягнеш у балота, жывўцом закопваеш у зямлю. Падданы ён,— ці чуеш ты, атрута мая? Сабака ён панскі. Божухна моцны! Няўжо ў цябе няма капелькі розуму, жаласці да свайго бацькі? *(Маўчанка.)* Ці чуеш, ты, пагібель мая? Чаго маўчыш? Я заб'ю цябе як шкоднае стварэнне, як быдла ашалелае! Ох, дзе ж бы мне раздабыць сілачкі, каб змагчы сваё гора? Такое насланнё, такое гора! Абач, дзяўчына, кінь гэтага валацугу; звалоча ён цябе ў такую дрыгаўку, што чым больш будзеш ходацца, тым глыбей апускацца... кінь яго.

Уляна. Татачка, родненькі... ніколі!

Тодар *(злосна кідае долата)*. Пракляну! *(Выходзіць.)*

### З'ява III

Уляна. Як будзе, чым кончыцца,— нічога не цямлю, толькі вось у сярэдзіне коле, а так жа баліць, моцненька баліць. Ці ж я таму вінавата, што я люблю Пiліпа? *(Кусае рог хусткі.)* Тата благі, тата не спрыяе. Як звер той, гыркае на мяне; ён мяне без пары даканчыць. Слоўца ласкавага не чула. І што ён яму дрэннага зрабіў? Вось, здаецца, у палоніку бы яго ўтапіў, такі ўжо нягодны; не люблю яго, не люблю нікога, апрача майго Піліпа; усе мне ворагі... й Бога не люблю, вось аж на злосць не люблю, не люблю!.. Ой, Божа, што я гэта кажу, што я, блудніца, кажу? Такі грэх, як мне язык павярнуўся? Тата

добры, усе добрыя, толькі я звар'яцеўшая, страшная, злосная: твар кастлявы, нос кручком, валасы, як мох, а кіпцюры даўгія-даўгія, савіныя. Я — ведзьма, чортава нявестка, вочы ў мяне бліскучыя, воўчыя... Ой, як жудасна, жах: за плячыма чухаецца. Але глупства, жах — няма нічога крапчэйшага за маё гора... Ой, тата, тата, наробіць ён ліха! Але я не дамся, не паслухаю, не магу!..

### З'ява IV

Уваходзіць Пі л і п.

Улляна. Хто гэта? А што трэба?
Пі л і п. Улляна!
Улляна. Піліп!

Абнімаюцца.

Пі л і п. Урэшце ж я цябе маю, усю, што да каліўца маю. Мае рукі — сетка дратаваная! У сетцы златапёрая рыбка, Улляна, ягадка наліўная! Эх, расцісну я цябе, з'ем, як яблык чырванабокі, зап'ю мядком, асалодай з тваіх вусначак чырвоных, як сачыстая каліна! Ну, хваліся, што чутно, бай, як гадуешся, уцеха мая?

Улляна. Ох, захліпаюся... не магу гаварыць ад шчасця. Ось быццам узбегла на высокую гару...

Пі л і п. О, чуццё маеш добрае, ведаеш бо, што на той гары ёсць буслава гняздо, а ў гняздзечку тым бітком набіта галапупых піскуноў; і крычаць, і гвалтуюць яны: мама, дай цыцы, ха-ха-ха!..

Улляна. Ой, Піліп, як мне добра, як мне добра, як я шчасна!.. Каб толькі так даўжэй... бо тут вечна тужыш, ведама, якое тут жыццё. Адны труды, адно гора; гібееш, дый годзе.

Пі л і п. Што ж гэта ты так жальбуеш, красачка мая?

Улляна. Ды бацька ўсё.

Пі л і п. Скрыпіць, кажаш?

Улляна. Перш не любіў цябе, а цяпер чым далей, тым горш. Галышом, дурнем бэсце.

Піліп. Дурнем? То й добра, за дурнем жа Бог.

Улляна. Лепш асцярожна, як воража.

Піліп. Ды нечага там, мы й самі з вусамі.

Улляна. Ой, не кажы гоп, не пераскочыўшы!

Піліп. Глупства! Няма благой дарогі да маёй нябогі.

Улляна. Ой, ты, узвей-вецер!

Піліп. Узвей-вецер панясе хмарку пухавую на пшанічку залатую, а пшанічка... *(Прыслухоўваецца.)*

Улляна. Што ты слухаеш?

Піліп. Ці мне, можа, здаецца?.. Чуеш?! Дадушы, выюць сабакі. Мяне трывога, жудасць ахоплівае... Калі сабакі выюць, то, кажуць, бяда тады будзе... Віхор журбуе... Трэба больш агонь зрабіць... Нехта страпае па шыбах, ты бачыш? Ты чуеш?

Улляна. Ды гэта куст язьміну расце пад акном, вецер яго калыша, дык ён і страпае.

Піліп. Улляна, прагані ты гэтых сабак — і гэтай некуды бяды дзяваць. Прагані, але ж хутчэй толькі!

Улляна ідзе.

Пастой! Не йдзі! Дзе твой бацька? Хто тут у вас яшчэ ёсць: чуеш, як па столі нехта ходзіць?..

Улляна. Ды што табе ўсё здаецца?

Піліп. Улляна, я баюся!

Улляна. Ты баішся, ха-ха... Чаго?.. каго?

Піліп. Не жартуй, красуля, корнік не баіцца навальніцы, жартуе з хваробы, калецтва, панскага гарапніка, смерцяй пагарджае, але ён журбуе, калі душа бродзе па смерці чалавека, гнецца перад ведзьмай, дрыжыць прад закляццем.

Улляна. Я бачу, што цябе нейкае ліха зняволіла, я баюся цябе... Ой, Божа, што з ім стала: ён як з таго свету прыйшоў!..

Пілiп *(пачуўшы вялікую боль)*. Што я зрабіў, што я зрабіў!.. Дна ў пекле мне не будзе, груган косці разнясе, трава выгарыць каля магіліцаў маіх. Што я зрабіў? Эх, толькі трэскі пасыпаліся; яна ненарокам

разбілася, лайба аб каменні разбілася. Бачыш, змяркала ўжо, а каменняў жа тут так шмат натыркана... прапала дабро, я чуць выжыў, а ён...

Улляна. Хто ён, гаспадар? Чаму ж ён не заходзіць? Што з ім стала, дзе твой пан?

Піліп. Не пытай ты мяне, чараўніца, ты губіш мяне, п'еш маю кроў; зачаравала, пракляла ты мяне. Твая краса ад нячыстай моцы, ты чорту прадалася... Я праз цябе загінуў на векі вечныя. Бяры мяне, п'яўка, я — увесь твой, грызі, муч мяне...

Улляна з жахам адсоўваецца.

*(Плача.)* Ой, цяжка, ой, балюча мне на душы! Кожную хвіліну сэрца крывёй абліваецца, свет пеклам здаецца, а боль выядае, грызе нутро так балюча, што не стрываеш, каб не крыкнуць, каб не заслязіцца...

Улляна туліцца к Піліпу.

Улляна, я няшчасны, шалёны, Богам пакрыўджаны, людзьмі збэшчаны. Прыгалуб, уцеш мяне... даруй, жучок залаты. Мо я сказаў што благога, крыўднага? Я не хацеў, я не памятую... не адыходзь толькі, мне так добра, шчасна з табой. Яшчэ шчыльней прыгарніся. Ты, здаецца, пытала, дзе гаспадар мой? Ён, бач, паехаў... Не, я адзін прыехаў. Я проста-такі кінуў яго: не ў магу мне стала жыццё маё без цябе. Але, кінуў і прыехаў.

Улляна. Ды нічагусенькі, супакойся. Ліха, як дым: закурыцца, пагрызе вочы й няма — ну, ці ж не праўда? *(Прыпявае.)*

Што там ліха,
Што там гора?
Сёння сонца —
Дождж учора.

Піліп

На аўсянні снапкі —
Узляцелі галубкі;
Любіліся, варкавалі.
Ахмялелі — перасталі.

Уляна

Калі любіш, дык любі,
Не кажы нікому;
А то людзі разнясуць,
Як віхор салому.

Пілiп. Уляна, як я цябе моцна кахаю й баюся гэтага кахання, бо цераз меру твой бацька пануры. Процiў яго волі не пойдзеш.

### З'ява V

Уваходзіць Тодар.

Пілiп. Добры вечар!

Якісь час моўчкі глядзяць адзін на аднаго.

Тодар. Згінь ты, прападзі, як з віру вырваўся! *(Да Піліпа.)* Ну, што скажаш, валацуга? Дачку прыйшоў украсці, што?

Пілiп. Дзядуля, ты — стары чалавек, сорамна, думай лепш, што кажаш, а не то...

Тодар *(падыходзіць да Піліпа)*. Ну, ну, што далей?..

Уляна баіцца сваркі.

Пілiп. Каруся перад табой, дзядулька мудры, бо куды ж мне? Пятух і вунь як храбёр, а й то ястраба баіцца. Бі, забі мяне, калі вінаваты, але за што ты мяне з гразёй мяшаеш? Ну, за што? Ці ж табе мала, што я люблю Уляну, я яна мяне? Ты з пагардай смяешся, у цябе сэрца з каменя.

Тодар. Думай лепш аб сабе й, пакуль трымаешся на нагах, не забывайся, дзе дзверы.

Пілiп. Эх, дзядулька даражэнькі! Глянь жа на мяне, чым я табе не памочнік, чым я не раўня тваёй дачцэ? Ці ж гэта не я кірую непаваротлівую лайбу па наравістай Веллі аж вунь куды — у мора; ці ж не я вырываў маладыя дубкі! А як гукну песню, дык абодва берагі на колькі-то вёрст разлягаюцца. Дай мне дачку сваю Уляну, а ў нагах тваіх, як сабака,

буду качацца, твае думкі ўгадваць буду, нявольнікам стану. Мудры дзядулька, пашкадуй нас, бо й ты ж быў малады. Уляна — твая дачка, а ў цябе сэрца бацькоўскае... А калі ты, хавай Божа, ты замахнешся на маю душу, то й славу сваю заб'еш. Усе фігуры, зробленыя табой, праклянуць цябе, людзі адвернуцца, Бог прыгразіць.

Уляна. Ох, бедачка над бядой — знаць прыказ такі ёсць з неба, каб памерці мне дзяўчынай.

Тодар. Уляна, ты б дала яму есці. *(Да Піліпа.)* З дарогі, пэўна?

Піліп. Я... але... толькі што, бачыце, прыехаў...

Тодар. Ну, то з'есці трэба.

Піліп. Ды дзякуй, не галодны, бяда, бачыце, не ў ядзе.

Тодар. Дзякуй таму, хто навучыў падарожнага ўтасціць.

Уляна. Садзіся, Піліп. Хутчэй, а то застыгне.

Тодар садзіцца да працы, Піліп — за стол.

Піліп. Ну, аснач чарнавокі, уляж, стаўбуй, закідай кардэль... Хі-і, што бачу, бульбяныя аладкі плаваюць у сале. Вось гэта дык уважаю. Нос аж чхае, а вочы дык хітрэй мераюць, ці глыбокая міска. Памагай, Уляна: гэта самае лепшае лякарства ад усіх хваробаў: глынуў, значыць, дзве-тры аладкі — й ніякага гора няма, свет раем здаецца, й паплыў у заморскія царствы, у крышталавыя палацы. Вось гэта дык я ўважаю, з ахвотай пазабаўлюся.

Тодар *(з іроніяй)*. Ану, памочнік, цікава, як бы ты зрабіў вуха вось гэтаму святому?

Піліп. А вось як: паказалі б, дык як вокам маргнуць, змайстраваў бы.

Тодар. А ці ў цябе, блазне, малако каля губ абсохла?

Піліп *(устае)*. Давайце, дадушы, зраблю.

Тодар. Джа! Ані важся: зашмат у цябе адвагі.

Маўчанка.

Уляна. Татачка, я й табе дам есці! Тата!

Маўчанка. Ульяна падыходзіць і лашчыцца каля бацькі.

Я дам майму татку чаго-небудзь есці... Добра? А то сягоння ад раніцы бадай ці еў што, усё з гэтай фігурай.

Т о д а р. Адчапіся, не хачу, не буду есці. Кончыць трэба, хутка кончыць... Ну, йдзі: работу мне перапыняеш; сказаў, што не буду есці.

У л л я н а. А я плакаць буду.

Т о д а р. Бачу, бачу, што ты здатна толькі плакаць і за слязьмі дурноты сваёй не бачыш.

У л л я н а. Ці я таму вінавата, што яны самі коцяцца? Мусіць, так трэба.

Т о д а р. Чакай, дачушка, паняньчыць цябе жыццё, загартуе гора пякучае, выплачаш усе слёзы, тады ясней адаб'ецца ўсё ў вачох тваіх.

П і л і п. І захочацца аладак.

Т о д а р. Ось, брыда, неданосак, толькі й знае аладкі.

П і л і п. Абжора, піхцель, боўдзіла, цяляпайла ці як там яшчэ, мне ўсё роўна, але ўсё-такі гэта праўда, што калі пад'ясі, то сэрца тоўхае весялей і думкі петушацца. Ого, жывот — самы важны пан; што ён аблюбуе, таму ўжо смерць і капут... Яму й цар, і мудрэц нават пакорны, а спрабуй яму не ўгадзіць, не паслухаць, то так зробіць, што й бязногі пабяжыць, і без'языкі закрычыць, залямантуе. Добра з'есці — вось найлепшая падзяка за ўсе труды.

Т о д а р. Добра й гэта, але яшчэ лепш, калі чалавек хоча быць чалавекам, калі кожную хвіліну можа выкарыстаць на вялікую карысную працу, калі ён вольны, як тая птушка ў паднябессі. Ці ты аб гэтым чуў, абжора?

П і л і п. Э, дзядуля, спудлаваў: якая ж там воля, калі вольнага часу няма, калі трэба працаваць.

У л л я н а. А ты не дзівуй — конь на чатырох нагах, а й то спатыкаецца.

П і л і п. Воля й гэтай аладкі не варта. Вольны толькі разбойнік ды сірата. А нашаму брату воля дык роўна яго смерці — цяпер што ўбіў, то ўехаў, а пасля дык...

Тодар. Улляна, адыдзі ад яго!

Пілір. Вось і воля, а сваю дачку няволіце. Ну, але дзякуй, насілкаваўся ўжо, сыт па горла.

Тодар. Ну, то бяры шапку й вон з маёй хаты. Чуеш, брыда? Няма мне часу з табой даўжэй тут балоціцца. Вон!

Улляна. Татачка! Што ж гэта, тата, робіш? Апамятайся, татачка!

Пілір. Але ж за што... ці пры сваім ты розуме, дзядуля?

Тодар. Ха-ха-ха! Што гэта ты думаў тут векаваць, каб атраўляць маё жыццё, каб ганьбіць маю дачку? Накарміў цябе, як падарожнага... А цяпер — вон!

Улляна. Татачка, родненькі!

Тодар. Выносся швыдчэй!

Пілір. Ну, дзякуй жа за гасціны: госць па абедзе дамоў едзе. Дзіўны чалавек. Ну, Улляна, збірайся, вольны мы цяпер. Ха-ха-ха!

Тодар. Хоць на ўсе чатыры стараны.

Пілір. Толькі ж ты нас і бачыш.

Выходзіць з Уллянай.

### З'ява VI

Тодар *(адзін)*. Улляна... і яна з ім... ох, мукі, мукі!.. *(Разбівае акно і дзіка крычыць.)* Стой! Вярніцеся!

### З'ява VII

Улляна і Пілір уваходзяць.

Тодар *(дрыжачым прыбітым голасам)*. Юнача, юнача, сцеражыся мяне, старога; а ты, дачка, рабі, што хочаш: твайго бацькі ўжо няма. Бог сведкай, што ты загубіла жыццё, лятункі мае...

Заслона

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Ноч. Месячна. Бераг вельмі ўкрыты хмызняком, паміж якімі тут-вуньдзе буграцца валатоўкі. Вецер галосіць, як бабы на хаўтурах, а схапіўшы туман надбалотны, акручвае ім луну. Чутно выццё сабак, кугаканне соў. Лётаюць начніцы, кажаны. Пануе жах, таемны, незразумелы, жах — страшэнная нячыстая моц. Ён вылез з вільготнага падзямелля й дрыжачы, з вострымі кіпцюрамі, выказелеўшы вочы, туліцца пад чорнае крыло сваёй маці, чорна-сіняй ночкі. Натапырыўшы дыбам шарсцінае пер'е, жах бліскае з цемнаты бельмамі й чакае, сцеражэ, каго перапалохаць, каму ўпіцца ў плечы, чакае нагатове, каб умомант сухастоіну перакінуць у кастлявы ўпыр, а куст, корч — у ваўкалаку, каб дзіка кугакнуць, таемна зашумацець у гушчары, у нетры, каб збіць з пуцявіны якога адважніка й загнаць, запрапасціць яго бясследна ў дрыгаўку бяздонную. Джжа! Во недзе нехта галосіць жаласна, жудасна. Якаясь моц перакідае тулягі хмар з аднаго боку на другі й мучыць, і змушае зоркі моргаць, моргаць. Бачна! Перасоўваюцца густыя, таёмныя цені, разрастаюцца, нікнуць; ой, ізноў налляй наплываюць, скачуць, крыўляюцца, а там на могліцах калышуцца мутна-бледныя паставы; невыразныя, яны блудзяць сонныя, без мэты, між крыжоў і магіл. Ведзьма з закляццем на вуснах, з пачкай зёлак выйшла ў помач жаху. Чорт хавае, лашчыць русалак. Цёмны бор стогне, сапе: ён здаўся, змогся. Ой, жах апанаваў яго, жах апанаваў усіх; усё й цёмна-сіняя ночка — не маці яго, а нявольніца пакорная, а зорка, луна й зямелька — цацкі, уцеха яго.

Багуе ўсёмагутны жах!

Цыц! Чуваць шагі. Ой, якая ж гэта нерастаропная галава блудзіць у такі благі час, у такое безгалоўе! Ці мо бяда-бедачка выгнала на пагібель пэўную жывога чалавека? Божухна, а мо гэта ўпыр ідзе?.. Што бачу? То ж Улляна, цікаючыся, вядзе Ціліпа к валатоўцы.

### З'ява I

Улляна. Ну, не ўпірайся, як баран, хадзі-хадзі — тутака гэта валатоўка.

Ціліп. Цемра, нічагусенькі не бачу.

Улляна. Зараз, саколік, месяц выгляне.

Ціліп. Ат, без жаласці ты, бы гадаўка тая, цягнеш у гэтакае безгалоўе, як бы я табе збрыд, як бы жыццё не міла.

Улляна. Бо й не міла, сам ведаеш, што пакуль не раздабудзеш грошы...

Пiлiп. Ды пярун іх спалі, гэтыя грошы!

Уляна. Ціха, не крычы, не будзе ліха. Калі не хочаш, то й прасіць не буду. Сам жа прасіў, каб паказаць, дзе цвітуць грошы.

Пiлiп. Лепш пад мост з нажом пайшоў бы, чымся тут заводзіць кантахты з нячысцікамі.

Уляна. Але ты не забывайся, што бацька можа кожную хвіліну ліха нарабіць... «Сцеражыся мяне, старога!» — сказаў ён, і зробіць нешта, дадушы, так зробіць, што пасля й не паправіш. Ужо я яго добра знаю: не збоча, каб там Бог ведае што!

Пiлiп. Не баюся я яго — мяне і ў ступе таўкачом не пападзеш.

Уляна. Ну, то нечага валэндацца — я йду дахаты.

Пiлiп. Пэўна што так!

Уляна адыходзіць.

Пачакай лепш хвіліну. Ось я павешуся. Чуеш?! Нацешышся, налюбішся, як я буду нагамі адбівацца, а тады сабе пойдзеш, куды вочы панясуць.

Уляна *(вярнулася)*. Ну, вешайся хутчэй.

Пiлiп *(прывязвае пояс да сука)*. Хто спяшыць, той людзей смяшыць. Табе ўсё смешкі, а я, дадушы, не жартую! Усё роўна мне не жыць без грошай, бо без грошай не будзе волі, а без волі не бачыць мне цябе — так разважае й твой бацька.

Уляна. А я заўтра буду аладкі пячы. Піліп, ці ты любіш верашчаку з свінымі скабкамі, а пасля зрабіць з аладкі карытца, чарпануць і ў губу, або яешню з вяндлінкай, пахне і вунь як смачна; або сыр сушаны ды ў масле патушыць...

Піліп адвязвае пояс.

Ну што, раздумаўся?

Пiлiп. Дурань я вешацца, калі столькі дабра на свеце. Буду жыць, пакуль ёсць верашчака й яе паддання.

Уляна. Ну, але, Піліпка, жарт набок.

Пiлiп. Ты думаеш, я жартую? Дадушы, Уляна, не. Я й сапраўды хацеў павесіцца. Ніяк не ўцямлю,

што кругом мяне робіцца, стаў непрытомны, без чуцця, як дрэва тое. Вось, бачыш, кусаю руку, й яна мне зусім не баліць — усярэдзіне толькі нейк ные, калоціцца, як перад вялікай бядой.

Улляна. А ты сапраўды ўкусіў — кроў ідзе... Кінь, Піліпка, час за работу. Відней ужо стала, месяц бліснуў. У гэтым вось месцы капаць трэба. *(Гладзіць Піліпа, які ўвесь час стаіць пануры.)* Ты, саколік мой, не бойся ніякага, нічога табе не здарыцца, аб нічым не думай, нікуды не глядзі, а капай сабе ды капай.

Піліп *(злосна)*. Ага, капай сабе ды капай.

Улляна. А ўжо, як грошы здабудзеш... Эх, грошы аж мітусяць, як жар, гараць, як збожжа, чырвонцы адзін у адзін, ажно вочы разбягаюцца, набярэш цэлы прыпол, поўны мех.

Піліп. Ой, праклятая сава, чаго яна кугакае?

Улляна. Ну згадай, яна добра варожыць?

Піліп. Ды не ведаю я.

Улляна. Яна кажа, што мы грошы дастанем, пажэнімся, а пасля: «Куга-куга, люлі-люлі, дзетка спаць, а я буду аддыхаць».

Піліп *(абнімае Улляну, яна вырываецца, ён гоніцца за ёй, але, дабегшы да Веллі, астанаўліваецца і з вялікім страхам кажа шопатам)*. Улляна! Улляна! Глянь жа! Чуеш?..

Улляна. Чаго? Што ты бачыш?

Піліп. Хадзі, хадзі... чый гэта лоб тырчыць у вадзе?

Улляна. Дзе?

Піліп. Вунь, вуньдзека, а што! Улляна, золатца маё, лоб, праўда?

Улляна. Ды што ты пляцеш, дзе ён бачыць гэны лоб? Гэна ж камень, дурны ты! *(Сплёўвае тры разы.)* Божухна мой, ото ж напалохаў мяне, памяло гэтае. *(Піргае Піліпа.)* Аж у пяткі кальнула, думала, скрозь зямлю праваліося.

Піліп. Дык ты кажаш, камень... Праўда, камень. А мне здалося, што мой гаспадар вытыркнуў лоб з вады.

Улляна. Калі здаецца, дык пеpажагнайся ды плюнь тры разы, а я зёлак свянцоных спалю — спосаб хвалёны, адвечны. *(Паліць.)* Ось так, бо лепш асцярожна, як варожа. А цяпер трэба чартапалох раскідаць. *(Раскідвае.)* Сюды, сюды, не зашкодзе, вось так. Ліха, як рукой здыме, нечысць ніяк ужо не прыступіцца.

Піліп *(у той час, калі Улляна паліць і раскідвае зёлкі, глядзіць задумліва на Веллю).* Красуе Велля, ого, вунь як красуе. Камень той трэба з левага боку аб'ехаць, і каб не зачапіў, то трэба сказаць прыхільнае слова, ну хоць бы: «Здароў, ягомасць»,— ці кінуць у ваду што ласага... Там пойдзе высокі, круты бераг... Дзікая яблыня на ўзгорку, далей векапомны дуб, на ім буслава гняздо. Эх, Велля чароўная, ты хістала маю калыску-лайбу важкую, хвалі твае пелі калыханку, баялі казкі!

Чуваць гром, раз, другі.

Эх, уцеха ты мая, красуеш, уешся, як каса русалкі, й, павабная, вабіш к сабе, вабіш!.. Сягоння ты поўная жаху, якраз як у тую памятную ночку.

Улляна. Піліпка, ці ты чуеш?

Піліп. Парнасць, духата, хоць ты душыся...

Улляна. Гром... Божухна, бура будзе!..

Піліп. Неба гатавалася, зямля дрыжэла, стагнала, маланкі не гаслі, а пры іх свеце ясна бачыў цэлую табалу русалак, рака запенілася, якіясь зялёныя, саплятыя галовы выторкваліся то тут, то там, чмыхалі, страсалі ваду і зноў хаваліся, а я, проставаласы, гнаўся сярод гэтага запусцення, безгалоўя, сціснуўшы ў жмені руль і пеў да хрыпаты. *(Пяе.)*

Улляна ў час песні то памагае спяваць, то хоча перабіць Піліпа, з жахам аглядваецца і туліцца к яму.

Гэй, гэй, Вулляна, дзяўчына краса;
Вочкі, як зоркі, а як шоўк, каса;
Каб не твой Сцяпанка ды не тваё гора,
Не плыла б ракой ты да сіняга мора.

Ой, бо твае слёзы, як пэрлы, ліюцца
І сіняй іступжкай праз ўвесь край нясуцца.
Гэй, гэй, Вулляна...

Расістая траўка, лес, сонца і хмары
Ткуць узор па йстужцы, ліюць красу, чары.
Па рацэ у лайбе, гой, у край далёкі
Едзе, пяе песню аснач чарнавокі.
Гэй, гэй, Вулляна...

Ой, трудненька, трудна, моцненька гарую,
Бо заставіў дома сваю дарагую.
Пацерак і шоўку прывязу з чужбіны
Для сваёй міленькай, для вішні-дзяўчыны.

Улляна. Піліп, Піліп! ці чуеш ты? Ачніся! Што з табой?

Піліп. Га? Што табе трэба? А дзе гэта мы? *(Аглядаецца.)* Ага, дык мы яшчэ тут. Ну скажы, чаго ты да мяне прыстала, чаго хочаш ад мяне? Вешаешся, ліпнеш, як хмель той; раз сказаў, што капаць не буду, й не буду! Проста дыхнуць не дасць. Думаеш, для красы тваёй стану галаву тут класці ў такое безгалоўе? Падумаеш, уцеха вялікая! Бачыў я, ягадка, не такіх. Вунь як паедзеш у Коўна, дык там літоўкі — проста пальчыкі аблізаць. Красулі! Як накруцішся паміж іх, дык лістам сцелюць, а я й глядзець сабе на іх не хачу, йду, значыць, арлом, шапку на патыліцу ды набок грыбок, баравік едзе! А яна тут сунецца, касалапая, вусы свае перш абсмалі. Ну чаму ж ты маўчыш? А ведаеш, чаму я не хацеў глядзець на літовак гэных? Бо ім да цябе, як бэрліцы да пірага, бо такой няма й не будзе, як ты, стрынатачка мая. *(Абнімае Уллянy.)*

Улляна. Сцеражыся мяне, старога.

Піліп. Ды пакінь ты! Яно ў мяне і так ужо ў вушах якоча безупынна... Эх, раз паміраць... *(Скідае шапку, плюе ў далоні, бярэ рыдлёўку і грозна страсае ёй.)* Ну, хай якая мара паткнецца, так агрэю, што сваіх не пазнае, па вушы ў зямлю ўганю! *(Рупна капае.)*

Улляна. Пачакай, саколік, дай я табе руку завяжу, глянь, як кроў ідзе. Дурны — кусаць аж да крыві.

Пiлiп. Адчапіся, кажу! Ты ж мяне ўсё баязнём бэсціш, на табе — ці бачыш? Такога адважніка, як я, днём з агнём не знойдзеш.

Улляна. Пэўна, чаго ж там баяцца — й зёлкі спалены, й чартапалох раскіданы.

Пiлiп *(капаючы)*. Сама рыдлёўка ходзіць, уміг раскапаю; вось як, вось як, вось ці бачыш, як расчышчаю дарогу к багаццю? Тупая, шэльма, рыдлёўка... Але калі што выкапаю, то ты панясеш, Улляна?

Улляна. А я, бачыш, каб усё было добра, хачу перш пайсці па свянцоныя зёлкі, бо як будзеш несці дамоў скарб, дык тады найгорш чартаўшчына донімае.

Пiлiп. Ну, йдзі, йдзі сабе ды чакай там дома мяне з аладкамі.

Улляна выходзіць.

## З'ява II

Пiлiп. Божа, як галосіць віхор.

Грукаціць гром...

Улляна! Улляна! Нашто я яе пусціў... ведама бо, што з бабай смялей, бо кажуць, дзе чорт не зможа, там бабу пашле. Ды ўрэшце што за безгалоўе, я-то зломак які, ці што? Ух, замарыўся! Як тут жудка ўсё-такі... Трэба лепш капаць, бо як пры бясчыннасці — жах так і ўпінаецца... Каб хутчэй хоць світанне. Ціха... плёскае нешта на рэчцы. *(Задумваецца.)* Божа, Божа, што я зрабіў?.. Эх, гахнула, толькі шчэпкі пасыпаліся, а яго, пузача, бруха на дно, як камень, пацягнула. *(Капае.)* Раз-два, раз-два... й зёлкі спалены, й чартапалох раскіданы, чарцям прыступу няма. Вось жа на злосць не баюся, га-га-га!.. *(Смяецца з прымусам.)* Яшчэ, яшчэ... Ой, нешта цвёрдае, нешта ёсць, вось як стукаціць гаршчок ці скрынка, ёсць, ёсць... *(Адкідае рыдлёўку і дастае рукамі.)* Не такі чорт страшны, як яго малююць... Ну вылазь, чаго там упіраешся, годзе прэць у зямлі, годзе людзям

наругацца... Чаму ж гэта такі лёгкі, ці мне здаецца... быццам пусты. *(Выносіць на святло — адкідае.)* Божа мой! чэрап людскі, а я так узрадаваўся, думаў — і канец бядзе. А мо мне здалося?.. *(Прыглядаецца.)* Чэрап! Згінь ты, прападзі! Трэба закапаць, а то не дасць супакою гідась гэтакая: будзе па начах трывожыць, пужаць у дарозе.

### З'ява III

Піліп хоча закапаць чэрап, але з-за валатоўкі высоўваецца гаспадар, жудасны, з сінім распухлым тварам і рукамі, мокры, аброслы мохам, жабурыннем, п'яўкі і ракі паўпіваліся шышкамі. Стаіць у імглістым водбліску.

Піліп. У імя Войца й Сына... *(Уцякае, але спатыкаецца, валіцца і ляжыць, як мёртвы. Маўчанка. Памаленьку ўстае, аглядаецца.)*

### З'ява IV

Піліп. Няма... Ох, Божухна мой, няўжо мне здалося? Ці мо крыж памог!.. *(Ідзе ціхенька, аглядае тое месца, дзе быў гаспадар.)* Дадушы, няма, здалося. Трэба ж было спаткнуцца. Ну, думаю, усё ўжо прапала: душы мяне, нечысць, бяры, муч! Ажно нічога не сталася, напэўна, здалося.

Стукнуў пярун, Піліп жмецца пад дрэва.

Мусіць, я прапаў, мусіць, тут мая смерць... Што ж мне рабіць?.. Ні шчасця, ні грошай, а бяду я сабе тут выкапаў. Ой, страшна, вось хоць скрозь зямлю праваліся... Каб так стацца маленькай кузуркай, забіўся б у шчыліну ці дзе-небудзь пад кару, пад лісток, прытаіўся б, знік... Страшна мне, страшна!.. Уцячы — адзін ратунак, уцячы як найхутчэй. *(Сядзіць нерухомы з перапуду, чуць гаворыць.)* Не, не магу, я не смею, я ўжо зачараваны, прапаў, страшна зварухнуцца, за плячамі цэлае пекла... Не магу я... Ой, ратунку! Уляна! Людзі! *(Маўчанка.)* Ага, гад, расамаха, і добра

табе, каб паслухаў,— жыў бы дагэтуль і гора не меў бы; кажу: «Гаспадар, затрымаемся ў Тодара — цёмна ўжо, можа лайба разбіцца аб каменні, а іх жа тут натыркана, як грыбоў». Дык не, праклятьі, і слухаць не хацеў, ды яшчэ гахнуў мяне па шчацэ... Ульяна, Уляна, я хацеў цябе пабачыць, і ніякая сіла не змагла б мяне стрымаць... Ну, але скарб як дабудзем, то... які скарб? калі? *(Сіліцца ўспомніць.)* Але, значыць, я цяпер у Тодара... Кінуў свайго пана. Ат! Якога ліха вінават. *(Дражніць.)* «Трымаць руль». Ого, разумнік, а вось паспрабаваў бы сам. Уляна! Уляна!.. Чаму вінават?.. Бо пэўна я ж яго мог выратаваць, ён маліў аб помачы, гразіў, захліпаўся... Чаму не ратаваў? Ах, я яго ўтапіў, пусціў лайбу сумысле, са злосці, я яго ўтапіў!.. Трах! Толькі трэскі пасыпаліся; замучыў, загубіў я яго, каб развязаць сабе рукі, каб пабачыць Уляну, утапіў я яго. *(Хватае рупна рыдлёўку.)* Што я хацеў рабіць, што мне трэба — ніяк думак не магу сабраць, нехта ўсё бяжыць, топае, хіхікае дакола, кружыцца й мітусіць. *(Кідае рыдлёўку.)* Не! Я не вінават, Бог сведка, што я не хацеў яго ўтапіць, о, ніколі я не адважыўся б, хай мне язык адваліцца, калі хлушу, калі я...

### З'ява V

З'яўляецца зноў гаспадар.

Пілiп. Ну вось добра, што прыйшоў. Скажы, калі ласка, ці я цябе хацеў утапіць, ці хаця прыгразіў табе? Я ж ніколі кузурачку сумысле не раздавіў, мне сэрца карабоцілася ад лопнутага мазаля, ад ранкі маленькай...

З горла гаспадара вырываецца смех, схожы з клёкатам буслоў,— кляшчы ў далоні.

Ну вось і добра, ты мне паверыў, дараваў, я ніколі не жадаў табе блага. Давай памірымся... Чорт, чорт... Я бачу, ты не тайся... ты — чорт, чорт... А бач, толькі каб ніхто не даведаўся, я табе прадам сваю душу,

толькі даруй... Стой! Каго завеш? Даруй! Ратунку!.. Я не вінават, бяры душу, бяры дарма... дзе рыддёўка. Ульяна, ратунку!.. Я жыць хачу!..

### З'ява VI

Выскакваюць русалкі з зялёнымі косамі, чорныя чэрці; усе бяруцца за рукі і дзіка крыўляюцца, круцяцца кругом Піліпа. З раскапанага ўзгорка пырснуў чырвоны агонь — вылез бог скарбаў, абліты золатам і срэбрам, вылез і спакойна курыць люльку. Ад усіх бакоў прыбываюць розныя нечысці.

Пілі п *(непрытомны, крычыць)*. А-а-а-а...

Заслона

## ДЗЕЯ ТРЭЦЯЯ

Дэкарацыя першага акта; дзень.

### З'ява I

Тодар *(шукаючы)*. Дзе долата? Няма нідзе... Долата дзе, Ульяна, чуеш, Ульяна? Эх! Нячыстая моц!.. *(Шукаючы, злосна раскідвае рэчы, б'е начынне; пасля ходзіць па хаце, раптам хапае сякеру, замахваецца на фігуру, але тут жа бяссільна выпускае сякеру; з мальбой да фігуры.)* О, даруй мне! Што я раблю? Адна ўцеха, адно, што дае моц не паддавацца, не спаткнуцца на цярністым маім шляху, гэта вы, фігуры! О, даруй мне, грэшнаму, даруй мне зухваласці — вось гэтым тапаром засяку лепш свайго ворага, крыўдзіцеля. Ён прычынай, што не магу спакойна працаваць, не магу даць гэтым кускам дрэва вобліку людскага, даць жыццё. Адабраў ён у мяне дачку, найдаражэйшае ў маім жыцці, узяў маё сонца, й я цяпер, як тая травіца ў цёмным склепе, гібею, чахну... І дзе яны падзеліся, з начы прапалі? Яна пад раніцу прыходзіла й зноў прапала. Мо ўцяклі?.. Дрэнна, дрэнна... камень з

ракой сварыцца, дрэўца з ветрам ходаецца, а яна запрагаецца ў ярмо, лезе ў балота. Дрэнна, дрэнна... *(Задумваецца.)*

### З'ява II

Уваходзяць багаты асначі яго корнік.

Аснач. Ну, Тодар, як здароўе? Дай выпіць, закусіць... На хвіліну заскочылі.

Садзяцца за стол. Тодар не чуе.

Што з ім стала? Што яму?

Корнік дае зразумець, што ці не звар'яцеў Тодар.

Ну, а дачка твая дзе, Тодар? Ды што ты маўчыш, як рыба? Я часу не маю... Гм... Ці ткі ты кінеш прыкідвацца. *(Крычыць і кратае Тодара.)* Ага, цю, ці не аглух ты часамі?

Тодар *(схамянуўшыся)*. Хто ты? Каго вам трэба? Ідзіце сваёй дарогай. Няма тут нікога, нікога, няма, йдзіце, йдзіце!..

### З'ява III

Тодар. Нейкія чужынцы, незнаёмыя... Ат! Толькі работу перабіваюць... Як бы прыпамінаю — калісь недзе бачыў. Але хто ж гэта выганяе людзей з хаты, вярнуць трэба. *(Хутка выходзіць, чуваць, як заве.)* Гоп, гоп! Вярніцеся, аддыхнуць можна... Я не сумысле, я кажу, вярніцеся... *(Уваходзіць.)* Уцякаюць, як ад пошасці якой. Кара божая, кара божая. Вунь і буслава гняздо пустое сёлета, варожа на ліха, бяду. Сцюдзёна неяк... На дварэ Пятроўка, жніва, а тут цябе дрыжака трасе. Пракляць! Згасла маё жыццё, хутка, неўспадзеўкі згасла; як лучыну тую, затапталі балотным лапцем, а ці засталася іскрачка? Хіба што не... Ох, ізноў пачаў жальбаваць, ізноў немач мяне апаноўвае. Дзяржыся, Тодар, не паддавайся! Не такой ты натуры, каб цябе якісь прыблуда мог сагнуць

у казіны рог і загнаць, дзе ракі зімуюць. Не, брат! Лягчэй табе з'есці бочку жалезнага бобу, чымся паканаць Тодара. Вось запяю песню, вазьмуся за работу, а там пабачым... *(Працуе каля фігуры і ціха пяе.)*

### З'ява IV

Цівун *(увайшоўшы)*. Ку-ку-рэ-ку! Я ашалеў! Ку-ку-рэ-ку! Поўнач прайшла, ха-ха!..

Тодар. Што з вамі, пане цівун?

Цівун. Перамена пагоды, будзе лагоднае надвор'е. Ку-ку-рэ-ку! Ха-ха!..

Ой, дуды, мае дуды,
Я вясёлы, туды-сюды!..

Смейся, Тодар, каб жывот твой трэснуў са смеху, скачы, каб прабіў столь, ямы павыбівау у падлозе. Ану рухавей, бо арапнік пушчу ў ход, ну, раз, два, тры... Ха-ха-ха... *(Абнімае Тодара.)* Тодар, золатца маё, мільён, сонца... Вялікдзень сягоння, з новым годам, ха-ха!..

Эх, уродліва на смех —
Наклаў, сабраў поўны мех,
Паднімуся, азірнуся
Ды ізноў за смех вазьмуся!

Тодар. Я ўсё-ткі не ўцямлю, аб чым гэта толк ідзе...

Цівун. Крычы, раві, як ерыхонская труба, хай у цябе тысяча языкоў вырасце: «Пан памёр!» Крычы: «Пан памёр!»

Тодар. Памёр...

Цівун. Але, памёр! Ужо не будзе мароз ляскаць на нашых тварах, плячах, не будзе гудзець віхор ад розаг; сціхне гром стогнаў, пракляцця; высахнуць рэкі са слязьмі, потам.

Тодар. Усё гэта чапялой пісана, памялом падпісана.

Цівун. Не верыш! Ну, то я табе скажу, што ты з дачкой ужо вольны.

Тодар. Як гэта? Шкода часу на такія жарты.

Цівун. У тастамэнце стаіць: «Тодару й дачцэ яго даць волю толькі тады, пакуль не зробіць ён фігуры св. Паўла...»

Тодар. Гэта імя пана.

Цівун. «...і ахвяруе ў нашу капліцу. Велічыня фігуры павінна быць у рост чалавека». Вось як стаіць у тастамэнце.

Тодар. Стаіць, як сонца на паўдні.

Цівун. Хоча, бачыш, хоць гэтым сваю паскудную душу выкупіць у чорта. Эх, Тодар, табе ўцеха, а мне яшчэ больш, ха-ха-ха!.. Проста-ткі млосна робіцца, як успомню белапуховае цела маёй пані.

Тодар працуе каля фігуры, устае, ходзіць і зноў працуе.

Не дзіва, што паны нічога не хочуць рабіць, ось ім асалоду ды красу. Хоць бы мая пані... «Абач, цівун,— кажа да мяне,— я люблю цябе, як цёмна, бо ты вельмі каравы...» ха-ха-ха!.. О, гэта не пані, а медуніца... гэта — пушаны пірог, а я не цівун, я... Хто ж я?! Не, я — шалёны. Хаджу па лясах, па полі й пытаю сябе: «Ці гэта ты?»

Эх! Уродліва на смех —
Наклаў, сабраў поўны мех,
Паднімуся, азірнуся
Ды ізноў за смех бяруся.

Прытопваючы, цівун выходзіць.

### З'ява V

Тодар *(працуючы)*. Як жа гэта?.. Вечны пакой тваёй душачцы, вечны пакой... Як жа гэта сталася?.. Ручкі мае залатыя, працуйце днём і ноччу! Галоўка любасць, уцеха мая... О светлая часіна, як гэта мне каб супакоіцца, каб працаваць і працаваць. Дзякуй табе, Божанька, наградзіў ты мяне! Але дзе ж Ульляна?.. Усцешу яе, благаслаўлю, хай жывуць памаленьку... й Піліп выкупіцца, хай сабе жывуць. Усё

добра будзе. Вось каб толькі хутчэй скончыць фігуру. Зраблю яе, як яшчэ ніводную. Усю здатнасць, ахвоту прылажу. *(Выпускае малаток і долата, трэ вочы.)* Што гэта ў вачах нешта цёмна стала. Нешта мае вочы сталі недамагаць. Эх, старасць — не радасць. *(Зноў працуе.)* Трэба кончыць, кончыць як найхутчэй...

### З'ява VI

Улляна *(уваходзіць заплаканая, раскудлачаная).* Татачка, не муч мяне, знімі праклянцце. Татачка, пашкадуй мяне. Ты, пэўна, праклянў нас, праклянў...

Тодар. Што з табой? Дзе ты была? Ты ведаеш, Улляна, мы ўжо вольныя... прыходзіў цівун...

Улляна *(не слухаючы).* Ой, Божухна мой! От ужо доля мая гарчэй асіны, палыну... Маці няма, бацька праклянў. Няма куды галоўкі прыхінуць, няма каму слёзы ўстрымаць. Матулька мая родненькая, красачка незавятая! Ці чуеш ты гора Улляны, дачушкі сваёй? Вазьмі мяне, гаротную, к сабе: лягчэй мне сырую зямельку дзяржаць, чымся такое гора валачыць. Ой, баліць, ные сэрцайка маё. Ой, лопне ж яно ад непамернай болі. *(Хватае сякеру і падае бацьку.)* Тата! Ты яго загубіў, замучыў, праклянў. На сякеру, кончы мяне, забі мяне...

Тодар *(бярэ сякеру і адкідае яе).* Кінь, шалёная. Ад цябе Бог адступіўся, я табе кажу вялікую радасць; пачуй жа ты, зразумей гэта, што мы ўжо вольныя! Скажы ты мне, што з табой сталася? На цябе страшна глядзець.

Улляна *(не слухаючы).* Ох, як жа цяжка горкая доля мая, ой, не стрываю!..

Тодар. Дочачка мая, Улляна, ахамяніся ж ты! Дзе Пліп, дзе вы бадзяліся ўсю ноч?..

Улляна. Татачка, няма Піліпа майго, няма, няма. Ратуйце мяне, звар'яцею! Няма ж яго, няма!.. Ён капаў валатоўку, грошы хацелі раздабыць, закляты скарб выкапаць; я пайшла па зёлкі свянцоныя, бура была, я заблудзіла, а прыйшла да валатоўкі, то яго

ўжо не было. Ён прапаў недзе. Піліпка, уцеха мая, прапаў; няўжо я з табой навек рассталася? Чуе маё сэрца, што бяда з ім здарылася.

Тодар *(як бы баючыся, каб хто не пачуў)*. Ціха, ціха, годзе, йдзі адгэтуль...

Улляна *(не слухаючы)*. То ж без тваіх вочак і сонейка бляднее.

Тодар *(выводзіць яе)*. Ціха, кажу, йдзі, йдзі яго шукаць, малю цябе — маўчы, йдзі, шукай яго, астаў мяне аднаго. Ты загубіла душу: Бог цябе пакарае, душагубка ты.

У дзвярах сустракаюцца з Піліпам.

### З'ява VII

Улляна. Піліпка, дзе ж ты быў? Я пайшла па зёлкі, вярталася й заблудзілася...

Піліп *(моцна абарваны, валасы раскудлачаныя, у іх мох і трава; твар, рукі, ногі параненыя, у крыві, гразі. Груба адпіхвае Улляну)*. Гаспадар ідзе, ціха.. Вунь, вунь ідзе, маўчыце... *(Зашчапляе дзверы.)* Ну, ці ўвойдзеш цяпер, гы-гы-гы?! Не! Дарма не лезь, і шчыліны пазатыкаю. Куды лезеш, стой! *(Дзіка ўзіраецца.)* Ох, вунь ужо стаіць, вунь!.. *(Цікаючыся, падыходзіць да фігуры, з гікам кідаецца на яе і, паваліўшы на зямлю, душыць за шыю.)*

Улляна *(моўчкі з жахам глядзіць на Піліпа)*. Ах, звар'яцеў! *(Сланяецца, адступае і валіцца вобземлю.)*

Тодар адпіхвае Піліпа ад фігуры, той з гікам уцякае на двор. Тодар, мармычучы, топае каля фігуры. Улляна ўстае з абамлення і, абапіраючыся аб сцяну, даходзіць да вядра, п'е ваду, праводзіць рукамі па твары, папраўляе валасы, вопратку. Маўчанка.

### З'ява VIII

Тодар *(лагодна)*. Трэба было б, Улляна, пшанічку жаці, а то, бачыш, сыпецца ўжо.

Улляна моўчкі бярэ серп са сцяны і панура выходзіць.

### З'ява IX

Тодар. Дзякуй Богу, што хоць жыў... Бог пакараў... Бедныя мае галубкі!.. I трэба ж было ім адважыцца... *(Працуючы каля фігуры.)* Розум у яго памуціўся. Памаленьку мо як прыйдзе да сябе. Я знаў аднаго дрывасека, таксама сустрэў у лесе здань і звар'яцеў, а пасля й нічагусенькі, паправіўся, ажаніўся... *(Выпускае малаток, долата, праціра бочы.)* Зноў пацямнела ў вачах, імглой зацягвае... Божухна мой, за што ты мяне крыўдзіш?.. Што ты на мяне яшчэ сашлеш?!

Заслона

## ДЗЕЯ ЧАЦВЁРТАЯ

Дэкарацыя, як у першай дзеі. Раніца. Тодар сядзіць каля фігуры. Паліцца ў печы. На ложку ляжыць купец. У хаце непарадак.

### З'ява I

Тодар *(водзячы рукамі па фігуры).* Хутка будзе скончана... Вось тут толькі трэба абгладзіць, тут паглыбіць... Піліп! Мусіць, яго тут няма... Піліп! Пілір!

Купец *(прабудзіўшыся).* Охо-хо, трэба ўставаць, а тут не хочацца, лянуюся — разаспаўся зусім... Хацеў, значыць, ехаць, як дзень, і дзеля таго не распрануўся; думаў на дзве якія гадзінкі прылегчы, а тут во які ўжо вялікі дзень, а я сам... *(Прыпявае.)*

Нацешыўся, налюбіўся
Ды нацалаваўся;
Як салоўка у садочку,
Ягад наклеваўся.

Абач, дзед, дзе Улляна?

Маўчанка. Тодар сядзіць нерухомы.

Сядзіць, як святы турэцкі. Ну, яснавяльможны пан купец, уставай жа ўрэшце, вязі свой дарагі тавар у

багатую чужыну, збывай па даходнай цане, зарабляй, набівай шчырым золатам свае скрынкі акаваныя... Але ж будзь ласкаў, устань, глянь, якая ўжо пара. *(Пазяхае.)* Ну, раз, два... *(Устае.)* Гэй, хлопцы, дзецюкі! Дзе іх нечысць пазганяла?..

Тодар. Яны спалі ў пуні на сене.

Купец *(узіраецца ў акно).* І не ў пуні, й не на сене, а вунь саколікі мае чакаюць ужо на лайбах. Добра! Люблю! *(Кідае на стол грошы.)* За начлег... Бывайце!.. *(Выходзіць.)*

### З'ява II

Тодар. Ідзі, хоць у вір галавой... *(Маўчанка.)* Дзякуй табе, неба, што ты адняло ў мяне бляск яснага дня, што не магу глядзець у пагардлівыя вочы людзей, не магу бачыць свайго сораму. У маёй хаце, дзе жылі праца, чыстата, прыкладнае жыццё, цяпер запанавалі немач, дрэнства, гідасць. Ох, калі я не бачу, то затое я чую гэты сорам, паняверку; паліць ён мяне полымем, агнём. Ось, здаецца, сяджу на высокай гары і ўсе мяне бачаць і торкаюць пальцамі й насмяхаюцца, што я завіхнуўся ў сваім жыцці, дастукаўся да пагібелі, пракляў свае надзеі. *(Энергічна.)* Не, кажу я вам і небу кажу: не! Пакуль тоўхае сэрца ў грудзёх маіх, не кажыце, што я здаўся. Калі небу трэба мукі — дам іх без меры; калі людзям трэба кроў маю — дам, колькі маю, але Тодар застанецца Тодарам, не збочыць, не здасца. І гэта я чытаю ў душы маёй, і будзьце вы сведкамі, рукі мае мазалістыя, судзіце вы ў час маёй немачы, здрады, судзіце тады смерцю галоўку маю векавую, сівенькую. Але я веру, што ўсё будзе добра, дачушка мая апамятаецца й зразумее, што жыве брыдка, не па-людску, а я тым часам скончу фігуру... Але дзе ж гэта Пілiп падзеўся? Піліп!

Маўчанка. Чуваць граннё жалейкі з пералівамі аж да канца дзеі.

Бывала, як я быў падшпаркам, на пядзю ад зямлі адросшы, дык дурэў, весяліўся, як тая белка на суках. Чаго толькі не даказваў! Прыбяжыш гэта да ракі, дзе альшэўнік рос, здзярэш кару з маладой вольхі, зробіш трубу ды тругу-тругу! Быццам гэта толькі й трэба было рабіць. Не чапай, кажа маці, не псуй дрэў, глянь, то ж у цябе, як у расамахі, твар і рукі абкрываўлены, ты п'еш кроў вольхі. Праўда, не чапаў я больш вольхі, затое колькі я папсаваў лазы, усё робячы жалейкі. І вось як гэты пастушок, зайграеш, бывала. *(Напявае.)*

Ці не дудка мая,
Ух я!
Весялушка мая,
Ух я!

### З'ява III

Пілiп *(прыносіць цэлы прыпол асенніх лісцяў)*. Вось на, на, дзядуля, хавай гэтае золата, што табе трэба; сам Бог нам прыслаў. На, кажа, занясі Тодару. А там жа ж шмат яго, шмат. Я яшчэ збегаю...

Тодар. Стой, Піліпка! Хадзі сюды, вазьмі долата, малаток, будзем канчаць, мой даражэнькі. Выручай мяне, сляпога. Вось сюды ўдар колькі разоў. Вось так! Чакай жа. Дай я абшчупаю... Добра, добра, родненькі!.. Цяпер сюды...

Пілiп. Дык гэтае золата нядобрае?

Тодар. Не, нядобрае — усялякае золата нядобрае.

Пілiп. Дык як жа гэта будзе? Нам жа канешне патрэбна.

Тодар. Ну супакойся, я табе ўжо колькі разоў казаў, што нам ніякага золата не трэба. Вось збі долатам гэты бугарок. Вось так... Ох, мой Піліпка! Я табе ўжо й не дзякую: як памру — тады, тады адпакутую двойчы, й за сябе, й за цябе. Тут удар, Піліпка...

Пілiп. Я ўчора ўсё шукаў Бога, усё хацеў яго папрасіць, каб нас болей не крыўдзіў, дык вось ён

нам даў золата, але вось, дзядуля, кажаш, што нягоднае, фальшывае.

Т о д а р. Бедненькі ты, мой саколік!

### З'ява IV

У л л я н а *(шумна ўваходзіць, раз'елася, у бруднай, заношанай вопратцы, голасна ікае і ўсё нешта жуе. Згледзеўшы грошы на стале, лічыць)*. Добра плаціць — золата ракой льецца. А, бач, дурнюк Піліп,— грыб! чуеш?! Вось капаюцца там, як куры на сметніку. Дурнюк, прынясі вады, жыва!

Т о д а р. Піліпка, кінь! Пасля... Прынясі перш вады. Я сам схадзіў бы, але...

П і л і п бярэ вядро і выходзіць.

### З'ява V

Т о д а р. Я не ведаю, як гэта ты... я-то не адважыўся б паняверыць яго дурнем.

У л л я н а. А то разумны? Мабыць, як цыцалі жыдоўскія.

Т о д а р. Я вось як аслеп, дык ён мне зусім інакшым здаецца. Мо ён і не разумны, але й не дурны. У ім якісь святы супакой, нешта не нашае, не людскае.

У л л я н а. Ат, гародзіш без толку. Абое з розуму зжылі. З вамі пажыць, дык, дадушы, можна звар'яцець. *(Стукае ў акно.)* Гэй, целяпень, асталоп, нясі хутчэй!

Т о д а р. Ох, цяжка мне, цяжка! Перамянілася й ты, Улляна. Як я цябе пачую, дык мне ўсё выдаецца, што ты ходзіш на чацвярынках і раз'елася, як кабан, а вусны ў цябе тоўстыя, блішчаць, вымазаныя, як у сале... Вось як цяжкі сон...

У л л я н а. Ха-ха-ха!.. Ну то чым жа кепска? А тата мне выдаешся, як чараўнік, вядзьмар. І ўсё мне здаецца, што вось паднімеш свае кастлявыя рукі й

праклянеш усё, й здрыганецца зямля, задрыжыць усё жывое, й страшна мне робіцца.

Тодар. Эх, Улляна! Пакрыўдзіў мяне й Піліпа Бог, але цябе яшчэ больш пакрыўдзіў; згас свет у маіх вачах, застыг розум у Піліпа, а ў цябе, Улляна, душы няма.

Улляна. Куды гэта выходзіш? Хутка снеданне будзе гатова.

Тодар. Я пайду пад крыж, падумаю, памалюся, пагукаю з Богам, бо няма мне больш з кім душы адвесці. Пры табе не магу працаваць.

Улляна. Ну, то йдзі сабе, толькі я з ядой чакаць не буду.

Тодар. Я хутка прыйду. *(Выходзіць, лапаючы наўкола рукамі. На лаве абмацаў лапаць.)* Во парадкі ў хаце — на лаве атопкі валяюцца! Такімі бабамі толькі грэблі ладзіць. Ой, Улляна, Улляна!.. *(Выходзіць.)*

### З'ява VI

Улляна. Выдумаў жа кожны дзень пад крыж хадзіць. Ох, пакараў мяне Бог у такія маладыя леты! Ох, гора маё! Поўная хата сляпых, дурных, усё за ўсіх самой рабі; каб было дваццаць рук, дык не хопіць. Вось гэты дармаед таксама нічога не робіць... Вось збрыд ён мне! Пайшоў па ваду й сеў. *(Выходзіць; чуваць яе крык.)* Нясі хутчэй ваду, насланнё ты маё! *(Штурхае Піліпа, які ўваходзіць, несучы ваду.)*

### З'ява VII

Улляна. Як куды пашлеш, дык і самой ідзі. Пойдзе, як па смерць. Ах, каб ты запрапаў, асіна дурная! Ну, ніякай жа з яго карысці — усё трэба самой рабіць. На вось наскрабай бульбы. *(Піліп скрабае.)* Во яшчэ лыжкі не прыбраны. *(Сцеле пасцель на сваім ложку.)* Эх, калі тут з вамі ні работы, ні аддухі. А гэта што? *(Разглядае пояс.)* Слуцкі пояс... У маім ложку... Забыўся, пэўна, а мо сумысле аставіў? Мо я яму

так ужо спадабалася? Эх, прыгожы пояс, золатам адбівае, а краскі на ім як жывуць. Шырокі, багаты пояс — пэўна, сумысле аставіў, бо так жа моцна цалаваў, ласкава песціўся. *(Складае пояс і кладзе ў невялічкую скрынку. Палажыўшы, вынімае адтуль другія рэчы.)* Вось гэты пярсцёнак даў той чарнамазы, брыдкі такі, але смехатун і непаседа, як жывое серабро. Я, кажа, як прадам чорту душу, дык тады з табой ажанюся, бо ты, кажа, ведзьма. А вось гэта йстужжка ад таго хмурага — больш нічога й не звяжа, як толькі *(дражніць)*... «з вады лёд — з лёду вада». Поўную лайбу тавару вёз, а мне толькі істужачку даў. Скупы, чорт. Хоць сам шэльма, ох, і прыгож! Вусы, як крыллі крумкача, вочы йскрыстыя, строгія. Ох, чаму ён не мой! Зваліўся, як з неба, й вылецеў назаўсёды няведама куды. Сумненька мне на душы, сумна, сумна... *(Кідае скрынку.)* Эх, прападай ты, такое жыццё праклятае! *(Садзіцца на калені Піліпу.)* Ну прыгалуб мяне, пацалуй, усцеш, вось так, яшчэ, яшчэ... Ха-ха-ха! Эй ты, дурнюк, чаму ў цябе вусы такія плюгавыя, трэба, каб былі як скрыдлы крумкача, а вочы такія строгія, строгія? Ну зрабі такія строгія вочы. Ха-ха-ха!.. А цяпер дай вуха. *(Цягне яго за вуха да ложка.)* Памятай жа, ачумеўшая галава, што калі я цябе не заву, дык ніколі, скажы — ніколі...

Піліп. Ніколі...

Ульяна. Добра! То каб ты, значыць, ніколі не падыходзіў да майго ложка. А то пусці свінню за стол, дык яна й ножкі на стол. Не з такімі я маю занятак. Ну йдзі хутка мне наскрабай бульбы. Або, то ж у печы пагасла! Што ж, не дзівота: дровы аж цякуць, сырыя-сырыя. Эй ты, дармаед! Кінь там сваю дурную прывычку — усё пад нос марматаць, вазьмі вунь гэна палена — фігуру, што вы ўсё длубаецеся. Цяміш? Ну дык вазьмі ды парубай яе на кавалачкі на падпал, і хутчэй толькі; трэба аладкі пячы.

Піліп *(радасна)*. Аладкі, аладкі!

Ульяна. Ага, аладкі. Ну жыва! Як я бачу, за цябе ўсё бізун робіць.

Піліп выносіць фігуру.

### З'ява VIII

Улляна. Ну добра, хай пасячэ, а то толькі старому галаву марочa. Ніякага толку, ані карысці няма. *(Пяе.)*

Спарадзіла чачотачка семера дачок;
Спарадзіўшы, ахрысціла семера малых:
І Аўгіню, і Аксіню,
І Тацюху, і Насцюху,
І Макрыну, і Грыпіну,
Сёмую Хімку...

### З'ява IX

Цівун *(уваходзіць з гарапнікам, сярдзіты)*. Ты, патаскуха, чаму не прыйшла паншчыну адбываць? Чаму, пытаю, бо саб'ю, як горкі яблык!

Улляна. Паночак, даражэнькі! Я адбыла ж пазаўчора. Няўжо вы забыліся, а Божанька моцны!

Цівун. Што! Дык ты мне і лгаць у вочы будзеш?!

Улляна. Панок даражэнькі, во сіняк яшчэ застаўся, то ж вы мяне сваёй рукой білі, падганяючы да работы. Няўжо не памятаеце?

Цівун *(б'е)*. Вось я табе дам на памяць! Заб'ю! Замучу! Скуру жыўцом здзяру!

Улляна з енкам выбягае, цівун за ёй. Чуваць крык, мальба. Улляна зноў убягае, за ёй цівун.

Улляна *(стаўшы на калені)*. Ой, не бейцеся, ой, злітуйцеся, ножкі вашы пацалую... Вазьміце гэтыя грошы, толькі злітуйцеся. Паночак даражэнькі, міленькі!..

Цівун *(узяў грошы і сеў, знямогшыся, на лаве)*. Ох, мукі, мукі!.. Знюхалася з якімсь хлыстом, а той і мяне, як сабаку, паневярае, бэсціць. Здрадніца! Ох, гэтыя бабы, чортаў рот, сабачыя аб'едкі! *(Адкідае грошы.)* На, падавіся ты імі, пякельнае стварэнне!

Не грошы, не работа твая мне патрэбна, а помсты, помсты... Пазабіваю ўсіх, пазабіваю, усіх баб пазабіваю...

Выходзіць, як ашпараны. Улляна плача.

### З'ява X

Т о д а р *(уваходзячы).* Што гэта за крык? Што тут сталася? Ты плачаш, Улляна? Чаго?

У л л я н а. Ох, каб ён біўся галавой аб сценку, як ён мяне збіў, праклятьі! Каб яго пакруціла, паламала!..

Т о д а р *(панура).* Цівун, мусіць... Зноў біў?..

У л л я н а. Каб ён лепш мяне ўжо забіў, чымся гэтак здзекавацца. Ні за што ні пра што збіў, збіў — і няма ніякага ратунку. Вось ужо жыццё, каб на яго звод!..

Т о д а р. Ціха, дачушка, супакойся. Вось кончу фігуру, тады не памкнецца якоесь дрэнства, не пасмее нават замахнуцца на цябе. Годзе запрагаць у ярмо, ездзіць на людскіх плячах, годзе, панскія сабакі! Каб толькі хутчэй кончыць... Піліп! *(Шукае фігуру.)* Дзе яна?.. Родненькія, галубочкі, дзе ж яна, гэта фігура, дзе?..

У л л я н а *(праз слёзы, нехаця).* Ды дзе? Піліп сячэ на падпалку.

Т о д а р *(як шукаў, сагнуўшыся, так і апусціўся на калені. У кожным яго слове чуецца страшны боль, і кожнае слова напамінае звягу-енк парванай струны).* О Найвышэйшы! Ты вырваў свет з маіх вачэй, каб я не бачыў сцежкі да Цябе. Ты дапусціў да ганьбы гордасць маёй душы, аздобу майго жыцця, дачушку маю адзіную. Чаму ж не даў ты ёй душы? І чаму ты даеш здзек, калецтва, гідасць, калі ў цябе просіш волі, шчасця, жыцця, свету? Крыўда, крыўда! Гэй, раскрыйце вокны, дзверы, выведзіце мяне на сонца! Хай чуюць людзі, зямелька стогн маёй душы: крыўда, крыўда! Хай чуе ўвесь свет маё страшнае праклящце, хай...

Уляна *(згледзеўшы перамену ў бацькі, сціхла плакаць, з жахам прыглядаючыся да яго, а як Тодар загаварыў аб праклаццi, перабіла).* Не кляні, ціха, тата!.. Мне страшна, не кляні. Не кажы такім галасам. Я баюся...

Тодар *(прыгарнуўшы Уляну, гладзіць па галаве. Спакойна).* Супакойся, дачушка, няма нічога страшнага... Во, чуеш, як рубае Піліп усё сабранае праз увесь мой век, сабранае мазолістай рукой, думкаміi непаседамі,— усё гэта не страшна. І што цела тваё збітае, стаптанае, й што душы ў цябе няма, й што жыцця інакшага не бывае; як гаротнае, пякучае,— усё гэта не страшна, не для гэтага мы жывём... Ціха, слухай... Ці ты чуеш, як старэе наша хата, як імчыць восень, як стогне фігура пад тапаром?.. О, я яшчэ нешта чую... чую!

Уляна. Пакінь, тата, мне страшна!

Тодар. Ціха, с-с-с!..

Чуваць, як Піліп сячэ фігуру.

Паволі апускаецца заслона.

## Драбніца жыцця

За зялёным сталом важна сядзяць валасныя суддзі. Усе яны спацеўшыя, чагосьці незадаволены і так плаксіва пазіраюць у вокны. О, бо сягоння кірмашовы дзень, добрае надвор'е, а народу — як мора, і мітусяцца, ось бы мак цвіце. Важны кірмаш,— а тут суды судзі. І суд не йдзе, а на ўзавады бяжыць. Нечага там валаводзіць. Выклікаюць «толькі хутчэй, жыва» Пятра і Грыгора. Прыйшлі.

1-ы суддзя *(да Грыгора).* Ты чаго?

Грыгор. Як чаго? Дык ён жа мяне набіў.

Пётра. А ты, значыць, вось так стаяў і слухаў, як я цябе дубасіў? Навіна!

Грыгор. Дзякаваць Богу, рукі яшчэ не адсохлі!

2-і с у д д з я. Ну, вы, гэтага,— толкам, толкам! *(Да Грыгора.)* Значыць, і ты яго біў?

Г р ы г о р. Вядома, біў, не шкадаваць жа мне гэтага гада...

У с е  с у д д з і. Дык чаго ж ты лезеш судзіцца?

П ё т р а. І то праўда — чаго лезці? Вось толькі добрым людзям час аднімае...

Г р ы г о р. «Час аднімае»?! Маўчы, калі да цябе не кажуць! Ну як жа з ім не судзіцца — ён жа так і рукамі, як языком. Яму раз, а ён два. Добра не судзіцца, калі сіняк во які!..

П ё т р а. Быццам сліўка тырчыць!

Г р ы г о р. Усе пальцамі торкаюць, праходу не даюць. Няўжо, кажуць, ты Пётру даруеш?

1-ы с у д д з я. Ну, дык і ты яму сіняк зрабі, і мірыцеся, хай на вас багавіца!

У с е  с у д д з і. Ведама, мірыцеся.

Г р ы г о р. Не, ужо як сабе хочаце, але без грошай не паміруся — як тапаром адрэзаў.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Суддзі нейкі час раіліся, пасля аб'явілі прыгавор: Пётру на двое сутак у халодную, а Грыгора — на адны.

П ё т р а  і  Г р ы г о р. За што?! Не-е! Дык ужо лепш памірымся, памірымся. Ды і сіняк гэты я аглабнёй набіў. Памірымся...

І, міргнуўшы ў бок карчмы, паплылі сябры з воласці.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

А «паганыя» суды доўга яшчэ мучылі, ой, доўга яшчэ беглі, аж покуль не занеслі здрэнчаных суддзяў у карчму.

Тут ім, што называецца, «мёд лыжкай сёрбаць» — вось такі ўжо паганы навык.

Адзін сівенькі суддзя развражаў, апёршыся аб сцяну, бо ногі ўсё коўзаліся ад падмазкі аднаго з жалабшчыкаў. Развражаў ён з кумам аб Грыгору і Пётру:

— Не, не тыя, куме, часы. Дрэнь цяпер стаў народ — змарнеў... Куды ім да тых! Бывала, усыплюць

бярозавай кашы, як капусту тую дашчэнту ссякуць, жывога кусочка нідзе не знойдзеш. Толькі гах! ды гах! А ён хоць бы што: устаў, значыць, аблізаўся, і ні лыс. Яшчэ сып столькі — выдзержыць! Тут табе і капец — ні судоў, ні клопату. А то выдумаў — «сіняк»! Цьфу! Проста-ткі мутарна!.. Ха-ха, халоднай спудзіліся! Мухаморы! Распанелі! Яны ж табе не паедуць у мароз па дровы, у сцюдзёнай лазні будзе мыцца, каб папарыцца, дык не: ад аднюсенькай чаркі ахмялее... Эх, каб такога ў тыя часы, змяк бы ён, як каравая ануча ў лужы...

Кум, вытрасаючы апошнюю кроплю сівухі з паўкварты, мармытаў:

— Яно-то быццам і праўда, але, рассмакаваўшы, то праўды і на смех няма, як казаў той. Хіба што так. Чалавек узяў ды аброс, як вожык той, калючкамі, ну, дык і коціцца — значыць, так і трэба. Вось мае ўнукі будуць паняняты, напэўна будуць вялікімі панамі, ну, дык што з усяго гэтага?.. Эх, ды не ў тым справа — благі час, бо пустая паўкварта, ды і грошай няма. Чуў, ёсць махляры, што падрабляюць грошы, ды так акуратна, што лепш нават за гэтыя — вось як! Ого! Я дык над гэтым вунь як сушыў мазгі, і нічога не выходзіць — апрача лапцёў і калыскі, больш нічога не схітрыш...

І стукнуў ён сінюю чарку аб стол, яна была пустая, а надпіс казаў: «Будзь здароў!» Але выходзіць з карчмы не хацелася. Там на сцяне вісеў ярка намалёваны пятух у ботах са шпорамі і ў камізэльцы дый курыў папяросы «Райскія», побач вісела машынка секчы мяса («Во да чаго людзі дадумаліся!»), а далей — велізарны параход «Горды» рэзаў глыбока сінія хвалі. Гэта ён плыве ў Амерыку, як тлумачыць Бэрка.

Часта хмельнай галаве сніцца гэты «Горды» — нясе ён у свет, поўны падробленага бляску, вялікіх вуліц, шуму надзвычайнага, дзе адны казкі, столькі дзіва...

І не хочацца выходзіць з карчмы.

# Збянтэжаны Саўка

*Жарт у адной дзеі*

АСОБЫ

Саўка.
Магрэта.
Жабрак.

**З'ява I**

Саўка *(уваходзіць)*. Жонка!

Магрэта. Я.

Саўка *(грамчэй)*. Магрэта!

Магрэта. Тутачкі яна.

Саўка *(яшчэ грамчэй)*. Чарвіва качарыжка!

Магрэта *(яшчэ цішэй)*. Лістком перад табой, пакорна, як цялё.

Саўка. Вух, каб цябе маланка, рэся-разанка!.. Ты чаму мне палуднаваць не прынесла? Іншыя ратаі дык і паспаць ужо здолелі, бо маюць жонак, а не гэткія во, рэзгіні гнілыя. Вух, які я злосны!

Магрэта. А доля ж мая чубатая! Ды я і так ужо стараюся. Усё з кута ў кут, то тое то сёе, то туды, то сюды, адным словам,— ні работа, ні аддуха. Хіба ж я тут вінавата?!

Саўка. Ціха, малатарня! Залапатала ўжо. Каб ты так рукамі завіхалася, як языком, дык муж не галадаміраваў бы. І нашто ты жывеш? Толькі свет копціш. Вух!

Магрэта. Ясны дзень, будзь мне сведкай, дух нябесны, будзь суддзёй! Працуеш, гэта, ад зары да зары, як мурашка, б'ешся як рыба аб лёд, а яму ўсё мала, а ён хоць бы што...

Саўка. Бачыў Бог працу, ды не даў мазаля. Ніякага спору, прыбытку ў тваіх руках няма. Тпру! Ды — но! І ўсё на адным месцы. А я, Саўка, ні за што ні пра што пакутую, галадую, гібею ў непагоду, лютую там з сахой... Вух, каб цябе маланка, рэся-разанка!

Магрэта. І не піла ж я, і не ела ж я, памаліцца не здалела, а ўсё аб табе, аб Саўцы сваім, думала. І за думкай той не здалела ахнуць, як і поўдзень прыйшоў...

Саўка. Чакай, ты ў мяне ахнеш, як дабяруся я да твае аўчынкі — ох, скудлочу, ох, злямцую...

Магрэта *(плачучы)*. Згінь ты, пропадам прападзі, жыццё гэткае катаржнае! Годзіш яму, як благой скуле, на пальчыках ходзіш перад ім, хукаеш, дзьмухаеш, а ўсё дрэнна, а ўсё не так. Дам я табе палуднаваць, дам я табе есці, не абгрызай ты толькі маіх костачак; хай будзе ціха, як у вуху, каб людзі не смяяліся, свет не абгаварваў...

Саўка. Джа! Ані заікніся! Ані не магу я слухаць твае звягі — ось быццам тупым нажом па шкле ёрзаюць. Ну і галасок удаўся — як у парасяці, ушчэмленага ў плоце.

Магрэта. Антыхрыст ты! Яшчэ той чалавек не радзіўся, які б табе ўгадзіў... *(Хоча дастаць з печы яду.)*

Саўка. Цыц! Ані важся, ані зварухніся, бо ў зямлю па вушы ўганю! А калі не біта, дык нечага і хліпаць там у нос. Чуеш?!

Магрэта. Во залейцаў, во закелзаў, ані пікнуць, ані крануцца. Во дзе крыўда? Не магу далей трываць! Гіну ўжо, гіну, гіну, гіну...

Саўка. Ціха!

Магрэта. Вох, вох, вох!

Саўка. Гвалту, гвалту, аглохну, здурэю!.. *(Затыкае вушы.)*

Магрэта. Ай, яй, яй, яй...

Саўка *(хапае вопратку ці посцілку і накрывае Магрэту)*. Ну, калі хопіць духу, дык крычы, каб цябе маланка, рэся-разанка, крычы! Га-га-га!.. Ну, крычы, чаго ж анямела? Вось хітра прыдумаў. А мо яна ўжо і скапуцілася? *(Адкрывае Магрэту, каторая сядзіць на падлозе.)* Ну вось, уціхамірылася, дык і дзякаваць Богу. Цяпер я з табой хачу пагутарыць аб нечым важным. Ты вось жальбуеш на сваю долю чубатую, што табе ў хаце вельмі дрэнна, работа заядае, ну і ўсё такое.

Магрэта. Горш і быць не можа. Ліхому ворагу не жычу такой жыткі, каб на яе звод, каб на яе...

Саўка. Тра-та-та-та! Пачалося! Дык жа калі табе так дрэнна, то зробім, каб было добра. Ты пойдзеш у поле араць, а я буду дома гаспадарыць. Я чалавек згаворчывы. Калі табе тут, у запечку, непанадна сядзець, ну, дык ідзі паары пасеку, патузай саху, папацей у дваццаць патоў, дазнайся, па чым фунт ліха. Годзе вам, даўтакудлым, лынды біць! Усю цяжкую работу дык мужчына рабі. Вайна — мужчына ідзі, як у мясарэзку; мужчына й сям'ю кармі, барані, з цешчай агрызайся, а яны, баб'ё, сядзяць сабе на ўсім гатовенькім, кудахтаюць. І гэта называецца «доля чубатая». Ой, абскубу я вам гэту долю, будзе яна лысая, як калена. Дык жа знай: я хачу быць бабай, і канец! Вось як!

Магрэта *(устала)*. Добра, саколік. Дзякаваць Богу, што ўжо кончыў... Воля твая — загад для мяне. Толькі памятай: кісель хваляць, пакаштаваўшы.

Саўка. Я не лізун, каштаваць не люблю, а калі ем — дык усё, да дна. Ну, а ты выносся, нечага выстаўляць тут свой бабскі розум. Я больш забыўся, як ты ведаеш! *(Выпіхвае Магрэту.)*

Магрэта *(праз дзверы, як Саўка прыгразіць — схаваецца; і так колькі разоў)*. Ты ж глядзі, каб курыца не зляцела з яек, бо яны як астынуць, дык занішто прападуць. Пасля свінням травы назбірай, курэй пашчупай, хлеб рашчыні, кароў падаі, начынне памый, звары...

Саўка *(бярэ венік)*. Ну, а яшчэ што?!

Магрэта. Бабскі атопак, курашчуп, памыйнік!..

Саўка *(замахваецца венікам)*. Я табе зараз памыю тваю патэльню! Вось ужо дакучлівыя стварэнні гэтыя бабы! *(Адзін, глядзіць у акно.)* Цьфу ты, напасць! Пайшла. Я думаў, што яна будзе пярэчыць. Ажно ад першага слова — фыхт, хвост у зубы і пайшла, зыкуючы. А нагаварыла ў паўтары засекі. *(Дражнячы.)* Курэй падаі, свіней пашчупай, начынне рашчыні, хлеб звары, і каб варыва не астыла... І яшчэ нейкую

трасцу, гарачка яго ўсё ўспомніць... Эге ж, гэта ўсё-такі непарадак: яны заўсягды наперакор, а тут раптам... Часамі, прыкладам, хоча варыць крупнік з малаком, а я, не любячы малака, папрашу, каб, значыць, зварыла на сале. Дык яна — не! Затопае, залапоча і давай таргавацца. І так цэлы дзень пратакаем, пранекаем — і крупнік не звараны, і мы не еўшы... Ой, нешта тут ёсць нядобрае! Трымайся, Саўка, каб не спатыкнуцца. Ну, але — такой бяды. Мы і самі з вусамі; хіцер Зміцер, але і Саўка не дурны. Першнаперш трэба папалуднаваць, бо есці хачу, як воўк. *(Дастае з печы ежу.)* Маеш табе — насілкаваўся!.. Цк! Як смачна пахне, хоць ты языком ліжы. Ах, каб табе ручкі ў кручкі — страву, дар Божы, марнаваць. Рукі як кавёлы. Вось усадзіў Бог душу! Як у пень. Ах, каб цябе маланка, рэся-разанка; кару грыз бы — так есці хачу. Трэба пашукаць, паветрыць па схованках Магрэты, а мо што й перападзе. *(Выходзіць у клець і выносіць адтуль кадушку з салам, а на кадушцы хлеб.)* Го-го-го! Распеpазайся, Саўка, во цяпер мы закусім ды пабалюем, эх, закусім! Сала і хлябок, еш, колькі душа жадае. А Магрэце скажу, што пацук з чорным катом з'елі, гэ-гэ-гэ!.. Ну, давай прыступімся... *(Жагнаецца, хоча рэзаць хлеб, але яго спыняе голас праз акно: «Саўка, а Саўка, у тваім варыве парасяты, а гарох гусі латашаць!»)*

С а ў к а. А-яй, парасяты гусей латашаць... *(Выбягае.)*

### З'ява II

Ж а б р а к *(уваходзячы праз якісьці час)*. Пахвалёны ў хату! Падарыце сляпенькаму, бедненькаму, старэнькаму дзядочку. Не магу я працаваць, сілачкі не маю. Бог цемрай пакараў, жыву з ласкі людзей добрых... *(Кашляе, стукае палкай, а зглядзеўшы сала, а таксама хлеб на стале, выцягвае шыю, нюхае, цмокае, тупае на месцы.)* І хочацца, і колецца... Кгы! Кгы!.. Нікога не чуваць... Э, хто адважны, той пан важны... *(Падыходзіць на пальчыках, хавае ў тор-*

*бу сала і хлеб.)* Ой, нехта ідзе! *(Падцягвае торбу да парога.)* Ну, цяпер я прапаў, цяпер мне смерць! *(Моліцца.)* А слова сталася целам...

**З'ява III**

С а ў к а *(уваходзіць)*. А што табе, чалавеча, трэба?

Ж а б р а к. Дзень добры!

С а ў к а. Калі табе трэба «дзень добры», дык ідзі на панадворак і пашукай там яго!..

Ж а б р а к. Ды не!.. я, гэтага... не аб тое... Вось, можа, купіце ў мяне сала?

С а ў к а. А мо ты ў мяне купіш, бо маю багата?

Ж а б р а к. Хі-хі-хі! Ну, дык падайце, калі ласка, і я папхнуся далей.

Саўка падае.

Толькі ад сабак правядзіце, а то яны ў вас куслівыя.

Выходзяць.

**З'ява IV**

С а ў к а *(убягае)*. Ой, есці, есці, есці... А дзе ж яно падзелася? Ні хлеба, ні сала... Кусочка не ўкусіў, а ўжо не стала. Гм... І сабакі не брахалі, і сала не ўкралі. Што за насланнё?! Ці не дамавік тут прыслужыўся? Ці гэта я, можа, сніў? *(Шукае.)* Стой, брат, ці не мае ён гэта сала прадаваў?! Пэўна, ён сцібрыў! Пастой, я табе палічу костачкі. *(Хапае качаргу і выбягае, але хутка варочаецца.)* Зловіш яго! Зловіш вецер у полі, якраз! Ах, каб табе наскрозь прайшло, каб ты апундырыўся, жывадзёр, валацуга!.. Ну, чакай, хоць на тым свеце, але як сустрэнуся з табой, тады і палічымся. А цяпер есці хачу, гвалт есці хачу! *(Шукае.)* Каб мне Нябесны Гаспадар сказаў, што выбраць: галодны рай ці сытнае пекла, дык я, не разважаючы, у пекла папёрся б. І вось, як на ліха, нідзе нічога ніякага не знойдзеш. *(Шукаючы,*

*разбівае пасудак.)* Чорт вас тут панаторкваў пад рукі. Трэба ў печ злазіць, мо там што абнюхаю. *(Лезе ў печ, крэкчучы, і вылазіць адтуль, вымазаны ў сажу.)* Няма! Охо-хо! Галодны гаспадар добрага слова не варты! А ўсё-такі выглядае так, што я выменяў з Магрэтай каня на аброць, выйграў, значыць, як той спекулянт Заблоцкі на мыле. Трэба крыху ўпарадкаваць, а то Магрэта скажа, што зрабіў з хаты стадолу. *(Замятае венікам смецце ў адно месца і разважае.)* Як мая Магрэта, дык, мабыць, на цэлым свеце няма такой бабы — днём з агнём шукай — не знойдзеш, ні сярод жывых, ні сярод памёршых. Да раны яе прылажы, дык рана загоіцца. Сапраўды, каб была доўгая, доўгая драбіна, дык яна жыўцом бы на неба палезла. І зрабілася б яна тым духам чыстым, святой Магрэтай... Але як даведаецца гэты дух чысты, што я гэтак хітра сала запрапасціў, вось будзе ў хаце вайна. Здзярэ яна жыўцом з мяне сала... Во, на зямлі крошкі валяюцца... *(Падбірае і есць.)* Збоку гледзячы, дык можна падумаць, што я з голаду крошкі падбіраю... А я проста-ткі як добры гаспадар, каб не марнавалася...

Крык курыцы.

*(Выбягае і крычыць за бакавінамі: «Аюсь! Аюсь! Аюсь! А каб цябе маланка й рэся-разанка! Аюсь!» Уносіць скрынку з яйкамі.)* А бо, свіння чуць не паела. І пагнала ж яе нялёгкая! Вось трэба вучыцца ад свіней: яны ўсягды па-свінску робяць, а мы дык ніколі па-людску... А яйкі астынуць, а яйкі прападуць... Пайду лавіць курыцу... А, каб яе маланка й рэся-разанка!.. *(Выбягае, заве: «Ціпачка, ціп, ціп! Селачка, сел, сел!.. Курачка, кур, кур!.. Ах, каб цябе, хай цябе, каршуновы аб'едкі!» Убягае.)* Ніяк не даецца, а Магрэта хай толькі адзавецца да яе, як яна прысядзе, гэтак скукарэчыцца, хоць ты яе, значыць, бяры і рэж, а ад мяне на гоні ўцякае... Ах, каб цябе маланка й рэся-разанка! Хіцер Зміцер, але і Саўка не дурны: жыў не буду, калі не злаўлю! *(Надзявае спадніцу.)* Ашукаю курыную слепату — яна падумае, што Маг-

рэта, ды і скукарэчыцца. Ой-яй-яй, а тут яйкі як стынуць, так стынуць. *(Выбягае і на хаду навязвае хустку.)*

### З'ява V

Магрэта *(уваходзіць, несучы ў торбе сала).* Во нагаспадарыў, пустадомак! Гэта ж не жарцікі, столькі сала ўкралі! А ў хаце што робіцца — усё ўверх дном паставіў. Во, бунтаўшчык, во, авантурнік, абрыда, цюхцялей! Ох, дапякла б я яму, аж язык свярбіць, паказала б, дзе Макар козы пасе, бяда толькі, што і я недзе кабылу згубіла. І немач яе ведае,— раптам як напаў зык, калі паставіць гэта яна хвост дудой ды ў кусты, ледзь сахі не паламала. Ой, будзе мне ад Саўкі. *(Выносіць сала ў клець.)*

### З'ява VI

Саўка *(уваходзіць змучаны, з разарванай спадніцай).* Ох, няма мае сілачкі. Замучыла, каб яе каршун... знямогся, знядужаў... Чуць-чуць не злавіў, ужо і за хвост зрэпіў — і трэба ж было зачапіцца, паляруш яе ведае. Во, і спадніцу разадраў, і нюхаўку чуць не расквасіў. Бег за ёй, бег, каб цябе маланка й рэся-разанка, ажно бачу: мая кабыла па аўсе як шалёная круціцца, быццам сам Люцыпар на яе ўссеўся... А Магрэты як няма, дык і няма... А яйкі ўсё стынуць, псуюцца, гінуць... І трасца іх ведае, што з імі рабіць?! Розум за розум заходзіць ад неспакойства. Я, мабыць, і звар'яцею, і пасівею, а як прыйдзе Магрэта, дык памру, бо яна мяне заб'е. І чым уціхаміріць мне гнеў Магрэты, і што мне рабіць?.. А яйкі стынуць, а яйкі псуюцца... І, як я бачу, няма іншага ратунку, як самому на іх сесці. Цьфу! Да чаго дажыўся! І смех і грэх, і плач разбірае. *(Садзіцца на яйкі.)* Каб толькі яешні не зрабіць... Ну і папаўся я з сваёй выдумкай, як таракан у саладуху. Адным

словам, майстар з хлеба гузікі рабіць. Вух, які я сярдзіты! Адно мяне толькі ўсцяшае, што я радзіўся не бабай і што разумнаму чалавеку ніколі не шанцуе. А вось з дурнем дык заўсёды Бог. Але ад гэтага мне не лягчэй. Вух, які я сярдзіты! Я цяпер не толькі жаночую, але і курыную работу раблю. Паскудная работа! Вух, які я сярдзіты!

### З'ява VII

Магрэта *(уваходзіць, прыглядаецца да Саўкі, пазнаць не можа, жагнае яго)*. Згінь, нячыстая сіла, прападзі. Няўжо гэта ён, бунтаўшчык?! Саўка, ці гэта ты?

Саўка. Я, Магрэтачка, я! Дадушы — я!

Магрэта. Што ты тут робіш?

Саўка. На яйках, жоначка, сяджу, на яйках.

Магрэта. Цьфу, паскуднік! Не блазнюк, здаецца, каб гэтакімі жартамі займацца!

Саўка *(устае)*. Не да жартаў мне... Вось паглядзі... Каб не застылі, не папсаваліся... Я чалавек гаспадарчы...

Магрэта *(з жахам)*. Ахці мне! Сапраўды яйкі!.. А ён у спадніцы, страшны, як чорт балотны... Стой, не падыходзь!

Саўка. Чаму, Магрэтка, клёцачка мая?

Магрэта. Стой, стой! Адыдзіся! Звар'яцеў. Не ўсе дома... Ай-яй-яй, не падыходзь! *(Уцякае ад Саўкі.)* Людцы, ратунку, звар'яцеў, звар'яцеў!..

Саўка. Магрэтка, крупаварніца мая. Няўжо ж сапраўды я звар'яцеў? А мо ў цябе матылі запладзіліся, мо табе кабыла брыкнула ў галаву ды мазгі на затаўку зрабіла?..

Магрэта. Не варушыся, дурань, бо крычаць буду. Стой, кажу, стой!

Саўка *(як стаў у нявыгаднай, смешнай паставе, так і застаўся)*. Во арудуе, во закілзала...

Магрэта. Калі ты не звар'яцеў, дык скажы пацеры.

С а ў к а. Ой, не скажу! Забыўся; не было выпадку памаліцца.

М а г р э т а. А колькі табе гадоў?

С а ў к а. Ой, не скажу! Не было часу палічыць.

М а г р э т а. Стой! Стой!.. А як ты завешся?

С а ў к а. Бедненькі, збянтэжаны Саўка.

М а г р э т а. А па-мойму — дурны Саўка.

С а ў к а. Але, але, дурны Саўка. Цьфу, напасць!

М а г р э т а. А як твой бацька завецца?

С а ў к а. Ой, Баўтрук, Магрэтка, Баўтрук!..

М а г р э т а. А жонка як?

С а ў к а. Магрэта. Каб яе маланка й рэся-разанка!

М а г р э т а. Ой, ой! Чакай, стой!

С а ў к а *(пяе)*

Ой, Магрэта, жонка,
Не рабі ты крыку,
Бо і так твой Саўка
Збіўся з панталыку.

М а г р э т а *(пяе)*

Зачашы ж на носе,
Што розум прыходзіць
Гэткім, як ты, дурням
Па часе, па шкодзе.

С а ў к а *(пяе)*

Ой, Магрэтка, жонка,
Пакінь вычварацца,
Дай чмокнемся лепш мы,
Каб з бядой не знацца.

М а г р э т а. А біцца не будзеш?

С а ў к а. Хай мяне лепш пярун заб'е!

М а г р э т а. А ці ведаеш ты, што я кабылу згубіла?

С а ў к а. А ты ці ведаеш, што ў мяне сала прапала?

М а г р э т а. Ведаю, стручок. Я шукала кабылу па кустах, а знайшла сала, калі жабрак закладаў яго за абедзве шчакі. Як цыкнула я на яго, дык ён з перапуду і торбы адрокся, і сала.

С а ў к а. І я ведаю, мая перапечка, што ты кабылу згубіла — у аўсе яе зламіў і ў хлеў запёр.

Абое смяюцца, пасля, прытупваючы, пяюць.

Гоцы, цацы, гоп, цуг!
Тра-та-та-та, тройля.
Тылюсенькі, тылі!
Тра-та-та-та, тройля.

З а с л о н а

# Пасланец

*Жарт у адной дзеі*

АСОБЫ

П а с л а н е ц.
К у х а р к а.
П а н.
Л ё к а й.

Рэч дзеецца ў часы паншчыны. У дворнай кухні тупае каля печы к у х а р к а. Уядаюць сабакі. Ускоквае п а с л а н е ц.

### З'ява I

П а с л а н е ц. Ну і ветлівыя ў вас сабакі: уся псарня як ёсць высыпала мяне спаткаць.

К у х а р к а. А сам нябось ляцеў, як у чорта з зубоў вырваўся...

П а с л а н е ц. Вырваўся, бо спяшыў да пана з навінамі. *(Аглядае кухарку, падлабуньваючыся.)* Дзень добры вам у хату!

К у х а р к а. Дзень добры...

П а с л а н е ц. А ці пан дома?

К у х а р к а. Дома.

П а с л а н е ц *(нюхае).* Ой, як жа тут моцна пахне, вось дык пахне! І вось цікава: хто тут гэткі пах выдае?.. *(Да кухаркі.)* А, гэта ты, красачка, так пахнеш... Але, ты, ты... Дзіва! Жывы вазончык! Адшчыкну я сабе флянсік ды завяду ў сваёй хаце такі пах, што

не адзін дурань пазайздруе. Безумоўна, ушчыкну. *(Шчыпле кухарку.)*

К у х а р к а *(строга)*. Ну, чаго трэба?

П а с л а н е ц. Ой, шмат мне што трэба: торбу грошай, стог табакі, возера гарэлкі і закусіць вунь тымі катлеткамі, што падрумяніліся, як твае шчочкі. А твае шчочкі — пацалаваць. *(Хоча пацалаваць.)*

К у х а р к а *(торкае яму фігу)*. На вось, пацалуй!

П а с л а н е ц *(б'е па фізе)*. Вось табе, пацалаваў! Дай яшчэ пацалую... Чакай, вось, я зараз вазьму сваю палку і заганю цябе, дзе чартапалох расце.

К у х а р к а. Гвалт! Ратуйце, разбойнік!.. Гвалту!

### З'ява II

Л ё к а й *(уваходзіць)*. Ціха, чаго табе не хапае, асіна ты дуплаватая?!

П а с л а н е ц. Не, мой паўпаночак, яна — баба-мёд.

Л ё к а й. Як паўпанок?!

П а с л а н е ц. Але, паўпанок. Пан усё з'есць з паўміскі, а лёкаю застанецца толькі вылізаць. Вось і выходзіць, што паўпанок.

Л ё к а й. Каму паўпанок, а табе, хаме, пан — разумееш?

П а с л а н е ц *(да кухаркі)*. А ты, ягадка, разумееш? Вось гэта-то мне зразумела, што, як цябе ні называй, ты ўсё-ткі саладзей за мёд.

Л ё к а й. А ты хто такі?

П а с л а н е ц. Пасланец.

Л ё к а й. А скуль ты?

П а с л а н е ц. З курнай хаты.

Л ё к а й. Дурань ты!

П а с л а н е ц. Дзеля таго мяне і паслалі. Кажуць, дурань з дурнем лепш разгаворацца.

Л ё к а й. А хто ты?

П а с л а н е ц. Я... сын бацькі і маткі.

Л ё к а й. Ты мне кажы толкам.

П а с л а н е ц. Вось гэта і ёсць толк, бо толькі чэрці родзяцца без бацькі і маткі.

Л ё к а й. Ну, а хто цябе паслаў?

П а с л а н е ц. Мяне паслала пані з Хадасевічаў. Ведаеце, пэўна, другі панскі двор?

Л ё к а й. Ну!..

Пасланец азіраецца.

К у х а р к а. Чаго ён круціцца, аглядаецца, як баран з матылямі?

П а с л а н е ц. Ды я, бачыш, гляджу, ці не стаіць тут дзе якая жывёліна, што гэты паўпанок усё нукае.

Л ё к а й, сплюнуўшы, выходзіць.

Чакайце, дык вы скажыце там пану, што я прынёс вельмі важныя навіны. Так і скажыце пану: вельмі важныя навіны.

Л ё к а й вярнуўся; пасланец уцірае яму нос рукавом.

Л ё к а й. Вон, ашалеў, ці што?!

К у х а р к а. Ведама, шалёны, узвей-вецер.

П а с л а н е ц. А ты, ягадка, не ківай дарма языком, а лепш паглядзі на яго нос, як блішчыць. Язык, бачыш, кароткі, дык ён носам...

Л ё к а й. Хам, лапаць! Ды я цябе з зямлёй змяшаю!

П а с л а н е ц. Ой, ой, не біся! *(Уцякае.)*

Г о л а с п а н а. Гэй, Себасцьян! Ах, лотра!..

Л ё к а й мігам выбягае. Пасланец сядзіць пануры.

К у х а р к а. Прыціх, дзякаваць Богу. *(Маўчанка.)* Язык, пэўне, з'еў. Ха-ха-ха... Ну, ці смачны язык? Ха-ха-ха... Ты, мусіць, ці дурны, ці п'яны...

П а с л а н е ц *(пяе)*

Ты не думай, што я п'яны.
Пасланец я паслухмяны,
Сваёй паняй я пасланы,
Але маю свае планы!
Але маю свае планы!

К у х а р к а *(пяе)*

Я кухарка маладая.
Пан дае мне хлеба, солі.

Я дзяўчына не такая,
Каб кахацца... Цьфу! Ніколі!

Пасланец *(пяе)*

Твая ласка мне патрэба,
Як ком масла к лусце хлеба.
Як прылашчыш ваўчанятка,
Дык не страшна й яго матка.

Ой, мне страшна! Паўпанак хацеў біць, а пан — дык у магілу ўгоніць. Ну, але бог бацька!

**З'ява III**

Лёкай адчыняе дзверы, убягае пан.

Пан. Што за навіны?.. Дзе ён? Што пані прыслала? Якія навіны? Хутка! Ну, чаго маўчыш?!

Пасланец вінавата глядзіць на лёкая, той выходзіць.

Пасланец *(прыпамінаючы)*. Вось бяда здарылася, а-я-я...

Пан. Якая бяда?.. Кажы! Што, можа, пані захварэла?

Пасланец. Ды вось лёкай, гэтая боўдзіла, хацеў ударыць мяне, а я з перапуду ўсёсенькі забыўся... Вось бяда, а такія ж важныя навіны...

Пан *(крычыць праз акно)*. Тамаш, Тамаш, скажы фурману, каб усыпаў лёкаю розаг. *(Да пасланца.)* Ну, і што мне з табой рабіць, калода ты нямая, корч трухлявы?! І важныя навіны?

Пасланец. Такіх навін не было і не будзе, як свет светам.

Кухарка. Але, панок, ён казаў лёкаю, што вельмі важныя.

Пасланец. Чакайце, пачну я спачатку, мо ўспомню... Увайшоў, значыць, пасля шапку зняў... вось так... пасля, цыт! Вось зараз, зараз успомню. Што ж далей? Ага, пацалаваў кухарку.

Кухарка бароніцца, але пад пагрозай пана падстаўляе адну, а пасля другую шчаку.

Пасля яна мяне ў руку цмокнула, бо я ёй дзядзькам прыходжуся...

Кухарка цалуе і сплёўвае.

Пасля яна пачаставала мяне катлеткай. *(Бярэ катлету і есць.)* Ой, ой, гарачая!..

Пан. Ну, ты хутчэй успамінай, а то я табе дам на розум!

Пасланец. Хі-і!.. Вось яно што!.. Успомніў!..

Пан. Ну, што там?

Пасланец. А, нічога... Узяў ды ўспомніў...

Пан. Эх, як бачна, то аканом мала цябе шліфуе, ой, мала...

Пасланец. Паночак, кожны дзень стаіць з арапнікам над каркам, ды яшчэ воз розаг пры запасе трымае за фальваркам, каб ён дна ў пекле не знайшоў...

Пан. Ну, годзе! Кажы, якія навіны, што там у пані чуваць?

Пасланец. А, нічога, усё добра, панок.

Пан. Як гэта? А па добрым што?

Пасланец. Ды вось, аканом сказаў мне... панскі ножык-складанчык зламаўся. Аздобны быў ножык, бы малюнак той.

Пан. Ат, глупства гародзіш!

Пасланец. Ого, як жа можна казаць, што глупства? То ж ён зламаўся, не лежачы ў кішэні, а знімаючы шкуру з выжла,— хацелі, значыць, на боты пану. Ось той выжал, што пан праганддяваў з маршалкам на трох падданых. Памятае пан?

Пан. Ну, добра памятаю.

Пасланец. Я мяркую, што пану і гэта ў памяці, што выжал быў вялікі абжора. Дык усе пакутуюць за свае грахі, нават жывёліна. Як аб'еўся мяса жарабка, дык, бядак, і ногі выпруціў.

Пан. Як, дык і жарабок здох?

Пасланец. А, здох, вось як і не было. А такі быў удалы, не аднаму фурману зубы выбіў. Пястун, цацачка, але ўжо цераз меру далікатны: як запраглі да работы, дык і не вытрымаў — падарваўся.

Пан. А такі конік! Ну і парадкі ў вас там: стаеннага жарабца да работы ўжываць! Ой, горача вам будзе за яго, папомніце!

Пасланец. Мой панок, як жа было не запрагчы?! Ваду цягалі, увесь двор у агні, як жа было не запрагчы?!

Пан. Ці пры сваім ты розуме?! Што ты кажаш — двор згарэў?

Пасланец. Згарэў, паночак, як свечка,— чыста, гладка, хоць рэпу сей, бы языком хто злізаў.

Пан. Ой, Матка Боская, прапаў жа я цяпер! Такі двор, такое гняздзечка! І ад чаго ён згарэў? Ці хто падпаліў, ці вы, гадаўё, комінаў не чысцілі, з папяросамі хадзілі?!.

Пасланец. Не, паночак, ад свечак.

Пан. Якіх свечак?

Пасланец. Ведама, заўжды свечкі паляць, як хто памрэ...

Пан. Дык памёр хто? Кажы ты, лотра, хутчэй, бо я табе язык вырву!

Пасланец. Вечны пакой, каб ёй на тым свеце лёгка ікнулася,— пані памерла...

Пан глядзіць на пасланца, дзіка вытарашчыўшы вочы.

Але, памерла...

Пан ходзіць па сцэне, охаючы, схапіўшыся за галаву.

Паночак, не тужы, не гаруй. Не адно ж ліха на свеце... Даў Бог пану і прыбытак...

Пан. Ой, ратуй, усцеш! Які прыбытак?! Аб чым ты хочаш сказаць?!

Пасланец. Я пану ціхенька, каб ніхто не чуў... Панская дачка радзіла блізнюкоў. Але ж і гожыя хлапчукі! Ось, рыхт-рыхтык, быццам выліты панскі фурман Гаўрыла...

Пан. Гвалту, ён забіў мяне!.. Доктара, доктара!..

Пан выбягае, а пасланец рагоча.

### З'ява IV

К у х а р к а. А-а! Што ж гэтак цябе ўсцешыла?

П а с л а н е ц. Смех смехам, але трэба чухацца і дахаты, бо як апамятаецца пан, то будзе мне тое ж, што і лёкаю. *(Хоча выйсці, але кухарка трымае яго за рукаў.)*

К у х а р к а. Не, саколік, не пушчу! Вельмі ж ты ўжо соладка цалуеш... Не пушчу! Пасядзі, адпачні.

П а с л а н е ц. Ось наказанне боскае! Добра кажуць: лепш з разумным згубіць, як з дурным знайсці.

К у х а р к а. Пацалуй, прыгарніся,— ты такі прыемны, і вуснaчкі аж гараць...

Пасланец смяецца.

Чаго ты ўсё рагочаш?

П а с л а н е ц. Ды не толькі я, а пан і пані будуць смяяцца, і ўвесь двор бакі падарве. Сягоння, бачыш, першага красавіка, дык пані і кажа: «Ідзі пану нахлусі, што ў галаву набрыдзе. Толькі, кажа, не баўся, на адной назе назад ляці...» Ха-ха-ха... Ну, але трэба чухацца. *(Хоча ісці, але кухарка трымае.)* Ну, пусці ты, ці чуеш?! Учапілася, як п'яўка!

К у х а р к а. Не, не, мой міленькі, салодзенькі, вясёленькі, даражэнькі...

П а с л а н е ц. Ох, каб жа гэта ведаў, дзе павалішся, дык бы сеў. Ну, добра ўжо, добра, пацалую і ўсё такое. Толькі ты павінна мяне пачаставаць. *(Пяе.)*

Скрыпіць кола без падмазкі;
Не йдзе посная капуста.
Не памогуць просьбы, ласкі —
Трэба мазаць тлуста, густа.

К у х а р к а. Добра, саколік, добра... Усё дам... І вяндлінкі, і сырчыку, і яечак, і піражка...

П а с л а н е ц. Ах, каб ты роду-племені свайго не знала, як ты мяне няволіш! Каб ты спухла, як нітка!.. *(Што прыносіць кухарка, хаваючыся ад яе, кладзе ў кішэні.)* Ну, чаго ўзіраешся?! З'еў ужо... Падавай!.. Круцей хадзі!..

Кухарка. Зараз, міленькі, я табе дастану смажонку.

Пасланец. Болей цягні, не шкадуючы... Ух, як ты надакучыла мне і тым людцам, што за намі назіраюць!.. *(Выскоквае праз акно.)*

### З'ява V

Кухарка *(нясе рондаль на стол)*. Вось, цёпленькае, смачненькае... А дзе ж ён?! *(Шукае, глядзіць у акно.)* Уцёк! Вунь дзе... Толькі пяткі мітусяцць... *(Хныча.)* Ну, не дарую я табе: скажу пану, што нахлусіў, што ашуканец. *(Выходзіць.)*

Заслона

## Конскі партрэт

*Жарт у адной дзеі*

АСОБЫ

Маладзіца.
Гаспадар.
Гаронім Цырубулка.

Сялянская хата днём. Маладзіца, перагнуўшыся праз акно.

### З'ява I

Маладзіца. Вось мінае ўжо Курашчупа, а там дзве хаты — і будзе Варап'ян. Паўзі ты хутчэй! Ідзе на балёўку, а ногі чуць валочыць, як вол у баразне. Во, дзякаваць Богу, уваліўся ўжо ў хату, а там яму капут — дзень і ноч не выберацца: утопіцца ў гарэлцы, каўбасы яго спутаюць... *(Зачыніўшы акно.)* Муж пайшоў на ўпоўзіны, а я сабе зраблю банкет

на ўвесь свет. Прыйдзе мой цацаненькі Геронім Цырубулка, вось я яму і зраблю прывітанне надзіва! Пастаўлю настойку моцную, смачную прыгатую закуску... Што ж тут прыдумаць?.. А ўсяго настаўлю — дзякаваць Богу, хапае і хлеба, і да хлеба. *(Гатуе, часта кідае работу, узіраецца ў люстэрка, што вісіць на сцяне, і ўсё жуе і гаворыць.)* Няма лепшага жыцця, як замужняй жанчыне! Перш-наперш не трэба ўжо сушыць мазгі думкамі аб тым, каб хутчэй выйсці замуж; пасля, не трэба прыкідвацца добрай, прыгожай, спраўнай работніцай; а калі якая бяда ці грэх здарыцца, дык ужо дзеліцца з мужам. Адным словам, не жывеш, а ў карэце едзеш... А людзі брахалі, што я ніколі замуж не выйду. І не выйшла б, каб не зрабіў цуда Мікалай Цудатворца — выпрасіла ў яго. Я ўжо задок цяляціны ахвяравала, трэба будзе яшчэ дзве аўчынкі занесці. *(Глядзіць у люстэрка.)* І ты замуж выйшла!.. Ха-ха-ха!.. Ці не сон гэта?! Ах, як мне весела, шчокатна! Нават і любоўніка маю, каторы завецца Гаронім Цырубулка... Ха-ха-ха!.. Як бы гэта дазнацца праўды?..

**З'ява II**

Убягае, айкаючы, гаспадар.

Гаспадар. Ай-яй-яй! *(Пакруціўся па хаце, чуць не паваліўся, зачапіўшыся за ўслон, і выбег.)*

Маладзіца хавае прысмакі.

*(Убягае зноў.)* Няма мне куточка, шчылінкі на гэтым свеце, дзе б я мог схавацца, затачыцца ад свайго сораму, здзеку, паняверы... Быццам я на смех людзям радзіўся... Брэшуць на мяне, торкаюць пальцамі на кожным кроку, дзе б я ні быў: на кірмашы, на сенакосе, на ўпоўзінах — усюды з мяне вышчараюць зубы, як з падзёртага каптана. Цьфу!.. Надоечы кабылу сваю вяду ў аглоблі, а яна ўперлася чацвярэнькамі і ані з месца! Зіркачы выказеліла, хвастом круціць, лупамі пляскае — і тая, каб цябе апундырыла,

кепікі з мяне ўжо строіць. А ты, можа, думаеш, што калі падноска адстала ў маім боце, дык гэта, значыць, ён парваўся?! Не, ён не парваўся, ён смяецца з мяне, як і ўсе — і жывыя, і мёртвыя, і чужыя, і сваякі! Усе рагочуць, каб іх сардэчны смех зглуміў, усе наругаюцца, каб ім языкі патрухнелі! *(Тупае нагамі.)* Гвалт! Не вытрываю! Гвалт! Ратуйце!

Маладзіца. Ціха, супакойся! Што з табой? Ці не шалёны сабака цябе ўкусіў?..

Гаспадар. Шалёныя людзі ўкусілі! А калі і шалёны сабака, дык што далей? Што далей, пытаю?!

Маладзіца. Чакай, не далей, а пачнём спачатку. Ці Варап'ян пабудаваў сабе новую хату?!

Гаспадар. Пабудаваў.

Маладзіца. А ці ён цябе на ўпоўзіны прасіў?!

Гаспадар. Гм... прасіў.

Маладзіца. Што ты там быў, дык гэта я ведаю, але чаму так хутка вярнуўся, дык не згадаю.

Гаспадар *(ядавіта)*. Што гэта, па-твоему, на ўпоўзінах трэба век векаваці? Што гэта, па-твоему, калі кажуць, што ў цябе не жонка, а конскі партрэт, разумееш ты,— конскі партрэт,— дык гэта трэба слухаць ды аблізвацца? Га, чуеш? Кажы! Ух, так і просіць кулака! Лепш уцячы, каб не зграшыць. Уцячы на той свет, каб не бачыць, не чуць... *(Выбягае.)*

### З'ява III

Маладзіца. Як сто нячысцікаў на яго ўссела... Лётае, як пацук па гарачай пліце, як са шпількамі ў пятах... Пад ногі не глядзіць, носіцца без памяці... Яшчэ, чаго добрага, з размаху ў студню ўскочыць... Пайду пасачу за ім.

У парозе сутыкаецца з гаспадаром. Абое айкаюць, схапіўшыся за пабітыя месцы.

### З'ява IV

Гаспадар. Люцыпар цябе падкруціў...

Маладзіца. Хай на цябе безгалоўе — лоб у цябе каменны, ці што?! Аж іскры пасыпаліся.

Гаспадар. І выйшаў, гэта, я толькі на вуліцу, каб ужо ляцець, куды вочы вядуць, куды ногі нясуць, ажно адкуль ні вазьміся — тыц: выскачыў з-за вугла галапуп ды давай крычаць на ўсю вёску: «Конскі пальтлет! Конскі пальтлет!» Ну, і што мне рабіць, як мне жыць?! Ох, каб была дзе такая фабрыка, дзе б ёй можна было зрабіць рамонт, апошняе кашулі не пашкадаваў бы, аддаў бы гэтую мардасіну, гэты сіняк мае душы...

Маладзіца. З кім ты там гутарку вядзеш?

Гаспадар *(злосна)*. Есці давай!

Маладзіца. Вось табе маеш: быў на ўпоўзінах — і есці яму давай.

Гаспадар. Есці, кажу, давай!

Маладзіца. Нічога ласага няма.

Гаспадар. А, Божанька мой!.. *(Крычыць.)* Есці давай!

Маладзіца. Або-о, гэта ж ужо сонца на апоўдні — палуднаваць пара. Ты толькі не думай, што я спужалася твайго крыку. Прыйшла пара — дык я і даю. На, во, сёрбай капусту.

Гаспадар *(разважаючы сам з сабою)*. Так я і зраблю. Перш схаджу да шаптуна: мо ён паратуе і дасць якой палітуры ці аздобы, каб яе крыху ахарошыць. А калі не, дык ноччу вазьму ды прыкончу.

Маладзіца. Годзе там ужо спавядацца, хадзі палуднаваць, а то я ўсё з'ем.

Гаспадар. Чаго яна да мяне прыстае і хто яе прасіў гэту ежу даваць?

Маладзіца. Як хто прасіў?! Ці пры сваім ты розуме?

Гаспадар. Ты — конскі партрэт!

Маладзіца *(бярэ міску са стала)*. Гэта не жыццё, а круцёлка якаясьці.

Гаспадар *(адбірае міску; абое ядуць)*. Нябось сама, пэўне, ужо ўсе дзялянкі паела?..

Маладзіца. Дурны поп цябе хрысціў, вось што!

Гаспадар. Ды не цямкай ты губамі, а то ўсе свінні пазбягаюцца!.. Ціха, не сёрбай, а то мяне зараз уцягнеш!.. *(Не даносіць лыжкі да губ, прыглядаецца да жонкі, кідае лыжку і адварочваецца.)* Ох, не магу, мутарна, нудзіць мяне...

Маладзіца. Што, таракана ў капусце знайшоў? *(Шукае ў місцы.)* Дзе? Няма.

Гаспадар. Не таракан, а ты мяне нудзіш, як гнілое яйка, нудзіш... Вось завесіла б сваю яндоўку якім-небудзь рызманом, каб вачэй людскіх не псаваць. Ох, хай бы я лепш галаву сабе скруціў, чымся меў з табой жаніцца! Хай бы лепш заместа цябе радзіўся які чорт хвастаты, пан пузаты! Хай на цябе звод, конскі партрэт!

Маладзіца. А, брашы сабе — мне хоць бы што! Брашы сабе, калі ў цябе такая лапатлівая натура. *(Сядае на лаву, нешта ў нос напявае, калыша нагамі і чэша валасы.)*

Гаспадар *(заклапочаны, стаіць каля дзвярэй)*. Гм... і рабі, што хочаш. Трэба выйсці на двор — і няма як. Проста хоць згінь! Выйдзеш — а тут табе з-за вугла галапуп і выскаліцца: «Конскі пальтлет!»

Маладзіца. А чаго цябе на двор нясе?

Гаспадар. Ось, паляруш яе ведае, пытае, чаго людзі на двор ходзяць і ўсё такое... Ой, як жа мне быць?! Страшна! *(Вытыкае галаву ў дзверы.)*

Маладзіца *(палохаючы)*. Гррр... вазьміце яго! Ха-ха-ха!..

Гаспадар *(перапужаны, зачыняе дзверы)*. Дурніца ты, вось і ўсё! Пудзіла старое! У каноплі цябе паставіць... Я з табой свіней не пасвіў, таму няма чаго са мной панібратацца. Вунь хоць бы грыўку сваю асмаліла, а то і сапраўды да конскага партрэта падобна!

Маладзіца. Ціха... Ці ты чуеш?.. Нехта гвалт крычыць.

Гаспадар. Дзе гвалт крычыць? *(Прыслухоўваецца.)*

Маладзіца. Во, хадзі сюды... Як бы пад сталом і разам з тым як бы далёка... Бліжэй падыдзі... А што, ці чуеш?..

Гаспадар. А хай бы цябе немач, хай бы цябе разарвала на макавыя часткі! У носе ў яе свішча, а ёй выдаецца нейкая чартаўшчына. Выгадавала нос на кукальбаку, вось вецер у ім і гуляе, як па коміне, ды пасвіствае.

Маладзіца *(углядаецца ў люстэрка)*. Ха-ха-ха, чаго ён прычапіўся да майго носа?! Ну, хай ён крыху павялік, а так акуратны, як точаны... Ат, калі благі добрага не любіць.

Гаспадар. Чорт, мусіць, сто гадоў думаў, пакуль выдумаў гэткае дабро. Хоць ты бяры ў трэсачкі ды выкідвай гэтае дабро вон... Кара Божая, кара...

Маладзіца. Ох, і трудненька мне... Марнееш, як той сыр у масле, ха-ха-ха...

Гаспадар. Ну, далей ужо не магу трываць! Дагэтуль жыў, але больш, выбачайце, не магу! Ось, лягу і буду паміраць... Не хапае сіл цярпець гэткую пакуту... Годзе! Ох, душна мне, душна... А тут яшчэ каля шыі цісне... не магу жычкі развязаць... душна... Дай мне нож!

Маладзіца *(перапужаная)*. А, Божухна, нашто яму нож?! Кінь благую думку.

Гаспадар. Дай мне нож!

Маладзіца. Родненькі, даражэнькі, апамятайся, пашкадуй душу... Страшна...

Гаспадар. Дай нож!

Маладзіца. Не губі жыцця. Грэх! Людцы, ратуйце!

Гаспадар *(разрываючы каўнер)*. На табе, астаропіна! Казаў, дай нож... Шый на другі раз шырэй каўняры.

Маладзіца *(сплёўвае тры разы)*. Ото ж напужаў!.. Думала, самагубствам скончыць.

Гаспадар *(ідзе ў кут)*. Вось, памалюся да абразоў святых, вазьму грамнічку і тады памру, канешне, памру. І як гэта я да гэтай думкі перш не дагадаўся?!. Пякельныя мукі, страшнае насланнё... О, святы Ба-

боля, ты што... *(З жахам.)* А гэта што?! Глянь! Нашто панавешвала конскія партрэты?! Што, гэта, мне на іх маліцца?

Маладзіца. Дзе? Тут нічога няма. Абразы толькі...

Гаспадар *(сядае за стол і галосіць на ўсю хату).* Праўда, абразы... Прапаў я, звар'яцеў. Нячысцік розум пакаламуціў. Жонка жыццё атруціла.

Маладзіца. Ну, чаго ж ты плачаш, пястунчык мой? Ну, супакойся...

Гаспадар *(плаксіва).* Чаго? А што, калі, ратуй Божа, ды ты пажывеш яшчэ колькі гадоў, і я з табой разам, ды, калі, ратуй Божа, у нас будуць дзеці... А ад гэтага не ўсцеражэшся... А гэтыя дзеці, ратуй Божа, пойдуць па табе... А калі, ратуй Божа, у гэтых дзяцей ды будуць яшчэ гэткія дзеткі, дык усе людзі будуць не людзі, а конскія партрэты. *(Уздрыгваецца.)* Ух, як скажу гэтае паскуднае слова, дык... як бы мяне чэрці на гарачыя вілы ўздымаюць! Апаганіў я сваю хату, узяўшы цябе за жонку. Нюхаўка — як дуга, зіркачы — як у крата, лоб — як патэльня, а губы і нос — цэлы воз. Адным словам, не твар, а торба, лапаць... А грыўка!.. Ну, сапраўдны конскі партрэт! Цьфу!

Маладзіца. Кончыў ужо?

Гаспадар. Дзе там кончыў! Валовай скуры не хопіць апісаць тваю красу. Ну, але хай будзе — кончыў.

Маладзіца. Ну, дык жа слухай. У мяне ёсць палюбоўнік, і я з ім пабяруся, а з табой — развод! І слухаць не хачу — развод, развод!..

Гаспадар *(ашаломлены).* Выбачай, я крыху недачуў...

Маладзіца. Развод, развод...

Гаспадар. Гэта добра, я чую, але ты скажы першае. Недачуў я нешта.

Маладзіца. У мяне ёсць палюбоўнік, і я з ім пабяруся.

Гаспадар. Каб ты толькі жыла! У яе палюбоўнік, ха-ха-ха!.. Яшчэ гэткі дурань не радзіўся... Ой, не кажы ты больш гэтага глупства, бо ўсе куры са смеху паздыхаюць.

Маладзіца. Развод, развод, развод!..

Гаспадар. А хто ж ён, гэты твой палюбоўнік?

Маладзіца. Гаронім Цырубулка.

Гаспадар. Гм... то мо і сапраўды ты кажаш?

Маладзіца. Як прыйдзе сюды, тады паверыш.

Гаспадар. Сюды?! Чаго ж ён прыйдзе?

Маладзіца. Ха-ха-ха! А чаго ж палюбоўнікі ходзяць...

Гаспадар. Во, ліха, дык яно да праўды падобна. *(Трасе кулаком.)* А яны, гады, казалі: «Спі спакойна: на тваю жонку ніхто не паквапіцца». А скажы ты мне, што ён у табе ўпадабаў?

Маладзіца. Во, кажа, люблю твае ножкі... Дадушы, казаў.

Гаспадар. Ну ўжо і ўпадабаў крывашлапую! Ану, прайдзіся! Паўзіраемся.

Маладзіца. Ну што ж, і прайдуся. *(Праходзіць.)*

Гаспадар. А, нічога сабе, нічога... Хваліць вельмі няма чаго, але і ганьбаваць нельга.

Маладзіца *(задаволеная)*. А каб ты ведаў: як пачне цалаваць, дык прысмокчацца, як п'яўка, а пасля давай кусацца. Тут паглядзі, каля шыі — пэўна, знак ёсць.

Гаспадар. Бач яго, падлюга! Знак і сапраўды ёсць. Ды і не дзіва, што кусае — шыйка белая, як сыр. А ён жа, гад, заўсягды галодны, як воўк.

Маладзіца. Не мані. Ён у мяне так насілкуецца, што заўсягды кажа: «Наеўся, напіўся, і хвосцік завіўся». А як жа любіць мяне абдымаць! «Ты, кажа, пружыніста і цвёрда, як малатамі выкута».

Гаспадар. Няўжо праўда? *(Прабуе.)*

Маладзіца. Стой, не шчыпайся — баліць.

Гаспадар. Праўду ён кажа. Ну, а што болей?

Маладзіца. Каб ты ведаў: як сойдземся з ім, дык ён усё просіць, каб заспявала... Голас мой упадабаў... Асабліва гэтую песню:

Сядзіць жаба на карчы
І кажа вароне:

— Кланяйся мне да начы:
Я сяджу на троне.

Вые сабака.

Гаспадар. Добры галасок, нішто. Але што гэта стрэліла сабачаму розуму? Аж завыў, воўчы клык!

Маладзіца. Ат, глупства, ён заўсёды вые, як я пяю. О, мне толькі трэба маргнуць вокам, як мужчыны за мной шнурам! Што ж, няпраўда?..

Гаспадар. Магчыма... Любоўнікаў не абы-хто будзе мець... Ну, а што ён яшчэ ўпадабаў?

Маладзіца. Ласун, ты хочаш, каб я табе так усё і сказала, ого! Не будзь вельмі цікаўны — пастарэеш хутка.

Гаспадар. Ён, пэўна, свістун, тваіх валасоў не пахваліў? А кудзеркі маеш надзіва!

Маладзіца. Хто «ён»?

Гаспадар. Той жа Цырубулка. А што, у цябе іх шмат, што ты пытаеш: «Хто?»

Маладзіца. Цхі-і... хоць адбаўляй! Вунь і Гаўрыла Таўкач ужо клюе...

Гаспадар. Клюе?! *(Абнімае жонку.)* А мая ж ты сіваваронка, а мая ж ты перапечка, а мая ж ты крупаварніца... вось усцешыла мяне! А я думаў, што адзін дурань на свеце — гэта я...

У дзвярах паказваецца Гаронім Цырубулка — кульгавы, прыдуркаваты, з палкай.

### З'ява V

Гаспадар. Хадзі, хадзі, брат, закурым, не бойся...

Цырубулка. Ды некага мне баяцца, тося-бося. Я прыйшоў пазычыць хамут у кума.

Гаспадар. Ха-ха-ха, ведаю, які хамут! Не прыкідвайся нязнайкаю. А шуры-муры з маёй жонкай хто заводзіў? Га?! Ха-ха-ха!..

Цырубулка *(убок)*. Во, тося-бося, ускочыў у мех — толькі завязаць...

Гаспадар. Ох, люблю я цябе, «тося-бося». *(Абнімае Цырубулку.)* Цяпер на свеце ўжо ёсць два дурні. А ўдвух сумаваць не будзем.

Маладзіца *(абнімае Цырубулку)*. А мой ты галубок, добра, што прыйшоў, бо мой не хацеў усё верыць...

Гаспадар *(адцягвае жонку)*. Ты, гэта, вельмі не падлабуньвайся, не прыліпай...

Маладзіца. Што, ты мне забароніш?! Агледзеўся цяпер?.. А чапялы ці пробаваў калі? Га?! Кыш з хаты, каб і духу твайго не было! *(Выганяе гаспадара.)*

Гаспадар *(выткнуўшы галаву праз дзверы)*. Конскі партрэт! *(Іржэ.)* І-га-га-га! Конскі партрэт!

Маладзіца *(кідаецца на гаспадара; ён хаваецца)*. Ты мне пагаворыш!..

### З'ява VI

Цырубулка. Ах ты, тося-бося, бульбаед! Заганю цябе ў казіны рог! Аблаю на дваццаць гадоў! *(Затыльгіцкаў.)*

Маладзіца. Не турбуйся, цацаненькі... Я ўжо зашчапіла дзверы — не ўлезе цяпер. Ну, пацалуй жа мяне!..

Цырубулка. Чакай, хай апусцяць заслону, а то будуць смяяцца...

Заслона закрываецца.

Гаспадар *(лезе з боку публікі на авансцэну)*

Стой, стой, не закрывай!
Я зараз... Крыху пачакай...
Адтуль не хочуць прапускаць...
А жонку мушу пакараць,
Каб іншых здраднiц напужаць
Ды каб маральнасць п'есе даць.
О, не пусцілі!.. Як ідаць,
Трэ ўжо, папраўдзе, паміраць

І час жаніцьбы праклінаць...
Астаўлю вас тут хахатаць,
А сам я змушан уцякаць.

Канец

# У кавалёвай хаце

*Драматычны абразок у адной дзеі*

АСОБЫ

Кабеціна.
Анеля.
Якуб.
Сват.
Ксавэры.

Чутна песня, паднімаецца заслона. Даносіцца звон б'ючых аб жалеза молатаў. Праз змерзлыя шыбы прабіваецца ў хату бледнае сонца. Анеля і кабеціна прадуць.

Кабеціна *(пяе)*

Ці ў полі, ці ў полі ці бярозка расла.
Ці ў полі, ці ў полі кучаравая была.
Яе ўзялі паламалі,
У пучочкі павязалі,
Мусіць, трэба было.

Анеля. Ой, сястрыца, годзі! Не пей гэту песню — вельмі жаласная, так неяк маркотна робіцца ад яе, што я заўсёды плачу. Проста-такі туга, як нажом, сэрца рэжа.

Кабеціна. А мне нічагусенькі, так ужо з тугой зжылася, што без яе то як бы і адзінотна. Дадушы, праўда!

Анеля. Ат! Глупства гародзіш. Кожнае ліха пераходнае.

Кабеціна. Ды і не так думала. Ждала, ці ведаеш, ждала. Ну, думаю, пераменіцца. Дык жа ўсё горш і горш, бяда на бядзе едзе, бяда бядой паганяе.

Анеля. Ой, міленькая! Каму лёгка жывецца? Кожны валоча свой хамут. Вось хоць бы я. Ворагу найгоршаму не жадала б.

Кабеціна. Ты кажаш: табе трудна. Глянь, мы з табой адналеткі, а куды ж мне да цябе?! Як шэрай сухастоіне проціў кунаценькай сасонкі. Ад ветру хістаюся, туман сцежку засцінае.

Анеля. А ты сама вінавата — трэба было не выходзіць за такога душагуба.

Кабеціна. Што ты кажаш, Анелька?! Як жа не йсці?.. Божухна мой! Я ж на яго глядзець не магла. Я ж як яго сустрэну, бывала, так і заные сэрца. Ой, чула, ой, ведала я гэту напасць, але бацькі, хай ім Бог даруе, гонам выгналі з хаты: ідзі ды ідзі, кажуць, гэта тваё шчасце. Не шукала, не ждала я яго, а ён — каб ты ведала,— дык коні з'ездзіў, валочачыся да мяне, прысягаўся, краснай зоранькай яснай зваў, а цяпер я ў яго доля няшчасная, змяя падкалодная: б'е, як шкоднае стварэнне, хваробу ўбіў, атруту ўліў у маю кроў, зняважыў маю красу. Анелька, трудненька мне, ой як трудненька! Каб хоць я магла праклінаць яго, мучыць, забіць, каб магла ўцячы хоць куды, хоць на дно ракі... Але ж не магу, так ужо змарнела, знядужала,— ось, як учадзеўшая хаджу, у вачох няясна, здаецца, вось-вось хістануся і палячу ў бяздонне... *(Абаперлася на калаўрот, тужыць.)*

Заходзіць сонца.

Анеля. А вось ужо і сонца заходзіць.

Кабеціна. А праўда — заходзіць! Час ужо дахаты мне ісці!.. Але як крывава заходзіць!

Анеля. Вецер, пэўне, будзе.

Кабеціна. Малы цяпер дзень. Калядніцай дык з кута ў кут — і вечар тут.

Анеля. Ды ўжо ж!

Кабеціна. Ну, трэба збірацца... А мароз, відаць, яшчэ паправіўся. Ведаеш, Анелька, я ў цябе астаўлю прасніцу і калаўрот, а заўтра таксама прыйду на попрадкі. Добра?

Анеля. А як сабе хочаш, так і рабі.

Кабеціна. Чаго ты сярдуеш?

Анеля. Ды як жа не сердавацъ... Каб ён, прападаць яго галаве, ні за што ні пра што жыўцом гнаў у магілу — ніколі, кажу табе. Калі яму трэба мая смертухна, то ўжо разам ляглі б у дамавіну. Вось як! Такая я ўжо ўдалася. Што, гэта я якомусь асталопу на здзек радзілася ці мне жыццё не міла? Эх, даражэнькая мая, вазьмі ты чапялу ў рукі ды цыкні разок-другі на свайго мужыка, а пабачыш — на цыпачках стане хадзіць.

Кабеціна. Не, Анелька, не магу. Куды ўжо мне!

Анеля. Ой, не кажы гоп, не пераскочыўшы...

Кабеціна. Ну, дык да заўтрашняга, Анелька! *(Выходзіць.)*

Анеля. Усяго... Трэба і мне ўжо кінуць... Напрала я поўную шпульку, работа мая спорная, нітачка мая роўная, чыстая, як струна... Эх, усё бы добра было, каб жаданае збывалася. *(Парадкуе прасніцу, пасля падыходзіць да печы.)* І печ ужо астыла... Але ж сцюжа якая, мароз аж трашчыць!.. Тата лысы — трэсні мароз, Цімох лысы — трэсні мароз, Шмуйла лысы — трэсні мароз...

Кабеціна. Або! Ці ведаеш, а я забылася калаўрот узяць.

Анеля. А ты казала, што пакінеш да заўтрага.

Кабеціна. Казала?! Ну то і добра, хай застаецца. Забылася я. *(Выходзіць.)*

Анеля. Ужо змяркае, а яе дагэтуль няма. І няўжо яна пайшла маю пагібель шукаць? Вось не чула я на сваім вяку, каб мачыха ды была добрая. Ну але мая мачыха — дык ужо днём з агнём не знойдзеш такой ліхадзейкі. *(Пяе: «Ці ў полі, ці ў полі...» Перарывае песню плачам, схаваўшы твар у падушцы.)*

Якуб уваходзіць у кавалёвым фартуху — прыслухоўваецца. Пачынае плакаць, дражнячы.

У цябе, Якуб, сэрца з каменя. Табе ўсё жарты.

Якуб. Чым жа слёзы асушыць, калі не жартам?

Анеля. Якія тут могуць быць жарты, калі вось мачыхі дагэтуль няма?

Я к у б. А ты што — замаркоцілася па ёй?

А н е л я. Хоць і грэх, але дадушы жадаю, каб яна дзе замерзла ў дарозе. *(Маўчанка.)* Сваты, пэўне, хутка прыедуць...

Я к у б. Сваты, кажаш, прыедуць? Так... Але вось мой партабак недзе закаціўся, і ніяк не магу знайсці. Зацеплі ты, Анелька, лямпу.

Анеля паліць лямпу.

Цёмна тут... і дзе ён запрапасціўся? Ага, вось, знайшоў.

А н е л я. Ды гэта ж папіросніца!

Я к у б. А я як казаў?

А н е л я. Партабак.

Я к у б. Магчыма! Думаеш аб адным, а кажаш аб другім... Паслухай, Анелька, птушачка мая, ці ты калі пробавала думаць аб тым, што табе добра было б замуж выйсці, бо табе тут не жыццё, а я цябе люблю і мне цябе шкада? Мачыха твая, бачыш, ведзьма, яе толькі памыць і павесіць, каб высахла, а бацька таксама добрая ягадка і танцуе пад дудку мачыхі. За табой хлопцы шнурам, дык выходзь замуж — я табе кожны дзень аб гэтым кажу.

А н е л я. І кожны дзень мяне дабіваеш. Вось даў бы лепш што-кольвечы адразу, каб не мучыцца, бо мне або з табой жыць, або смерць. Вось як!

Я к у б *(у задуме)*. Праўда, каб не мучыцца, мо гэта і лепш... Эх, Анелька, думаеш, мне лёгка табе гэта казаць. Вось скажу, а ўсярэдзіне так і зашчыміць, так і гарыць полымем. І сумысле я аб гэтым кажу, хай баліць, хай раз'ядае нутро маё — так мне і трэба. Ох, мукі! Ты ведаеш, бацька твой, гэтая плюгавая казяўка, глухі чорт, вось дзьмухнуў, здаецца, і паваліцца, а глядзі, як ён мною камандуе — ён выгнаў мяне цяпер з кузні, кажучы: «Ідзі, зломак, і скажы Анелі, каб яна цябе выкінула з галавы, і хай не бядуе, бо мачыха ёй прыдбае жаніха, ды яшчэ не абы-якога!» І гэта ўсё за тое, што я памыліўся ўдарыць малатком. *(Злосна.)* Не! Гэта не хутка кончыцца, не стрываю я такой паняверы, катаргі. Я ў яго

горш як падданы, як сабака. Ён, як п'яўка, упіўся ў цела маё і п'е прагавіта кроў. Забіць толькі гада — адзіны паратунак.

Анеля *(ціха)*. Якуб, аж мне жудка стала! Няможна так.

Чуваць стукат у акно і гнусавы голас: «Якуб!»

Якуб *(ускочыў, устрывожаны, кінуўся да дзвярэй і вярнуўся)*. Зараз, зараз! Ах, не магу! Што мне рабіць! Зняволіў ён мяне.

Анеля *(прыгартаючыся)*. Пачакай, мой саколік, міленькі мой, хоць адну мінутачку!..

Якуб *(адпіхвае ад сябе)*. Абач, Анеля, усё-ткі забудзься аба мне, не магу я з табой жаніцца, не магу я цябе любіць, бо твой бацька не хоча, не магу, бо я, Анелька, душагуб, душагуб...

Анеля. Ах, Божа мой, што ты гэта кажаш?!

Якуб *(праз слёзы)*. Анелька, я не варт цябе, плюй на мяне, тапчы, спаневярай, я ля ног тваіх, як сабака, качаюся, бо я звер, душагуб... О, вяжыце мяне, катаржніка, злодзея. Я краў дрэвы ў лесе... Ляснік злавіў мяне... Я тапаром засёк лесніка... кроў асляпіла мне вочы, рукі абкрывавіў... Я засёк лесніка... А бацька твой бачыў гэта, і цяпер я ў яго горш як быдла: што хоча, усё раблю, бо ён гразіць, што людзям скажа, данос зробіць.

Анеля. Як жа ты адважыўся, Якубка? Нашто было чапаць? Прыхілі ка мне галоўку сваю... развогненая яна ў цябе. Ну, не сумуй, тваё гора — маё гора.

Якуб. Не ўсцяшай ты мяне. Нічога на свеце мяне не супакоіць. Хіба смерць мая або яго...

Анеля. Якубка, міленькі, не затойвай свой грэх, хай лепш дазнаюцца людзі, шмат лягчэй стане. Ідзём, раскажам усім аб сваёй бядзе, аб нашых муках, аб нашай любасці. Хай судзяць. Сашлюць цябе ў катаргу — і я з табой, засудзяць на смерць — і я загіну, загібею... Якубка даражэнькі, як я цябе бязмерна, моцна люблю!

Якуб. Ты кажаш, не таіць граху, каб людзі даведаліся, што я душагуб? Не, хай лепш знае адзін

Бог! Цяпер мне ўсё гэта выдаецца страшным сном, а як усе дазнаюцца, дык на кожным шагу будуць напамінаць: ты душагуб, ты душагуб!.. Ох, аб гэтым страшна, нельга думаць... *(Адсоўваецца ад Анелі.)* Да смерці буду несці свой крыж, адзін пайду сваёй цярністай пуцявінай, хаваючыся ў цень, каб менш была выдатнай мая горкая душа, каб не бачыць шчасця людскога... Анеля, забудзься аба мне!

Чуваць зноў той самы голас: «Якуб, Якуб!»

Іду, іду! Ужо! *(Хапае шапку і, не здолеўшы надзець, выбягае.)*

Мачыха *(спатыкаецца ў дзвярах з Якубам, той груба адпіхае яе з дарогі).* Ха-ха!.. Напужала я вас, галубкі мае! Га? *(Ставіць гарэлку на паліцы.)* Ох, і замарылася дачыста! Мучышся, гаруеш, стараешся ўсё для людзей, а падзякі і на нюх няма. Ну і свет зрабіўся, хай ён уверх дном стане!..

Анеля. Ох, Божанька, мой Божа!

Мачыха. Пекны хлопец наш Якуб! Маладзенькі, як мядок; ну ці ж не праўда, Анелька? Селязень — дый годзе! А ведаеш, дачушка, замерзла я зусім... А печ сцюдзёная... Чаму ж гэта ты, дачушка, у печы не падтапіла? Вось як выйдзеш з хаты, дык ніякага толку няма... Дарма, трэба было вытапіць,— табе тут цёпла было з Якубам, але ж трэба думаць і аб усіх. Не ведаю, якая з цябе будзе гаспадыня, а ўжо замуж выходзіць, аж мне за цябе сорамна...

Анеля. Ох, Божанька, мой Божа!

Мачыха. Але ты не думай, дачушка, што я сярдую,— хавай Божа! Я ніколі ні на каго не сярдую, усе мы людзі, усе мы грэшны. А ты вось скажы: забылася падтапіць, ось у нас і будзе ўсё па-добраму, па згодзе. Ну скажы, дачушка: забылася. Ці, можа, язычок з'ела, ну, расчухайся, красуля!.. Ой-ой, што гэта ў цябе на шчоках? Сажа! *(Хахоча з кпінай.)* Віш, шэльма Якуб след aставіў. Сатры борздзенька, сатры, бо бацька як пабачыць, то... Дай я сатру, мне аддай. Не хочаш?.. Вольнаму — воля, шалёнаму — поле.

Анеля сама сцірае.

Ды не сцірай, блудніца, нічога няма, я пажартавала. Што ўжо з цябе будзе, дык я не ведаю... Ну, але трэба ўжо ў печы тапіць... Анеля, трэба ў хаце ўпарадкаваць, прыбраць. Маладая дзяўчына, а ўсюды балота, хоць рэпу садзі. Сораму не маеш, пакуль бацьку не скажу...

Анеля. Адчапіся ад мяне! Кусаецца, як гадзіна ашалелая. Ось уцячы ад цябе некуды.

Мачыха. Ціха, ціха, лаяцца не трэба, няма за што. Я табе не вораг: калі кажу што, дык на тваю карысць. Не злуйся, вось схадзі лепш, дачушка, у сад, малін наламі. Трэба папарыць, а то катар сціснуў грудзі, дыхаць не магу. Толькі, калі ласка, не проставалосай... На маю хустку.

Анеля скідае хустку і выходзіць.

*(Паднімае хустку і гразіць услед Анелі.)* Я цябе акілзаю! Будзеш ты ў мяне па нітачцы хадзіць. *(Падтаплівае ў печы.)*

Брэшуць сабакі.

*(Глядзіць то ў адно, то ў другое акно.)* Няма!.. Прыедзе, нідзе не дзенецца, бо за яго, боўдзілу дурнога...

Уваходзіць Анеля і кідае галіны малін мачысе.

Дзякуй табе, дачушка, будзем лячыцца. Запару, мо і ты вып'еш, бо яно калі не памагае, то і не шкодзіць.

Анеля. Лепш атруту дала б.

Мачыха. Чаму ты сёння такая хмурная? Плюнь, дзяўчына, усё балазе будзе. Я цябе не дам скрыўдзіць.

Анеля. Вось крывіць душой, вось крывіць. Добра кажуць, што крывое кола на сябе балота кідае.

Мачыха. Ну, весялей, весялей, дзяўчына! Вось аладак напячом, яешню трэба прыстроіць, каб толькі раз-два — і гатова! Не люблю, калі работа з рук валіцца. Я і кварту гарэлкі раздабыла — будзе баль.

Табе, здаецца, ужо я казала ці не? Сюды хутка, бачыш, прыедуць на агледзіны: кавалер той, што бацька табе ўсё навязвае. Ён-то мне не даспадобы, ну, але бацька...

Анеля. Ды што там бацька, бацька! Сама выкапала яго на маю пагібель, каб цябе!..

Мачыха. А хоць бы і сама, дык ці ж я не бачу, што табе час замуж, што ты спелая, як вішанька, аж покаешся. Ну ці ж мне не шкада, што такая дзяўчына і яе краса марнеюць, гальчэюць тут між старыкоў. Трэба замуж... Эх, усіх баб такая доля, але ж горка рэдзька — а ядуць, благі замуж — а ідуць. Таму лепш, таму горш, але вось жывуць, любяцца і Бога хваляць. Яно справядліва: хоць за вала, абы дома не была. Ну, ведама, за Якуба пойдзеш, ды не пойдзеш, а пабяжыш... Ха-ха-ха!

Анеля. А-а! Гэта табе не даспадобы, бо сама да Якуба смоллю ліпнеш, грэхаводніца!..

Мачыха. Дачушка мая, нашто ён мне? У мяне, дзякаваць Богу, муж ёсць. Нашто мне твой Якуб?

Анеля. Не заві мяне дачкой. Я цябе знаць не хачу. Я зразумела, якога ты поля ягадка. Ты хочаш мяне выдаць замуж, выгнаць з хаты, я табе на перашкодзе. Якуба хочаш любоўнікам сваім зрабіць, але, любоўнікам, здрадніца. Табе і бацька мой на перашкодзе, ты ўсё праз сон клянеш яго. Мала, што ён глухі, але я яму гэта скажу. Усёй вёсцы скажу, што ты хадзіла да шаптухі па атруту для бацькі, па любчык для Якуба. Ну што? Можа, скажаш, што не хадзіла?

Мачыха кідае міску ў Анелю.

Мачыха *(сыкаючы)*. Ціха, сука, ціха!..

Чуваць званок і брахание сабак.

Анеля. Дагэтуль маўчала, а цяпер скажу свету цэламу, і Якуб мне пасведчыць...

Мачыха. Маўчы, бо задушу!.. А яго ў астрозе згнаю, данос зраблю, што лесніка засёк, пагублю...

Сабакі ўядаюць.

Ой, прыехалі... А бедная ж галовачка мая... *(Збірае чарапкі ад міскі.)*

Госці. Добры вечар!

Уваходзяць двое мужчын.

Мачыха. А-а! Добры, добры!.. Неспадзеўкі вы к нам... Ну, ці жывы, здаровы? Сядайце, калі ласка, вельмі рады. *(Выцірае лаву.)* Што чуваць? А мы дык зусім не спадзяваліся... Тут з Анеляй усё аб гаспадарстве, аб клопатах сваіх... Ну, дачушка, частуй гасцей, каб хадзілі часцей, ды пазаві бацьку, хай цешыцца, якіх нам Бог праслаў гасцей.

Сват. І Бог і добрыя чуткі аб вашай падчарыцы.

Анеля. Ох, не вытрымаю!..

Мачыха. Ну а як дарога — ці добрая? *(Да Анелі.)* Ну, не адварочвайся, пакажыся людзям, прывітайся. Дзеўка, бачыце, маладая, дык сароміцца. Усе мы такія да замужжа. Абач, Анелька, схадзі, дзетка, за вадой, толькі асцярожна каля студні, бо там коўзка і ўваліцца можна. Яна ў нас і гаспадыня, і работніца хоць куды, папытайцеся нааўкруг — першая жняя, ткалля...

Анеля, як учадзеўшая, бярэ вядро і выходзіць.

*(Адчыняе дзверы і ўслед Анелі.)* Асцярожна каля студні — уваліцца можна... *(Да гасцей.)* Ды садзіцеся, будзьце як дома, зараз закусім, пагрэемся і ўсё такое.

Госці. Ды дзякуем!

Сват. А што добрага чуваць?

Мачыха. А нічагусенькі, мае даражэнькія. Чуваць вось тое, што нічога не чуваць. Хлеб ядзім і Бога хвалім... Што ў вас? А пан Ксавэры як папрыгажэў. Цвіце, як мак!

Ксавэры *(рагоча)*. «Папрыгажэў»!..

Сват. А чаго ж яму хірэць? Купаецца, як сыр у масле.

Мачыха. Ведама, ведама...

Ксавэры. Ну і напужалі нас ваўкі.

Мачыха. Ваўкі? Каб іх паляруш! Дзе ж гэта?

К с а в э р ы. Ды ў суседнім лесе. Але то стада, дык, мусіць, з паўкапы будзе! Ужо аж за сані чапляліся.

М а ч ы х а *(пагдядаючы ў акно)*. Аж за сані, кажаце? Як жа вы выратаваліся? І шчасліва?

К с а в э р ы. Ведама, на нашых конях ды каб не шчасліва! Ха-ха!

С в а т. Балазе, што коні добрыя...

М а ч ы х а. Праўда, праўда... Але, гэтага... Што я хацела сказаць?.. Выбачайце, госцейкі, я, гэтага, схаджу ў варыўню па акрасу. *(Выходзіць.)*

К с а в э р ы. Ха-ха-ха! Ну, ці добра?

С в а т. Ат! Выдумаў непатрэбшчыну.

К с а в э р ы. Паўкапы! Ха-ха!..

С в а т. Ціха ўжо ты, лепш сядзі і маўчы. А то ад тваёй гаворкі свінні падохнуць са смеху, тараканы з хаты паўцякаюць, не то што дзяўчына. Вось пайшла і не вяртаецца.

К с а в э р ы. Толькі ж, сват, скажы ёй, што яна ў мяне не будзе на печы ляжаць і нагамі малаціць; каб не была саплівай, гамзатай і ўмела пасцель мякка слаць, тлустую кашу, густую капусту варыць. Вось як, а не то я яе навучу строгай гаворкай, прыгражу лазовым дубцом. Хай знае, што я не лыкам шыты.

С в а т. А, годзе табе!.. Гародзіш не да рэчы.

М а ч ы х а *(уваходзіць і нясе акрасу)*. А ці праўда, што пан Якуб у Амерыку збіраецца ехаць?

К с а в э р ы. Гэ-гэ-гэ... які гэта Якуб?

М а ч ы х а. Цьфу! Язык паплутаўся, я хацела сказаць... *(Глядзіць у акно.)* Але, гэтага... аб чым я... цёмна на дварэ... Дык вось, я хацела сказаць, пан Ксавэры...

С в а т. Чаго яму ў Амерыку, яму жаніцца трэба...

Чуваць крык: «Гэй, сюды, памажыце! Чалавек у студні». Усе застылі, слухаючы.

М а ч ы х а *(лямантуючы)*. А Божухна, а міленькі!.. Анеля ўтапілася... Людцы, бяжыце, ратуйце дачачку, радасць маю!.. Ратуйце, ратуйце!..

С в а т. Во бяда...

К с а в э р ы. Эх, куртатае маё шчасце!..

Абодва выбягаюць. Мачыха варочаецца ад парога.

Мачыха *(зларадна)*. Вось як... збылося... ха-ха-ха!.. збылося!.. *(З трывогай.)* Але Якуб, Якуб... што ён на гэта?!.

Заслона

# Стараста

*Жарт*

АСОБЫ

Стараста.
Мікіта Бульбатка.
Кандрат.
Сяляне.

Карчма. За сталом сядзіць стараста, а насупраць яго Мікіта Бульбатка. Кандрат і сяляне сядзяць за другім сталом.

Стараста *(устаўшы)*. Ты знаіш, хто я? Знаіш?

Мікіта. Чаму ж не знаць. Ты — наш стараста.

Стараста *(падняўшы палец угору)*. Стараста! Я — стараста! *(Аглядае ўсіх начальніцкім вокам.)* Ста-раста! Во! *(Стукнуў кулаком, як бы гэтым самым хацеў дадаць сабе больш велічы, затым шлёпнуўся на лаву.)*

Кандрат *(да сялян)*. Ахмялеў ад чыну і гарэлкі. Не ўстаяў, бач...

Стараста. Мікіта Бульбатка, а ты ведаеш, што гэта ёсць такое «стараста»?

Мікіта. Ведаю. Толькі не ведаю, якому старасту адказаць, бо бачу іх аж шэсць штук. Ну, стараста... стараста гэта і ёсць стараста.

Стараста *(матае незадаволена галавой)*. Што гэта «ёсць стараста»?

М і к і т а. Ты — чалавек, выбраны вобчаствам... Значыць, пастаўлены ад вобчаства. Вось гэта і ёсць стараста.

С т а р а с т а *(налягаючы, адбівае кулаком)*. Што гэта «ёсць стараста»?

М і к і т а *(заклапочаны)*. Ну, ты — нашае начальства... Ну...

С т а р а с т а. Во, во!.. Праўду кажаш. І калі пайшло ўжо на праўду, дык і я табе скажу праўду: ты — самы разумны чалавек у вобчастве. *(Падняў палец угору.)* Самы разумны! Так кажа табе начальства. Люблю я разумных, страх як люблю... Дай, пацалуемся...

Цалуюцца, перавесіўшыся праз стол.

К а н д р а т. Браточкі, глядзіце: розум з начальствам цалуецца!

С т а р а с т а *(да Кандрата)*. А што, можа, кажаш, што я не начальства?

К а н д р а т. Ды куды там! Ніхто не пасмее гэтага сказаць. Мы добра ведаем, што ты — нашае начальства. Хіба ж не ты ў нас падаткі бярэш?

С т а р а с т а *(ківае задаволена галавой)*. Так!

К а н д р а т. Ці ж не ты гоніш нас на работу?

С т а р а с т а. Ганю!

К а н д р а т. Ці ж не ты нам павесткі падпісваеш і завяраеш?

С т а р а с т а. І ты разумны, Кандрат! Ты і Мікіта — абое разумныя. Кажы далей!

К а н д р а т. Ці ж не цябе гэта Сальвесь Канстантаў гнаў млёнам праз усю вуліцу?

С т а р а с т а. Што?!.

Усе, стрымліваючы сябе, смяюцца.

К а н д р а т. Ці не ты ў халоднай сядзеў? Памятаеш, земскі пасадзіў?..

С т а р а с т а. Маўчаць!

К а н д р а т. Ці не ты гэта, як жабрак, нядоімкі збіраеш?

С т а р а с т а. Дурань ты, дурань, дурань!

Кандрат. Няхай сабе дурань, а ты — панскі папіхач! Якое ты начальства?! Пхае цябе пісар, пхае старшыня, земскі... Хто хоча, той і пхае. Вось спытай разумнага Мікіту.

Мікіта *(целяпнуў галавой, мармычучы пад нос)*. Ум... гм...

Кандрат. А што, і Мікіта пацвярджае, што ты папіхач.

Стараста. Мікіта, праўда гэта?

Мікіта. Ды ці я ведаю... Мне ўсё роўна.

Стараста. Ты мне кажы: праўда ці не?!

Мікіта. Ну, праўда...

Усе рагочуць.

Кандрат. Калі Мікіта сказаў: «праўда» — значыць, праўда, бо Мікіта — самы разумны чалавек у вобчастве.

Стараста *(грозна да Мікіты)*. Праўда?!

Мікіта. Праўда.

Стараста. Ах ты, гіцаль, і ты мяне лаеш, ты, каторы маю гарэлку піў! Мяне, начальства, лаеш? Ах ты, бунтаўшчык, крываносы басалай!..

Мікіта. Ты гэта што мяне перад усім вобчаствам бэсціш? А ты маёй гарэлкі не піў, каб ты смалы напіўся?! Жабіч ты! Ты думаеш, што калі стараста, дык ты ў мяне вялікая цаца? Пляваць я на цябе хачу! Начхаць мне табе ў вуха! Хрушч ты рыжы! Жабіны начовачкі, абармот, п'яніца! Пастух ты, вось хто!

Стараста. Ты мяне лаеш?.. Дык ці ты ведаеш, каго ты лаеш?! Мяне, даўжнасную асобу, пры спаўненні службовых абавязкаў... *(Схапіў бутэльку.)* Ды я цябе ў Сібір запяку, сатру на гліну, у халодную пасаджу! Ды ты ведаеш, хто я?! Людзі, будзьце сведкамі!..

Усе рагочуць.

Ага, вам смешкі з начальства... Вы зараз у мяне паплачаце! *(Выбягае.)*

Усе рагочуць.

Голас старасты. Пусці!

Кандрат. Глядзіце, начальства ўшчамілася! *(Паказвае на паліну світкі старасты, што ўшчэмлена ў дзвярах.)*

Голас старасты. Пусціце! Атвячаць будзеце!..

Кандрат *(глядзіць у акно).* Глядзіце, тузаецца, як трацяк у сасе! Ха-ха-ха!..

Голас старасты. Мікіта, пусці, бо я табе скуру спушчу!..

Кандрат. Во папаўся, як таракан у саладуху! Ха-ха-ха! Глядзіце!.. Адарваўся... Чабохнуў у лужу носам...

Усе кінуліся ў дзверы, глядзяць і рагочуць.

Стараста *(убягае з адарванай палінай у руцэ, вымазаны ў гразь).* Скажыце, які гад печаны хацеў мяне забіць?! Во вяшчэственнае даказацельства! Прызнайцеся, хто хацеў забіць?!

Кандрат. Ха-ха-ха! Вось табе і начальства — у лужу носам...

Усе рагочуць.

Заслона

## Блуднікі

Ноч. Мяцеліца. У хаце мяккі свет ад снегу ў вокнах. Як завые віхор у коміне, то жар у істопцы блісне ды зноў паволі тухне й тухне... У час зацішша чутно чыканне гадзінніка... Цёпла, бяспечна, добра. Вось у цёмным кутку хіснулася цень чалавека, падышла да прыпечку і, выпарнуўшы вугольчык, закурвае папяросу — вугольчык распылаўся, асвяціўшы бязвусы твар юнака. Закурыўшы папяросу, ён сеў на лаву пры акне. З таго кутка, скуль ён выйшаў, пачулася сумная песня жаноцкага голасу; песня штораз мацнее... Воддаль пачуўся раз-другі гудок цягніка.

Юнак. Наста, а Наста! Ідзі цягнік сустракаць, чуеш?!.

Наста. Запалі ліхтарню, галубок... Яна стаіць на лаве... з правага боку...

Юнак з поспехам паліць ліхтарню, каторая раскідае па хаце чырвоны і зялёны водблеск. Наста, накінуўшы кажух, бярэ ліхтарню і хутка выходзіць. Чуваць, як цягнік, грукаючы, праходзіць міма.

Юнак. А тэлеграфныя драты граюць, граюць, быццам хто па іх смычком водзіць...

Маўчанка. Юнак пачынае пасвістваць. Шумна ўваходзіць Наста і ставіць ліхтарню.

Наста. Дык ты, дзяцюк малады без вусоў, без барады, не верыш, што ён мне ногі цалаваў?! Га?..

Юнак. Ну то й добра, што цалаваў, а мне што за бяда...

Наста. Ох, саколік мой ясны, усе людзі так кажуць!.. Праўда, што табе за бяда, што мой муж — гэта маё насланнё, пагібель мая; што табе за бяда, што я не выдзержу і атручу ці ноччу засяку яго. Але што табе за бяда, што ён зараз прыйдзе і цябе тут знойдзе і задушыць, як кацянё, ха-ха...

Юнак. Бач, якая, а казала, што сёння, напэўна, не прыйдзе...

Наста. Ну, дай паваружым! *(Стукае палец у палец.)* Прыйдзе — не прыйдзе...

Юнак. Ты мне кажы толкам, а то...

Маўчаць абое.

Наста *(пакрыўджана)*. Не! Не прыйдзе!

Юнак. Так і казала б, я табе не блазан, тут кепікі з мяне строіць... Вось чаго ўжо не люблю!

Наста. Каб жа ён ніколі-ніколі, каб зусім не прыйшоў!

Юнак. Чым ён табе правініўся, што так яго паневяраеш?

Наста. Ох, каб жа ён мне што зрабіў, мо тады палягчэла б... Ён нічога не зрабіў. Найгоршы праступак яго, што ён ажаніўся са мной; з таго часу свет мне пеклам зрабіўся. Божухна, як я мучуся, як ён мне абрыд!

Ю н а к. Не адзін чорт лапці стаптаў, пакуль вас у кучу сабраў!..

Н а с т а. Здаецца, у гэтай хаце міла, багата, а так жа яно мне абрыдла! Вось як увайду, дык нейкая трывога, жах апануюць, як увалюся ў глыбокую яму... Адна ніколі не астануся...

Ю н а к. Дык яно ўсё абрыдне. Я ў школу хадзіў, хадзіў, а пасля — годзе галаву дурыць... кінуў...

Н а с т а. Ох, мой ты жучок, які ты яшчэ зялёненькі, без вусоў і барады! У такім веку і чорт прыгож... мала цябе жыццё няньчыла. Дай я цябе палашчу, мая ты ўцеха!.. Ведаеш, успомнілася мне: як я цябе — гэтак калісь мяне, сірату дурную, малалетку, хлопцы цацкалі, з пуцявінкі зводзілі... Пасля мне бабы сказалі, што ў мяне будзе дзіцё. Божа мой, як я тады намучылася, чаго толькі не выраблялa! Усё малое мучыла, душыла. Помню, гняздзечка з трыма пісклятамі сарвала з сучка, кінула на зямлю ды зверху каменем; а пасля, каб адмаліць грахі, калола сябе шпількамі, голадам марыла, а то памятаю... Эх, мой браток, чаго я толькі не пeражыла! Агонь і ваду перайшла і выйшла на дарожку, дыванoм высланую, роўную, чыстую — проста да самага Люцыпара.

Ю н а к. Дык усе бабы пойдуць да Люцыпара, бо кожная баба чорта ў сабе носіць; вось хоць сабе і ты: не то я цябе люблю, не то не; як пры табе, дык нейкая злосць бярэ, а як тут астануся адзін — на плач забірае, жаласць нейкая, ці што...

Н а с т а. А каб жа ты бачыў мяне маладую, касу маю тоўстую, шчочкі з ямачкамі, галасок, як званочак... Я цяпер пажаўцела, зморшчылася. А каса мая, гордасць мая, колькі ж праз яе я пашаны мела, колькі ўцехі ад зайздрасці і плётак сяброваk маіх... Марнее бедненькая *(туліцца да касы)*, валасы сыпуцца, ломяцца, а ўсё ад тых думак праклятых, ад жыцця гаротнага, марнеюць і ніяк выратаваць не магу. Вось нехта невідочны вырывае сілком з болем, губіць красу маю, і няма радасці, няма ратуначку... *(Плача.)*

Ю н а к. Вось надумалася — плакаць! Я надоечы згубіў ножык-складанчык і то не плакаў, а яна...

Маўчаць.

Ну, годзе, кажу. Чаго плачаш?.. Ці чуеш?.. Думаеш, мне лёгка жыць...

Наста. Ну, вось, паплакала — і мякчэй стала, а мой жа ты міленькі, і ў цябе вочы ў слязах... ха-ха...

Юнак. А як жа, у слязах... Яшчэ што выдумала!.. Вось ужо не люблю чаго!..

Наста. Ну, ціха ж, ціха, не плач! *(Прыпявае.)*

Не тужы ты, дзяцюк, болей,
Не крыўдзь сваёй ліхой долі,
Бо як тая уцячэ,
Туга горай прыпячэ!

*(Туліцца да хлопца.)* Эх, ты, мой міленькі, каб так нам удвох зажыць, каб з усіх сіл зажыць, каб аж галава захмялела, закружылася!.. *(Зноў прыпявае.)*

А мяцеліца мяце і гудзе,
А мой мілы нацянькі ка мне ідзе...

Пачынаюць кружыцца па хаце. Чуваць страпанне, стукат у дзверы.

Хто там?

Чутны мармытанне, стогн.

Хто там?

Адчыняюцца дзверы. Хлапец хаваецца пад ложак. Уваходзіць, зусім знямогшыся, мужчына, увесь у снезе, сасульках; лапаючы сцэну, падыходзіць да ложка, але валіцца вобземлю.

*(Памагае яму легчы на ложак.)* Ах, Божухна мой, што з табой, золатца маё, Казючок міленькі?!.

Казюк. Я зусім змёрз, я ранены. Настачка, я памру, не чапай мяне, дай супакою... Так сонна мне, Настачка, так сонна... Я памру...

Наста *(бярэ ліхтарню і прыглядаецца да Казюка)*. Сонна... ха-ха!.. Яму сонна... Казючок, муж мой, то ж і дзякаваць Богу, што табе сонна, мо на век вечны заснеш, а я сабе і новага прызапасіла. Добра кажуць: «Запас бяды не чыніць». Вылазь, галубок, не бойся: ён ужо не страшны, ён сонны, ха-ха!..

Выцягвае хлопца з-пад ложка. Казюк, згледзеўшы іх удвох, хоча кінуцца на іх, але, зняможаны, валіцца на зямлю.

Казюк. Здрадніца, гадзіна!

Наста. Паглядзі, мой галубок, як у яго кішэні надуліся — яны поўныя грошай; я яго сумысле паслала аграбіць арцельшчыка, а ён жа слухае, як сабака... цялюк мой добры, добры... *(Гладзіць Казюка.)* Ой, укусіў! *(Піргае нагой.)* Цыт, гаўра, не кусайся!..

Казюк. Людцы, міласці... не мучце, уміраю, трудненька мне! Настачка, Настачка, даруй мне, цяжка на душы!.. Ты не вінавата, Настачка... гэта я сваім жыццём цябе загубіў... Даруй, ох, трудненька мне... я забіў арцельшчыка, ён мяне раніў: баліць, агнём гарыць рана мая, тутака грошы... ох, трудненька мне.

Наста. Ну, дзяцюк, вазьмі ліхтарню ды пасвяці: трэба выбраць грошы; будзем лічыць, ці шмат.

Юнак свеціць, яна дастае грошы і галосіць, жартуючы.

О, дзякуй жа Богу, ты мяне пакінуў, пакінуў вясёлай, як сарока, пакінуў мяне, шчабятушку, раскрыў клетку на свет-волю. Каб жа ты смалу цягаў пад кацёл, у каторым я буду гатавацца, ох, каб ты, ха-ха... Во, колькі грошай — ты ведаеш, я цябе сумысле паклікала, каб ты памог адабраць грошы, як ён прыйдзе, а калі трэ было б, то і забіць...

Юнак *(ставіць лямпу)*. А згінь ты тут, прападзі з усім разам! Хай на цябе звод, нячыстая сіла!.. *(Шпарка выходзіць.)*

Наста. Ох, Божа мой, ізноў я з ім адна... *(Задумваецца, пасля кідае са стала грошы на Казюка.)* Казюк! Казюк! *(Падыходзіць да яго.)* Памёр! Ну цяпер нашы дарожкі разышліся — я пабягу сваёй, а ты... Ах, гора маё, у яго вочы адкрыты, глядзіць бельмамі, холадам цябе ўсю абдае... у хаце зноў будзе нябожчык. Трэба іх закрыць. *(Закрывае Казюку вочы.)* Не наглядзеліся за жыццё — нечага па смерці ўзірацца. Спіце, нягодныя, вякі вечныя непрабудна спіце!.. Божа, які ён страшны, гідкі!.. *(Адходзіць.)* Што мне рабіць?!. *(Задумваецца.)* Ха-ха — што рабіць?!

Жыць! Эх, весела, сытна, багата жыць, карыстаць з жыцця як мага, каб пачула маё цела, мая душа, што я жыву... О, маё жыццё — гэта быў страшны сон, чорная, душная ноч... цяпер канец, годзе мукам!.. Жыць! Маё віно, хлопцы, золата, багацце — усё маё, увесь свет мой! Гэй, чорт, нячыстая сіла, глянь: я Хрыста прадаю! *(Зрывае з сябе медалькі і кідае вобземлю.)* Бяры душу маю, толькі дай мне ўцеху, хмель, забыццё... Разлівай віно, звіні золатам!.. І грошы гэтыя, шмат іх... усе мае... залітыя крывёй, грэшныя, пякельныя грошы, мае грошы... *(Выпускае грошы і з жахам адскоквае ад мерцвяка.)* Зноў глядзіць... проста вытарашчыў на мяне... Ах, заве мяне, заве... Ціха, ціха!.. Ідзе ўжо... во, сабакі на яе выюць, скомляць... віхор свішча паміж яе костак... Зараз, зараз... будзе тут, паласне касой... ціха... с-с... *(Туліцца ў цёмныя куткі, зашчапіла дзверы, прыслухоўваецца.)*

Раптам чуваць моцны стукат у акно,— яна ўскрыквае і валіцца на зямлю. Зноў чуваць стукат і голас: «Людцы добрыя, скажыце, калі ласка, кудой праехаць да Святога Кута?»

З а с л о н а

## На шляху да сонца

Убогае, з нізкай столлю прыстанішча — мансарда. Паўкруглае акно без малога даходзіць да падлогі і завешана старым лахманом. У кутку пасцель на нейкім узвышэнні. На пасцелі ляжыць ю н а к і ціха стогне.

На пустой скрыні каля пасцелі гарыць каганец. Кнігі, паперы, малюнкі раскіданы ўсюды. Фабрычны гудок...

Юнак спяшаецца ўстаць, але па яго збалелым твары, худым целе відаць, што не ўстаць яму. І праўда,— падняўшыся, зноў бухнуў на пасцель, як падгніўшы верставы слуп, кажучы: «Ох, беспатольны я чалавек!»

Б е с п а т о л ь н ы. Гудок... на работу трэба ісці, і няйдзецца. А людзі кажуць: хто хоча, той можа. Я не толькі хачу, але мне і трэба, і не магу. Гудзі,

гудзі сабе,— толькі я ўжо цябе больш не паслухаю, бо ў мяне ёсць новы гаспадар, шмат прыхільнейшы, дужа ветлівы. Я ў цябе, крыклівага, потам абліваўся, хвіліны вольнай не было — усё араў у полі нядолю; а мой новы гаспадар дык цераз меру ўжо добры — усё ляжаць, аддыхнуць запрашае. Дзякуй вам, дабрадзеі, за хлеб і пашану дзякуй!..

Гу-у... не разбяру, ці гэта ў мяне ў вушах гудзе, ці там... Ох, трудненька мне, так балюча на душы, так сіратліва, адзінотна. Вось каб як перабрацца ў другое месца, на край горада, дзе была б драўляная хаціна ў цяньку ліп, жоўтыя дарожкі, раніцай пеўні... А тут во гэтая падушка дык як чарвякамі напіхана,— і капошацца, шаўкаюць, як у мерцвяку; а ложак мой быццам над бяздоннай чарнатой стаіць. І не сысці мне адгэтуль, а сыду — у бяздонне правалюся; лятункі павянуць, засохнуць... Крыўдна, жудасна, халодны пот выступае... І няўжо я сапраўды ўжо не ўстану?.. *(Паўтараючы гэтую фразу, устае, перш трымаючыся за сцяну, пасля сам ідзе-варочаецца на ложак. Цяжка дыша.)* Ну, вось, гэта яшчэ не так хворы, калі хадзіць магу. Няма мне чаго вельмі трывожыцца... Толькі вось немач нейкая апанавала, ось, быццам прыпаў нехта ноччу і выпіў з мяне кроў, сілачку маю... Ой, хвароба благая не тым, што мучышся фізічна, а тым, што ад цябе адкасаюцца і Бог, і людзі, і мудрасць.

Але нічагусенькі; галоўнае — верыць. Арганізм мой малады, павалтузіцца зможа і без лякарстваў. Галоўнае — верыць! *(Паднімае рукой табурэт.)* Го-оп! Во! Гэ-гэ, не тужы, дзяцюк! *(Выбівае пальцам якуюсьці вясёлую мелодыю, думае, усміхаючыся.)* Не, як устану, то першым чынам... Эх, як я ўстану з гэтага логава, то пайду і пайду без аглядкі, бясстрашны, бурай налячу на сучаснае жыццё, раскідаю, размяту і пабудую... Не, нічога не пабудую, а рвану ўсе ўстоі, бажніцы, крыўды, і скрышыць мяне руіна, згіну, змогшы ворага, згіну сярод барацьбы... О светлая хвіліна!..

Пайду я да новых, да тых, што будуюць; дарую ім найвялікшую любасць, сонца дарую, пайду па светлы ўспамін, па вечнае жыццё.

О, матулька даражэнькая, і да цябе я палячу на крыллях добрай славы, да цябе, красачка мая белая, несмяротная, пад саламяную страху, пад нівы прыземістыя...

Што гэта — каганец тухне? Цямнее... Але газа яшчэ ёсць. Гэта ў вачах цёмна стала — галава закружылася... О, Найвышэйшы, калі ты чуеш мой стогн, разумееш мае мукі, калі ты...

Перабівае яго музыка і гоман ігрышча.

*(Як штосьці ўспамінае.)* А там, за вёскай, за борам, на ўзгорку, грамаздзяцца муры недаконачанай будыніны. Горда раскінуліся яны ў бакі, знаць, творца іх меў вялікі размах і цвёрды гарт думак. І ўсё-ткі муры гэтыя недаконачаныя, і яны ўжо руіна — рассыпаюцца, урастаюць у зямлю... Ах, нават і рака, што калісь воддаль плыла, цяпер змяніла кірунак і, здрадліва бліскаючы, імчыць каля руін, падрывае фундамент, памагае часу руйнаваць. А на мурах гэтых, у цеснай шчыліне, вырастае маладзенькі дубок — няўдалы такі: лісткі бледныя, кара чахлая, а як вецер павее *(хоць бы гэта было дыханне зары)* — ён задрыжыць і гнецца так жаласна, з вялікімі мукамі. Бедны праклёныш! Чаму ты ўпаў на гэткі грунт і навошта табе жыццё гаротнае? Нашто гэта жыццё гаротнае: і так неміласэрны законы твае, Божа моцны... нашто?!. Адкрый мне свае тайны, скажы мне: я тут адзін? скажы і забі мяне... толькі скажы!..

Чую гоман ігрышча і вясёлую музыку... Там ёсць радасць і шчасце... Там людзі гуляюць і весяляцца... Як гэта дзіўна адбіваецца ў душы маёй! Малююцца мне бляск, салодкія стравы, хмельнае віно, люстраныя сцены, у якіх адбіваюцца, як вясёлкі, паненкі. Іх шмат, як пахучых красак у садку, а паміж імі чорныя, як жукі, кавалеры. І вось, каб я быў разам з імі, то стараўся б, каб палюбіла мяне самая задуменная, найбольш сумная дзяўчынка. Прыгарнуў бы я яе моцна-моцненька і сказаў бы: «Гордасць, надзея мая, будзь яшчэ шчасцем, уцехай маёй...» Але куды ж мне! Я, мусіць, калматы, худы, бледны, як выхадзец

з магілы... Цікава ўсё-ткі, як я выглядаю... ось няма люстэрка... *(Ідзе да міскі, дзе мыецца, налівае вады і ўглядаецца ў яе.)* Лепшых, як кажуць, у магілу кладуць. *(Хістаецца і валіцца вобзем. Паўзком дабіраецца да ложка.)* Ух, змучыўся! Ат! Дурны я з сваімі лятункамі... зямлёй пахну, адной нагой у магіле стаю...

Трэба лепш карміцца. Усё буду прадаваць... Як сіл набяру-набуду... А то яда ў мяне вельмі несамавітая. *(Шукае.)* Вось была скарынка, і мыш, пэўна, з'ела... *(Знайшоў скарынку, грызе яе.)* Безгалоўе, прокляць! Называюся царом зямлі — а ні разочку не пад'еў, каб мог сказаць: досі, наеўся па горла! Усё бег, змагаўся, шукаў, летуценіў, верыў, пачаў вялікую працу — ахарошыць, аздаровіць жыццё ведамі, а тут — маеш табе: смерць... Але што такое смерць? Напрыклад, я ходаюся, не паддаюся, кратаюся; я — гэта жыццё. Ну, а дзе смерць? Цела, дайшоўшы да парога сваёй пуцявінкі, пачынае новае жыццё... А душа?.. *(У задуме.)* Кружацца, таўкуцца думкі, як на глыбокім дне залатыя рыбкі: блісне адна, другая — і няма... Думкі хваляй набягаюць, і не ўцяміш, не выкажаш іх. І абступаюць мяне цені будучых пакаленняў, ловяць мае невыразныя, незлічоныя думкі, і яны ў руках замяняюцца на букеты з чароўных пахучых красак. І асыпаюць мяне цені праскамі, і чую дзіўную мелодыю — музыку срэбных званочкаў: жыць, жыць, жыць... *(Схамянуўшыся.)* О, каб хутчэй дзень, каб сонца... Так мяне цемната страшыць, ноч мучыць... *(Чытае кнігу.)*

Кніга праз якісьці час вывальваецца з рук.

Блага мне, блага, ой, як трудненька! *(П'е ваду.)* Каб куды ўцячы — надаела, збрыдла мне ўсё тут... Вось мне здаецца (а мо гэта і праўда?), што ўся мая бяда ў гэтай пасудзіне... *(Разбівае яе, ставіць табурэт уверх ножкамі, зрывае партрэт са сцяны.)* Біў бы, крышыў усё! Крыўда патрабуе помсты, страшнай, крывавай помсты, катавання, здзеку!..

Маўчанка. Чуваць музыка.

*(Напявае рэвалюцыйную песню і перарывае яе моцным, наўзрыд, плачам.)* За мае шчырыя, светлыя думкі-лятункі, за добрыя ўчынкі, вялікія жаданні, мазольную працу — і такое гора, нечалавечыя мукі і панявера святасці маёй душы. Я, што ўсёй моцай юнацкай душы хачу працаваць, тварыць, так моцна хачу жыць,— і гіну-гальчэю без пары ў муках... О неба, няўжо ж гэта я блудзіў?! Людцы, няўжо ж гэта ваша праўда?!

Няма ратунку, няма!.. Людзі адзінокія ў сваім горы, людзі бяссільны, ашуканы, і не толькі я, але і іншыя, безнадзейна хворыя... Няма жыцця, некуды схавацца ад ледзянога глуму, глухога на мальбу, стогн... Чую, чую, як глум ступае па зямельцы і стогне, угінаецца зямелька. Разлягаецца рэха ад яго страшных, цяжкіх лап... Тух! Тух!.. Вось ён ужо недалёчка... Ідзе, ідзе...

Стукат у дзверы.

*(З жахам прамаўляе.)* Можна...

Стукат.

Можна...

Дзверы са скрыпам адчыняюцца. Нікога няма. Жудкая маўчанка. Валіцца з акна лахман. Сонца. Відаць горад. Гудуць званы. У адчыненым акне паказваецца маляр у белым фартуху, запэцканы пабелкай.

Маляр. Добрага дня ў галубятню!

Беспатольны. Добрага... Хто вы?! Як жа гэта аж сюды... Божа, як я рад, дужа рад! Гэта вы дом беліце, гэта вы, мусіць, і стукалі?..

Маляр *(разглядаючы пакой).* «Беліце»... «стукалі»... Кнігі, малюнкі, рыззё... Ну і ўлез жа ты на стопаверхнае гора!.. І як жа ты сюды ўзулубаўся? І чаму гэта на работу не ідзеш?

Беспатольны. Не магу... не маю сілы. Хворы.

Маляр. Цьфу ты! Якой нудотай займаецца. Я думаў, пасля п'янства... А ён — «хворы».

Беспатольны. Я не жартую, чалавеча. Ужо тры дні, як не працую... Смерць галодная мяне чакае...

I з кожнай хвілінай горш і горш... Нейкае праклядце вісіць нада мною! Цяжасць грахоў, блуду спрадвечнага, сусветнага гне мяне далоў, мучыць, крышыць. І ось бы тая каменная сцяна абрушылася на мяне. І гора маё, што я яшчэ не ўзрос, не акрэп, не загартаваўся, што я бяссільны выглянуць з-пад гэтай цяжасці, каб мог пабачыць светлае, шчаслівае жыццё. Скажыце слова ўцехі, пашкадуйце мяне... Калі ж будзе канец маім мукам?!

Маляр *(сядае на акно)*. Ого-го, дай жа мне на цябе паўзірацца. Гэта значыць, кінуў вёску, цяжкі хлеб і барзджэй у горад па навуку, славу, роскаш... *(Смяецца.)* Ну, а што далей? *(Маўчанка.)* І ў гэтым гняздзе шыпучай бяды, і тут шчасця чакаюць! Ох, шчасце, дзе ж ты запрапасцілася! Усю Зямлю людзі абышлі, абшукалі, і вось тут, у гэтым віры людскога патоку, мільёны гаротных, беспатольных сабраліся, каб знайсці, збудаваць шчасце. Але ці ёсць ты дзе, шчасце, і ці было, ці будзеш ты калі? Тысячы пакаленняў верылі, змагаліся, гінулі за лепшую будучыню, насаджвалі райскіх дрэў... Го, думалі, завядзём калісь рай на Зямлі. Завялі, каб на вас звод, слепата курыная, пустацветы! Прасніцеся і скаштуйце гаркчыню пладоў, што ўзгадавалі для патомкаў, прасніцеся і скажыце балючую праўду, скажыце, што і мы будзем ашуканы, асмеяны, пракляты... Дык у чым жа наша шчасце і ці патрэбна яно?! Мы ўжо праз хітрыя шкельцы прыглядваемся да ўсяго, раздрабляем, поўзаем, як плюга тая... і ўсё шукаем... Мы, бадай, ужо ўсё паканалі, не — зглумілі, знішчожылі, і астаўся чалавек з адным ворагам, астаўся сам з сабою... І паканаць нельга і ўцячы некуды... Ну, але годзе Лазара пець, вось, можа, маеш чым пахмяліцца, а то верашчыць у жываце нешта...

Беспатольны. Прыкра вас слухаць... Хоць бы і было так дрэнна, дык усё-ткі якісь ратунак гэтаму ёсць... і павінен быць.

Маляр. Ёсць, ёсць, а як жа, ёсць: гэта як найхутчэй увесь род людскі як найстрашнейшую пошасць закапаць жыўцом у зямлю, закапаць як найглыбей, нагой прытаптаць, камень цяжкі ўзваліць...

Беспатольны. Вашы словы як чад, як скавытанне ашалеўшай жывёліны. Вам невядомы вялікія ідэалы, шуканне тайнаў, нязведаных абшараў у бязмежнай душы чалавека.

Маляр. Ха-ха-ха! Слухай жа, зелянюк, не мне, а табе няведама, што хаваецца пад гэтымі крылатымі словамі. І шчаслівы будзеш, калі памрэш, не даведаўшыся. Я, братка, таксама быў на мансардзе і бачыў шырокія гарызонты будучыні, загараўся ад Liberte, egafte traternite, пеў гімны свабодзе. Пасля дастукаўся да вучонага знаку і перайшоў жыць у ніжэйшыя паверхі. Але і там сярод роскашы, дастатку не было мне супакою: нявідны чарвяк тачыў і тачыў мяне; і я, як той апад, зваліўся ў сутарэнне. І тут няма ратунку: туга-моль душы і тут дакучае. Як ранены гад, сыкаю на людзей, на жыццё. І каб жа было жыццё, а то нейкая невылазная памыйная яма.

Беспатольны. Шкада, што такія людзі родзяцца свет паганіць.

Маляр *(не чуючы)*. Я бачу, што туга і цябе мучыць, але пад тваёй тугой гарыць полымя юнацкіх надзей, табе хочацца змагацца, верыць, у тваёй галаве рояцца ідэі, мэты, малюецца светлая будучыня... Але гора тваё, юнача. Хай цябе паняньчыць жыццё — і ты пераканаешся, што жыццё не варта тых мук, што ўсюды блуд, непатрэбшчына, зменнасць, фальш... І застыне, зледзянее ў табе гэты шырокі, адважны размах душы, і ўцяміш ты, што Зямля дужэй за ўсё, што на ёй жыве, усіх яна паканае, пахавае на векі вечныя, перагноіць, бо яна гэтым жыве. Але Зямля таксама смертная. І горш таму, хто вышэй ад яе падняўся.

Беспатольны. Я не магу больш вас слухаць, ідзіце адгэтуль, ідзіце! Душна мне...

Маляр. Чакай, я вельмі люблю бачыць, як безнадзейныя хворыя паміраюць.

Беспатольны. Выйдзіце, прашу вас, малю, дайце мне супакоіцца! Аднаму мне лепш... Дайце мне набрацца сілы. І я ўцяку адгэтуль... я не магу тут жыць!..

Маляр. Ну, гэта ты стрывай. Горад цябе не пусціць, чуеш, не пусціць: занадта чэпкія ў яго клешні, задуж ён, каб табе, кволаму, з ім ходацца. Горад — гэта сучасны волат, гэта аграмадная, багатая, моцная душа, вельмі адважная, здатная да бітвы з сіламі прыроды, нават з самім Богам... (*Маўчанка. Глядзіць на мукі Беспатольнага.*) На, закуры, мо палягчае...

Беспатольны. Піць дайце мне...

Маляр (*падае*). Што ты гэту ваду лыгчаш: толку з яе мала.

Беспатольны. Каб чаго кісленькага, халоднага...

Маляр. Каб учора не прагайдамачыў, то было б і кісленькае, і халоднае... А мо дзе й закінулася якая дурная капейка... (*Выварочвае кішэні.*) Тут во кішэні вытрасаеш, а там, у другіх (павер, бачыў), увесь стол застаўлены залатымі слупкамі. Усё чырвонцы, шчыразлотыя... Ласая штука!

Беспатольны. Божа мой, ці ж гэта мне ўжо няма ратунку?! Каб як доктара...

Маляр. Э, што там доктара! Есці табе трэба на абедзве шчакі, каб аж вушы краталіся, есці ад зары да зары, грошы табе трэба, жыццё вясёлае, якое жадае юнацтва, і бляск горада — вось табе што трэба! А ён: «Доктара, доктара...» Чакай, добрая думка: я тут пераначую і зраблю важны інтарэс,— мо й цябе ўзвяду на добрую дарогу, будзеш і здароў і весел. Перш-наперш табе трэба ведаць, што я не маляр. Я поўзаю па сценках дома дзеля таго, каб прыглядзецца, дзе што дрэнна ляжыць. Дык вось, памажы мне аблаташыць тут пузача з другога паверха...

Беспатольны (*моцна пакрыўджаны*). Разбойнік! Злодзей! Вон адгэтуль! Гвалту!..

Маляр (*вымае нож і замахваецца на Беспатольнага*). Цыц! Ты мне толькі пікні! Бач, як вышчарыўся, а, здаецца, чуць ужо дыхаў. (*Прывязвае вяроўчынай драбіну да падаконніка, затым спускаецца.*) Ведай жа, што прападзеш, як сабака, бо пакуль нажом не парнеш — не злітуюцца, не памогуць...

Беспатольны. Ох, я, мусіць, не вытрываю... Памру, памру...

**Маляр** *(праз акно).* Ты бачыш, што драбіна мая чуць прывязана? Пацягні во за гэты канец — і я стоцьма палячу на каменні. Скажаш, што драбіна сарвалася, і ўсё тут... А забіць чалавека не кожнаму ўдаецца... Цікава, варта... *(Знікае.)*

**Беспатольны** *(ідзе да акна, але слабее і садзіцца).* Ніяк не магу звязаць сваіх думак... *(Мацае кругом рукамі.)* Усё мне здаецца, што вакол мяне ляжаць чарапкі розных колераў; іх шмат, і ўсе яны — мае думкі, пабітыя, раскіданыя мае думкі... *(Кладзецца на ложак і трызніць.)* Дайце мне піць, піць дайце... Гарыць унутры, гарыць... Не тужыце! Мы свайго даб'ёмся!.. Эй, там, не адставай... Вышэй сцягі! Ну, пачынайце!.. *(Напявае.)* Горача, смага пячэ... Ну, зачэрпвай з таго калодзежа, з той крыніцы, хутчэй толькі!.. Стойце, не выходзьце, я малю вас! Не пакідайце! Бачыце, якая тут безгранічная пустыня і як усё цямнее, цямнее... Дзе вы падзеліся?.. Тут толькі цені, цені... Яны гусцеюць, пераплятаюцца... Страшна мне... *(Зрываецца з ложка, кідаецца да акна, сонца яго асвятляе.)* Сонейка маё! Здаровае, багатае, слаўнае, вясёлае сонейка! На шляху да цябе затрымалі мяне ліхадзеі і хочуць, каб я збочыў, і пагражаюць мне, і мучаць, вабяць бяспуццем. Сонейка маё іскрыстае, бессмяротнае... *(Энергічней.)* Не здамся я ім! Вырвуся з гэтага віру, каменнага страшыдла, уцяку, захаваюся ў непраходныя нетры, пад вываратню заб'юся, мохам абрасту, ваўком лепш завыю, каб толькі цябе, сонейка, бачыць і славіць, каб цешыцца жыццём, каб жыць...

Выходзіць і пры парозе валіцца мерцвяком. Чуваць фабрычны гудок.

Канец

# Сказ аб гуслях

Ахвярую чарадзею беларускай
лірыкі — Янку Купалу

Заходзячае сонца, прабіваючыся праз грозныя, яркіх, агністых колераў хмары, крывавіць і без таго ўжо акрываўлены ўзгорак. А ўзгорак гэты ад таго, што зямелька згорбілася, згорбілася ад велізарнага цяжару, каторы трымае на сабе. Вось ляжаць покатам велікалюды, згінуўшыя ў надмерных змаганнях за жыццё. Тутка-там тырчаць паглумленыя стрэлы, лукі, сякеры, а то і сукаватыя доўбні; а адзін з малойцаў-загубленых ляжыць з каранастым вырваным дрэўцам, як дзіцянё, заснуўшае з цацкай-уцехай. Над пабоішчам кружацца, каркаюць груганы. Відаць бляск пажару. Прайшоў ліхі вораг, як навальніца, як кара, паглуміў, пабраў, стаптаў усё лепшае, здаровае, пазганяў у нетры, балоты ўсё жывое. Толькі вось на пабоішчы, пужаючы груганоў, хістаецца кволы чалавек, пакінуты доляй паміж мерцвякоў, руін і папялішчаў, як непатрэбшчына. Ён, знаць, Гусляр, бо тупае каля паломаных гусляў і, як тая баба на хаўтурах, галосіць-прыгаворвае:

— Туга розум мой паланіла, калючкамі сцежку ўкрыла, чорным крылом засланіла радасць светлых дзён. Па сцежках, між красак і дубоў цяністых, тут песня хадзіла, у бляск сонца прыбрана, край адгукаўся рэхам галасістым, а рэха чуў Ільмень, Царград мураваны. І веча ў Полацку песняй гардзілася, і гэтай жа песняй старонка малілася. О, гуслі мае!.. О, песня няспетая!..

Але тут слязлівае мармытанне Гусляра перабіла гэткая гутарка збоку:

— Вось ідзеш, як па падушцы! А ты, Ілля, як там?

— Стой, Пётра! Ратуй, братка! Ну і ўграз жа я!

— А я таксама сунуся на дно дрыгаўкі і бачу праз альшэўнік, лазу і чаромху, што людзі там на ўзгорку спяць, хоць яшчэ і для курэй спаць рана.

— Гоп! гоп! А хто там жывы,— хадзі і паратуй, бо балота жыўцом нас глыне!

Пачуўшы гэта, Гусляр куцнуў у кусты, скуль ішоў кліч, кажучы:

— Добра, добра, бягу ўжо, а са мной дапамога і ўсё такое...

Паохаўшы, пастагнаўшы, выкаціліся ўрэшце на ўзгорак Пётра, Ілля і Гусляр.

Пётра. Ух, выкаціліся, хоць, мабыць, камар дужэй будзе за нашага паратуншчыка. Ну, але памаленьку, неяк жа...

Ілля. Але ж і гразка ў вас! І чаго вы тут-ка разгняздзіліся?!

Гусляр. А таго, што захаваліся ад ворагаў, гвалтаўнікоў, крыўдзіцеляў нашых. Не даюць нам распачаць жыццё... Але і тут нядрэнна: зямелька-маці ўсіх прыгартае і рада, чым багата... Вось толькі гуслі... Ой, бедныя мае гуслі! Ну, але час вам, мусіць, узяцца за справу, па якую прыйшлі, і хутчэй толькі. Эх, бо мне ўсё роўна цяпер — няміла жыццё паміж груд пабітых людцаў ні за што ні пра што, гібеюць, непахаўтураныя, пакінутыя на папас звярам, груганам, рабакам...

Пётра. Што ён кажа?!

Ілля. Дык гэта, значыць, усе мерцвякі? Дзень мой, век мой, гадзіна — прыбаўка...

Пётра. Дык скажы, чалавеча, што тут такое здарылася?

Гусляр. Тут, як гэта і ўсюды вядзецца, людзі захацелі мець болей свайго, а гэтае сваё расце лепш, калі яго крывёй паліваць... Мы — во ў якія нетры запраторыліся, аднак чорны бог усюды жыве, а з людзьмі яму вельмі дасужа. Нездарма і вы сюды прыйшлі. Дагадваюся я крыху...

Пётра. А скуль табе ведаць, чаго мы прыйшлі?

Гусляр. Ой, каму больш ведаць, як не мне? Я — гэта ўсё, што вы бачыце, увесь край, а ўвесь край — гэта я. Яго радасць — мая радасць, яго гора — маё гора. Дык як жа мне не ведаць?! І вось сваю веду

вам перакажу, што, сюды якi толькi дурань-прыблуда, чужак-пустадомак не ўспаўзе, кожны хоча гаспадарыць, каб яму ўсяго, чаго ён нi жадае. I вось пасля яго гаспадаркi пасеўнае поле лесам зарастае, вёскi пажарышчам пужаюць, гарадзiшчы зруйнаваны, а людзi дзiчэюць па лясах, балотах... Ну, дык чаго ж стаiцё?! Бярыце мяне ў палон, а не, дык забiце цi абдзiрайце вунь тых мерцвякоў — мне ўсё роўна... Вось толькi гуслi... Ой, гуслi мае даражэнькiя! Iзроньце сваё срэбнае слова, узнясiце к зорам душу маю, каб не бачыць, не чуць людзей, граху iх, паратуйце душу маю асiрацелую, абяздоленую!

Пётра. Ат, уздумаў жа прыгоду! Ад розуму, мабыць, адбiўся.

Iлля. Дзiўны ты, чалавеча! Мы зусiм не памыкаемся на тваё жыццё-быццё. Мы не тутэйшыя. Мы, вучнi Хрыста, вучыцеля ўсiх мудрацоў, прыйшлi з мiрам i дабром.

Гусляр. Не ведаю я вашага Хрыста i пакорна дзякую за фатыгу: зубы нечага загаварваць, бо яны мне i не баляць... Добрыя i вы цацы.

Iлля i Пётра. Як, вы Хрыста не ведаеце? Куды ж гэта мы заблудзiлiся, калi так?

Гусляр. Як, дык вы не ведаеце, што гэта крывiчанская зямля?! Дзiва! Мы, крывiчане, апрыч таго што з дрыгавiчамi i радзiмiчамi маем адну праўду, але з намi жыве яшчэ вялiкi таёмны дух, у паслузе якога знаходзяцца сонца, грымоты, русалкi, дамавыя, лесуны, вадзянiкi i моц iншых усяведаў, усёмагутных.

Пётра. Гм! Вялiкая дружына ў твайго Бога, але толку з яе, вiдаць, мала.

Iлля. Э, гэта ўсё робiцца ўжо дакучлiвым. Абач, добры крывiчанiн, будзь яшчэ лепшы i прынясi нам слязу неба, а то мы рассохнемся ад тваёй гасцiннасцi.

Гусляр. Выбачайце, але ж вы не на вяселле прыйшлi. Во — гляньце навокал, на ўвесь вiдавок, колькi тут было крывi разлiвання, сiлы пагублення, а смерцi пажыўлення. Хамы ўсе яны грубыя,

азвярэўшыя. Нашто брацъ, нашто гвалціць... хто пільнуе, той крадзе... Вялікі таёмны дух не даваў, не аднімае — ён толькі стараецца разгадаць свайго Бога. Дык і мы б жылі і пазнавалі яго і моцай духоўнай дужэлі б. Эх, граў я паміж іх, адзічэўшых, развогненых злосцю, граў на гуслях і песняй хацеў палоніць іх тупыя душы. Я падстаўляў свае грудзі пад сякеры, пад капыты, але яны не мяне зарубілі, стапталі, забілі, а маю песню, ганебна пакрыўдзілі мае гуслі чуластрунныя. Я быў паміж імі і, як сярод буралому, у роспачы крычаў: не крываўце зямлі, не крываўце зямлі, не крываўце зямлі!.. О, гуслі, о, гуслі мае, ізроньце срэбнае слова, усцешце мяне — непатрэбшчыну, самае кволае, няздатнае стварэнне, лішніцу, пустацвет!..

Пётра. Крывічанін, не валтузься! Хай боль твой сунімецца, бо — ты дужэй за ворага, мудрэй паміж сваіх, ты за смерць крапчэй.

Ілля. І чутка аб табе разойдзецца, а на небе будзе самая слаўная.

Гусляр. Ці вы згодны з гэтым, светлыя мужы, што апрача гоману бору, паху красак, усходу сонца і грання маіх гусляў бывае часам яшчэ нешта прыгажэйшае, мілейшае — гэта словы чалавека?.. Ага! Дык я пабягу па ваду. *(Выходзіць і вяртаецца.)* Я калі замаруджу, забаўлюся крыху... бо аж у крыніцу па ваду... яна ў нас надзвычайная — лечыць і добрых, і благіх.

Пётра. Дзякуем, мы пакуль што не хворыя. Ці няма тут бліжэй дзе вады?

Гусляр. Няма. Усюды ўскаламучаная капытамі, пачырванелая ад крыві... *(Выходзіць.)*

Пётра. Хай бы ён хутчэй — нечага нам загульвацца, бо я ключы ад неба ўзяў... вось яны... А там мо каму трэба будуць.

Чуваць далёкі гром.

Ну, і што ты робіш, Ілля, зноў грукаціш, стукаеш — тут і так граззю захліпаешся.

Ілля. Ну я-то ўжо ведаю, што раблю.

П ё т р а. Але, ты ведаеш. Добра аб табе людзі кажуць: «Ілля наробіць гніЛЛя».

І л л я. Гэй, там, грымі, грамавік, смалі, пярун!

П ё т р а. Узяць хоць бы надоечы: я падмёў, значыць, падмыў неба чысценька, гладзенька, усе кучкі, ахутаў зямельку лёгкай сінявой. Усюды параточкі, ахутаў зямельку лёгкай сінявой. Усюды парадачак — проста любата. Не! Дык вось трэба было парваць, паглуміць, заслюнявіць...

І л л я. Грымі там, гагокай, а мацней толькі!

П ё т р а. Трэба ўсё-ткі з людзьмі лічыцца і прыглядацца да іх патрэб. Тварэц не раз табе казаў: давай дажджняк, яны просяць, чуеш — просяць, просяць, бо ты недачуў і даеш, як яны косяць.

І л л я. Ах пакінь ты, піла тупая! Ось як пачне скрыпець, дык аж мяне бярэ ахвота раскумякаць табе, што ты круглы дурань, вось як! Бо ты, напрыклад, кажаш з людзьмі меркавацца. Добра! Але колькі ж разоў ты, дабрадзеец, пёк іх бязлітасна пры постаці, пакосе, паліў іхні ўраджай, сушыў іхняе поле, а?

П ё т р а. Ды, паміж намі кажучы, людзям не дагодзіш — дакучлівыя стварэнні.

І л л я. Во, так і кажы! А то завёў... Па іх сцежках небяспечна хадзіць — як відзіш галаву скруціш. Але ўсё-такі іх душы шмат узбагацелі пасля Хрыста.

П ё т р а. Ты, Ілля, не толькі глухі, але і сляпы. «Узбагацелі...» Глянь вунь на тых двух шчапіўшыхся мерцвякоў.

І л л я *(уздрыгваючы)*. Ух! Плюгаўства, агіднікі, самі сябе жруць...

П ё т р а *(адварочваецца)*. Мне мутарна...

І л л я. Уцячом!..

П ё т р а. Мы, калі куды прыходзім, дык не таго, каб адтуль уцякаць. Я, бачыш, хачу сказаць, што тут Хрыста яшчэ не знаюць і што, пазнаўшы яго... Эх, ведаеш, Ілля, спудлаваў наш вучыцель, што не адвучыў людзей мяса есці!

І л л я. Ён бы шмат чаму навучыў, але яны самі не захацелі.

П ё т р а. Ды яно заўсягды так — за добрае злым адплата.

І л л я. Не заўсягды! Недарма Хрыстос так палюбіў людзей і так шмат ад іх спадзяваўся. Нешта ёсць такое.

П ё т р а. Вось і я аб гэтым часамі мяркую. Возьмем сабе таго крывічаніна — ён асаблівы.

І л л я. Во, во, ён мне даўспадобы — такі цікавы, светазарны. Я ўжо разважаю, чым яму даказаць нашу прыхільнасць, спагаду. Я дык даў бы яму краску папараці.

П ё т р а. Ну, гэта небяспечна!

І л л я. То паправім яму гуслі і дамо ім вялікую моц.

П ё т р а. Ды не, зашмат!

І л л я. Пётра, будзь сябрам, зрабі! Мы не ашукаліся — тут, бачыш, уся старонка — добры грунт для нас. Яе маўклівая трывога, халодная развага абяцаюць цікавую разгадку.

П ё т р а *(папраўляючы гуслі)*. Каб яно не выйшла так, што абяцанкі — цацанкі, а дурному радасць.

Г у с л я р *(рупна ўваходзіць)*. Выбачайце, замарудзіў... Ух, замарыўся... Вось вам вадзіца.

П ё т р а. А табе гуслі... Пакуль ты схадзіў па ваду, дык мы табе іх паправілі.

І л л я. Ха-ха-ха... не верыць! Ты вазьмі іх на рукі, крані струны...

Г у с л я р. Гуслі... мае гуслі... паправілі... І добра паправілі? *(Кратае струны.)*

І л л я. Ну, а як ты думаеш? *(Смяецца.)*

П ё т р а. Гм... «Ці добра паправілі»...

Г у с л я р. Гамоняць, гудуць, чароўныя, жывуць і сіратлівую душу маю радуюць, акрыляюць. І не ўстрымаць мне сваіх пальцаў, і не ўцячы вам, галасістыя, чулыя струны. О, вясёлая навіна!

П ё т р а. Лійся ж, песня, па горах, долах, лясах... Будзі, яднай, сагравай каханнем. Ажыўляй памёршых. Лунай, песня, у паднябессі, спявай хвалу свету.

І л л я. Справядліва! Так быць павінна!

П ё т р а. Бачыш, Ілля, месяц ужо выплыў, дык павідну пасунемся.

І л л я. Ну што ж, то і пасунемся.

Пётра пайшоў, а Ілля стаяў і з любосцяй глядзеў, як Гусляр наладжваў гуслі. І калі ўпарадкаваныя струны зайгралі, зліваючыся ў гарманічныя тоны, то Ілля, ужо адыходзячы, пацалаваў Гусляра ў галаву і сказаў: «Люб ты мне!» Але Гусляр замоцна быў заняты, каб звярнуць на гэта ўвагу. Ён у той час праз гуслі з небам гукаў. Яго граннё (о, чароўныя гуслі!) ажывіла, прабудзіла Ламізялеза, Вярнігору, Вырвідуба і іншых — яны падымаюцца, хватаюцца за аружжа і пяюць:

Гэй, схамяніцеся ад сну —
Пара, пара нам уставаць!
Ад ворага ліхога след,
След помсты просіць нас.
Дык хто устаў, аружжа ладзь
І будзь гатоў на кліч, на збор.
Мы, як арлы тых груганоў,
Разгонім ворагаў сваіх,
Дакажам ім, навучым іх,
Што грозны і бяссмертны мы,
Што моц — магучы волат ёсць
З нас кожны целам і душой!
А ты, гультай, забаўку кінь,
Найшоў калі і дзе іграць.
Жыццё — змаганне, дык за край
І за жыццё у бітву йдзём.
Адняць трэ гуслі у яго
І даць атручаныя стрэлы,
Лук пругкі...

## Досвіткі

*Драматычныя сцэны*

Сялянская хата. Спачатку хату асвятляе зарыва пажару; пажар тухне, і пасля з другога боку ўзыходзіць сонца. Час ад часу чуваць далёкі грукат гармат. У хаце, як перапуджаныя авечкі, таўкуцца-запрытаіліся сяляне. На ложку стогне хворы. Адна з кабет, хістаючы дзіцянятка на руках, пяе калыханку.

З грамады:

— Душна, цяжка дыхаць, як пад лёдам.
— Як жывыя ў магілу закапаныя.
— Пагінулі, прапалі...
— І як жыць, з чаго пачаць?..

— Гарматы грукацяць, а мне выдаецца, што я ляжу ў дамавіне і на мяне пясок кідаюць, кідаюць...

Селянін *(увайшоўшы)*. Кара Божая, кара Божая... Ад вёскі засталіся чорныя галавешкі, белыя печы... дымам усё знікла. Толькі гэта хатачка аднааднюсенькая ўцалела, каб затуліць у сабе нас, пакутнікаў, знядужэлых ад бяды, мук...

Гаспадар. Хай бы лепш і яна пажарышчам стала, чымся дачакаць гэткае пашаноты.

З грамады:

— Не грашы, браце, Богу...

— А дзе твае яшчэ?

Селянін. Дзе мае?.. Жонка, знаць, ачумела ці хацела мо ратаваць, бо кінулася ў хату... а страха ўжо гарэла. Дачка, енчучы з болю, усё хадзіла каля вогнішча хаты і звала: «Мамка, мамачка!..» Ажно толькі цяпер выгарнулі яе костачкі... Я не мог глядзець... А дачка білася аб зямлю, кляла і блюзніла, аж пакуль шалёная куля і яе... Эх, чаму гэтая куля мяне абмінула?!

З грамады:

— Як, дык і яна забіта?

— Бедная дзяўчынка...

Селянін. Ох, браточкі мае, калі я згледзеў, як яе кроў дымілася на гарачым попеле побач з сатлеўшымі костачкамі яе маці, дык так запякло, задрыжала ўнутры! Крыўдна мне стала, моцна крыўдна. Камень грыз бы са злосці, помсты жадала сэрца... але ворага нідзе не было. Ды і хто нам вораг?..

З грамады. Праўда, усе нам ворагі, усе нас пакінулі, як зблытаных авечак. Усё пабралі, паглумілі, праз век запрацаванае крывавым мазалём. Б'юць нас, здзекуюцца з нас, а што мы? А мы, загнаныя ў казіны рог, жальбуем толькі.

Селянін *(стаіць, абапёршыся на кіёк, як бы сам да сябе)*. Хто нам вораг?.. Каб жа мы зналі, мо гуртам, грамадой далі б яму рады... Але кожны думае па-свойму, у кожнага іншы вораг, кожны сам сабе і ўсім вораг.

З грамады:

— Паны нам ворагі!

— Паны пабітыя ці паўцякалі, а на месцы двароў ляжаць выгарэўшыя плямы, а з іх бароў і пушч на нашыя шнуры і агароды лес ідзе.

— Грозным поступам лес ідзе...

— Мо лес наш вораг?..

З грамады выступае кволы чалавек у бабскім каптане; скідаючы яго, гаворыць да ўсіх.

Кволы чалавек. Я — ваш вораг! Наце, аддаю...

З грамады:

— Якім парадкам?

— Чаму ты нам вораг?

Кволы чалавек. Як пачаўся пажар на вёсцы, дык я, гэтага, кінуўся нібы ратаваць ды ўскочыў, гэтага, у Дамінікаву хату. Цапнуў, што папалася ў рукі, і ў кусты, гэтага. Думаю, калі забыліся на грэх, дык і я, гэтага, хоць пад старасць вальней пажыву. Але папаўся мне толькі вось гэты бабскі каптан. Пабег я да сваёй хаты, а яе ўжо няма — згарэла... Так і застаўся ў каптане, прыкрыў гэтак ім шальмоўскую душу сваю... І каб вы, суседзі, палаялі, а то і пабілі, гэтага, мо палягчэла б, а то ўсярэдзіне гатуецца, шчыміць, гэтага, як на дне пякельным.

Некаторыя смяюцца. Чуваць стукат у акно і крык.

За акном. Гляньце, гляньце, коціцца на нас аграмадны камень, лясы ломіць, горы расціскае, бажніцы крыша... Камень коціцца!.. Ах, проста на нас!..

Разбуджаныя дзеці паднялі плач; усе ўстрывожыліся.

Ярміла. Звар'яцела баба... Панесла раз яна сваім сынам есці ў лес, ажно глядзіць: на вярбе вісяць у бялізне тры дзецюкі, вышчарыўшы зубы на месяц. Як пазнала, што гэта яе дзеці, дык і звіхнулася з розуму... А доўгі час яе сыны баранілі нашу вёску ад напасці, далёка аб іх чутка пайшла, цэлыя палкі ўбок зварачвалі... Ажно, урэшце, падказаў нехта...

З грамады:

— Ат, меле языком, быццам людзі першы раз гэта чуюць.

— Лепш бы гэтага зусім не чуць.

Ярміла. Ды я так, каб не маўчаць...

Вар'ятка *(з візгам убягае і зашчапляе дзверы).* Ай, ратуйце!.. Пакусаў усё маё цела... Трымайце дзверы! Ён не Ярміла, а ваўкалака... перакідаецца ў рудога ваўка, п'е кроў людскую... Сваіх пляменнікаў паеў, маіх сынкоў, і хоць асілкаў, але здужаў, але змог... Цяпер мяне хоча з'есці, грызе дзверы, лезе... Ратуйце!..

Ярміла. Ты, сука, што гэта на мяне брэшаш!

Вар'ятка *(выбягае, чуваць яе крык).* Ай, камень коціцца, давіць, крыша!.. Уцякайце, уцякайце!..

Ярміла. Не верце, людзі! Ніколі я нікога не выказваў... Ніякіх людзей я не еў і ў ваўкалаку не перакідаюся. Гэта ёй проста папалася на язык маё прозвішча, вось яна і чаўпе. Не верце, браточкі, прысягну вам, што няпраўда! Каб не сышоў я з гэтага месца, каб не разняў гэтых пальцаў, каб... *(Маўчанка. Абводзіць усіх вачмі, як бы шукаючы спагады, але ад яго адсоўваюцца.)* Каб вы спрухнелі, чаго ж вы маўчыце, чаго ўцякаеце ад мяне, як ад пошасці якой! Вы той ашалелай верыце, а мне дык не?!. Плюю я на вас! Не баюся я нікога! Бо нікога няма. Бог з бажніцы прагнаны, паны ў палацах падушаны, начальства разбеглася, як мышы тручаныя, а вы... Плюю я на вас! Вось мне душна тут — і я разбіваю акно і не баюся нікога, бо я тут цар і Бог, і нічога вы не зробіце... Ха-ха-ха, як смяхотна тырчаць вашыя нямыя, перапужаныя твары!.. Чаго маўчыце, чаго прыціхлі, пабялелі, як нябожчыкі?! Ну, ем я людзей, ваўкалака я, душагуб, п'ю кроў, дык што ж?! І вы будзеце есці людзей, нават дзяцей сваіх, саміх сябе будзеце грызці, ліха вашай галаве!.. Будзеце, кажу, калі нівы гастаптаны, аруды пагарэлі, край зніштожаны, свет галодны, людзі азвярэлі, а злое ўсюды пануе, патопам разлілося, а пошасць, паморак, як чад, распаўзаюцца. Дык як жыць?!. У злым трэба шукаць ратунку,

шайтанам трэба стацца, хай вырастае воўчы клык... *(Узяўшыся за клямку ад дзвярэй.)* Вы, можа, думаеце, што я ўцякаю ад вас, баюся вас?!. Плюю я на вас! Душна мне тут, цесна... *(Шпарка выходзіць.)*

Доўгая маўчанка.

Хворы. Вось каб так ціха было, альбо каб смерць настала... Каб мяне ў касцёл палажылі: там і паветра шмат, і свету, і ціха-ціха... А хараство сценак і абразы наганялі б думкі аб Богу, аб небе, аб шчасці... Я б там выздаравеў.

З грамады. Каб жа смерць...

Хворы. Найлепшая падзяка за жыццё — гэта спакойнае, без мук, скананне.

З грамады:

— Мама, мамачка, дай есці... Мамачка, есці хачу...

— Ціха ты, дакука мая, няшчасце маё!.. Што я табе дам?.. *(Раптам прыгартае дзіця да сябе і плача.)* Супакойся, дзіцятка маё родненькае... Мне яшчэ трудней, бо мушу разумець твой голад і сама галадаць... Ой, гора ж маё, гора!..

Гаспадыня. Ціхаце ж!.. Я падзялю страву хворага... Хай дзіцянё заморыць рабака... *(Дастае з печы ежу.)*

Хворы. Дай, дай... мне толькі абы супакой, цішыня...

Кабеціна *(уваходзіць з дзіцянём на руках).* Святы чалавек, гэты наш вучыцель: дзе ён ступіць — там і радасць запануе.

З грамады:

— Ну, што там такое?

— Дык ён не ўцёк?

— Ну, хіба ж не бачыў, як ён тушыў пажар?

Кабеціна. Выратаваў мне дзіцёнка, жыцця не шкадуючы, выратаваў... Маю красачку, надзею...

З грамады:

— Дык чаго ж ты плачаш?

Кабеціна. Я і плачу, і смяюся, і жаль мне нейкі, і радасць, як з Богам гукалася... Ён усім памагае,

гэты святы чалавек. Цяпер раненых даглядае, поіць, суцяшае словам і чынам...

Чуваць шум матора; усе кінуліся да акна.

З грамады:

— Араплян, араплян!..

— Дзе?

— Глядзі ўверх, правей...

— Вунь дзе: як павук, паўзе па хмарцы...

— Бомбы, мусіць, кідае... Каб на нас не кінуў...

— Хай бы ён лепш, лётаючы там, каля сонца, свету нам кінуў.

— Ох, калі гэтая крутаніна кончыцца, калі ўціхамірыцца?!. Няма жыцця!..

— Круціцца, мелецца, як на торжышчы якім...

— Крыўдна нам, крыўдна... Вось хоць бы я: з багатага, семяністага гаспадара астаўся як стой. Жабрак! Усяго таго багацця — галоднае, халоднае жыццё.

— Церпім гора — мусіць, так трэба. Аднаго толькі цяпер прашу: каб супакоілася гэтае насланнё...

— Міру, міру!

— Нашы дзеці дык і не знаюць, што такое мір, спакойнае жыццё.

— Я надоечы, як хаваліся ад куль, прылёг у ямку. А кулі, значыць, нада мной роем пзынкаюць, хэ-хэ... А я перажагнаўся, утуліў галаву і ўзіраюся, значыць, у зямлю. Бачу: адна, другая дзюрачка, а праз іх так і снуюць мурашкі. Адна, значыць, казяўку якуюсь валоча, другая — траўку сухую — ну, ведама, кожная мае занятак. Толькі вось я, думаю сабе, туляюся па ямах, як збойца, кінуў гаспадарку, сям'ю... І за што, і нашто?.. І жаль, значыць, моцны мяне агарнуў, слёзы, як гарох, пасыпаліся, хэ-хэ-хэ... дадушы, пасыпаліся, самахоць... *(Незнарок выцірае слёзы.)* Ускочыў, значыць,

я і стаў навідавоку, але ні адна куля не зачапіла — такі ўжо лёс, хэ-хэ...
— Дык не дзіва: жывеш, здаецца, па-людску, і бацькі Бога не гнявілі, а вось душа калоціцца ў трывозе, як пакутніца, як бы ўчыніў якісь страшны праступак.

*Тут адзін з сялян, што спаў, прысеўшы на падлогу, ускочыў, крычучы спрасонку.*

Прабуджаны. Стойце, не біцеся! Пагібель на вашу партыю!

З грамады:

— Чаго ён? Што з ім стала?
— Спрасонку, пэўне...

Прабуджаны *(ачуняўшы)*. Ох, дайце рады! Толькі, гэта, вочы зажмурыш, як перад табой аратар так і тараторыць, так і камандуе рукамі... Сніў, што мяне прывязалі да слупа, бо я не хацеў слухаць, а тут кожнае слова аратара як цэпам па галаве, як цэпам па галаве... Ох, ажно цяпер галава баліць, гарыць, покаецца ад болю, пал у грудзях, сэрца ные, трапешчацца...

З грамады:

— Усялякія партыі навыдумлялі! Які чорт ні вырвецца з падваротні — усё новую партыю табе суліць, просіць дапамогі, яднання, падбухторвае на сваіх ворагаў. І ўсе точуць вайну, толькі не паміж сабою, а з нашымі курамі ды парасятамі.
— Скубуць, як гарох пры дарозе...
— Здаецца, у лес бы ўцёк, у зямлю жывы палез, так усё надакучыла...
— І ніяк душа не прымае, у галаве не тоўпіцца...
— Мукі!.. Акапцілі душу, цьфу!
— Я вам кажу, што антыхрыст прыйшоў, а яго прыхвасні каламуцяць жыццё і свет, хочуць збіць з панталыку, ачмуціць, а тады з нашым братам што хочаш рабі, хоць поле абнавозь...
— Адзін ратунак — да споведзі схадзіць.

— Каб жа было каму спавядаць...
— Усе ўпрочках.

Уваходзіць вучыцель і ўносіць звязаныя кнігі.

Вучыцель *(выціраючы пот).* Ух, замарыўся, знямогся... Але хоць крыху адратаваў... Як шмат вас тут сабралася...

Дзіця *(аглядаючы кнігі).* А-ей, як абгарэлі!.. Во дзе «зорка», а замурзалася як!

З грамады:

— А чаму гэта вучыцель не ўцёк ад ворагаў?
— Нам дык няма куды, але вам са светлай галавой дарога адкрыта...

Адна з кабет пяе калыханку.

Вучыцель. Не магу, бо тут засталося наймілейшае, найдаражэйшае душы маёй.

З грамады:

— Хто гэта?

Вучыцель *(прытуляе да сябе дзіця).* Во хто — Маладая Беларусь! *(Да дзіцяці.)* Скажы мне, уцеха, гордасць мая, ці любіш Беларусь?

Дзіця. Як жа мне яе не любіць, калі яна багаціць і акрыляе душу маю, калі я першы раз згледзеў тут сонейка, неба, пачуў калыханку ў матчынай мове! Люблю за яе хараство, люблю за тое, што нікога Беларусь не крыўдзіла і не няволіла! Люблю ўсёй моцай душы сваёй!

Вучыцель. А ці верыш у Беларусь?

Дзіця. Моцна веру, што закрасуе наша сярмяжная Беларуская праўда, што Беларусь будзе жыць на славу і шчасце людзей! Веру, бо мая вера мае мучанікаў.

Вучыцель. А ці ратаваць Беларусь будзеш?

Дзіця. Усюды і заўсёды, з потам і кроўю, бо люблю і веру ў Беларусь, бо без яе няма мне жыцця, бо ніхто яе не паратуе, калі не мы, дзеці яе!

Вучыцель. Слухайце ж вы, сівыя бароды, і знайце, што тыя, якіх яшчэ няма, будуць яшчэ мілейшыя, яшчэ даражэйшыя!

Дзед. Добра вы, пане вучыцель, навучаеце нашых дзетак, толькі ж нас гэтым не ўсцешыце. Не прыждаць ужо нам радасных дзён — дым з пажарышч нашых вёсак выесць нам вочы, голад паморыць нашых дзетак... Гора нам, гора!..

Селянін. Спрадвеку мы церпім крыўду і занядпад сваёй Бацькаўшчыны, ямо чорны хлеб наймітаў, нявольнікаў — аб гэтым сведчаць нашы бледныя твары, пашчапаныя ад працы рукі.

З грамады:

— І раны, калецтва нашых сыноў!

— І крык звар'яцелых матак!

— Як былі паднявольнымі, так і застанемся стагнаць пад чужым ярмом...

Вучыцель. Ніколі! Годзе трызніць! Жыва мова — жыве народ. Беларусь ужо ўваскрэсла. Сярод пажарышчаў, над трупамі замучаных, над стаптанымі нівамі ўсходзіць сонца лепшай долі, сонца нашага Адраджэння. Бурная радасць дрыгаціць унутры. Неўстрымана рвецца крык з грудзей: «Жыве Беларусь!» І гэтая праўда найчасцей, найглыбей у нас захавана. Слухайце, як маё сэрца гвалтоўна б'ецца ад любові да роднага краю! Гляньце, як вочы мае зіхацяць адвагай, бо я жадаю вялікіх, слаўных спраў, працы без супачынку, як чало маё гарыць ад агністых думак! Я аддаў гэтай зямельцы стаптанай, паглумленай крыўдзіцелямі, прыблудамі, аддаў усё сваё жыццё, сваю душу, і за гэта яна нагрnative дзіла мяне моцай магучай, непакананай. І няма мне перашкод, і няма тых кайданаў, якія змаглі б скаваць маю волю, акарнаць мае легкакрылыя думкі!..

Маладзіца *(убягае раненая, збалочаная, абарваная)*. Ратунку! Збаўленне! Там... вёску нашу паляць. Там забойствы, здзекі... Трупы, кроў пад нагамі... Дзіцятка маё ў агонь кінулі... Я ад паняверы чуць выратавалася... паранілі, намучылі... Помсты! Помсты!

З грамады:

— Значыць, хутка тут будуць...

— Што рабіць, куды дзецца?

— Прапалі!..

— Ох, ох!..
— А мо нас як абмінуць...

Чуваць далёкія выстралы. Куля разбівае абраз на сцяне, які з бразгам валіцца далоў.

— Кладзіцеся на падлогу! Кладзіцеся!
— Ох, Бог нас ужо забыўся.
— Уцякайце! Уцякайце!

Маладзіца *(заступае дарогу, стаўшы на дзвярах).* Стойце! Уцякаць... чаго ўцякаць? Укралі што? Душагубы вы! І ці, уцякаючы, бароніце сваю сям'ю, дамову, дабро? Куды ўцякаць: у лясы, балоты? Да звяроў, гадаў? Ды вы самі горш звяроў! А загінеце — невялікая страта!

З грамады:
— Пагібель тут нам.
— Уцякаць, уцякаць!..
— Набок яе, бі яе!

Маладзіца. Не пушчу, недалюдкі! Праз труп мой пройдзеце! Хай кроў мая спляміць навек вашы гідкія душы, а здань замучанай маці заслоніць вам свет! Пракляцце на вас, душагубы! Хай страшная помста падае з неба на вас і вашых дзяцей!

Дзед. Стой, баба, не праклінай! Мы ўжо і так праклятыя...

З грамады:
— Яна праўду кажа: няма чаго і няма куды нам уцякаць.
— А вышчарылася, дык як змяя...
— Ат, ды мне ўсё роўна: як усе...
— Усё-ткі смерці ў зубы лезці неахвота...

Вучыцель *(да маладзіцы).* Вы супакойцеся... Трэба ўсё цярпліва пераносіць. Дайце, я вам рану завяжу, бо яна ў вас крывавіцца. *(Рве хустачку і хоча завязаць рану.)*

Маладзіца. Боль душы заглушае боль маіх ран. Не гэтым рызманом трэба лячыць раны, і не па гэткія лекі я да вас прыйшла!

Вучыцель. Дык што ж нам рабіць? — мы бяссільны.

З грамады:

— Але, што рабіць?

— Кажы, калі такая разумная...

Маладзіца. Хіба ж вам мала кажуць пажарышчы, парытыя, здратаваныя нівы, трупы вашых дзяцей і жонак, гэтая кроў, што цячэ па мне?! Вы глухія на крык болі, на крык а помачы! Вы толькі послух маеце там, дзе посвіст нагайкі, і тады, калі спаласуюць вашую скуру ў крывавыя градкі! Вы больш не бацькі, не браты і не грамадзяне, а шкурнікі, здраднікі, бабскія аб'едкі!..

З грамады:

— Во разанула!

— Праўду баба кажа...

— Ды ўжо ж — гнілякі...

— Хлопцы, пачнём з малога: сабяром дзе якое аружжа, а там розум нам падкажа!..

— Ды ўжо ж, раз паміраць...

— Надта ўжо надакучыла гэтае безгалоўе.

— Гэй, там! Часу не марнуйце, каб пасля позна не было!

— Хадзем, хадзем!

Вучыцель. Грамадзяне, спыніцеся! Перасцерагаю вас — не будуйце на крыві сваё шчасце! Сіла не ў штыку і не там, дзе пануе дужэйшы, а там, дзе ўсе роўныя, дзе гарт душы і еднасць думак.

Чуваць выстрал. Вучыцель ускрыквае і валіцца нежывы на зямлю. Усе з жахам расступаюцца.

Маладзіца. Вось вам што рабіць: гінуць пакорна ад варожай кулі і пакінуць дзяцей у той няволі, у якой і самі гібееце! Альбо ісці за мной, а кроў маіх ран вызначыць вам дарогу!..

З грамады:

— Не абмінуць нам ужо смерці...

— Ах, Божа моцны, згінуў знішто.

— Такі чалавек...

— А ды годзі вам ужо лапатаць языком! Бачыце, бягуць сюды...

— Бабы і дзеці, хавайцеся ў склеп!
— Смерць за смерць!
— За праўду, Бацькаўшчыну і волю!

Кабеты і дзеці рупна выходзяць. Кожны шукае, чым бы бараніцца. Усе валтузяцца, крычаць; сярод моладзі жартуюць, смяюцца.

— Агата, а ты чаму не ўзбройваешся?
— А яна языком больш наробіць, як ты тапаром.
— Бабы, бярыце з сабой маладзіцу — аслабела яна, пабялела, як палатно.
— Стой, не чапай! Гэты таўкач мой, я сабе...
— А я з чым буду?
— Аддай!
— Ціхаце, дайце слова сказаць! Тут не да жартаў. Вы, старэйшыя, ідзіце ў Міхасёвы каноплі, а мы тут іх, каля хаты, прывітаем ды тады абапал і зашчэпім. Толькі завіхайцеся, бо справа крутая...
— Добра, добра.
— Хадзем! Хутчэй!
— Ура!..
— Складна прыдумаў...
— Павадыром яго, камандзірам зрабіць!..
— Жывей там чалдыхайцеся! Ідуць, як на прыгон...

Усе выходзяць. Хворы застаецца. З-пад печы вылазіць баязень.

Баязень. Пфу! Нанюхаўся курынай парфумы...

Хворы. А ты чаго пад печ залез?

Баязень. Я так сабе... Не думай, што я баюся. А прылёг я — ведама, кулі дурныя.

Хворы. Ах ты, брыда! Вон!.. Вон, кажу, ідзі!..

Баязень. Ой, братка, баюся!.. Хоць бы яшчэ дзянёк пажыць... Чуеш?..

На двары чуваць выстралы і крыкі: «Ура! Біце іх, душагубаў, зладзеяў! Даганяй гэнага куцага!.. Стой, гіцаль, не ўцячэш! Ай, ратуйце!» Хворы з натугай сочыць праз акно.

*(Лежачы на падлозе.)* Куды ты вытыркаешся?! Кладзіся на зямлю... там кулі!..

Х в о р ы. Вон! Не пагань хаты! Каб уміг...

Б а я з е н ь, войкаючы, перапаўзае парог.

*(Сочыць праз акно, цяжка дыша, мучыцца за сваіх, гаворыць хрыпла.)* Ага, пагналі нікчэмнікаў!.. Нашыя ўжо і аружжа маюць. Здаліся... вунь толькі. Ах, цэліцца!.. Божа!.. *(Крычыць.)* Беражыся, Тодар, схіліся!..

Выстрал.

Ха-ха-ха... Схібіў... Кінуў рушніцу, уцякае... А там, з-пад рэчкі, выходзяць другія ворагі. А шмат іх, як гразь цячэ!.. *(Рупна ўстае, хістаецца.)* Памагаць... разам... не паддацца... як цёмна... дзе дзверы?.. разам... не паддацца... *(Валіцца нежывы; узыходзячае сонца асвятляе яго.)*

Чуваць водгулле барацьбы.

К а н е ц

# На Каляды

Убогая хата. Нікога няма. Чуваць званы. Месяц праз акно асвятляе хату. Уваходзяць М а к с і м і А к с а н а.

М а к с і м *(топае з нагі на нагу, трэ рукамі вушы).* Мароз аж трашчыць, аж іскры сыплюцца, павекі зліпаюцца... А печка халодная...

А к с а н а. Нятопленая... няма дроў.

М а к с і м. Ну, Аксана, памаліліся мы з табой, цяпер давай падсілкуемся — чаго ты там прызапасіла. Спаткаем Каляды па-людску, па-гаспадарску.

А к с а н а. Толькі бедная наша вячэра: міска саладухі і трохі праснака. Запалі каганец.

М а к с і м. Працавалі мы шчыра, не аддыхаючы, а есці няма чаго. *(Паліць каганец.)*

А к с а н а. Не ўсім Бог роўна дзеліць...

М а к с і м. А вось каб я дзяліў, дык бы ўсім роўна падзяліў. *(Скача праз тапчан.)* Хто сколькі зарабіў, таму столькі даў.

А к с а н а. Што ты гэта робіш?

М а к с і м. Холад перамагаю.

А к с а н а. Пакінь! Апошнія лапці стопчаш.

М а к с і м. Лапці для мяне, а не я для іх. Ну, але ты круцей хадзі, а то жывот да спіны прыліпае.

А к с а н а *(несла міску з саладухай і выпусціла).* Ах!

М а к с і м. Маеш табе! Астаткі з хаткі. Дзе тонка — там і рвецца. Але ж тваім ахам сыт не будзеш.

А к с а н а. Гэта ўсё дурны паспех, людзям на смех. Прыйдзецца праснак усухамятку есці... Але ж дзе ён?! Тут, на паліцы, стаяў, а цяпер няма. Кот з'еў, пэўне, кот з'еў. Кожны дзень ён мне шкоду робіць.

М а к с і м. Цьфу ты, напасць! А мне што за бяда? Давай, бо есці хачу.

А к с а н а. А што я табе дам?! Хіба тагоката, што праснак з'еў. Усюды пуста, гола. Сала не стала, масла пагасла, каўбасы не нашы, пірагі дарагія.

М а к с і м. Значыць, па-твойму, кладзі зубы на паліцу і вый ваўком з голаду?

А к с а н а. Па-мойму, трэба ісці спаць — сон мацнейшы за холад, голад і бяду.

М а к с і м. Дзякуй,— каб цыганы сніліся! Ёсць нешта мацнейшае за сон. *(Абнімае жонку і, цмокаючы, цалуе.)* Ах ты, мая крупаварніца! Я больш аб нічым не думаю, толькі аб табе. Свет мне без цябе не міл. Вочкі твае — сонейка, губкі — мядок салодзенькі, носік — слівачка, шыйка, як сыр, а як яблычкі...

А к с а н а. Адчапіся! Ці не звар'яцеў ты?

М а к с і м. Голад перамагаю. Але няма рады — не памагае, кішка ў кішку лезе. Пайду пазычу ў суседзяў хоць хлеба лусту. *(Выходзіць.)*

А к с а н а. Пайшоў у пазыкі голы да абадранца, каб вярнуцца, з чым пайшоў. Ох, ты, доля, доля, мінаеш ты нашу дамоўку, блукаеш па чужых парогах, не чуеш нашай мальбы, нашага стогну! Дзе ты, доля,

дзе ты?! Прынясі нам солі, хлеба, цяпла і радасці ў гэты вечар святочны! Разгані тугу-сум! Прывядзі Каляду з песнямі, скокамі, жартамі, прыпеўкамі, каб спамянуць мінулае, палетуцець аб будучым!.. *(Пяе.)*

Ішла Каляда, калядуючы...
    Святы вечар людзям добрым!
З вёскі ў вёсачку, дый бядуючы...
    Святы вечар...
За ёй хлопчыкі, ўсё жартуючы.
    Святы вечар...
Прыйшла Каляда у Іванаў двор.
    Святы вечар...
Дары, не шкадуй, гаспадар Іван.
    Святы вечар...
Сып пшаніцы нам, шчодрай рукой сып.
    Святы вечар...

Максім *(уваходзіць)*. Выпрасіў, пазычыў. Хадзі, жоначка, падзелімся, пакуль кот не з'еў.

Аксана. Спрыцен жа ты! Дзялі толькі на тры часткі.

Максім. Ну, чаму на тры?

Аксана. Трэцяя частка Дзедку Марозку, каб не быў такі сярдзіты. Чуеш, як пастуквае-пагражае?.. Скацінку памарозіць, у хату ўлезе.

Максім. То, можа, і ката надзяліць, каб ён праснака не краў болей?

Аксана. Ты вось не жартуй, а глядзі, добра дзялі, а то сабе дык болей адрэзаў, як Дзедку Марозку.

Максім. Гэта, бачыш, нож крывы.

Аксана. Глядзі, каганец гасне... газы няма. Яшчэ адна бяда: будзем святкаваць без святла.

Максім. Наша свята: у холадзе, голадзе і цемнаце...

Каганец гасне.

Аксана. А мяне дык яшчэ і страх нейкі ахоплівае. Дрэннае прачуццё грызе, трывожыць. Чуеш, сабака вые?..

Максім *(да сябе)*. Сорам прызнацца, але мурашкі па целе пабеглі...

Аксана. Вось чую, як бяда з усіх бакоў находзіць... За вокны страпае, у дзверы б'ецца... Прыгарні мяне, Максімка...

Максім. Сціхні, кажу! Бо зараз як аддастажу цябе і тваю бяду разам. Будзеш мне тут бяду наклікаць.

Аксана. Глянь, вунь у кутку нехта чорны стаіць...

Максім. Дзе стаіць?.. А, праўда, нешта не так як трэба... Хто там, адзывайся?.. Хто, пытаю, а то дрэнна будзе?! *(Падыходзіць, баючыся.)* Не варушыся, а то страляць буду — равальварам так і бахну... Цьфу, напасць! Спадніцы спужаліся...

Аксана. А ты не вер вачам... Можа, і не спадніца — пашчупай...

Максім. Ах, я табе зараз задам такога страху, што...

Чуваць моцны трэск, як выстрал.

Цьфу! Цьфу! Цьфу!..

Аксана. Ах! А што! Не казала я...

Максім. Глупства, гэта мароз трашчыць...

Зноў той самы трэск.

Аксана. Ой, не вытрымаю!

Максім. Сярдзіты, гад. Хату разверне...

Зноў трэск.

Мароз *(за дзвярмі)*. Пусціце вы мяне ці не?!

Максім. А, калі ласка, заходзьце...

Аксана. Што ты, звар'яцеў?! Не пускай!

Мароз уваходзіць у белай махнатай вопратцы — у сасульках і снезе. Ад кожнага кроку яго разлягаецца трэск. Падае руку Максіму.

Максім. Ай, ай, руку адмарозіў!..

Мароз. Го-го-го!.. А дзе мой кавалак хлеба?

Максім. Водзека, самы большы Вам аставілі... Толькі Вы не мейце ўвагі ані вока на маю жывёлу. Не звяртайце на іх зусім увагі, абмінайце за вярсту

хлявы, аўчарню; коўзайцеся па лёдзе, пакачайцеся па гурбах, падскочце да зорак і адтуль імжой рассыпцеся па лясах...

Мароз *(есць хлеб)*. Го-го-го!.. Мне і тут добра.

Максім. Але гэтае дабро нам не на здароўе. *(Хукае ў рукі, трэ вушы, топае нагамі.)*

Мароз гагоча. У гэты час Аксана няўзнак запальвае кудзелю, якая ярка запаланела.

Аксана. Уцякайце! Пажар!

Мароз. Пссс... *(Уцёк.)*

Максім. Во добра прыдумала! А то як бачыш замарозіў бы.

Аксана. Але гэта дорага мне каштавала: апошнюю кудзелю дымам пусціла.

Не пытаючыся, уваходзіць Смерць з касой. Хату напаўняе фасфарычны свет. Кашляе, чхае, крэкча, гаворыць пісклявым галаском. Бесцырымонна садзіцца за стол.

Смерць. Ох, замарылася, знемаглася... Кгы-кгы-кгы... Перазябла... Пагана, дужа пагана. Рэзала нядаўна аднаго пана. Рэжу, а ён усё хрыпіць. Тоўсты, як кабан. Жывучы... Усё горла перарэзала. Акрывавіў мяне, цьфу! Так і кінула — абрыдла. Добра мець справу з вамі, вясковымі людзьмі: чык — і гатова. Лёгкая работа... *(Меціцца касой.)*

Пяе пятух.

*(З перапуду выпускае касу.)* Ох! Акыш ты, паганец! Вось перапалохаў. Ой, ой...

Пятух пяе. Смерць падходзіць да падпечча і ганяе петуха, які доўгі час не сціхае. Максім бярэ касу і хавае.

Паскуднае маё жыццё. Усё руйнуй ды руйнуй, ніколі я нічога не стварыла. Галоўнае тое, што ўсё гэта надакучыла.

Максім. А гэта, цёценька, дзеля таго вы не творыце, бо не кахаеце.

Смерць. Хм!.. Ты мне даўно ўжо прыгледзеўся, вось я і прыйшла. А дзе ж мая каса?..

Максім. Ды вы аставілі пры гэтым пане. Ён яшчэ жыве, і вам трэба яго дарэзаць.

Смерць. Цьфу! Я і забылася. О-хо-хо, ну і пакуты з гэтымі таўстапузымі! Ізноў таўчыся па снезе. *(Выходзіць.)*

Максім. Трэба ўцякаць, бо інакш мы пагінем тут, як рудыя мышы.

Аксана. Уцякаць, уцякаць — адзін ратунак.

Выходзяць і сустракаюцца з Важаком.

Важак. Добры вечар! Ці не пусціце нас з казой пагрэцца, папас зрабіць?

Аксана і Максім. Просіма, толькі ж у нас холадна і голадна.

Важак. Гэй, грамада, хадзіце ў хату!

Максім. А што мы ім дадзім?

Аксана. А вось я свой хлеб не даела.

Максім. І дабавім добрае слова.

Уваходзяць з рознакаляровымі ліхтарыкамі Каза, Мядзведзь, Варажбітка і Музыкант. Усе загрыміраваны сажай, чырвонай паперай, мукой, на тварах — маскі. Варажбітка — пераапрануты хлапец. Ходзяць кругам па хаце і пяюць. Важак наперадзе. Музыкант ад хмелю не надта моцны на ногі; ён увесь час іграе на скрыпцы, не зважаючы на тое, што кругом робіцца.

Усе *(пяюць)*

Мы да вас прыйшлі
З словам добранькім,
З песняй радаснай,
З мудрай козачкай.
Го-го-го, козачка,
Го-го-го, белая,
Го-го-го, мудрая,
Хадзі крута ты
З хаты ў хатачку,
З вёскі ў вёсачку,
Бо там шмат бяды,
Сцюжы, голаду.
А ты мудрая,
А ты добрая.

Дзе каза топ-топ —
Там сена сем коп.
Дзе каза рогам —
Там сена стогам.
Дзе каза хвастом —
Там жыта кустом.
Дзе каза ходзе —
Там жыта родзе.
Дзе не бывае —
Там вылягае.

Спыняюцца.

Важак. А цяпер, каб вы зналі, каго тут прынялі, скажу па парадку з самага пачатку. *(Кланяецца.)* Добры вечар вам да хаты! Я сам просты грэчкасей і, як бачыце, гарбаты, бо, як быў шмат маладзей, усё думаў, прабаваў, каб да сонца як дабрацца, бо хацелася, прызнацца, мне ўкрасці сонца ком, каб сагрэць і асвяціць нашу долю і наш дом. Ажно, тыц — з чужбіннай далі дабрадзей ка мне ляціць. Ды давай з мяне смяяцца, так і гэтак наругацца: «Эх, дурная ты галоўка, не ўзлезеш без вяроўкі». Шлык за шыю прывязаў і ўверх цягнуць пачаў. Ды, на шчасце, пырх вяроўка — аб зямлю я бразнуў лоўка, ажно вырас горб гарбаты. «Добры вечар вам да хаты!» — кажа козачка цяпер. Весяліся, люд рабочы, не тужы, спадзейся, вер! Казярога знак на небе трубіць славу Сонцу-Богу. А козачка пры патрэбе спяяць песню вам гатова.

Каза. Мэ-мэ-мэ...

Важак. Цяпер на сваім струмэнце зайграй, козачка, зайграй, пакажы сваё штукарства! Адважся, пачынай.

Каза звоніць званком, які павешаны на шыі.

А музыка наш Піліпка, душа яго гэта скрыпка, яго голас — скрыпкі гранне, а іграць ён перастане, як душы яго не стане.

А вось Мядзведзь таўсталапы на Каляды з логва выйшаў. Ён вучоную адзнаку мае са смаргонскай школы высшай. Ён — хадзячы прыклад трутням,

гультаям і дармаедам, не есць хлеба чужой працы, а ссе лапу безупынна.

Ёсць яшчэ аб ім навіна — наш Мядзведзь на моц вучоны. Ён, напрыклад, добра знае, як шкадуюць, плачуць жоны, калі мужык памірае.

Мядзведзь жаласна мармыча.

Як «Лявоніху» танцуюць бабы п'яныя на фэстах.

Мядзведзь ходзіць, крыўляючыся.

І як бабы ў бойцы-звадцы свае косы рвуць-кудлачаць.

Мядзведзь кідаецца, рыкаючы, на Аксану, якая, лямантуючы, уцякае.

*(Адганяе Мядзведзя.)* Варажбітка, гэй, маруда, лекаў дай ад перапуду!

В а р а ж б і т к а *(скубе Мядзведзя, паліць і дым дзьмухае на Аксану).* Пажуру — як бач пяройдзе, здаравей, чым была, будзе, мех здароўя і пуд сала ёй прыбудзе; а як мала — хай кахае свайго мужа, будзе весела і дужа, спор, прыбытак будзе меці, не старэць, а маладзеці.

В а ж а к *(пяе)*

Го-го-го, каза!
Пакланіся ты
Гаспадынячцы
Ды гаспадару.

Каза кланяецца і мэкае.

*(Пяе.)*

Пакланіся ім
Нізка-нізенька,
Папрасі у іх
Дабра сытнага,
Жыта і аўса,
Сыраў і каўбас,
Хай даюць-дарацьr
На Каляды нас!

Аксана. Рады мы душой надзяліць усім, толькі няма чым. Вось хлябец не свой, а пазычаны на вячэрку нам, аддаём мы вам.

Максім. Чым хата багата — тым і рада.

Важак і Варажбітка. Дзякуй, дзякуй вам за калядны дар, памагай-спары вам нябесны цар!

Важак *(да Варажбіткі)*. А цяпер на картах жыва напрароч, наваражы, долю, волю прадкажы — каб збылося ўсё надзіва!

Варажбітка *(паднімае андарак і вынімае з кішэні нагавіц карты; раскладвае іх)*. Раз, два, тры, дамка, валет, туз, доля, воля, беларус... Карта добра наказвае, карта кажа, што ў вас агонь у печцы забушуе з дроў дубовых, вось ураз...

Аксана. Максім, глянь! Агонь гарыць, печка топіцца сама.

Варажбітка. Што аладкі, верашчака — будзе яда там усяка...

Аксана *(дастае з печы гаршчок, з якога валіць пара)*. Што я бачу, во прысмакі! Поўны гаршчок верашчакі... Дык хадзіце, Максім, госці!.. Тут салодкага ёсць штосьці... Будзем есці, усім хваціць...

Максім. Аж пах пайшоў па ўсёй хаце!

Варажбітка. А ў вядры замест вады віно будзе заўсягды.

Максім. Што ты кажаш!.. Быць не можа... *(Каштуе.)* Праўда, віно! А мой Божа! Хоць жа раз паслаў нам шчасце сярод гора і напасці.

Важак. Піце, ешце на Каляды, ахмялеўшы — паскачыце. Будзьце шчасны, будзьце рады, а нас з казой правядзіце добрым словам...

Чуваць уяданне сабак.

Аксана. Адлажыце развітанне, пагасціце, дарагія.

Максім. Каго носяць там благія, што сабакі так якочуць?! На падмогу трэба скочыць...

На парозе сустракаецца з Гаўрам і Аўтарэняй. Гаўра ў зубах трымае аграмадную костку.

Гаўра. Ух, змарыўся!.. Выбачайце, што да хаты... Мы ад вашай гаспадаркі дэлегаты. Я, сабака стары Гаўра, і цяліца Аўтарэня прыйшлі к вам на пакланенне, за дагляд злажыць падзяку, за гадоўлю, пракармленне... Дык паверце ж мне, сабаку!

Аксана. Балбатун ты, Гаўра...

Гаўра. Праўда. Але тут дык і нядаўна. Вось ад Гаўры вам гасцінец: костку вырваў з нагі Смерці, што хацела к вам улезці. Дайце ж лізнуць хоць мізінец...

Максім. Ха-ха-ха!.. Хай Смерць знае, з кім і дзе знаёмства мае.

Важак. Ха-ха-ха!.. І кульгава, і шчарбата — пабаіся нас, праклята!

Гаўра. А цяліца Аўтарэня мела гэткае здарэнне — прывяла ў падарунак бурай поўсці, бы малюнак, бычанка вось з гэткім каркам, гордасць усім гаспадаркам.

Усе *(падкідаюць Аўтарэню)*. Мы віншуем Аўтарэню! Слава яе пакаленню!

Гаўра ў гэты час шастае каля гаршка. Раптам цямнее на сцэне і расступаецца задняя сцяна. Каляда ў яркім святле, на фоне начнога неба з зоркамі стаіць на ўзвышэнні і мае закаваныя рукі.

Каляда. Я, Каляда, вітаю вас, нясу вам радасныя весці: не страшан чорны бог для нас — Белбог пабіў яго ўрэшце! Рву кайданы *(рве і скідае іх з рук)*, бо яны не зняволяць радасць нашу! Ніхто, нішто не зможа нас, ад волі не адстрашыць!

Усе. Ура! Наша ўзяло! Хай жыве воля!

Пяюць хорам песню «Ішла Каляда, калядуючы». Каляда кідае на іх срэбразлотыя зоркі, квяцістыя істужкі, краскі... Песня заканчваецца, Каляда знікае. Хату напаўняе living рознакаляровае святло, якое пырскае з усіх кутоў.

Важак. А цяпер на развітанне, гэй, «Лявоніху» да рання!

Усе. Гэй, «Лявоніху» да рання!

Музыкант садзіцца на суфлёрскай будцы і грае «Лявоніху». Ідуць «Лявоніху»: Максім з Аксанай, Важак з Варажбіткай, Гаўра з Казой, Мядзведзь з Аўтарэняй. Той-іншы пяе прыпеўкі. Ад юру і віхорнасці «Лявоніхі» не могуць устаяць і хатнія прылады — усё ходзіць хадуном: скача стол і тапчан, целяпаюцца абразы... І калі музыка, святло і рух ствараюць адно гарманічнае цэлае,

заступае заслона.

# П. С. Х.

*Фацэція на адну дзею*

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

Гаспадар.
Гаспадыня.
Чырвонаармеец.
Кітаец.
Сусед.

Сялянская хата. Смешны безлад: напрыклад, на стале ляжыць лапаць, на печы табурэт, вядро на ложку і г. д. З аднаго боку сцэны сядзіць Гаспадыня і клепле касу альбо сячэ дровы, з другога — Гаспадар, які латае аграмадную дзіру ў нагавіцах і насвіствае на матыў якой-небудзь рэвалюцыйнай песні. Якісьці час ідзе мімічная ігра.

Гаспадар. Цьфу! Дзе гэта відана, каб жанаты чалавек латаў сабе нагавіцы.

Гаспадыня. Ох, дзе гэта відана, каб замужняя жанчына секла дровы штодня.

Гаспадар. А зусім зразумела. Не сяку дроў, бо не маю часу — мушу латаць нагавіцы, мушу рабіць тваю работу.

Гаспадыня. Брэшаш, гэта я раблю і тваю і сваю работу, а ты толькі бадзяешся па сходках ды дурыш людзей. Падумаеш, у партыю запісаўся! Арацер! Камуністы! Цьфу! Пустадомак ты, а не гаспадар! Паглядзі, да чаго ты хату давёў: як пасля пажару. Ужо хай бы валачыўся па чужых кутах, валакіта

паджары, дык не: навёў груганння, а тыя ўсё ўверх дном паставілі. *(Парадкуе ў хаце.)*

Гаспадар. Ай-ёй! У калена ўкалоў. Сціхні ты, хай цябе люндар свісне — заслухаўся і ўкалоў. Вельмі ўжо складна язык твой завіхаецца. Глядзі, каб ён цябе на камісара не выкіраваў.

Гаспадыня. Гэта ты дамагаешся такой чэсці, а ў мяне камісар і атопка не варты.

Гаспадар. Ой, не разганяйся вельмі. Цябе, таварыш жонка, як відаць, буржуйскае натхненне апанавала.

Гаспадыня. Ты свае настаўленні сабе на снеданне пакінь, бо мне ад іх толькі духі падводзіць.

Гаспадар. Вось я табе і кажу, што гэтыя паскудныя буржуйскія духі лепш выпусці, бо я як партыйны не пацярплю, каб...

Гаспадыня. Ах, каб ты затануў, во чаго дачакалася. Прыйшоў гэта ў маю хату прымаком, прыйшоў, як кажуць, на ўсё гатовенькае, усё змарнаваў, усё праеў...

Гаспадар. Брэшаш, не ўсё праеў... было так, што і прапіў.

Гаспадыня. Нават пад бок няма чаго падлажыць...

Гаспадар. І добра: не будзеш доўга спаць.

Гаспадыня. У хаце пуста, і аруды пустыя...

Гаспадар. Дужа добра. На выпадак пажару меншая страта будзе.

Гаспадыня. Вельмі ўжо ты разумны, як абора ад лапця.

Гаспадар. Ды я табе паказаў бы свой розум, але ты яго не патрафіш убачыць.

Гаспадыня. Ну ўжо і розум — з хлеба гузікі рабіць.

Гаспадар. Ану, давай падужаемся. Вось скажы ты мне, сарока-белабока, што такое калакціў?

Гаспадыня. Дурань ты!

Гаспадар. У дурня ўсё дурное. Слухай жа: калакціў — гэта такая машына, зробленая з людзей. І калі яе пусціць у равок, рэвалюцыйны, значыць,

камітэт, дык яна наробіць такі тарарах, што ажно ўвесь свет вушы падыме...

Гаспадыня. І калі ва ўсім свеце будзе такі парадак, як у нас у хаце, і калі ў жываце кожнага будзе вурчэць ад голаду, як у мяне, дык гэта будзе не свет, а пекла.

Гаспадар. Калакціў што хочаш зробіць: з неба пекла і з пекла неба. Праз яго мы, паднявольныя працоўныя, загаспадарым на ўсім свеце, запануем над панамі і дазволім сабе аддыхнуць, бо ўжо годзі, напрацаваліся. Вось як!

Гаспадыня. Нос лепш свой вытры ды навучыся перш быць гаспадаром у сваёй хаце, а пасля думай аб усім свеце.

Гаспадар. Не я гаспадар, увесь народ гаспадар, бо я што — гузік. Ды ў мяне нічога свайго няма. Хата, жонка, душа і нават люлька не мая, а ўсіх, агульная. Цяміш, сарока-белабока? Ёсць такі таварыш Пардон[1], дык ён кажа, што ўласнасць — гэта кража.

Гаспадыня. Вось пачуў ад нейкага галадранца і чаўпе, як у пустую бочку.

Гаспадар. Вось жа! У галадранца найчасцей бывае голая праўда.

Гаспадыня. Ох, каб я ведала, што ты перавернешся ў камуністу, дык лепш бы галавой у прорубку кінулася, чым за цябе замуж выходзіць.

Гаспадар. Каб я ведаў, што ты абуржуішся, дык аб'ехаў бы цябе, як дзірку ў мосце. І зачашы сабе на носе, што калі мы збудуем камуністычны рай, дык цябе, паганае зелле, і на вярсту не падпушчу.

Гаспадыня. У ваш рай толькі здохлых катоў кідаць.

Гаспадар. Вось каб ты была так разумная, як дурная, дык я крыху мог бы падурнець і далей з табой пагутарыць. А так няма аб чым, бо ты — калода трухлявая.

Гаспадыня *(плачучы)*. Я ведаю, што я табе не жонка, а калода. Ох, доля мая! І смертухны на мяне

[1] Прудон.

няма. Думала, дзетачак дачакаю, жонкай і гаспадыняй буду, а тут на табе — калода, наймітка...

Гаспадар. Маніш. Найміткай я цябе не абзываў, бо і па дакрэту найміты не палагаюцца.

Гаспадыня. Усе суседзі жывуць як людзі, а мы, як на папасе,— проста рукі ападаюць. Ох, няма ў цябе нічога святога. Поўзаеш ты, як крот, точышся, куды не трэба, як жук. Ты толькі падумай: ці ж мы на тое будавалі гэтую хатачку, каб у ёй панаваў безлад і папасвалася розная нечысць. Верабей і той будуе сабе гняздзечка, бароніцца і дзетак гадуе, а тут... сэрца толькі крывёй абліваецца.

Гаспадар. Гэта ўсё на праўду як бы і падобна, але калі, бачыш, ужо час такі: беспартыйнаму, хоць трэсні, аніяк няможна быць. Трэба альбо туды, альбо сюды.

Гаспадыня. А ты і не туды, і не сюды, а будзь тут, тутэйшы, і пільнуй сваёй хаты.

Гаспадар. Яно-то справядліва, але цемната наша вельмі ўжо надакучыла. Хочацца выбіцца ў людзі. Свет, бачыш, не толькі ў акне, але і за акном ёсць.

Гаспадыня. Калі сам сабе цаны не знаеш, дык людзі цябе не ацэняць.

Гаспадар. Былі б залатыя твае словы, але ты іх так мочыш слязьмі, што выходзіць адна гразь. Вось пакінь лепш плакаць. Давай папалуднуем — мо я і палепшаю.

Гаспадыня *(дае есці)*. А ўжо дабраты ад цябе не дачакаешся — добра, каб ты хоць паразумнеў крыху.

Гаспадар *(есць)*. Ты толькі не плач — усё будзе добра. І хата не перакуліцца, і дзяцей, як бобу, будзе, і пойдзе спор і прыбытак.

Гаспадыня голасна ўздыхае.

Што так жаласна ўздыхаеш?

Гаспадыня. Цяжка мне, што няма ў нас гаспадарскага жыцця: ніколі ты не абнімеш, не пакахаеш мяне.

Гаспадар. Дай во заціркі пад'есці, дык і пакахаю.

Гаспадыня. Ну дык і я табе памагу, каб хутчэй. *(Есць зацірку.)*

Гаспадар. Спраўлюся я і адзін... Паможаш ты мне, як кашаль хваробе...

Маўчанка.

Гаспадыня. Ці ты чуў, што Тамашыха рассыпалася? Дзяўчынка — як анёлачак.

Гаспадар. А ты мне глядзі, каб хлапцоў.

Гаспадыня. Гэта ўжо прасі бусла.

Гаспадар. Каб хлапцоў і каб па двое. *(Ушчыпнуў гаспадыню.)*

Гаспадыня ойкае і рагоча.

І каб па мне пайшлі...

Якісьці час жартуюць. Стукат у акно.

Голас суседа. На сходку! На сходку!

Гаспадар *(кідае есці)*. Ужо! Ужо іду! *(Бяжыць, завіхаючыся, але гаспадыня ловіць яго за падалы.)*

Гаспадыня *(крычыць)*. Гвалту! Каравул! Замучыць ён мяне, заб'е, загубіць!..

Убягае сусед.

Сусед *(да гаспадара)*. За што ты яе б'еш? Шэльма ты! Чым яна табе правініла?

Гаспадыня. А табе, дабрадзею, што за інтарэс? А можа, я сама хачу, каб ён мяне біў!

Сусед *(адступаючы)*. Ды мне што — вось пачуў гвалт, дык і прыйшоў.

Гаспадар выбягае.

Гаспадыня. І сам прыйшоў гвалтаваць?.. Што гэта, па-твоему, муж не мае права біць сваёй жонкі?! Апякун які вырваўся, як Піліп з канапель. Можаш сабе выходзіць, з чым прыйшоў, ды жывей, каб твайго смуроду не было, бо зараз чапялой...

Сусед *(уцякаючы)*. Вось ведзьма кіеўская!

Гаспадыня *(адна)*. Гэта мужыкі называюцца! Адзін уцякае ад жонкі з хаты, а другі не дазваляе жонку біць. Цьфу! Вось і жыві цяперашнім светам. І што мне рабіць, беднай галованьцы? Ізноў адна ў хаце. Хоць ты ў пятлю лезь... Ох, як гэта цяжка, калі муж ёсць і ён не муж, а валакіта. Былі тыя, паны, дык глядзеў, рукі сашчапіўшы, як яны ўсю дамову глумілі, поўзаў на ўслужэнні, прадаваўся за тры грошы... А цяпер з гэтымі камяністымі заюрыў, на партыю захварэў, зыкуе па сходках... Ну, але я не буду, калі табе гэта не адкінецца.

Убягае чырвонаармеец, за ім кітаец. У абодвух нашытыя зоркі на шапках і рэвальверы напагатове.

Чырвонаармеец *(акцэнтуе па-маскоўску)*. Руки вверх!

Гаспадыня. Дык у нас няма нічога... Было калісь, але...

Чырвонаармеец. Бандиты?

Гаспадыня. Ведаю, што вы бандыты, толькі ж я кажу, што нічога няма. Жыццё мілей — усё б аддала.

Чырвонаармеец. Молчать! Где контрреволюционеры?

Гаспадыня. Як?

Чырвонаармеец. Чаво?

Гаспадыня. Як, пытаю.

Чырвонаармеец. Буржуев здеси нетути?

Гаспадыня. Буржуяў, кажаце... Гм... буржуяў... дзе тут бы выдлубаць буржуя... У вёсцы дык няма... А тут, гм... Чакайце! Ёсць! Вось у гэтай хаце жыве! Страшэнна буржуяваты, боўдзіла.

Чырвонаармеец. Живет? Подать его сюда!

Гаспадыня. Ды дзе ты яго цяпер зловіш. Прыйдзе сам, дзе ён дзенецца. Але гэткі, ці ведаеце, закаранелы буржуй, што мне проста ад яго жыцця няма. Добра, што вы прыйшлі. Сядайце, калі ласка. Я вас не пазнала з перапуду — прыйдзецца падкурываць. Сядайце. Буржуй страшэнны — мой муж. Ён грaзіць цэламу свету — машыну нейкую выдумаў, хітра так называецца...

Чырвонаармеец *(да кітайца)*. Слыхал?.. Машину... Будет жарко...

Кітаец замычаў.

Гаспадыня. І гэтай машынай хоча ўвесь свет пад сваю ўладу закаціць. Дадушы, праўда. Надоечы мне хваліўся — як жонцы, дык ён аб усім хваліцца.

Чырвонаармеец. А где он теперича буржуйничает?

Гаспадыня. Паляруш яго ведае, дзе ён... Мо гэтую машыну пускае ў ход... Толькі вы не звяртайце на яго ўвагі, калі будзе хваліцца, быццам ён камуністы. Хавай Божа, ён ім ніколі не быў і не будзе. Трэба толькі добра яго пужануць бізуном ці чым іншым — умомант прызнаецца. Я ўжо яго натуру знаю.

Чырвонаармеец *(трасе нагайкай)*. Не извольте беспокоиться, товарищ, мы его приведем в христианство. Слушай, ты, попугай китайский, ежели он будет сопротивление оказывать, так стегай его поразмашистей. Понял?

Кітаец. Дау, туарышч.

Гаспадыня *(глядзіць на кітайца, падпёршы галаву рукой)*. Божа моцны, якіх гэта толькі стварэнняў няма на свеце! Вось паставіць бы яго на ворыва замест пугала. *(Да кітайца.)* Скажы, ці гэта твой народ есць людзей? Ай, ай... не падходзь... стой... баюся... Згінь ты, прападзі!..

Чырвонаармеец. Ха-ха-ха! Боишься смерти, голубушка? Ну, красавица, пока суд да дело, попотчуй-ка нас теперича чайком.

Гаспадыня. Нічога, галубочкі, не маю: ні хлеба, ні да хлеба.

Чырвонаармеец. Да-а... Дело, значит, лафа... А знаешь, курносая, ты мне больно ндравишься.

Гаспадыня. Не ведаю. Не цямлю.

Чырвонаармеец. То есть как так «не цямлю»?

Гаспадыня. А так, што каб вас уцяміць, дык трэба бочку жалезнага бобу з'есці.

Чырвонаармеец. Да-а... А меня поцелуешь, жисть ты моя?

Гаспадыня. Ну так ужо зразу і цалавацца.

Чырвонаармеец. Ну, а какое такое тебе удовольствие составить, чтобы расположение иметь?

Гаспадыня. А вось трэба паставіць моцную гарэлку і палажыць смачную закуску, дык тады і пагутарыць весялей будзе. Тады гэтае вашае распалажэнне і састаўленне будзе.

Чырвонаармеец. Ха-ха-ха!.. Эх ты, моя разлапушка! Ну, раскосый, замечаешь бабу-то? Как тебе?

Кітаец *(цмокае ў пальцы)*. Цк, туарышч!

Чырвонаармеец. То-то оно-то! А если бы у тебя не были раскосые глаза, так ты бы еще больше толк взял в этой разлапушке. Ну, так валяй к подводе и тащи... Понял? И чтобы без промедления обратно возвратился.

Кітаец. Дау, туарышч! *(Выходзіць.)*

Чырвонаармеец. Ну, а ты песни играть-то умеешь?

Гаспадыня. А як калі давядзецца.

Чырвонаармеец. Черт! Вот уж ни бельмеса не понимаю. Скажи, пожалуйста, это ты польским изречением разговоры разговариваешь?

Гаспадыня. Ды куды там — па-польску інакш.

Чырвонаармеец. Ану, жарни по-польски-то.

Гаспадыня. Пся крэв, прошэн пана...

Чырвонаармеец. Ха-ха-ха!.. Очень мудрено. А вот каким языком ты изъясняешься?

Гаспадыня. Якім... па-беларуску.

Чырвонаармеец. Какой такой белорусский?

Гаспадыня. Па-беларуску, ну, па-тутэйшаму.

Чырвонаармеец. Ха-ха-ха!.. Чудно, ей-богу! Долго странствовал, многих видывал, но таких, так сказать, переплетов не слыхивал, ей-богу.

Кітаец уносіць выпіўку і закуску.

Ура, китайский попугай!

Гаспадыня падае чарку.

Итак, начнем трапезу. Выпьем за расположение и составление, ха-ха-ха...

Выпіваюць. Чырвонаармеец заспявау.

Сидит Ванька на заборе
С выражением во взоре.

Гаспадар *(уваходзіць)*. Го-го! А гэта што за баль?

Гаспадыня. Вось ён...

Чырвонаармеец. А ты кто будешь? Ты хозяин?

Гаспадар. Гм. Калі што добрага, дык я.

Чырвонаармеец. Ты, голубчик, поудерживай свое словоизлияние и отвечай на самую-то суть относительно касательного факта.

Гаспадар. Які хвакт? Адкуль ён?

Чырвонаармеец. Опять своротил на окольную... Говори: ты буржуй?

Гаспадыня выйшла.

Гаспадар. Ха-ха-ха!.. Я — буржуй, ха-ха-ха!.. Ну і смехатун!

Чырвонаармеец. Чево «смехатун»? Буржуй, спрашиваю?

Гаспадар. Што-о? Ты, таварыш, не лайся, бо я, таварыш, таксама таварыш. Я нават таварыш самага важнага тут, у вёсцы, таварыша... Змалку з ім грушкі кралі, свіней пасвілі...

Чырвонаармеец. Нет, голубчик, не ускользнешь — мы тоже знаем, что ты знаешь. *(Да кітайца.)* Ану, вяжи его, да покрепче!

Гаспадар. Як, мяне, гаспадара... за што? Нашто?

Чырвонаармеец. Говори: ты — буржуй?

Гаспадар. Хавай Божа, ніколі ім не быў. Стойце, чаго вы прысталі... Які я буржуй... Вось нядаўна латаў сабе лату ды зацірку хлябаў.

Чырвонаармеец *(да кітайца)*. Зашпандоривай ему в задние обстоятельства.

Кітаец б'е гаспадара.

Гаспадар. Ай, ай, стойце! Што гэта вы, таварышы, пашалелі, ці што? На якога чорта здалася вам мая скура? Па дэкрэту не палагаецца біць.

Чырвонаармеец. Сознайся, аль еще мало всыпали?

Гаспадар. Цьфу, напасць! Калі вам так трэба, каб я быў буржуй, дык хай сабе буржуй. У мяне ўжо розум за розум заходзіць. Мо я і сам не заўважыў, як зрабіўся буржуем...

Чырвонаармеец. И динамо-машиной обладаешь?

Гаспадар. Ці чуў?! А-я-я...

Чырвонаармеец. И всему пролетариату угрожаешь?

Гаспадар. Во як? Няўжо?

Чырвонаармеец. Сознайся, мразь африканская!

Гаспадар. Чакай, дай успомніць, нешта мне гэта не ў памяці.

Чырвонаармеец. Эй, раскосый, дай ему на память-то!

Гаспадар. Ай, ай... Ужо, ужо ўспомніў: уграavailable, усяму пралетарыяту ўгражаю як ёсць. Цьфу! Ну і папаўся, як таракан у саладуху.

Чырвонаармеец. Ставь, раскосый, буржуя к стенке. Расстреляем собаку.

Бяруць на прыцэл.

Гаспадар. А браточкі, а даражэнькія... за што, за якое?.. Я ўжо ўсё, што вы хочаце... Я ўжо нічога нікому ніколі ніякага... Каравул! Ратуйце!

Убягае гаспадыня.

Гаспадыня. Таварышы, таварышы! Уцякайце — паўстанцы! Паўстанцы з лесу выходзяць і проста на вёску валяць.

Чырвонаармеец і кітаец рупна ўцякаюць.

Ха-ха-ха!.. Вось ашукала. Цяпер іх каменем не дагоніш і сабакамі не зловіш.

Гаспадар. Ох, дзякуй табе, мая ты збавіцелька! Яшчэ момант — і мяне не стала б.

Гаспадыня. Вось, бачыш, я да цябе заўсягды з дабром, заўсягды шкадуючы, а падзякі ад цябе як няма, так і няма.

Гаспадар. Як жа я табе падзякую — бачыш, рукі і ногі звязаны. Вось развяжы мяне, мая шчабятушка-весялушка.

Гаспадыня. А за што гэта яны цябе так спавілі?

Гаспадар. Ат, глупства. Ну, ведама, партыйныя справы: я сваё, а яны сваё, далей — болей, і мяне чуць не замучылі. Ох, напужалі...

Гаспадыня. Горш яшчэ будзе, калі не будзеш жонкі слухаць.

Гаспадар. Ой, развяжы...

Гаспадыня. Няма мне часу. Ты тут паляжы, адыхні, папільнуй хату, а я тым часам пайду на сходку курэй ды парасят.

Гаспадар. Жоначка, развяжы...

Гаспадыня. Паспееш з козамі на торг. *(Выйшла.)*

Гаспадар *(злосна)*. Жонка! Жонка! Ці я табе болей не гаспадар? Га? Развяжы, кажу! Чуеш, бо дрэнна будзе. Гэй, хто там жывы, выручайце! *(Маўчанка.)* Ах, хварэць вашай галаве! Што гэта вам я на смех радзіўся?.. Калі ж так, дык вам давяду, што я не лыкам шыты! *(Рве вяроўкі.)* К чорту вашыя путы! Вось як! Калі сам сабе не паможаш, дык ніхто табе не паможа. Ну, дрыжы, вораг! Врррр!.. Я, пабіты, абакрадзены, аблаяны, завурчэў са свайго логава, з хатачкі маёй апушчанай, пакрыўджанай... Ух, задам такога пытлю, што... *(Чапляецца за венік.)* А ты, што, таксама ў іх хеўру запісаўся? *(Ломіць, топча.)* Вось табе, во, знай свайго гаспадара! Чакайце, спраўлю я вам усім такую балёўку, што ўнукі будуць помніць! Пачну ад жонкі. Дзе жонка? Жонка! *(Выбягае.)*

Гаспадыня ўбягае; чуваць крык гаспадара, які пагражае гаспадыні і кліча яе.

Гаспадыня. Ловіць мяне, шукае... Прапала я цяпер, заб'е, згінула...

Гаспадар *(убягае з суком)*. Ага! Вось дзе я цябе прыпасціў...

Гаспадыня. Ціха, ссс... Яны...

Гаспадар *(перапужаны).* Яны... як... сюды, ізноў... дзе яны? *(Выпускае сук, ногі трасуцца, язык заплятаецца.)* Дзе б мне схавацца, во напасць... Пракляты дзень... *(Торкаецца ўсюды, каб схавацца, урэшце хаваецца пад ложак ці пад прыпечак.)*

Гаспадыня. Ціха, ужо, здаецца, прайшлі, абмінулі... Вылазь!

Гаспадар. Не, я ўжо, каб бяду абмінуць, лепш пасяджу тут.

Гаспадыня. Кажу табе, што прамінулі. Вылазь! Маеш для смеласці выпіць чарку.

Гаспадар *(вылазіць са сваёй схованкі і выпівае чарку).* Яшчэ, котачка!

Гаспадыня. Маеш.

Гаспадар. Яшчэ, рыбачка!

Гаспадыня. Пі, толькі не пужайся.

Гаспадар. Яшчэ, ягадка!

Гаспадыня. А ці не хопіць ужо?

Гаспадар. Яшчэ, яшчэ...

Гаспадыня. Не перабірай меркі.

Гаспадар. Эх, жоначка, бачу я, што ты ў мяне міністр, ты — мучаніца, а я — цьфу, ды нагой расцерці... *(Слязліва.)* Ох, немарасць мучыць мяне. Да чаго я дажыў... Што са мной сталася... Сорам на свет паказацца.

Гаспадыня. Глупства, не маркоцься. Нагавіцы я сама падлатаю, а як вытку тканіну...

Гаспадар. Ды не тое... Душу мне трэба латаць, душа мая дзіравая... У пазыкі яе аддаваў. Знасілі, абкаравілі яе... Ты думаеш, што гэта слёзы з маіх вачэй цякуць?.. Гэта жаль цячэ, боль цячэ...

Гаспадыня. А ты думаеш, мне лёгка... *(Хныча.)*

Гаспадар *(згледзеўшы вядро на ложку).* Во, гэта ўсё атрута для мяне... Вочы мае адкрыліся на праўду... Стаіш ты, ложак пакінуты, забыты, як човен дзіравы ў затоцы, а рака жыцця майго бяжыць міма цябе, міма... Ох, замест зіркатых дываноў і пухавых падушак я бачу — чорт яго ведае, што я бачу! Замест гарачых шэптаў, рыпаў-скрыпаў, охаў-уздохаў

стаіць на табе вядро вады. Дзе гэта відана?! А ўсё я вінават, я ўвёў у хату свайго прыяцеля — безлад. Эх, заслужаны, выгадны ложак мой, даруй ты мне! *(Валіцца на ложак і камічна ўсхліпвае.)*

Гаспадыня *(здымае вядро)*. Ну, сціхні, я ўжо ўпарадкую.

Гаспадар сціхае, пэўны час маўчанка, потым ён пачынае смяяцца.

Чаго там гагочаш?

Гаспадар. Мне смешна. Ха-ха-ха...

Гаспадыня. Чаго табе смешна?

Гаспадар. Што я дурны.

Гаспадыня. Во гэта, хоць дурны, але праўду сказаў.

Гаспадар. Ведаеш, стрэльнула ў галаву вельмі цікавая думка, але так трэснула, што аж зашчакатала.

Гаспадыня. Што такое стрэльнула?

Гаспадар *(смяецца)*. Ну, як да гэтага я перш не дагадаўся! Такая звычайная рэч і такая моцная праўда. Хадзіў каля гэтага, шчупаў, бачыў і не разумеў. Вось дурны!

Гаспадыня. Аб чым гэта ты ўсё чаўпеш?

Гаспадар. Слухай. Мы, гэта значыць, ты і я, бульбаеды і дамаседы, закладваем сваю партыю. І ведаеш, як яе назавём?

Гаспадыня. Ну?

Гаспадар. Не «ну», а «Пільнуй сваю хату».

Гаспадыня. Цьфу! Амерыку адкрыў. Я табе даўно аб гэтым казала.

Гаспадар. Не, ты сціхні... ты паслухай. Ты казала, а я зраблю... Я давяду, дзе праўда... *(Узлазіць на зэдлік; тонам казальніка.)* Грамадзяне! Час грамадзіцца! Бо што зробіш сягоння, таго ўжо заўтра не асіліш. Ратуйце свае хаты, у якіх стрэхі захварэлі на воспу, вокны — на слепату, зруб пакрывіў паляруш, а гаспадар сядзіць пад печкай, бо нячыстая моц хатай камандуе. Грамадзяне, запісвайцеся ў партыю «Пільнуй сваю хату»! Памятайце, што ў аб'яднанні — моц, а ў моцы — шчасце, бо хто дуж, таму мора па

калена. Гэтая партыя бароніць хату ад усялякіх такіх чыкаў-брыкаў. Яна дае гаспадару тое, што гаспадар сам возьме, бо даведзена ўжо, што абяцанка — цацанка, а дурному радасць. Апрыч таго, яна дае, ну, вы разумееце, што яна — гэта тое... ну і ўсё такое. Верце мне, я — стары верабей! Перапробаваў я ўсе партыі: справа налева і злева направа. Тыя мне папсавалі ўсю скуру, як сабаку таго, клікалі рознымі найменнямі, абдзёрлі, як ліпку...

Гаспадыня *(плачучы)*. Апошнюю кароўку забралі, пяць хунтаў воўны ўкралі, нізкі сушаных баравікоў...

Гаспадар. Але, але... А гэтыя... падаць мне іх сюды... чуць капут не зрабілі. Дык я і кажу, што гэтая партыя «П. С. Х.» найлепш нам пасуе. Не кажучы аб іншых выгадах, тут табе нават і жонка ёсць. У якой партыі вы гэта знойдзеце? Праўда, жонка? *(Абдымае гаспадыню.)*

Гаспадыня. Праўда, міленькі, праўда!..

Гаспадар. Дык чаго ты плачаш?

Гаспадыня. Калі ж ты ўжо вельмі жаласна, вельмі хораша гаворыш.

Гаспадар *(выпівае чарку і зноў прымае тон казальніка)*. І хай толькі цяпер хто ткне нос у нашы хатнія крэнту-мэнту, дык з тым вось як! *(Разбівае чарку аб падлогу.)* Хай красуе гаспадар на покуці сваёй хаты!

Гаспадыня. Хай красуюць і ручаць хатнія справы!

Разам. Хай жыве партыя «Пільнуй сваю хату»!

Заслона

# Кавалі

*Сцэнічны абразок*

Чуваць звон ад кавання жалеза. Заслона падымаецца. Стары і малады кавалі куюць. У глыбіні палае горан. Кавалі перастаюць каваць. Стары кладзе ў горан жалеза, а малады ўздувае мех. Праз адчыненыя дзверы кузні відаць зорнае неба. Чуваць сумны народны матыў — пяянне начлежнікаў.

Стары. Старайся, сынку, хай безупынна мех распаляе агністы жар! Хай жар грызе жалеза, каб аж іскры мітусіліся чырвонымі краскамі сярод цемры глухой ночы! Жалеза будзе гнуткае, мяккае, як воск,— лягчэй, спарней пойдзе праца. Хутчэй зарабім на кавалак хлеба.

Малады. Я працую з усіх сіл. У кожны свой дых укладаю святое парыванне юнацкай душы. Люблю волю, хачу мець жыццё агністага зместу і дзеля таго ад світання да змяркання цяжкім молатам выкоўваю лепшую долю. Мяне так цікавіць і захоплівае кожная новая праява ў жыцці! Усёй істотай сваёй чакаю прыходу нечага небывалага, светлага, радаснага. Мне здаецца... не, я веру, што ўсё прасякнута шчасцем, што ўсё і ўсюды перапоўнена здароўем і багатай творчасцю. І каб гэта нам пачуць, ахапіць, з'яднацца, дык трэба на ўсё дыхнуць гарачай любасцю. Хай сэрца палае, як горан! Трэба быць чулым, быць усім і ўсюды. Хай пераплаўляе агністае натхненне!

Стары. Эх, сынку! І я калісь гэткія думкі-іскры раскідаў усюды, пяяў звонам малатоў да светлай будучыні, гартаваў сэрца палкай любасцю да волі-долі... Эх, сынку, аднак хата наша ўбогая, жыццё наша галоднае, доля наша беспатольная, а след наш — крывавыя краскі на цярністым шляху, звільжаныя нашым потам і слязьмі... Эх, сынку... *(Нясе жалеза на кавадла.)*

Якісьці час куюць. Спыніліся, каб выцерці пот, перадыхнуць.

Чуеш?.. Начлежнікі пяюць... То ж народ склаў гэткую песню, песню няволі і тугі-суму, складаў доўгія вякі, доўгія вякі...

Абодва ў задуме. Абапершыся на малаты і кавадла, стаяць якісьці час, іх сілуэты выдзяляюцца на чырвоным водблеску ад горна.

*(Рыхтуючыся да працы.)* Будзем канчаць.

Малады *(рашуча)*. А што мы робім?! Каму мы робім?!

Стары. Робім кайданы. А каму? — тым, хто іх робіць. Робім дзеля таго, што кайданы носім... *(Незадаволена.)* Ды, урэшце, няма часу на развагі. Позна... Што робім — не бяда. Бяда будзе, калі не заплацяць, калі ў жываце будзе з галаду вурчэць... Справа наша маленькая... Ану, гайда! Стыне...

Малады *(адкідвае молат)*. Хай мне лепш рукі адпадуць, чымся я маю рабіць гэткую праклясць! Хай стыне жалеза, хай нам не плацяць, хай душыць мяне гора — я не сагнуся! Што спрадвеку ўсе працоўныя жывуць у цемры і недастатку, што, запрэжаныя ў ярмо, аруць поле злыбяды — дык дармо ж?! Не ўздзенуць мне! Я хачу не толькі сам быць чалавекам, але і другіх зрабіць людзьмі. Каб не было заграбання жару чужымі рукамі, каб гора аднаго не было радасцю другому, эх, каб не было так, як цяпер ёсць — агідна, чорна, чадна!.. Нам нічога не даюць... Нас, галодных, змучаных, прыкавалі да молата, і нічога ў нас больш не засталося, толькі ён, молат. *(Паднімае молат.)* Сярод сваіх мук і крыўд мы яго палюбім... з ворага хай стане нам другам! Хай кожны яго ўдар дае гарт сталі ў душу, моц жалеза ў цела — і мы ўзрасцём, мы падужэем! Волатамі станем! Бразнуць кайданы — і ўчарашнія рабы стануць валадарамі свету!.. Праца! *(Рыхтуецца каваць.)*

Стары. Эх, сынку, а што ж нам рабіць?! Наймітаы мы, адзінокія мы... Загад іх — воля наша. Дык што ж нам рабіць?!

Малады бадзёрым рухам вырывае ў старога жалеза і кладзе ў горан. Стары пакорна падыходзіць да меха і ўздувае яго. Чуваць «Ад веку мы спалі...» шмат выразней, як папярэдняе пяянне.

Малады. Працаваць для вызвалення, працаваць для ўладарання працы, для грання-звякання

securityкаванага жалеза, для вось гэтых іскраў-зорак горна!.. Працаваць для шчасця роду людскога, для характва жыцця!.. Вось перапла́ўлю, перакую ўсю нашу папярэднюю працу! Стукну-гакну молатам, песню запяю, улажу ў працу любоў і здатнасць ды выкую сталёвую звонкарэзкую касу! А зрабіўшы касу, эх, дый выйду я ў ноч хмарную, глухую!.. Мая коска бліснe яснасцю маланкі, звякне, адзавецца... Размахнуся, гойкну раз у раз паўкругам!.. Пакос за пакосам ляжа лежнем-трупам нядоля ліхая, гора хат убогіх...

Зацягнуўшы «Ад веку мы спалі...», мaлaды кладзе жалеза на кавадла. Кавалі, плюнуўшы ў далоні, куюць.

Стары. Мацней!
Малады. Жывей!

Якісьці час запальчыва куюць, ажно з грудзей вырываецца: «Гах! Гах! Гах!»

Заслона

# Проза



# На рацэ зімой

## I

Піліп Крумкач, выйшаўшы з мястэчка, зірнуў злосна на бакі, ударыў рукой па шапцы так, што тая апынулася на патыліцы, значыць: знай сваё месца! — з агідай плюнуў і, размахваючы рукамі, сунуў па шляху, паднімаючы пыл нагамі. Ішоў ён не бокам дарогі, па вытаптанай сцежцы, але, як кажуць, конскім следам. І каб яго мазгі затрымаліся і паразважылі над тым, што для ног дрэнна ісці, то ён бы, пэўне, пайшоў, дзе выгадней. Але Піліпа гэта не цікавіла. Вось ён агледзеў выразны адбітак конскага капыта — знаць падкова, цвічкі, гакі. Піліп затрымаўся, зайшоў з аднаго, з другога боку, узіраючыся ў след. «Нядаўна, відаць, падковіны — гакі вострыя»,— і пайшоў далей. А пры тым шляху, дзе ішоў Піліп, расла бярозка каля вялікага каменя. Тут жа стаяў і слуп верставы. Сустрэўшы іх, Піліп чамусьці абышоў вялікім кругам. Яму і самому гэта дзіўным зрабілася і, як бы тлумачачы свой пастулак, раптам засмяяўся, кажучы: «Ах, каб цябе цялятамі скавалі! Ну, дык што там,— выпіў, дый і ўсё! Але з цыганом не варта было піць. Ці мала ў цябе сваякоў, знаёмых, блізкіх і далёкіх? Будуць крыўдзіцца. Вось я гэтага і хачу, каб прызналі мяне крыўдзіцелем, каб клялі і шкодзілі мне на кожным кроку, выракаліся, білі і мучылі мяне. А пасля дазнаюцца, што дарма мяне віновацілі, што ў мяне няма і не будзе благой думкі да іх, і пачнуць каяцца і наракаць на сябе, і я ў іх папрашу даравацъ мне, скажу: «міленькія, родненькія», і абнімемся, і слёзы пакоцяцца, ды не такія, як ад радасці ці жальбы, а слёзы асаблівыя, якімі плача анёл.

«Піліп Крумкач, Язэп Крумкач,— памірыцеся!» Ну і памірыўся б. Што мне тыя грошы. Хай на іх

звод! Дый абрыдла ўжо цягацца па судах. «До, памірыцеся!» Справа не ў тым, пане міравы. Смачна табе масла Язэпава, добра ён цябе падмазаў — язык лёгка ходзіць... «Памірыцеся!» Не, стагнаць тваёй галаве: не такі я арэх — зубы паломіш, пане міравы! Судзі, вось як, судзі — на тое вы пастаўлены! Мала, што ён брат мне, адной жа маці дзеткі — вось як, але судзі. А хто мне рассёк вусны і выбіў тры зубы, калі дзялілі дабро бацькавае, а за каго мне ў халоднай трэба было галадаміраваць і карміць усялякае плюгаўства?! Добра, не ўкраў жа я гэтыя паўкапы з поля, а ўзяў, як свае, бо ён жа, брацішка мой, закрыўдзіў мяне ўвачавідкі, балюча закрыўдзіў! Усе суседзі аб гэтым кажуць. А мяне за нішто за ніякае — у халодную. І не ўкраў жа я гэтыя паўкапы, а падвёз да вёскі ды кажу: «Бярыце, людцы, вось мяне. Кажу, лішніца заблыталася». Ох, трудна! Цяпер, значыць, нас падзялілі... Ты мне ніхто... Ды хто ў цябе спаганяць будзе? Ніякай я жалабы да цябе не маю. Бог не цяля — ён бачыць круцяля. А можа, мы абое рабое.

Эх, усё-ткі ты мне брат! Часамі надыдзе такая хвіліна, што ажно сэрца покаецца ад жаласці, ад болю, слёзы коцяцца, і люблю, і шкадую цябе моцна-моцненька! І матулю тут неяк спамянеш, і дзяцінства халоднае, галоднае, і здаецца, ногі твае цалаваў бы, родненькі ты мой! Але, не маю я да цябе благой думкі. Бог сведка. То ж я і кароўку прасудзіў, коніка праездзіў: укралі пры карчме. Голы я цяпер, як бізун, не падняцца мне ўжо на ногі, не падняцца... Бабы ў хаце няма... Няма, няма... Кажуць людзі: Бог — за адну жонку, а ты — за другую. Ох, міленькія, другой Аўдоцці не знойдзеш. Ніколі! А як жа я яе біў, жывую ў магілу гнаў — вельмі ж яна мне нялюба была: твар бледны, з рота нядобра пахла, плоская... як мне яшчэ рука не адсохла. А яна ўсё корчыцца, моўчкі слёзы аціраe ды толькі кажа: «Ведаеш мо, Пілiпку, тое, мо гэтае?..» Рэдкая кабета. Схуднела, ссохлася, як пярынка, вось, здаецца, ад ветру гнулася. І горшая злосць яшчэ ахоплівала. Во, кажуць, Піліпа жонка, як конская смерць. А пасля... Мо яна і

сумысле наварыла воўчых грыбоў?.. Наварыла тады, калі мяне дома не было. А пасля яе не стала. Вось як! Ох, нутро так і ператрасае болем балючым... А парадак жа быў у хаце, чыстата — аж блішчэла! Адным словам, гаспадыня! І жывёліна яе любіла: вераб'і, бывала, каля яе, як курчаткі, аж шэра. Ці ж мне гэта лёгка?.. Як успомню яе, дык быццам шкло пабітае па жылах трэцца, дыхнуць цяжка. Хай знаюць людзі: Бог мне сведка,— карчма аптэка! Чхаю я на ўсіх! Дармо сунеце свае языкі, як жыгалы. Гір, гір, кусіце! Вон, пракляць! Аўдоцця святая! Аўдоцця — гордасць, любасць мая. Эге ж!

Ну, вось і крыж недалёка, і вёска мая: прысяду, аддыхну, крыху аб Богу падумаю-паразважу... А вось па шляху коціць наш багатыр Клешч. Крыўдзіць, карае яго Бог. Град выбіў збожжа, летась пагарэў, а надоечы коней парачку вывелі. А конікі — у акрузе не знойдзеш, цацачкі!

Добрага дня! Куды гэта, пане, так спяшаецца? Ды дзе ж вы яго цяпер знойдзеце?.. У злодзея адна дарога, а ў вас многа.... Які з мяне злодзей, а што п'яны, дык праўда, але розуму яшчэ не прапіў, праўды не згубіў і гэту праўду хачу вам сказаць, што вы сваім жыццём толькі свет паскудзіце. Лежыцё на грашах, як свіння на балоце, і нічога для вас на свеце больш няма. А забыўся, ягамосць, як цябе мы ўлетку білі за падкапванне бульбы, бо не меў чаго есці? А што твой бацька нажыў багацце нячыстым дзелам, то гэта яшчэ не заснула. Ды едзь сабе з Богам, едзь. І не забывай, што Бог і багатым шые торбы...

Ат, вось закрыўдзіў чалавека, а ніякай на яго злосці не маю. Мо ён і нядрэнны чалавек. Не веру я цяпер сабе, зусім не веру — памыліўся на Аўдоцці, век не забуду. Яна, пралесачка, на гэтым крыжы вешала фартушок — сіні крыжык вышыты,— вось ён! Вазьму сабе, буду насіць на грудзях замест крыжыка і ўсё ўспамінаць, тужыць па ёй. Вось яна ўсцешыцца, хіба што ўсцешыцца».

І Піліп Крумкач пачаў адвязваць фартух. Ах, чаму гэты крыж быў такі стары, згніўшы!

## II

Гудуць сяляне каля воласці, як пчолы перад роем. Іх цэлая табала. Гэта сходка. Начальства няма, і сяляне разбіліся па колькі чалавек у грамадкі.

Першая грамадка:

— Мала Клешч паставіў!

— Зусім мала — і вусоў добра не замачыў.

— Хэ-хэ... а жонка нябось да хаты самога чуць даваЛакла.

— Ды не ў тым справа — з багатыра можна было б і болей.

— Трэба будзе пашумець, каб на сходцы паставіў.

— Ведама, трэба!

Другая грамадка:

— Як жа ж! Клешч сам бачыў, як ён з цыганом піў.

— Ды, пэўне, што ён украў, а хто ж болей!

— А пекных конікаў укралі! Бачыў. Асабліва той буланчык!..

— Ды ўжо ж! Але не бяда. Клешч другога купіць, лепшага нават. Во, нашаму брату канакрад — пятля на шыю, горш пошасці: вывеў коніка — вывеў і цябе з торбай. Ого, хай на іх звод!

— Бойся Бога — страшна падумаць.

— Глядзі, вось тут за гэты час, як я ведаю, восем конікаў, лёгка сказаць. Я цяпер спаць не магу: усё мне здаецца, што майго рабога выводзяць.

— Веру, сваток! Я дык і сабаку завёў, хай пільнуе... І вось нейкая цяжасць на душы, неспакойства. Надоечы жонка мая пажартавала, кажа: каня ўкралі! Я гэта барзджэй у хлеў; бачу, стаіць мой гняды, давай яго ганяць па хляве, лапаць па ім, а ўсё не веру. Пасля ўжо, як прыйшоў да памяці, дык аж заплакаў з уцехі.

— Трэба рабіць які ратунак, а то прападзём.

— Вось сягоння ўпарадкуем п'яніцу гэтага, а там павінна пацішэць.

— Ды ўжо ж! Ну, а як удалася ярына мая, ці ведаеш...

Трэцяя грамадка:

— Прапаў чалавек!

— Вось скажы, як па свеце дзеецца. Даўно гэта ён быў у нас першы, найлепшы. Чаго, бывала, ні папросіш — сабе адкажа, а паможа. Часам у бядзе якой пагутарыш з ім, пажальбуеш — і бяда не так страшнай зробіцца, і на душы стане весялей, лягчэй. Восьналяцела нейкае ліха, звіхнула, скруціла яго, спіўся нанішто, а цяпер — на табе! — канакрад!

— Мне дык і веры няма, каб ён быў вінават.

— А маланка яго ведае! А ўсе-ткі трэба каго пастрашыць, бо заўтра могуць у мяне або ў цябе вывесці.

— Ды і водку Кляшча распілі, трэба і яго паддзяржаць.

Чацвёртая грамадка:

— А хто паўкапы аўса ўкраў з поля, га?

— Ну, гэтым-то, бадай, не адзін з нас грэшны.

— А хто жонку ў дамавіну ўвагнаў? А ў царкве ты яго калі бачыў? А хто крыж абваліў ды пазрываў ахвяры — фартушкі?.. Ляжыць, гэта, як быдлё, і храпе на ўсе застаўкі, а фартушок за пазухай знайшлі. І гэты хацеў украсці, ужо хіба не інакш.

— Ну, ужо сказаў «украсці». Быў п'яны, без памяці, вось табе і разгадка.

— Але што крыж зняважыў, то дрэнна.

— Вось я аб гэтым і кажу, што дрэнна. «П'яны» тым горш, ён цвярозым ніколі не бывае. Ты, брат, законаў не знаеш. Яго, хрыстапрадаўцу, трэба было б жывым спаліць, суставы павыкручваць... Лепш не заступайся, а то і самому ліха не мінуць. Усе вы — чэрці адной шэрсці.

— Ат, ці ведаеш, нечага пужаць, нечага ў дурні запісваць: я ўжо пяцьдзесят два гады вучу-

ся. Што, узяў ад Кляшча абрахапку, то думаеш, што губернатар? Цьфу! Не фуфырся, не спужаемся!

— А сам-то чыю водку піў?!

— Піў, бо ўсе пілі... Дык і маўчы!

— Ды маўчу ўжо, хай на вас багавіца... Я як усе... Але сам-то, хоць на кускі мяне рэжце, слова благога на яго не скажу.

— Ведама, як усе...

У старане стаяць Піліп Крумкач і яго брат.

Брат. Дурны ты! Варона! Чаго трэшся па кутках, прасі іх, пакуль сходка не адбылася, а то позна будзе.

Піліп. Не буду прасіць, згіну, а не буду. Бог сведка, што я ніякіх коней не краў, не чапаў... Хай бы іх ваўкі паелі, гэтых коней! Скажы ім, сходцы гэтай, што хай просяць у мяне змілавання, а я — ніколі!

Брат. Хай на цябе безгалоўе, асароміў ты нашу радню! Вось ужо ўрадзіўся! І трэба ж было чапаць таго Кляшча — упіўся ён у тваю скуру. Ідзі, кажу, прасіся...

І браты моўчкі расходзяцца. А вось прыйшло ўжо і начальства: пісар і старшыня. Пісар петушыцца, бо ён жа ў крамнай вопратцы і гаворыць «па-гарадскому», «па-панску». Ад яго сяляне даведаліся, што гэта за насланнё — законы, бо ён па закону ўзятку возьме, па закону — вінаватага апраўдае, а невінаватага ў халодную засадзіць па закону... ды ці мала што. Старшыня — яго начальнік, але і той за яго жмецца. Ведама, які з мужыка начальнік.

Сходка пачалася. Хутка, як па пісанаму, вынеслі пастанову, каб Піліпа Крумкача саслаць у Сібір за тое, што быццам ён памог цыганам вывесці коней Кляшча, што ён таксама і тых восем штук украў; а каб не ўздумаў часамі адамсціць, падпусціць, значыць, «рыжага», ці студню затравіць, ці што іншае, то ўсадзіць яго ў халодную да высылкі. Вось што пачуў Піліп, а пачуўшы, замармытаў невыразна: «Дзякуй,

браточкі! Лепш бы самасудам, паламалі б галоўку маю, грудзі стапталі...»

І сярод цішыні пабрыў за сторажам у халодную. Сход маўчаў і не варушыўся, ось бы пасля бліскавіцы чакаў грому. Вось-вось нехта крыкне: «Што ж мы гэта зрабілі!» ці як там інакш. Але ўсе маўчалі і ждалі, а час, каторы лечыць раны, ляцеў сваёй чарадой, а зняволенае вякамі «я» згубіла свой голас, і сход разышоўся.

Ох-хо-хо!..

## III

Апынуўшыся ў халоднай, Піліп быццам скамянеў, аб усім забыўся, аб нічым не думаў. Як увайшоў у халодную, так і стаў нерухомы, перапужаны, як бы згледзеў нешта незвычайна страшнае. Нязручна пастаўленая нага ламала ў суставе, але гэтая боль была нейкай асалодай для Піліпа. Пасля сталі набягаць думкі. Здаецца яму, што ён есць сырое мяса, кроў, тлустасць цячэ за рукавы, капае з губ на грудзі. І мяса гэтае паскуднае, смярдзючае. І Піліпу мутарна стала, галава закружылася. А то ізноў быццам ён па купінах скача, што плаваюць на рудаўцы. Знядужаў ён, засопся — і бух у балота. Вось асоўваецца ён усё глыбей, глыбей... топіцца, хоча крыкнуць і не можа. Душна стала, вочы заліліся слязьмі... Паў ён на зямлю і пусціў усю боль, усё гора слязьмі.

А даўно ён так шчыра плакаў.

Піліп не агледзеўся, як заснуў, а праснуўся ён ад выцця сабакі. Рупна ўскочыўшы, пачаў кідацца па халоднай. Усё часцей, гусцей пралятала думка, апальваючы яго ўсяго: «У пятлі задушуся, а ў Сібір не пайду». І з поспехам, безупынна лапаў навокал рукамі, дзёр ён сцяну, падлогу... А падлога зусім гнілая была і сыпалася, як труха. Піліп хутка разалубаў сабе дзірку — ладную дзірку — і палез уніз. Падмуроўка ў рагу дома рассыпалася, і свет месяца жмурыўся праз яе. Тут часта куры хаваліся ад коршуна і ад дажджу, а то і котка, украўшы што ласае.

Пiлiп вылез на агарод, дзе тырчаў спелы мак, сарваў некалькі макавін і, кульнуўшы праз востры частакол, якім быў абнесены агарод, апынуўся ў полі. Тут ён выняў з кішэні галоўку маку і вытрас яе ў рот. «Гатунковы!» — шапярнуў ён і палез па другую. Няподаўта Піліп падышоў да сваёй вёскі. Гаспадары яшчэ спалі, але не спакойна: яны прадчувалі бяду, вялікую бяду, якую гатовіў ім Піліп. Вось ён пусціць іх сядзібы, дамовы дымам. Вось ён стаіць ужо пад саламянай страхой з таго канца вёскі, скуль вецер, дастаў сернікі, чыркнуў, утуліў агонь ад ветру, папрыдзяржаў так, аж пакуль не прыпякло ў пальцы. Пасля кінуў на зямлю яшчэ чырвоны вугольчык ад серніка і затаптаў нагой, каб, значыць, не распалалася. «Ат, вось я, мабыць, ашалеў». І, усміхнуўшыся ў бараду, накіраваўся да старасты, у вёску.

Цешцеся, гаспадары,— вёска ацалела, бо то быў Піліп Крумкач. Яму і ў галаву не прыйшло б падпаліць, каб аб гэтым на сходцы не казалі, а пры тым, як маглі б вочы глядзець на тое, як тырчаць печы сярод чорных абгаркаў.

Пачало світаць.

## IV

Піліп Крумкач астаўся на Беларусі. Ён зрабіў так, што была сабрана другая сходка, каторая валялася п'янюсенькая за Піліпавы грошы, і калі старшыня спытаў: «Так вы, значыць, Піліпа Крумкача астаўляеце?» «Інакш і быць не можа!» — грымнула сходка, як адзін, і давай пералічваць добрыя ўчынкі Піліпавы, нават такія, якіх ён і сам не знаў, хрысціць яго святым, цалавацца з ім.

І жыццё далей пабегла сваёй дарожкай, толькі Піліп плюнуў услед гэтаму жыццю, плюнуў і звярнуў убок, на бездарожжа.

Ён яшчэ горш запіў і зусім адкаснуўся ад людзей, а людзі празвалі яго «туманнікам». Піліп і гаварыць перастаў. Адны казалі, што ён з'еў язык з голаду, другія, што яму зладзеі вырвалі, каб не выказаў іх,

бо быццам бы ён з імі вадзіў каншахты. А то казалі, што язык яго анямеў ад водкі...

Гэты ж самы Піліп сядзеў раз у карчме, ну і, ведама, п'яны. Былі тут людзі, што вазілі бульбу ў бровар ды заехалі, каб карчмы не мінуць, каб «пагрэцца», хоць на дварэ была адліга і мокры снег церушыў. Былі і вясковыя хлопцы з музыкай, бо назаўтра манілася быць нядзеля і, дзякаваць Богу, на малацьбу ўставаць дадня не трэба. І як пачуў Піліп музыку, дык і размяк. Заварушылася, ажыло даўнейшае, павабнае. Жаль, ой які салодкі жаль ашчапіў яго! Вось ён, малады хлопец, трэцца паміж дзяўчат. Боты мае бліскучыя, як люстэрка, валасы курчавыя, і ўсім ён вядомы жартаўнік і музыкант. А дзяўчаткі, як ягадкі, як мядок, і — нечага таіць — усіх ён любіў, як шмель краскі, за ўсімі млеў з любосці, і кожная за яго гатова была выйсці. А тым часам выбраў «з гурту курту», гэтак людзі яму дапякалі. «Ах, каб вам языкі спрухнелі! Загубілі дзве душы, ды ці дзве? Каб жылі ў згодзе, то, можа, сямейку пералічыць і пальцаў не хапіла б. Хутка, Аўдоцця, і я да цябе пайду, ужо бачу тын тваёй сядзібы: кульнуў, значыць, праз яго — і ў цябе. Час мне ўжо, ведама, час. І так подаўга жыву. Толькі ты, уцеха мая, не сярдуй. Глянь, як я мучуся, і ў Сібір не пайшоў, каб бачыць кожны твой слядок. Успомніш — і так зашчыміць усярэдзіне, што вось, здаецца, кончуся, не вытрываю; але не — туды-сюды — і зноў тырчыш лішніцай. Ты ўжо, ці ведаеш, даруй! Я ведаю, ты баба добрая, згаворчывая. Перамелецца — мука будзе. Ну, цяпер мы інакш зажывём — пановаму. Але ты, Аўдоцця, як я бачу, паправілася, пакруглела. Эге ж, і шчокі папаўнелі, і з ямачкамі нават. Ну, вось і добра! А вось я табе пайду куплю нешта прыгожае, смачнае, каб аж усе ахнулі...»

Піліп выйшаў на двор. Адзін са згаладалых коней заіржаў.

— А мой буланчык, як гадуешся? Высмяг, згададаўся ты, тут стоячы! Ну, але цяпер канец твайму гору. Ты ў мяне будзеш кругленькі, чысценькі, і падкую, і кожны дзень пойла буду даваць. А цяпер

паедзем да Аўдоцці, яна, пэўне, з вячэрай чакае... Ведаеш, я з ёй памірыўся... Ну, дык кратайся... Но, кажу, а то пугу вазьму! Чуеш?!.

І буланчык, ірвануўшы раз-другі, адарваў повад і павёз ачумеўшага, п'янага Піліпа, куды вочы вялі. А людзі, што вазілі ў бровар бульбу, асушалі шкалікі ад водкі, а кішэні ад запрацаваных грошай. «Пі, весяліся, залівай гора! Бяда не ў хмялі, а ў пахмеллі. Сягоння жывеш, а заўтра гніеш...» Ну, але ўрэшце сабраліся ехаць, а тут — мык — жарэбчыка няма. «Ах, які конік! Памажыце, браточкі, шукаць, не пашкадую чары. Ратуйце чалавека!» «Ды ўжо ж, разам гулялі,— роўна будзем і бяду дзяліць». І, пытаючы таго-сяго, наўзаваду на сваіх падводах пусціліся шукаць Піліпа. А нагналі яны яго на лёдзе ракі, праз якую людзі зрабілі дарогу нацяянькі. Ужо ж далі яму, колькі ўлезла, колькі жадала п'яная, злосная рука, а здаволіўшыся, вывернулі з разналак гэтыя паламаныя костачкі, парванае мяса на лёд, на ваду, бо была адліга. Пад раніцу стукнуў мароз. Людзі пакуль знайшлі Піліпа Крумкача, пакуль аб гэтым дазналася начальства, то ўжо яго ніяк не маглі выдзерці з лёду і тузаліся над ім, аж пакуль станавы не гыркнуў: «Вырубіць канакрада!»

А сівыя бароды, сваякі і суседзі Піліпа, тут жа казалі: «Праўда наверх заўсёды выйдзе. Быў канакрадам і памёр ім. Калі не саслалі ў Сібір, дык адправілі на папраўку на той свет».

— Туды яму і дарога,— казаў сухарукі Рыгор, што меў вочы, як у недарэзанага барана.

Ён быў усім вядомы канакрад, што разам з сваёй хеўрай дзяржаў усю акругу ў страху. І ніяк да яго не падкапаешся, бо ён вадзіў з паліцыяй каншахты, бо ўмеў, як кажуць, канцы хаваць у ваду, і проціў шэрсці яго не пагладзіш, бо злосна агрызаўся. І ўсе яго баяліся.

— А што ён канакрад,— казаў Рыгор далей,— то гэта яшчэ памялом па вадзе пісана, качаргой падпісана. Куды яму — ён жыў, як мокрае гарэла! А па-мойму, калі ты запісаўся жыць, дык жыві, смурод гэтакі.

Глупства, што жыццё пякучае, калючае, а ты хукай, дзьмухай на яго, плюй, кляні, але не выпускай! Трымай, значыць, закілзаўшы гэтае праклятае жыццё, каб яно ў табе аж скрыпела, пішчала... А то пайшоў брынды біць. Дадушы, і плюнуць на яго не варта.

І старыкі, пазнаўшыя ўжо жыццё, ахвотна падтаквалі яму. А дзеці і дзецюкі, што збегліся паглядзець на здарэнне, коўзаліся дакола, бо лёд быў як шкло.

## Разбітая ваза

Пакой прыбраны ў мэблю і іншыя рэчы хатняй работы. Стаіць фартэпіяна. Праз адчыненае акно відаць зверху горад уночы. Чутна за сцяной сумная музыка. За акном пры электрычнай лямпе сядзіць чалавек сярэдніх гадоў і піша. Б'е гадзіннік. Чалавек задумваецца, устае, кажучы:

— Якаясь трывога, якоесь прадчуццё не дае мне супакою, адбівае ад працы, разганяе думкі. Штосьці будзе, штосьці будзе... *(Ходзіць.)* Чаму, душа, ты не знаеш, што цябе так непакоіць? Чаму, сэрца, б'ешся моцна?

Дзе ты, звястун — дух таемны? Што звястуеш: гора, радасць, смерць раптоўную ці, можа, тайну вечную адкрыеш? А то, можа, непарадак у якойсьці частцы арганізму робіць клопату мне столькі? Мо і так, бо памыляцца — гэта людская здатнасць. *(Маўчанка.)* Шмат людскі род памыляўся ў сваёй гісторыі доўгай, шмат блудзіў і цяпер блудзіць; і далей так быць павінна, бо тут ёсць расчараванне і раджэнне новай праўды, ёсць цярпенне, мукі, гора. А чыя душа праходзіць праз полымя цярпення, той бліжэй да таямніцы таямніц, а душа яго іскрыцца бляскам вечным і сусветным. І вось штораз усё болей людзі мучаюцца на свеце, нясуць крыж наверх Галгофы, і душа іх багацее, і бліжэй яна да Бога.

А то ж яшчэ сягоння газет не здолеў прагледзець — што за дзень культура наша дала новага навуцы і

якія дзе падзеі ўскалыхнулі жыццё наша. Вось зноў аб касмалагічнай драме. *(Чытае.)* «У апошнія часы чутка аб тым, што каметы пагражаюць існаванню жыцця на Зямлі, усё часцей і часцей трывожыць род людзей. І недарма: сёлетняя камета, як даводзяць вучоныя, сур'ёзна небяспечная для Зямлі. На шляху свайго імпэтнага сляпога бегу яна павінна зачапіць Зямлю... У лепшым выпадку — гэта калі Зямля пройдзе праз яе ядавіты хвост...» І гэтак далей. І вось наша старая маці — хлебадаўчыня-Зямелька — кончыць сваё існаванне ў бязмежнай цьме нябеснай. Божа моцны, і што значыць у гэтай страшнай драме неба свет Евангелля, надзеі Банапарта, нашыя мудрыя талкаванні аб душы, таемных сілах!.. Ах, усё, усё загіне без пратэсту, змілавання і не будзе дзе іскрыцца душы нашай бляскам вечным!.. Ха-ха-ха!.. Як мізэрна вяльможная пані мудрасць!..

Ну, але яшчэ заўчасу нюні распускаць над тым, чаго, можа быць, не будзе. Можа, гэта чорт-камета сфанабэрыцца і пойдзе другім шляхам у бяздонне... Можа, мы яшчэ жыць будзем незлічоны лік сталеццяў... Мо мы самі Зямлю кінем і качэўнікамі неба станем для сваёй патрэбы... Мудрасць наша светлазорная ў росце сваім непамерным мо захоча гразіць небу і між зорак распарадак завядзе на свой лад новы... О, будзь, неба, на варце, добра назірай за пылінкай, што лунае каля Сонца! Ой, наробіць яна ліха! Ой, будзь, неба, на варце!

Сяду я лепш пайграю, каб спыніць хоць крыху думкі, не патрэбныя нікому. *(Іграе на фартэпіяна «Сюіту беларускую» і не чуе, як уваходзіць кабета ў шэрым, каторая падышла да акна і глядзіць задуменна на ноч. Ён заўважае кабету.)* Што я бачу?! Здань гэта?.. Ты прыйшла да мяне? Ты зноў тут, паміж твораў рук мазольных, рук братоў сваіх сярмяжных... Ты зноў тут, дзе жыве вера ў народны дух магутны, дзе куецца для мільёнаў шчасце мець сваю культуру... Ты, сышоўшая са шляху праўды роднага народа, ты, што трапіла мне ў сэрца і разбіла ўсе надзеі, як адважылася толькі, што прымусіла ступіць цябе,

гордую, за парог мой?.. *(Маўчанка.)* Божа моцны, што сталася з табой, краска лугавая?! Пэўна, грунт той, дзе гальчэе твая жытка беспрасветная, горш за камень, за пустыню. Дзе ж твая круглашчокасць, зычны смех, яскравыя шаты? Пабляднела ты, завяла... Знаць, зашмат свет гэты грэшны бляскам сваім цябе лашчыў, застывала жыццё тваё ад сіверу душ чужынцаў... Адзавіся, дай пачуць галасок твой, дай паверыць, што ты ёсць тут, са мной разам?

— Падыдзі сюды, мой мілы. Ціха толькі, не спалохай воблік будучыні нашай... Бачыш, там, пад чорным небам, аграмадны курган... То магіла, дзе зарыта наша вера, ідэалы, багі, любасць жыватворная, няўсцешны сум наш... Яна загасіла свет Сонца, зямлю сцюжай акутала... Бачыш, мілы, вунь багуе ноч халодная, старая...

— Ой, хай лепш бы ты маўчала! Твае словы так балючы, як атручаныя стрэлы. Адыдзі ад гэтай цемры, сядзь тут, раскажы мне лепей, дзе жыла і як жылося... Схамяніся ад мар страшных... Божа, што з табою сталася?!

— Прытулі мяне, мой мілы! О, так моцна-моцна! Не давай яму мяне больш гнаць у цемру неразгаданую... Па бязбрэжнай Індыі мяне ён ганяў у непагоду... Там знайшла я, мой ты мілы, ледзяняшчую нірвану, там смерць глянула мне ў вочы... Прытулі мяне, мой мілы!.. Адтуль гнаў ён да вялікіх магіл вымершай культуры — пірамід тысячагадовых, і пабачыла я таемную, жудасную ўсмешку сфінкса. *(Хавае твар у руках.)* Як закрыю толькі вочы, так і бачу: мне здаецца, што вось-вось я разгадаю думкі каменя жывога, думкі страшныя, як смяротны прысуд мільёну мільёнаў...

— О, пакінь трызніць, гаротная, пакінь мяне мучыць! Божа, як мне цябе ратаваці?!

— Ці ты знаеш: ён — прарок мой! О, не — прарок усяго свету! Яго душа — то дыханне смерці, смурод трупа і гнілля. Ён нас вучыць, як любіць небыццё. Ён нас, пакрыўджаных, бяздольных, стамлёных бязмэтавым існаваннем, неразгаданымі пытаннямі

і непамернай барацьбой, усыпляе чадам затхласці сырых магільных склепаў... *(Прыслухоўваецца.)* Ціха, як бы ён ужо кліча, каб зноў мяне мучыць, мучыць... О, не, гэта мне здалося...

Але як прайграе адтуль тры разы сірэна, я зноў мушу быць з ім разам... О, ратуй мяне, мой мілы! Дзе ж мне ад яго схавацца? Я прыйшла сюды, каб трохі ўспамінамі пажыць, бо ў душы сваёй не маю ані радасці, ані свету — ён загасіў. Ён казаў, што зорка тая, што вяла людзей па шляху, даўно згасла, ой, даўненька! І калі людзі яшчэ бачаць свет, то толькі таму, што далёка згасла наша пуцяводніца...

— Супакойся, пакінь думаць аб ім, аб яго душы чорнай. Час залечыць усе раны.

— Каб успамінамі пажыць... і каб пабачыць, як куецца для мільёнаў шчасце... шчасце мець сваю культуру, якая хутка загібее, бо жыве памёршым светам даўно згаслай зоркі.

— Не, даражэнькая мая, не згасне свет, бо шлях наш асвятляе не свет далёкай зоркі, не, а яркі светач, што палае ў мазолістых руках нашых. Але супакойся ты, успомні, як мы калісь з табой жылі тут, між ціхай і дружнай творчай працы. Як я вось тут клаў на паперу малюнкі родных абразоў, а ты, глядзі, во як прыгожа лісточкі, краскі вышывала.

— Так, так, прыгожа... сон дзіўны бачу я. *(Аглядае пакой.)* Як усё міла!.. Вось тут я часта ў час змяркання любіла летуценіць аб шчасці... Ах, то ж калісь я іграла песні, а ты спяваў, помніш?.. Родныя песні, мілыя згукі шчаслівых хвілін... Давай зноў паспрабуем! *(Іграе, але знаходзіць толькі прыкры дысананс.)* Ах, дзе ж мае родныя песні, дзе песні, што акрылялі душу маю ў час няўсцешнай тугі? Родныя песні, мілыя згукі шчаслівых хвілін! *(Плача.)*

— Не маркоцься, пакінь плакаць! О, чаму ж ты так маркотна, зорачка, мая ўцеха? Глянь, букет твой, што ты калісь... *(Падае букет разам з вазай.)*

— Мой букет... праўда, мой. Яшчэ ён захаваўся! То я ж збірала... помніш, там, за рэчкай, луг?.. Тут

мятлічка, каласкі, і пасохшыя ёсць краскі... Я збірала іх у жніўні...

— О, так, помню, як на лузе ты ў вопратцы вясковай... быццам прыгожы матылёчак пырхаў з красачкі на краску... Захаваў я букет гэты як прыемны, дарагі ўспамін аб табе. Я ўставіў яго ў вазу... Глянь, твор мастака з народа, глянь, якія мяккія і прыемныя яе выгнутыя лініі — проста, хораша, павабна; гэта рэдкасць этнаграфічная, выкапаная з руін, дзе калісь жыццё кіпела нашых прашчураў вясёлых. Часта мне букет і ваза сілу творчую давалі... *(Чутны тры зыкі сірэны ад самаката. Яна ўскрыквае, выпускае вазу і, сланяючыся, выходзіць. Чуваць, як адыходзіць самакат. Якісьці час маўчанка.)* І вось яна імчыць у халодныя абдымкі свайго любоўнікаˊта, імчыць у цёмную неразгаданую даль, а за ёй неадступная, непаўстрыманая, як цень, гоніцца мара смерці. І вось адзін страшны момант — і смерць нагоніць... О, неба, літасці, літасці! *(Маўчанка.)* І вось неба, каб магло гаварыць, сказала б: «Агіднік ты! Тваё жыццё ўжо разбітае, нягоднае, вось як гэтыя чарапкі ад вазы. Твая душа — вось як гэтыя краскі, раскіданыя, засохшыя, без зярнятак і ўзросту. Твая душа — як старое, пакінутае, струхнеўшае гняздо...» *(Абяссілены, абапіраецца на клавішы фартэпіяна і з боллю кажа.)* О, бедная, беспатольная, мая душа!..

## Беларуская казка

Я быў яшчэ падшпаркам, а ўжо тады мне гэту казку баяў такі, як я цяпер, бел-бялюсенькі, як перастпеўшая ніва, дзядок.

О, гэта казка векапомная!

За даламі, за гарамі, аж за морам-акіянам была сабе старонка-край.

А сказ свой старонка тая пачынае вось з якога часу. Калі ўзгнеўлены Бог прыказаў Архангелу са-

гнаць з неба анёлаў-здраднікаў, хаўруснікаў злога, калі паслухмяны Архангел просьбай-пагрозай пачаў ачышчаць абшары пакояў Бога і калі адзін са зладняў зачапіў сваім савіным габдзюром нягрэшнае цела Архангела, то тады капнула нявінная кроў жыхара неба, капнула, папала на зямлю і лягла на зямлі крывавай плямай.

І вось гэта пляма ёсць тая беспатольная старонка, і з гэтага часу яна пачынае сваё жыццё-стогн.

Паплылі тады па старонцы рэкі слёз, пасеўнае поле, ураджайны грунт сталі багата фарбавацца крывёй бязвіннай, людской, братэрскай крывёй; сялібы, вёскі, гарады дымам узняліся і засланілі сонейка.

А ненаедная, прагавітая крыўда векавечна гнала ворагаў-жывадзёраў, а вораг...

— Ох!.. Але чаго я замаўчаў?! Гэта толькі казка, толькі казка.

І вось моладзь адважная, юнакі-асілкі, старцы-думаннікі ўсталі як адзін, цясней спаяліся ў згуртаваную, адналітую, адважную моц, узнялі свае белыя, чыстыя, як сумленне малалетак, вопраткі з чырвонымі ад нявіннай крыві пасамі-шляхамі, узнялі ўвыш на павеў ветру, на паказ сонцу, на пагібель ліхадзеям.

І так пад сцягам пайшлі...

Схамянуліся, захацелі, змаглі!

Вораг кінуўся на ўцёк-бег. Дык барзджэй на коней гарачых, быстрых, як птахі, і хутчэй у пагоню, паслаць пагоню!

Ускочылі на сёдлы і памчалі стралой. Пагоня дагоніць, даканае і адаб'е ім ахвоту памыкацца, пакарае па заслугах і вернецца са славай і здабычай...

О, супакойся, не радуйся, сэрца, не грымі прароча, голас, бо гэта казка, толькі казка...

І вось асталіся жыхары без сваіх абаронцаў-збаўцаў.

А бяда не ў лесе жыццё мае, а між людзьмі гадуецца, сябруе.

А ліхадзеі на зямлі рэдка сеюцца, але густа-ўраджайна ўзрастаюць, і дзіўна, як іх зямелька носіць, бо нават гадзіна ядавітая, укусіўшы, гіне ад іх крыві.

Дык зноў знедужэлую старонку агарнулі, запаланілі, пазганялі ў цёмныя астрогі ўдоў, сірот, калек, замучаных, схварэлых і паставілі вартаваць бяду-бядачку, боль балючую, гора горкае.

І моляць, чакаюць людцы пагоні.

Страшнай помсты жадае іх сэрца, свету — іх душа, лекаў — іх раны, хлеба — іх цела.

А пагоні як няма, дык няма.

Дні, вякі панырнулі ў вечнасці...

Ажно ўрэшце там, дзе сходзіцца зямля з небам...

Пагонь! Пагонь!

Здрыгануўся, уціхаміўся, прытаіўся вораг.

А дрэвы, вітаючы радасна, зашумацелі, заківаліся; рэкі весела заіскрыліся, а неба яшчэ раз узбагацела ўсмешкай Сонца-Бога.

А вораг-крыўдзіцель натапырыўся аружжам, прызапасіў моц магучую, зашыпеў, як гад падкалодны.

І вось пагонь тут, тут...

Гура, пагонь! Бі! Ратуй! Вызваляй! Гура!

Але дзіва: пагонь ідзе вольным крокам і мае выгляд, быццам сейбіт вясной у полі, быццам святы, згледзеўшы божы цуд, быццам мудрэц, адкрыўшы праўду светлую, вялікую.

І замест грознага покліча кажа да ворагаў гэтакія словы-гімн:

О, людцы! Мы да вас ідзём
З мірам і дабром.
Было-сплыло жыццё-быццё.
Крыўды болей быць не будзе.
Мы ўсе людзі!
Мы ўсе брацця!
Дык раскрыем жа абняцці
І палюбім ўсіх, усё
Так, як любіць Бог.
Свет, свет ідзе,
Волю вядзе
Па нашых слядох!

Але вораг-крывапійца не сказаў «аман!». А размахнуўся цяжкім смертаносным аружжам ды зноў

пачаў ліць кроў, бязвінную людскую, братэрскую кроў...

Ах, выбачайце! Я забыўся, што гэта казка... Вось як у казцы: «...І палюбім усіх, як любіць Бог!»

І вораг-звер стаў сябрам, чалавекам: раскрыў братэрскія абняцці, заплакаў слязьмі анёла.

І была вялікая радасць на зямлі і на небе...

І я там быў, кроў, пот свой ліў...

Выбачайце...

Дзед заплакаў, не дакончыўшы.

## Змярканне

*Фантазія*

Горад-руіна, абліты чырвоным водблескам заходзячага сонца. Віхор вые па апусцелых вуліцах. Чутна сумная песня:

Цені нямыя грозна гусцеюць,  
Колеры тухнуць, згукі нямеюць,  
Тайны без імя шлях заступілі,  
Немач з тугою мяне паланілі...  
Змярканне санлівае, як блудніца п'яная,  
За сонцам крадзецца, непаўстрыманае,  
А я, чалавек нядуж, адзінотны,  
Іду і іду уперад, маркотны.

Выходзіць чалавек, звонячы кайданамі.

— Зноў труп! Увесь горад, як гнойная рана, і няма яму граніц, і блукаю па ім, як па заклятым месцы. Кволы, знедужэлы, сунуся, як мара, як у цяжкім сне, і здаецца мне, што вякі вякоў буду хістацца тут між запусцення, мерцвякоў і заходзячага сонейка, а кайданы будуць напамінаць няволю, а віхор, б'ючыся між руін, казаць: смерць, смерць...

Садзіцца абяссілены. Маўчанне. Асыпаецца мур.

— Чуеш, душа, як руйнуецца твой твор! Колькі вякоў ты змагалася, молячы сонца аб помачы, аж

пакуль не пабудавала гэтыя вавілонскія вежы, каб іх паставіць пустымі. Бачыш, душа, во, як валяецца спаняверены чалавек, як тое быдла пабітае. Глянь, душа, на свой пройдзены цярністы шлях. Што ты хацела і што ты хочаш, ненасытная душа, мачыха наша?! Ты чакаеш, чаго не дажджэш, а што дажджэш, не захочаш, і што хочаш, сама не знаеш. Вечна галодная, ты кідаеш мяне на бездарожжа, у непагоду, у цемру непражытую, і я, пакорны табе, змучаны, паўжывы, усё стараюся выйсці з гэтай магілы туды, дзе радуецца сонца і гамоніць жыццё...

Хоча падняцца, але, знямогшыся, зноў апускаецца. Ціха напявае:

І ціха ступае змярканне:
Час успамін, час забыцця.
Між запаху ночы дыхання
Душа чакае ў маўчанні
Прыходу свайго небыцця.

Устае і ідзе. Перад ім узнімаецца стада груганоў.

— О, мудрасць людская! Што бачу, мой брат! Ты надчалавек, з найвялікшай душой, ты, усёвед, ляжыш ля маіх ног, ног твайго нявольніка, ляжыш, пакананы смерцю, ты цяпер — пажыва чарвей, груганоў... Пракляцце табе, тыран, скупы мудрэц з застыгшым сэрцам! Ты глухі быў на мальбу, на стогн людзей з галадаўшай душой. Ты забраўся на недаступную вышыню мудрасці, і красаваў там для сябе, і забаўляўся між духоўнай роскашы, і пагарджаў, здзекаваўся з людзей цёмных, з беднай душой. Пракляцце табе! Гэй, груганы, начніцы, ірвіце яго на кускі, мяшайце з граззю. То ж ён прабіваў шлях да тайны тайн! Бог даў яму моц генія, багацце свету, а веліч яго мудрасці была надзвычайная, але ён не падзяліўся з народам, а наадварот — пагражаў сваёй духоўнай магутнасцю. А хіба ж чалавек можа жыць без свету!

І вось я павёў цёмных, пакрыўджаных, з галоднай душой, павёў на цябе, на брата свайго, павёў вызваляць дух. А на нас, братоў, пайшлі немач, пошасць

і ідзе ноч... І вымер горад ад голаду душы, бо брат мой, скупы мудрэц, пашкадаваў змучаным душам жыватворнага свету; брат мой, каін, ляжыць гідкі, зачумлены, страшны, як грэх прыроды, ляжыць сярод апафеозу смерці. Бо хіба ж можа чалавек жыць без любасці!

— О, брат мой, як я бязмерна няшчасны, што не магу вярнуць табе жыццё. Чаму нашы душы не зліліся праменнямі гарачай любасці ў адно вялікае, без плям, сонца, каторае асвяціла б наша жыццё гаротнае? Чаму ты... Хі-хі-хі... Чую, як насмешна хіхоча цемра з разрушанага дому, праз выбітыя вокны хіхоча, бо...

Змярканне санлівае, як блудніца п'яная, за сонцам крадзецца, непаўстрыманае.

— Вітаю цябе, цемра! О, не будзь ты так пуглівай, бо вораг твой ляжыць пакананы. Слаўлю цябе! Ты схаваеш сорам чалавека і яго страшныя падзеі. Хадзі, цемра, і багуй, прыкрый чорным цалуном сляды смерці, асляпі мае вочы, каб я не мог бачыць, што будзе, што ёсць, каб не мог бачыць вось хоць бы гэтай дзяўчынкі ў чорным, гэтае маладое адважнае жыццё, што бегла па мармуровых белых усходках уніз і завяла, не расцвіўшы, упала на ўсходкі. А там недзе ў пакоях, між мілых, знаёмых рэчаў, асталіся думкі-лятункі аб каханні, аб славе, аб шчасці... Гэй, прыходзьце сюды, асыпайце яе краскамі, праслаўляйце таго, хто вас стварыў, бярог як наймілейшае, як найдаражэйшае! Прыходзьце, пакуль яшчэ мае воблік красы прыроды...

— О, мармуровыя ўсходкі, муры зруйнаваныя, бязлюдныя вуліцы, машыны паржавеўшыя, заплачам мы няўсцешна па безустанным тварцу, вялікім мучаніку — па чалавеку. Слава яму, слава! О, неба, прырода, глядзіце на чалавека, слухайце яго, мо ён першы і апошні паміж сусветнага прастору. Слаўце яго, плачце па ім!

Уваходзіць, рагочучы, Пан — бог прыроды. Ён худы, стары, храмы, з сукаватай палкай, укачаны ў асенняе лісце.

— Хто ты, ад смеху каторага дамы покаюцца?

— Я, вялікі стары Пан, бог прыроды, бог твайго бога, прыйшоў на хаўтуры чалавека, свайго ліхадзея. Смейся, усё жывое! А хто мне супраціўны, таго вось гэтай палкай прыб'ю, капытам забрыкаю.

— Знай жа ты, старая шчэпка, што мне не да смеху: я перажываю цяпер усю тугу, якую пазнала чалавецтва праз сваю доўгую гісторыю, і туга гэта ўсё ўзрастае і прывядзе мяне да смерці...

— А скажы, калі ласка, ці ты тут адзін?

— Гора маё! — адзін.

— Ну, дык прападай жа, калі ты такі адважнік!.. Не, шкада мне палкі на табе псаваць. Эх, ведаеш, што я табе параю! Дастань ты мне жыватворнай вадзіцы, каб я, скупаўшыся ў ёй, мог абмаладзіцца. Пасля вычысці плямы на сонцы, а то мае старыя косці мёрзнуць, і, канешне, раздабудзь, ну хоць бы сабе з Марса, насення траў, дрэў, рознай жывёліны, бо на зямлі расліна драбнее, звяр'ё вымірае... І кінь, пракляні ты гэтыя муры, машыны, і я цябе абніму моцна, як блуднага сына, што вярнуўся к праўдзе.

— Ніколі! У знак пратэсту і найвялікшай пашаны к сваім прашчурам і іх мудрасці я цалую вось гэты зачумлены труп...

— Эх ты, блуднік! Губіш самахоць сябе. Цэлае жыццё блудзіў, шукаючы шляху да сонейка. Святла, мудрасці хацеў больш... Ха-ха-ха! А ці ты ведаеш, нерастаропная галава, што ты і брат твой, і ўвесь гэты горад пагінулі ад таго, чаго вам так жадалася... Пакуль не позна, апамятайся, даўміся, загаі мае раны...

— Ніколі!..

— Гэй, лес мой, добры брат, абступі цесным кругам і ўпрыся магутным плячом у муры каменныя, праклятыя, не выпускай адгэтуль двуногіх, зачумленых!.. А ты, дзікая, калючая трава, раз'ядай карэннямі каменны падмур, рассцілайся зялёным дываном, укрывай гэту гідасць, гэты след і магілу чалавека! Гэй, іскрыцеся, рэкі, гуляй, віхор, пей хвалу вялікаму, старому Пану!

— О, пень трухлявы, кланяйся мне ў ногі, прасі выбачэння — я яшчэ чалавек, я іду пазнаць тайну, што завецца смерцю, а пазнаўшы яе, стану богам... Я ўміраю...

— Але! Ты бог, хоць жыў неказіста. Не, ты проста-такі злодзей. Украў у Наймудрэйшага частку яго багацця, што дрэнна ляжала, і зужыткаваў няўмела, распусна, на сваю пагібель. Ужо памёр!.. Я астаўся адзін... Чаму ж я не радуюся, не трыумфую... Нейкі страх мяне апаноўвае... Вось, здаецца, зараз здрыганецца, закалышацца зямля, насупіцца, прыгразіць неба... Мне страшна. Ну, але я тут загутарыўся, а ўжо і сонца няма — у пацёмках сярод гэтых руін і заблудзіцца можна... Ох, як холадам павеяла... Страшна мне...

Адварочваецца, каб ісці, але перад сабой бачыць чорны цень.

— О, неба! Хто ты, чаму не пускаеш, нашто заступіў мне дарогу, што ты хочаш? Чаму маўчыш? О, як цёмна стала... Гэта ты сонца ўкраў, запрапасціў. Ты?.. Зноў маўчыш!.. Ад цябе цемра хваляй разбягаецца. О, не глядзі на мяне — ад твайго погляду кроў застывае, у тваіх вачах бясконцая ноч гняздзіцца, на тваіх вуснах аддыхае вечнае маўчанне... О, як тут стала ціха, глуха і ноч захінула ўсё. Чую дыханне смерці, холад сырасці магільнай. О, пусці мяне! Хто ты? Ці з табой змагацца, ці маліцца на цябе?! Хто ты?

## Заклік

Брат мой мілы! Ты хмарней хмары, чарней зямлі. Вочы, поўныя слёз, няпэўна, трывожна перабягаюць даль. Ты блудзіш!

Брат мой мілы! Падарожны нашых непраходных пушчаў. Грозныя буры цябе аглушылі. Халодная цемра асляпіла. Знемагла цябе галодная бяда.

Які ліхадзей адважыўся кідаць каменнямі і так параніў тваё цела?!

Якое ж гэта ліхалецце загнала цябе ў гушчар, нетры, на бездарожжа?!

Спыніся, брат мой, прысядзь на прызбе маёй хаты вясковай, пахілай і дай пачуць сваё новае слова аб мудрай задуме засеянага поля, аб прарочым гомане векавечнага бору, аб нашым, блізкім, родным... Распелянай душу сваю ад залатых кос сонейка і сінявы нябеснай. Хай здаровая нагата яе будзе ўміленнем у сумную часіну.

Калі ж ты шукаеш Бога, каб напоўніць, сагрэць і асвяціць душу сваю, што, як бажніца без Бога, пустуе ў забыцці, дык увайдзі, брат мой, у маю хату вясковую, пахілую. Там ты, без малітвы і слоў, усёй істотай сваёй пачуеш, уразумееш Бога. І будзеш радасны.

Калі ж ты ачмучаны крыклівай праўдай, якой чураўся, ашуканы багатымі абяцанкамі, якія шкодны табе, калі ты сярод фальшывага бляску не пазнаеш сябе, сярод чужога горада згубіў сябе, дык увайдзі, брат мой мілы, у маю хату вясковую, пахілую. Там пазнаеш глыбіню і чыстату душы сваёй. І будзеш радасны.

Калі ты, безнадзейны, няўсцешны, нічога не шукаеш, бо дагэтуль знаходзіў толькі церні і роспач, калі цень смерці заступіла красу і ўцеху жыцця, а небыццё вабіць у бяздонную цемру, дык схамяніся, брат мой, і ўвайдзі ў маю хату вясковую, пахілую, дзе багуе каханне і гаспадарыць праца-весялуха. Там на стале, адліваючы срэбрам, красуе даматканы абрус, на ім ляжыць пушаны, пахучы хлеб, соль у бяроставай ступачцы, а ў паліваным жбанку сыта сытная. Адтуль відаць, як ружавее бела-ліловы золак. Там на Вялікдзень абразы на покуці ахарошваюцца дзеразой, а на Сёмуху пахне яірам пасыпаным. Там скуголенне злой снежнай мяцеліцы разбіваецца аб паважны спакой дабрадзейкі печы, якая змярканнем затуляе ў цёплую драмату. Там, брат мой мілы, аддыхнеш душой, падужэеш целам і праславіш музыку жыцця.

Дык увайдзі, брат мой мілы, у маю хату вясковую, пахілую, а будзеш дарагім госцем і ўзрадуеш мяне, засмучонага ад жудаснай сучаснасці.

Увайдзі!

## Як Лявон Недарада дарадзіў сваёй бядзе

Строгі быў загад у гміне, каб усе неадкладна заплацілі даніну[1]. Падышоў ужо апошні тэрмін, але з сялян, бадай, ніхто не плаціў: той не мае чым; той мае, але не рупіцца, бо чаму іншыя не плацяць; а той, кіруючыся ўсялякімі асабістымі перакананнямі, зусім не хоча плаціць. І так, даніна ані з месца.

Ажно прыехаў якісьці важны чын у гміну. Сабраў сход і ў прысутнасці жандараў нагрымеў страшных слоў, даў тэрміну толькі тры дні, прыгразіў астрогам, настукаў кулакамі, лаяўся — надта ўжо, відаць, яму гэтая даніна патрэбна была. Як ачумеўшыя, разыходзіліся сяляне са сходкі — ціхія, пануры, з затаенымі думкамі, вось быццам той лес, што чакае буру-навальніцу.

А Лявон Недарада дык, мабыць, больш за ўсіх меў клопату. Яму ўсё жыццё ніяк не ручыла, а ў грашовых справах — асабліва. І спраў гэтых у яго заўсёды было гібель, а грошай дык ніколі не было.

Узяць хоць бы цешчу Лявона, якая памерла і не сказала, дзе грошы схавала. Дакладней, не здолела сказаць — раптоўна памерла. А сама калісь хвалілася, што прызапасіла на чорную гадзіну. Нават нейкім прыпадкам старасвецкі чырвонец захаваўся. Лявон сам яго бачыў, пробаваў зубамі, стаўляў рубцом, ці не фальшывы.

Нямала клопату ён меў і са сваёй жонкай. Баба была хоць куды: спор мела ў руках і догляд гаспадарскі.

[1] Адначасовы падатак.

Адзін быў толькі фэлер: цераз меру была прыгожай. Кожны на яе галіўся, падлабуньваўся ўсялякімі спосабамі. І гэтым набівалі ёй цану. Пачала яна ганарыцца, узяла Лявона, як кажуць, на павадок. І не мог Лявон ёй пярэчыць, бо не ўстаяць яму супраць яе красы. Вось і цяпер: прадаў бы ён Серадулю і адпіхнуў бы сваю бяду — даніну, а там — бог бацька. Але не туды тое, зрабіць гэта не ўдасца, бо жонка не дазволіць. Ды яно і справядліва: што варта гаспадыня без каровы і карова без гаспадыні?! Апроч таго, жонка апошнімі часамі стала бокам хадзіць, трэба нейкім гасцінцам паддобрыцца. Бяда з гэтымі прыгожымі жонкамі! А тут і вясна на дварэ, хлеба няма, нарогі трэба купіць...

І ўсяго тэрміну тры дні! І яму, Лявону, звычайнаму сабе бульбаеду, трэба столькі грошай выдаўбаць недзе, прыдумаць нейкі ратунак.

Так разважаў Лявон, ідучы са сходкі. Усю здатнасць сваю ён ужыў, каб прыдумаць, дарадзіць сваёй бядзе. Але як? Хіба ж ён бачыў калі радасны прамень у сваім жыцці? Хіба ж не ён сын паднявольнага народа? Хіба ж не ішоў дождж і не разліўся пансак у печцы, калі ён радзіўся? А бародаўка на носе хіба не магнэс для ўсялякіх напасцей? Эх, з горам радзіўся, з горам, мабыць, прыйдзецца памерці! Дык вось чаму яго загартаваныя працай рукі сталі непаслухмянымі і так нялоўка ацíралі халодны пот з чала.

Прыйшоўшы дамоў змяркаsuccessfully, Лявон ні з кім з хатніх не ўваходзіў у гутарку і, не вячэраўшы, лёг спаць. Дакучлівыя, трывожныя думкі не пакідалі яго ўсю ноч.

Са змучанай душой устаў ён з першым пеўнем і пайшоў на даржнік, каб дагледзець гаўяда, і тут яму прыйшла шчаслівая думка.

У бальшавіцкія часы, калі аднасяльчане разбівалі панскі двор, Лявон, не умешваючыся ў разбушаваную табалу, пайшоў пацікавіцца гэтым надзвычайным выпадкам. Увайшоўшы ў панскі сад, ён згледзеў невялічкую бліскучую шмаціну з квяцістымі каменьчыкамі. Падняўшы яе, пайшоў дамоў і не ведаў, што

з ёй зрабіць. Разглядаючы аднаго разу знаходку, Лявон заўважыў на ёй чырванаватую пляму і адразу дагадаўся, што гэта была кроў. Аж неяк занудзіла яго, апанаваў забабонны жах, і каб далей быць ад граху, барзджэй абярнуў шмаціну ў рызман, улажыў у скрынку ад калёснай мазі і закапаў у ёўні. Хутка Лявон пераканаўся, што як толькі пачне думаць аб сваёй знаходцы, дык нейкае ліха з ім здарыцца: то конь пад ім спаткнецца і ён зваліцца ў гразь, то на прыпол выпусціць лыжку са стравай, то цвік назаве гузікам. Адным словам, Лявон прыкмеціў ва ўсім гэтым чартоўскую махінацыю.

Вось чаму ён так узрадаваўся, калі ўспомніў знаходку: сягоння кірмашовы дзень, пойдзе ў мястэчка і прадасць там каму-небудзь з-пад палы — і бяды пазбудзецца, і грошы будзе мець. Хоць грошы, праўда, нячыстыя, але на даніну самыя тыя.

Нікому не кажучы, адкапаў ён знаходку і пайшоў на кірмаш. Увайшоўшы ў бор, зняў шапку і, ідучы, пачаў маліць Бога, каб яму ды хоць раз у жыцці пашанцавала. Калі добра ўсё ўдасца, абяцаў Богу трэцюю частку выручаных грошай. Але пасля доўгай развагі над пакутным жыццём-быццём зрабіў моцную пастанову ахвяраваць толькі пятую частку.

Прыйшоўшы ў мястэчка, Лявон пацягаўся па рынку, прыглядаючыся да людзей, якія больш падыходзілі да яго справы. Знаёмых жыдкоў ён не хацеў чапаць, каб не асаромiцца. Усё гэта яго дужа непакоіла. Не раз, моцна задумаўшыся, натыкаўся на людзей ці, пачуўшы крык «З дарогі!» занадта позна, атрымліваў удар аглаблёй у плечы. Ужо думаў уцякаць дахаты, паслаўшы ўвесь свет к чортавай мацеры, як тут перад сабой згледзеў франтаватага паўпанка, пацягнуўшага, відаць, гары, бо ўсё ківаўся ў бакі. Доўга сачыў за ім Лявон, чуў, як паўпанка звалі амерыканцам, і ніяк не мог адважыцца, каб яго зачапіць.

«А што, калі арыштуюць ды пачнуць біць?!» — падумаў Лявон. Ну, але, мусіць, той важны чын у гміне

быў страшней за страх Лявона, бо ён, вытыркнуўшы рог шмацiны з кiшэнi, падышоў да паўпанка i сказаў: «Купiце!» Паўпанак абгледзеў, пamармытаў — i тыц два даляры ў руку Лявона. Аж у вачах Лявону пацямнела, хацеў у руку цмокнуць дабрадзею свайму, але той ужо знiк.

Напетушыўся Лявон, жывей забiлася кроў у сэрцы. Важна размахваючы рукамi, пайшоў да знаёмага загатоўшчыка Лейзара i загадаў паставiць гары, абяцаючы падвезцi козам ахапак сена. Цяпер ён меў толькi адзiн клопат — гэта разрахавацца з Богам. Пятую частку ад двух даляраў нiяк не адлiчыш, трэба iх мяняць. А мяняць не хацеў — баяўся, каб яго не ашукалi. Абмяняе ён iх у каваля сваёй вёскi, Боруха. Ён — жыдок сумленны. Аднак яго абяцанка Богу, справа шмацiны з крывавай плямай, гэтыя нечаканыя даляры не давалi Лявону супакою. I чым больш асушваў чарак, тым больш адчуваў страх перад Божым гневам, а ў сваiм раптоўным багаццi бачыў выкрутасы нячыстай сiлы. Нейкi цяжар прыгнятаў Лявона, марока плутала думкi, i радасць, i трывога валтузiлiся ў грудзях. Ён чуў патрэбу зрабiць нешта незвычайнае, балюча-вострае, каб ачуняць, пачуць ясней, што з iм i дзе ён.

Вось, каб пазбавiцца ад усяго гэтага клопату, рашыў хмельнай галавой i грэшнай душой пайсцi ў касцёл i паляжаць крыжам. Можа, такiм чынам не толькi адстрашыць чорта, але i адпакутуе пятую частку ад даляраў.

На нешпарах касцёл быў паўнюсенькi народу. Лявон зацiснуўся пад сцяну i бухнуў крыжам вобземлю. Народ здзiўлена расступiўся, а пасля стаў прывыкаць i цясней абступiў Лявона. Песня, арганы, цеплыня i хмель нагналi на яго такi смачны сон, што ён не пачуў, як разышоўся народ. А закрыстыян, дзякуючы кiрмашоваму дню, таксама нанюхаўся з бутэлькi i, не абгледзеўшы касцёл, запёр Лявона.

Прабудзiўся Лявон апоўначы i спрасонку пачаў шукаць жонку, думаючы, што ён спiць на ложку ў сваёй хаце. Хутка ён ачухаўся i скамянеў са страху. Сярод касцёла гарэла лямпачка. Цiшыня, дзiўныя

цені, нямыя, застыгшыя фігуры святых, бляск пазалоты — усё гэта веяла нейкім незямным, незвычайным і наганяла жуду на Лявона. Але раскумекаўшы сабе, што ён у касцёле, у пасвенчаным месцы, пад апекай святых, стаў падымацца, пільна ўглядаючыся ў цёмныя падазроныя месцы. Калі нічога страшнага не сталася, пасмялеў, кашлянуў колькі разоў для адвагі і адразу супакоіўся. Убачыўшы абраз, дзе быў намаляваны сам Бог у воблаках, а ў нагах меў зямлю, Лявон адазваўся:

— Дзякуй табе, Божа, што Ты даў мне такі выпадак, калі я магу пагутарыць з Табой вока на вока. Перш-наперш мушу перасцерагчы Цябе, што несамавіта Ты гаспадарыш на нашай старонцы. Жывём мы па справядлівасці, як кажуць: Бога не гневім і з людзьмі ладзім; калі нас б'юць па адной шчацэ, дык падстаўляем і другую. Ніколі нікога не крыўдзілі, не няволілі. Аднак гора — дык як мора разліўное, ажно захлябаешся. Кінь, Божа, хоць саломінку, паратуй у бядзе, бо мы народ цёмны, дзікі, раздражнены сучасным безгалоўем, і за сябе не ручаемся. Суд наш страшны, і крыві мы не шкадуем. Так што з разгону і Табе можам наклеіць. Гэта мы калісь былі пужлівыя, цяпер справа інакш стаіць. Успамінаю, як я раз уздумаў накрасці яблыкаў у панскім садзе. А вартаўнік там быў вельмі запальчывы. Бывала, птушка не ўляціць у сад, каб ён не заўважыў. Сушаным гарохам страляў па нас. Вось я начапіў торбу і палез, цікуючыся, праз паркан. І толькі, гэта, пераскочыў, як чую, што мяне нехта і цягне. Я барзджэй ірвануў назад і бег, мусіць, з паўвярсты, валакучы за сабой прасла паркана, што зачапілася за торбу, як я лез у сад. А то бывала...

Тут Лявон стаў гарадзіць аб сваіх брыдкіх справах і небывалых здарэннях і, урэшце, закончыў:

— Што да доўгу, то справа стаіць так: я ніколі не кручу, а Табе, моцны Божа, тым больш. Вось бачыш...

З гэтымі словамі Лявон дастаў залатую манстрацыю і, ківаючы, казаў далей:

— Я гэтую дарагую рэч магу ўкрасці, але я гэтага не раблю, бо я акуратны даўжнік і сумленны чалавек і аддаю табе, Божа, доўг з барышом.

Тут ён манстрацыю паставіў ізноў на месца і, лічачы ўсе справы ўдала паконччанымі, стаў разглядаць касцёл, каб не маркоціцца, пакуль развіднее. Абыходзячы каля сцен, Лявон згледзеў абраз святой Магдалены, дужа падобнай да яго жонкі. Доўгі час Лявон узіраўся на абраз, здзіўлены, а пасля, зарагатаўшы на ўвесь касцёл, сказаў:

— Ну, шмат у мяне знойдзецца гэткіх святых!

Пасля, пабачыўшы на другім абразе Адама і Еву, якія спіраліся аб яблыку, быў азадачаны пытаннем: на якой гэта мове яны спіраюцца?

Рамы вокан штораз ярчэй выступалі на шэрых досвітках. А хутка забразгалі ключы каля дзвярэй. Лявон паспяшыў затаіцца ў куточку. У адчынены касцёл пачаў находзіць народ. Загудзелі званы. Арган згушчаў касцельныя песні. Выйшаў незаўважаным у народ Лявон і рушыў барздҗэй дахаты.

Яшчэ здалёк пачуў Лявон звон малатоў у кузні Боруха. Ішоў ён пэўнай, цвёрдай паходкай, як чалавек з забяспечанай будучыняй, ішоў проста ў кузню, каб абмяняць даляры.

— Памагай Бог! — пажадаў Лявон, увайшоўшы ў кузню.

— Дзякую,— адказаў каваль і ўзяў пададзеныя новыя паперкі ў запэцканыя рукі, паварочаў іх і выйшаў з кузні на сонца — ён ніяк не мог паверыць, каб у гэтага абадранца маглі быць даляры.

— Псс...— раптам адазваўся Борух і аддаў даляры Лявону.

— Што ты псыкаеш? — зазлаваў Лявон.

— Пашкуства — фальшывы...

Вось быццам хто абухом стукнуў па галаве Лявона, ажно ён хістануўся ў бакі і прысланіўся да вушака. Боль пайшоў па жылах, бы атрута тая. Крыўда, жаль, злосць на сябе, на ўсё на свеце даводзілі яго да вар'яцтва. Качаючыся па зямлі, ён ірваў сабе валасы, блюзнерыў, праклінаў. Здавалася, што вось-вось —

і ён звіхнецца з розуму. Урэшце ўскочыў на ногі. З дзікімі, вытарашчанымі вачмі, ускалмачанымі валасамі, абкачаны ў зямлю, скрыгатаў зубамі і нема гразіў небу заціснутымі кулакамі.

На народ, які збегся глядзець, напаў страх; нават Борух схаваўся ў кузню. Як бы нейкім холадам павеяла, чадным паветрам хухнула, а Стэпка Люлічніха нават пабачыла рогі ў калматай галаве Лявона. Усім стала ясна, што паганы чорт змяшаўся з паветрам і валтузіць душу Лявона. Мужчыны сталі разыходзіцца, бабы жагнацца ды сплёўваць, дзеці ў плач, а ў Лявона паваліла пена з губ, і ён стаў усяляк трызніць на Бога і ўсіх святых.

Тут нехта параіў гукнуць шаптуху, каб абараніць неба ад паняверы, але Лявон пякельна зарагатаў і паплёўся дахаты, падымаючы нагамі пыл.

Прыйшоўшы дамоў, сваім страшным выглядам напужаў усіх хатніх: жонка схавалася на печ, а дзеці з гвалтам выбеглі вонкі з хаты. Злосна вырваўшы млён ад жорнаў, Лявон пачаў ім калаціць па абразах. Бразг шкла, трэск рам, крык гаспадыні — усё гэта разам тварыла пякельную музыку. Як толькі Лявон сцебануў па святым Антонію, дык з-пад абраза шухнуў на падлогу запылены пачак.

— Грошы ёсць! Лявонка, маміны грошы! — І жонка кульком кінулася з печы, каб падняць запылены пачак. І калі яна разварачвала папяровыя банкноты, выкаціўся вядомы чырвонец.

Лявон сядзеў ужо на лаве, сапучы, як кавальскі мех, і абціраў то адным, то другім рукавом абліты потам твар.

Пасля гэтага нічога надзвычайнага з Лявонам не здарылася. Заплаціў ён даніну і на рэшту грошай пачаў лячыць розныя гаспадарскія недамаганні. А крыху абжыўшыся, пасыцеў, пачырванеў, а гутарку сваю пераплятаў вясёлым смехам і жартамі.

— Вось, дарагенькія, як нам трэба: што ўбіў, тое ўехаў,— казаў Лявон Недарада.

## Беларуская казка

Жыла сабе бедная ўдава. І былі ў яе тры сыны. Адзін быў валакіта, марнатраўца, а працы баяўся, як чорт крыжа. Не прапускаў ён ні аднаго кірмашу, на якіх, п'яны, любіў пабуяніць, напракудзіць месцачковым і кірмашуючым. Шукаючы лёгкага хлеба і распусных асалод у жыцці, пачаў ён валэндацца па чужых старонках, аддаючы свае ўслугі шальмоўству, роскашы і душагубцам. Але ж ведама, што хлеб найміта не здаровы і не салодкі, і сын-валакіта кідаўся з месца на месца, прызываючы на помач злыя, шкодныя сілы, а дрыгва жыцця штораз глыбей загортвала яго ў свае абоймы. Не адгукнулася сэрца валакіты-найміта на заклік кахаючай маці вярнуцца пад родную страху, не чурацца свайго роду і простых звычаяў. Ані музыка, ані песня не акрылялі яго струхлеўшай душы. Прыкра было з ім маўчаць, а гутарка злой сваркай канчалася. І людзі здалёку абміналі яго, як вужаку ядавітую, як залом вядзьмарскі.

Болем балела сэрца маці за блудным сынам. Плакалі яе вочы, узіраючыся ў сінюю даль, а крыж на расстайных дарогах часта-густа чуў яе слёзны стогн. А колькі намалілася і наваражылася, і ахвяры клала, і пакутавала! І мілей бы ёй смерць была за жыццё, каб не другі сын — рабачай ад раллі, яе хлебадаўца і апора старасці. Спакойны, рахманы, працавіты, як мурашка, шанаваў хвалу гаспадара, а значыць, і гаспадарка яму спрыяла, рупіла. Карыстаўся пашанай у вёсцы, бо быў добры сусед — нікому, як кажуць, вады не замуціў, ды і на Бога не забываўся. Кожнага жабрака надзеліць, госця прывітае, чым хата багата, а хай зазвініць у якім вуху — дык перажагнаецца і тройчы плюне. І нечысць да яго не магла прыкараскацца. Ніколі не пахаяў малодшага свайго брата Янука, празванага статэчнымі гаспадарамі дурным. Цэлымі днямі пралежваў Янук на печы, вытылінкваючы на жалейцы «Былі ў бацькі тры сыны...». Дарма

ён еў хлеб, бо каб памагчы што ў гаспадарцы — ніколі. Толькі ж дурната яго была незразумелая, бо часам як аб чым скажа, дык як звяжа, адразу ўсё стане ясна, і ўся вёска падхопіць, і доўга перакідваюцца гэтым сказам. Слыў Янук і добрымі вачмі і лёгкай рукой. Каб вельмі добра ручыла нованароджаная жывёліна, дык трэба было на яе Януку першаму паглядзець. Каб ураджайная была ніва, дык Янук павінен быў рассеяць хоць адну жменю. Летам Янук рэдка дома сядзеў: любіў ён бадзяцца па лясах і слухаць шум-гоман лясны, пяянне птушак. Стане ў гушчары праставалосы, нерухомы, галаву крыху набок зверне, вочы быццам нічога не бачаць, як у непрытомнага, і слухае цэлымі гадзінамі. І птушкі яго не баяліся — садзіліся на калматую галаву ды весела чырыкалі кругом. Тады ніяк не скажаш, вар'ят ён ці святы.

Наслухаўшыся сакавітае музыкі прыроды, спрабаваў ён зрабіць новую жалейку, каб пераліць ураджайна-даспелую душу ў чулагучнае гранне. Толькі ж жалейкі такой яму не ўдавалася зрабіць, і песня «Былі ў бацькі тры сыны...» ізноў кацілася пявучымі хвалямі з печы.

Занемагла раз удава і напоўніла хату стогнам — хворасць на доўгі час кінула яе на ложак. Бяда расселася на покуці, журба стала пры парозе. Не адзін маладзік мінуў, перапрабавалі розных зёлак, прыпарак, загавораў, а папраўкі не было.

Цэлы век свой удава не знала радасці ў жыцці. Гора вадзіла яе па сцежках жыццёвых, цярпенне сачыла па слядах. Нялёгка было ўтрымацца пад цяжарам непамернай працы. І ўрэшце занядужала і звалілася.

Глыбокі сум агарнуў яе добрых сыноў. Нечаканая бяда збіла з панталыку хлебароба — работа стала з рук вывальвацца, не ручыла і ў гаспадарцы, бо апякунчыя думы гаспадара змяніліся ў тугу-сум кахаючага сына. Спахмурнеў і Янук. Заціхлі яго песні і гранне. Кідаўся нехаця з кута ў кут і думаў адну думу: як выратаваць дарагую матулю. А як

выратаваць? Маліцца Янук не ўмеў, новыя песні не складаліся, лекаў ніякіх не знаў, меў толькі гарачае, кахаючае сэрца і чулую душу. Дык нічога дзіўнага, што Янук браў гарачыя вугельчыкі ў жменю і трымаў, аж пакуль тыя не гаслі, і шаптаў,— каб толькі выздаравела. Нічога дзіўнага, што ён цэлымі начамі прыслужваў хворай, без слоў разумеў яе жаданні, сваім поглядам прытупляў яе востры боль. Толькі як певень запяе, а зарніца адаб'ецца ў яго бяссонных вачах, тады ён клаўся на печ і засынаў трывожным сном.

Аднаго разу, калі змярканне напоўніла хату, недзе на загуменні завыў сабака, а ў сенцах сама па сабе звалілася каса са сцяны, Янук прабудзіўся, з трывожным непакоем стаў туліць да сябе хворую, як бы баронячы яе ад грознай, нявідзімай сілы. Усцешвала яго маці кахаючай гутаркай, гладзіла ласкавай рукой, але Янук быў поўны трывогі. Ёй расказаў, што яму ў час сну пачуўся выразны голас, які казаў, што маці датуль не выздаравее, пакуль яе сыны не раздабудуць слёз радасных, слёз ад шчасця.

Сын-хлебароб, пачуўшы гэта, заайкаў, ківаючы галавой, махнуў зняверана рукой, бо дзе ж відана, каб у нашай старонцы, спавітай злой ноччу, мог хто плакаць ад шчасця.

Затое Янук прысягнуў хворай, што хоць пад зямлёй, але дабудзе, не вернецца без гэтых надзвычайных лекаў, што ён сярод зла і гора здолее знайсці нешта светлае, радаснае, пазнаўшы якое, людзі заплачуць ад уміленне, што калі яму смерць перашкодзіць дайсці да мэты, дык ён шчаслівы будзе ўжо тым, што жадаў, дабіваўся, што даказаў сваё бязмернае каханне да маці.

Была цёмная ноч, а віхор злосна стукаўся ў трухлявыя сцены ўбогай хаціны ўдавы, трывожыў скрыпучыя вербы і скуголіў па шчэлках і ў коміне. Куры на куроснах будзіліся ад трывожных перасцярог пеўня. Сабака, заціснуўшыся ў кут будкі, ветрыў носам

і жаласна скомліў. Каля восеці галёкала сава. Немарасць і страх апанавалі ўсё жывое, толькі блуднаму сыну ўдавы было хоць бы што. Зужыткаваўшы здароўе і ўсё заробленае на распусту, вяртаўся ён да хаты, прыслухоўваючыся да гідкіх нагавораў рознай нечысці, якой у гэтую страшную ноч было ўсюды паўным паўнюсенька. Увайшоўшы ў хату, ён удырыўся галавой у касяк, бо адвык ад сваіх парогаў, і брыдкай лаянкай перабіў малітву хлебаробу, які збіраўся ўжо ночку начаваць.

— Ціха, браце, матулю разбудзім...

— А што, яна яшчэ не струхнела? Жывучая, як руды кот...

І далей гэткай прыкрай гаворкай наймiт пачаў дамагацца грошай, сваёй часці ад гаспадаркі, казаў, што браты яго крыўдзяць, што трэба маці прагнаць, бо яна дармаедка і лішніца ў хаце.

— На, браце, хлеба кусок, калі ты галодны, і не будзь пустадомкам. Не забывайся, што пакуль маці жыве, яна — гаспадыня. Мы павінны яе слухаць і шанаваць,— сказаў хлебароб і палажыў перад наймітам хлеб.

Дзіка заблішчэлі вочы найміта, злосна пырнуў ён хлеб са стала і, схапіўшы тапор, зашыпеў, як гад падкалодны:

— Калі яна нам перашкодзіць, дык...

І замахнуўся на матку тапаром. У адзін міг хлебароб вырваў тапор і, крыкнуўшы на брата: «Юда!», хацеў адным ударам прыбіць яго.

— Каін! — сіпла прахрыпеў найміт.

Пачуўшы гэтае страшнае найменне, хлебароб аж здрыгануўся, з абяссіленай, апушчанай рукі высунуўся на падлогу тапор. Яго рыданне прарвала часовую маўчанку.

Усё гэта бачыла прабуджаная крыкам маці. Незаслужаная крыўда і пякучы жаль прыдалі ёй моцы, і яна, зышоўшы з ложка, бледная, як палатно, напаўжывая, працягнуўшы к небу кастлявыя рукі, пракляла пракляццем маці абодвух сыноў: аднаго як вырадка за паняверу бацькаўшчыны, за жудасны

намер забіць родную матку, а другога — што не здолеў з чэсцю абараніць яе, бо праз жаласць яго астаўся жывым страшны праступак, і ён, такім чынам, загідзіў асвячоныя працавітым жыццём сцены прадзедаўскай хаты. Ах, яна не можа жыць з імі пад адной страхой і пойдзе жабраваць у чужых людзей змілавання. Лепш згінуць ёй у полі, непахаўтуранай, як дамучваць свае апошнія дні ў лагве немачы і агіды.

І выйшла, хістаючыся, прыбітая горам, удава з сваёй хаціны, выйшла ў свет шырокі шукаць свайго сына апошняга, сваю надзею і радасць. Цяпер Янук стаў ёй найдаражэйшым, наймілейшым. Яна мусіць яго знайсці, каб прыгалубіць яго, пажальбаваць у горы, яна выпрасіць у Бога сабе здароўя, каб не засмучаць свайго Янучка. Ах, каб толькі ёй знайсці дарагога сыночка! Інакш і пасля смерці не будзе ёй супакою.

Вось так заўсёды чалавек у горы шукае, прыдумвае сабе ў нечым збаўлення, а фальшывае гэтае збаўленне няпэўна падтрымоўвае і памагае кульгаць па шляху, аж пакуль...

Але ж адна бяда не ходзіць, другую за сабой водзіць. Толькі ўдава пакінула сваю хату, як паднялася небывалая навальніца. Гудзела неба, стагнала зямля. Святло і цемра з сыканнем і скрыгатам перапляталіся ў злосным змаганні. Гатавалася, хвалявалася паветра. І сярод гэтай страшнай непагоды і бездарожжа чуваць быў крык пакрыўджанай, пакінутай маці: «Сынку, дзе ты?..» І недзе ў глыбіні бурлівай ночы, якочучы, пералівалася рэха: «Сынку, дзе ты?..»

Доўга хадзіў Янук, шукаючы такіх рэдкіх лекаў. Але не толькі слёз ад шчасця, ды і самога шчасця нідзе не мог знайсці. Усюды ён чуў толькі скрыпучы стогн і нараканне, якія зусім не былі падобны да пявучага шуму-гоману лесу і палёў. Янука штораз мацней пачаў апутваць дратаваны сум, штораз глы-

бей упівалася ў сэрца журба. Тут успомніў Янук, як ён, будучы яшчэ юнаком, еў з братамі з адной міскі, і калі браты адганялі яго ад заціркі, каб ім больш аставалася, дык Янук ішоў у лес, рабіў сабе жалейку і ў гранні забываўся аб голадзе. Вось і цяпер зрэзаў ён прыдарожную вярбіну, старанна зрабіў жалейку ды і зайграў...

А калі кончыў гранне, дык пачуў сябе радасным, светазарным — такая чароўная, жыццядаўчая была гучнасць жалейкі. І не дзіва, бо з жалейкі адклікалася, пяяла душа яго матулі — жалейка была зроблена з вярбіны, якая вырасла на магіле без часу загібеўшай удавы. Толькі ж Янук гэтага не ведаў. Узяўшы жалейку, ён пайшоў да людзей з пэўнай надзеяй, што цяпер сваім граннем дастукаецца ў сэрцах людскіх слёз ад шчасця.

Ой, вельмі жорсткія сэрцы людскія, каб іх чулымі гукамі ўзварушыць, вызваць рэха з затаёных куточкаў. Ой, лішне шмат уплыло слёз на бяду бедаваную, каб імі можна было асвяціць нечаканае шчасце; ой, шмат яшчэ сонца зробіць дарог, пакуль людзі глянуць душой і ўцямяць сэрцам.

І Янук, змучаны няўдачай, вынес сваю няўтомную веру ў бязлюддзе, у глуш лясную, на заімшэлую руіну. Там, сеўшы пад аграмадным каменем, усёй істотай сваёй аддаўся творчасці, пераліўся ў чулагучнае гранне, забыўся ў хмельных лятунках. Так было хораша гэтае гранне, што на камяні, пад якім сядзеў Янук, выступіла брыльянцістая раса — камень заплакаў.

Камень ажыў, загаманіў:

— Я, акамянелы велікалюд, плачу ад радасці, ад шчасця, ад хвалы, што моц мая магучая, моц важкасці зямной не загінула, а стала легкакрылай, красатворчай, славіць славу талакі, мэціць к сонцу свой узлёт...

Не слухаў больш велікалюда Янук, а паспяшыў збіраць слёзы ад шчасця. Як толькі чапнуў іх сквапнымі рукамі, дык сталася тое, што людзі называюць

цудам. Янук стаў знікаць: спярша пераамяніўся ў празрыстую сіняву, пасля ў светлы слуп, а ўрэшце зусім знік.

Так бывае з тым, чый творчы дух збірае плады — слёзы шчасця,— ён уваходзіць у вечнае, сусветнае.

## Марксісцкі аршын

У беларускай глушы, у вёсцы Забалоцце, яшчэ за часы цара было сваё начальства — стараста Сымон Пісака. Адзін ён у вёсцы быў пісьменны, за ўсіх ён распісваўся, дзе толькі трэба было, а гэта клопат для забалачан быў немалы. Вось чаму трымаў «сваю» вёску Сымон у строгім «прыжыме».

— Начальства з мяне, а я з вас трэбую.

Гэтак ён адказваў усім тым, хто паважыўся жаліцца ці крыўдзіцца на яго. І гэтым ён умацоўваў свой аўтарытэт і праваату.

Але вось настаў час, калі старое, плюючы на свой след, стоцьма ляцела ў небыццё, а новае віхрам расмыльвала ўсе перашкоды, заставы, узрастала і магутнела. Пранесліся рэвалюцыі ў сакавіку і кастрычніку.

Вёска Забалоцце таксама перажыла рэвалюцыю, толькі не ў кастрычніку, а так, праз некалькі месяцаў пазней. І «рэвалюцыю» гэтую зрабіў Сымон, загадаўшы выбраць сельскі камітэт.

Каб не Сымон, дык вёска Забалоцце мо да гэтага часу жыла б пад страхам Бога і цара, дзякуючы таму, што яе геаграфічнае палажэнне, як казаў той жа Сымон, на канцы свету, дзе ракі зімуюць.

Пасля рэвалюцыі ўся цяжкасць грамадскага, духоўнага і эканамічнага будаўніцтва Забалоцця ўзлегла на Сымона. Ён, Сымон Пісака, як майстар на ўсе рукі і сторублёвая галава, стаў для забалачан бог, цар і папіхач. Ён — сакратар і старшыня камітэта, ён — дэпутат ва ўсе канцы свету, ён — пасланец разведаць аб налогах, аб прызыве, аб выдачы солі,

мануфактуры. Каб было сто такіх Сымонаў, дык усім хапіла б работы.

Сымон з гордасцю адчуваў сваё верхаводства, але не раз, змучаны душой і целам, ён любіў сябе пашкадаваць: «Эх, катаржная работа, кожнаму дагадзі, кожнага паслухай. Пастух — і той большы начальнік. Адкажуся заўтра, хоць іх паляруш!» Аднак, аддыхнуўшы, Сымон браўся яшчэ з большай шчырасцю за сваю службу.

І кацілася жыццё ў Забалоцці роўна і мірна. Сымон сваім прыродным розумам вырашаў усе жыццёвыя закавыкі, сваім здаровым сялянскім нутром пераварваў новае, небывалае і сваёй простай гаворкай выкладаў, дапасоўваў да акружаючай сярмяжнай грамады.

Усе забалачане паважалі Сымона Пісаку як незамянімага свайго дзеяча і былі ім задаволены. Галоўнае тое, што Сымон быў падатлівы чалавек: трэба якую незаконную паперку падпісаць — Сымон падпіша, трэба павялічыць надзел ці едакоў — павялічыць.

Сымон жа адчуваў сябе не надта самавіта. Яму не даспадобы было тое, што ўсё, што даходзіла да Забалоцця, было новым, асаблівым, а вось забалачане аставаліся такімі самымі, быццам да іх гэта зусім не тычыцца. І ствараўся нейкі недахват, пахіб. Здаецца, робіцца ўсё, як і трэба, згодна дэкрэту і прадпісанняў, а выходзіць неяк не так, як яму, Сымону, хацелася. У чым гэтае «не так» Сымон не мог сабе ўявіць. Ён казаў: «У Забалоцці рэвалюцыя альбо недаробленая, альбо перароблена».

Але вось хутка Сымону давялося выпукла зразумець, у чым бяда. Проста-ткі як яму хто самую гушчу праўды лапатай палажыў у галаву.

А здарылася гэта ў Маскве, дзе так шмат муроў, людзей і шуму. Завозіў ён туды сабранае збожжа на карысць галадаючых. Як дарагога госця вадзілі яго па розных сходках, усюды паднімалі на «ўра», а ён там пацеў, пахнуў дзёгцем, гутарку сваю выказваў больш рукамі, як голасам, драмаў на доўгіх прамовах.

Адно, што яму запала ў галаву з адной прамовы,— гэта тое, што толькі трымаючыся Маркса, можна будаваць новае жыццё. Ён дае адказ на ўсе недарэчнасці, на ўсе пытанні, трэба кожны чын, паступак мераць марксісцкім аршынам.

Надта ж Сымону спадабалася гэта, прынамсі, выразна зразумела: адмераў, чык — і адрэзаў.

— Куплю, канешне, куплю гэты дзіўны аршын і навяду лад у Забалоцці,— цвёрда рашыў Сымон.

Праўда, аршын гэты марксісцкі Сымону не ўдалося здабыць — яму растлумачылі, што Маркс — гэта вялікі мудрэц, а не аршын, што ён напісаў шмат тоўстых і разумных кніг, і вось у гэтых кнігах, як з бяздоннай крыніцы, трэба чэрпаць праўду і адказы на жыццёвыя пытанні. Сымона гэта не расчаравала — ён разважаў: «Гм, не святыя гаршкі лепяць, а мы, мужыкі, не лыкам шыты. Цяпер такі час, нам усё трэба ведаць і ўмець. Саха сахой, але трэба і да кніг прывыкаць».

Сымон выпрасіў у аднаго камуніста некалькі тамоў «Капітала» і джгнуў з імі барзджэй дахаты.

Едучы ў цягніку, аж не мог ён уседзець на месцы з радасці. Ён уяўляў свой трыумф, калі сакрэтна прысвоіць сабе мудрасць з гэтых кніг і раптам адкрые новы свет перад сваімі суседзямі — вось ён вырасце, узвялічыцца ў іх вачах. Стаўшы вялікім і слаўным, дакажа ўрэшце сваёй жонцы, што бабіна дарога ад печы да парога, і хай лапатуха нос не ткне ў яго грамадскія справы і не дапякае, што дроў няма, што боб не ўрадзіў і інш.

Прыехаўшы дамоў, Сымон адразу залез на кут, здзьмухануў са стала, сцёр рукавом і, лізануўшы вялікі палец правай рукі, пачаў з вялікім задавальненнем і душэўнай паўнатой пералістваць першы том «Капітала». Пералістаўшы ад пачатку і да канца і наадварот, Сымон пачаў мумрыць пад нос — нараспеў чытаць, торкаючы пальцам у кожнае слова. Прачытаўшы першую старонку, раптам праяснеў:

— Ах, шэльма, ну і смагла ў яго выходзе! — Але пасля маленькай раздумы спахмурнеў, пачухаў патыліцу, расшпіліў каўнер і зноў пачаў ад пачатку.

Кажуць, што за кожную навуку трэба плаціць. Бедны Сымон з вялікім барышом заплаціў ёй потам, недаспанымі начамі і жаночай грызнёй. Ой, шмат заплаціў, але навукі ані на нюх не здабыў. Адно добра, што ён не падаў духам: ужо да чаго як прычэпіцца, дык не адыдзе, як сляпы ад плота.

— Гэта з непрывычкі,— паўтараў ён,— а як прывыкну, дык усё ясна стане.

Сымон далей стараўся прывыкаць.

А тым часам у Забалоцці справы разварочваліся. Па прыкладу другіх вёсак забалачане вырашылі перайсці з трохполля на мнагаполле. На гэтую прыгоду быў скліканы сход. На сходзе Сымон па старой памяці ўвайшоў у ролю аратара.

— Таварышы, без Маркса нічога не будзе — без яго не толькі ступіць, але і дыхнуць нельга. А дзеля таго толькі мераючы яго марксісцкім аршынам, можна перайсці з трохполля на мнагаполле. Але вы не думайце, што гэты аршын ёсць, не, яго няма, але ён як бы і ёсць...

І пачаў Сымон выкладаць сваю марксісцкую веду перад сходам, выкладаць тое, што завучыў на памяць, пачаў гарадзіць недарэчнасць, як кажуць, ні ў пяць ні ў дзесяць, пераплятаючы сваю гутарку страшна перакручанымі, нікому на свеце незразумелымі словамі.

Стаялі сяляне, як у лесе, вушы развесілі, лоб моршчылі, пакашлівалі — ані-ні ўцямкі не даецца Сымонава мудрагель. Слухалі яны, слухалі і хацелі было запярэчыць, спыніць аратара, але пасля струсілі: а што, калі Сымон ды нешта разумнае кажа, а яны не цямяць па дурнаце сваёй? Ажно нехта пусціў чутку, што Сымон перабраў мерку, што ў яго, мабыць, клёпка вывалілася з галавы. Гэта трапіла ўсім у перакананне. Патопалі, паціскалі плячмі ды з нічым і разбрыліся па хатах.

Моцна занепакоіла Сымона гэта няўдача. Яшчэ з большай запальчывасцю накінуўся ён на «Капітал», чытаў уголас і шэптам, перачытваў, завучваў. Чуў, што галава яго робіцца вялікай, але пустой і лёгкай. Чуў ён яшчэ нешта горшае: што валіцца ўніз са сваёй вышыні дзеяча. Сяляне, суседзі чураюцца, абходзяць яго. Замест яго аднаго намножылася ўжо шмат пісьменных, аратараў, правадыроў. Нават прыляталі на самалёце нейкія агітатары; вярнуліся дамоў чырвонаармейцы. Але найгорш яму ўпякліся гэтыя камсамольцы, якія выраслі неяк раптоўна, самі сабой. Яны ўсюды першыя, усюды нос усадзяць, перакруцяць, перамуцяць і на сваім паставяць, паставяць уверх нагамі, як Сымону здавалася. Ён іх, малакасосаў, лае, а яны яму наругаюцца:

— Сымон, як па-марксісцку таўчы ваду ў ступе?

— Сымон, ці Маркс цябе з жонкай памірыў?

А ў дабавак да ўсяго празвалі Сымона «марксісцкі аршын».

Кожнае выступленне Сымона з марксізмам і доказы яго, што хто не з Марксам, той проціў Саветаў, не мелі ніякай вагі і толькі выклікалі насмешкі. А калі хто даводзіў Сымону, што ўсе стараюцца жыць па Марксу, што ўсе сцяной стаяць за Савецкую ўладу, дык Сымон пытаў: «А чаму вы адкараскаліся ад мяне? Я — гэта Маркс!»

І чым больш зносіў ён насмешак і паняверы, тым больш стараўся давесці сваю праваату, тым больш завучваў «Капітал», тым больш заблытваўся і адставаў ад жыцця вёскі.

Як скупіндзя, ачумелы ад нажывы, шукае заклятага скарбу і верыць, што позна-рана, але знойдзе, так і Сымон блукаў у нетрах мудрых сказаў шматтомнай навукі і спадзяваўся, што яшчэ пры адной натузе ён знойдзе самую сутнасць. І тады ўсім дакажа, як ён быў праў і як усе памыляліся і блудзілі.

Гэтая недаступная мудрасць, незразумеласць рабіла Маркса ў вачах Сымона нечым незямным, рабіла богам. Дзе ён ні быў (а ў апошнія часы стаў

чалавекам бывалым), усюды чуў імя Маркса, чуў, як выгаварвалася яно з вялікай пашанотай. У гэты ж час пачалася антырэлігійная барацьба, у якой Сымон прыняў самы жывы ўдзел, зрабіўся самым заядлым бязбожнікам. Ён раней за ўсіх здолеў уцяміць, пераканацца, што стары Бог ужо не Бог, але што можна без Бога жыць — дык гэта ніяк не тоўпілася ў яго галаве. Як гэта, каб кут за сталом пуставаў, каб не было там абразоў.

І вось аднаго разу Сымон пад пракляцце сваёй жонкі на месца святых умацаваў партрэт Маркса.

Часта бывала так, што Сымон і яго жонка па старой прывычцы перад ядой жагналіся, звярнуўшыся ў кут. Жонка, згледзеўшы Маркса, плявала, а Сымон усміхаўся сабе ў вусы.

Аднак не шанцавала Сымону і ў антырэлігійнай барацьбе. Крылатыя, чужыя, незразумелыя словы, завучаныя Сымонам, былі лішняй прычынай папу ўмацаваць веру ў сваіх «авечках», а «авечкі» ўсюды бляялі, што толькі такія вар'яты, як Сымон, могуць брахаць на Бога.

Раз у час абедні прыйшоў Сымон у царкву з сваім замусоленым «Капіталам» і, падняўшы яго вышэй галавы, як на благаслаўленне, пачаў, глушачы ўсіх:

— Во ваша святая кніга, усяго трынаццаць фунтаў важыць, і не то што нейкая Евангелія...

А пасля тонам малітвы зацягнуў: «Бацька наш Маркс, ты — наш Бог, дык хай свяціцца імя тваё, хай прыйдзе царства тваё, хай будзе воля твая...»

Тут Сымон спыніўся, бо сталася тое, што «Капітал» апынуўся ў руках «бязбожнікаў» і ўжо не ў галаве, а на галаве Сымонавай астаўляў сляды.

Гэты выпадак камсамольцы ўзялі на язык і хутка аж за межы Забалоцця пусцілі пагаворку: падружыў, як Сымон з Марксам.

# Пакой № 184

Масква. «Общежитие» аднаго з вузаў. Пакой № 184. На дзвярах чытаем:

Спіс студэнтаў

1. Грыцэнка А. П.
2. Галкін В. А.
3. Дзяруга В. Д.
4. Дзядзюлевіч С. М.
5. Янткоўскі К. Т.
6. Кульман Р. А.
7. Наміхадзэ К. К.
8. Рубін Х. Б.
9. Рабчыкаў П. І.
10. Шарамецьеў Б. І.
11. Чыкін Д. А.

А на асобнай картачцы:

| Час працы |
| --- |
| ад 5—8 і 9—12 г. |
| Без дачынення не швэндацца. |

Чытаючы прозвішчы, уяўляеш сабе цэлы інтэрнацыянал: украінец, велікарос, беларус, паляк, латыш і г. д.

Масква — кузня новага жыцця — дае прыстанішча ўсім, хто хоча, у каго моцныя зубы, каб грызці граніт навукі. А такіх у СССР хапае. Кожны працоўны разумее свае абавязкі, разумее, што з амярцвеўшых рук буржуазіі трэба вырваць штандар навукі, а пад іх хворы быт, што яшчэ там-сям валяецца па кутох, трэба падлажыць дынаміт пралетарскай ідэалогіі.

«Усё ўмець, усё знаць!» — вось лозунг гэтых ваяк фабрык, раллі, ваенных франтоў.

Нягледзячы на тое, што кожны дзень перагружаны, ацяжараны марксізмам, хіміяй, матэматыкай і іншымі стопудовымі «гранітамі», аднак дні гэтыя

мігцяць, бы спіцы ў малатарні. Не здолееш успомніць, якая дата і аўторак ці пятніца, як ужо ў вушах звініць званок на 8-ю гадзіну новага дня, і хоцькі-няхоцькі, а «паўстань з навукай пабратаны ўвесь свет «гранітаў» грызуны».

Устаюць усе з песнямі, выкрыкваюць лозунгі, цытуюць мудрыя сказы, і кожны на сваёй мове, і кожны хоча, каб яго чулі, і дзеля таго стараецца ўсіх перакрычаць. Тут ужо ніхто не ўлежыць, нават мёртвы ўстане.

Збавіўшы такім чынам да належнага ўзроўню сваю энергію, якая напоўніла здаровыя арганізмы за ноч, студэнты пакрыху супакойваюцца. Глядзіш — адзін-другі бяжыць без нічога, як маці нарадзіла, пад пырск у калідор і там абмываецца халоднай як лёд вадой. Вярнуўшыся, жыва аціраецца. Мускулістае цела аж гарыць, кроў аж пырскае! Любата! Апрануўшы свае, свет відаўшыя, аздобленыя латамі вопраткі, студэнты неяк адразу ўрачыста заціхаюць — гэта кожны з іх сваімі грубымі працоўнымі рукамі датаркнуўся да кніжак, да гэтых яснадаўчых крыніц, з якіх хто нап'ецца — робіцца волатам веды, навукі.

Кніжка ў нашыя часы ў нашага брата перажывае залатую пару. Што яе шануюць, як святасць, аддаюць апошнія грошы і шукаюць днём з агнём, дык гэтую паўсямесную праўду нечага паўтараць. Кніжка дажыла да выяўлення свайго сапраўднага назначэння. Яна стала здабыткам усіх тых, каму патрэбна навука не для гузікаў бліскучых, не для смертаноснага аружжа, пышнай роскашы, а для дабрабыту ўсіх працоўных, для замацавання волі, узросту веды. Кніжка стала папулярнай і ўсім даступнай — яна ўжо не плеснее па бібліятэках у скураных вокладках з залатымі літарамі на магунёвых паліцах люстраных шафаў.

Вялікая сквапнасць да навукі ў новых прыяцеляў кніжкі не астаўляюць у ёй нічога нявысвеленага, неразгаданага — вычэрпваюць усе да дна.

Сабраўшы патрэбныя кніжкі, студэнты ідуць снедаць, а там і на лекцыю.

Пакой № 184 пусцее. Свежае марознае паветра спяшаецца праз адчыненую фортачку выціснуць не толькі кіслае паветра ночы, але і цяпло, каб прыйшоўшыя студэнты сказалі:

— Бр-р-р...

Скажуць, але не пакрыўдзяцца: бо хай сабе будзе халадней, але каб чыстае паветра, аб гэтым кажа і статут пакоя. Той жа статут патрабуе, каб утрымліваць парадак. Але дзеля таго, што слова «парадак» мае даволі шырокае талкаванне, а рэчы, папаўшы ў пакой № 184, згубілі сваю ўласнасць і фетышызм, дык часта бывае так, што рэчы не карыстаюцца асаблівай пашанотай. Вось з-пад ложка выглядае аблуплены нос стаптанага бота, запылены чамадан, а пасцель — як узбушаванае мора. Край квяцістай дыяграмы адклеіўся ад сцяны і павіс безнадзейна. Але што гэта над кожным ложкам... няўжо абразікі, усе сценкі абвешаны?.. Не, гэта партрэты Леніна, Маркса, Троцкага, гэта стыхійная цяга да «свайго», якое ўзглаўляюць вось гэтыя тры кіты новай будучыні, гэта дае яркае прадстаўленне аб тых, хто старанна прымацоўваў гэтыя партрэты не толькі на сценках, але і на грудзях на шпільках, жэтонах, медаліках; гэта спадчына старога быту, аб якім пяецца: «Ніхто не дасць самохаць волі — ні Бог, ні цар, ні багатыр». А, з другога боку, гэта доказ, што яны хочуць зліцца, з'яднацца, набракнуць вучэннем вонкавымі і ўнутранымі шляхамі.

А вось на стале, які стаіць сярод пакоя, вядзе згоднае суседства цэлы інтэрнацыянал розных прылад для рознага ўжытку. Ручкі для пісання, пагнутыя, сплямленыя, абрэзаныя; пер'і, даўно выйшаўшыя з ужытку; алоўкі рознага ўзросту; бутэлечкі з чарніламі ўсялякай якасці і колеру, разумеецца, найбольш чырвонага; лінейка, якая дае ўсякую лінію, толькі няроўную; некалькі кубачкаў з вадой, прэс-пап'е без прапускной, зламаны грэбень, покнутае люстэрка і г. д.

Наогул пакой не носіць слядоў так званага сямейнага ўюту, у які мама і тата ўкладваюць усё сваё

жыццё. Тут жывуць людзі з больш шырокімі інтарэсамі — яны працаўнікі ўюту ўсяго свету.

Пераваліла за поўдзень. Студэнты, тупаючы і хукаючы, сходзяцца ў свой прыпынак.

— Хлопцы! — крычыць адзін з іх, скідаючы дзіравы бот, каб паглядзець, ці не адмарозіў пальцы.— Хлопцы! Я прапаную выказаць Дзядзюлевічу падзяку за яго сягонняшні даклад аб фетышызме тавару.

— Назначыць яго начальнікам рэвалюцыі!

— Падняць яго на «ўра»!

— На «ўра»? Пагойдаць!

— Цяплей будзе! Сагрэемся!

— Жані!

І Дзядзюлевіч разоў пяць зрабіў у паветры смешныя выкрутасы.

— Кіньце яго — глупствам займаецеся! Гэта адрыжка старога.

— Хлопцы, на «ўра» і адшчапенца!

Пярэчыць, бедны, не паддаецца, але не ўстаяў супраць грамады. Гойдалі яго разам з тым, за што ён толькі ні чапляўся. Смех, жарты. Сярод гутаркі няўзнаку пераходзяць на палітычныя тэмы, да аналізу і ацэнкі апошніх падзей. Марксісцкі аршын пайшоў на ўжытак.

Спрэчка.

— Праўда, ты мерыш марксісцкім аршынам, але мерыш не сем, а адзін раз, і дзеля таго твая думка выходзіць нейкая куртатая, недаробленая...

Усе падобныя спрэчкі заканчваюцца абавязкова аб спосабе падняцця сусветнай рэвалюцыі — гэта невычэрпная тэма.

Б'е пятая гадзіна — ніхто не чуе. Спрэчка ў самым разгары.

Ужо панская Польшча перакулена, ужо фарсіраваным маршам пяройдзена Нямеччына, трашчыць Францыя, а адзін адважнік наважыўся пераступіць Ла-Манш, як тут раптам рэзкі стукат алоўка аб стол усіх уціхамірыў. Сядаюць за стол, панікаюць над кніжкамі. Вучыцца — дык лёгка, бо ёсць ахвота, але

вось веда не хоча паддавацца — замыславатая навука, цвёрды граніт...

Не адзін успамінае свой плуг, машыну ці варштат. Там працаваў, пеючы. А тут... вунь у трэцякурсніка сівыя валасы, хоць сам яшчэ юнак.

Але нічагусенькі! Гэта апошні фронт, а там глядзь — і «кухарка зможа ўпраўляць гаспадарствам».

— Курыць у пакоі... ідзі ў калідор.

— А праўда, забыўся. Не тое забу...

— Ссс... Ціха.

Зноў скрыпяць алоўкі, шуршыць папера.

Увайшла студэнтка з пакоя № 185 і просіць пазычыць палітэканомію.

— Чаму ты сягоння падобна да Маткі Боскай?

— А ты, як поп, запусціў патлы.

І студэнтка ўчарэпілася за курчавую галаву студэнта.

Тузаніна. Смех.

Стукат алоўка.

Студэнтка бярэ кнігу і на цыпачках выходзіць.

Спакой установлены. Няўзнаку ляціць час, калі ён дораг, калі яго не хапае, калі працу некалькіх месяцаў трэба ўціснуць у некалькі гадзін. Лектар па гісторыі культуры кажа: «Як я вучыўся — дык на Рым патраціў паўгода, а вам згодна праграмы трэба прайсці ў дзве-тры гадзіны. Дык рашайце, можа...»

— Нічагусенькі!

— Жані Рым!

І трупехлы целам і душой Рым пад націскам новага падыходу, у якім *свядомасць вынікае з быцця*, лёгка раскрывае свае заблытаныя падзеі. Каб толькі здолець прачытаць!

Ад 8-й да 9-й гадзіны перадышка — ідуць вячэраць. Пасля напружанай працы расходзяцца, як хмельныя, задуманыя. Той ці іншы вяртаецца па шапку, галёшы ці што другое. Забываюцца.

На стале — поле бітвы паміж мазгамі і кніжкамі. Ручкі з чырвонымі і цёмнымі слядамі, пакусаныя канцы алоўкаў — аружжа і сведкі трудных баёў. Шмат ахвяр: 189, 97, 13, 153 — гэта прачытаныя старонкі

ляжаць, бы зжатыя гоні, бы краскі, з якіх зляцела пчолка. Запісаныя ўдоўж і поперак шпаргалкі — поле засеянае і пабаранаванае. Старанна апрацавана, будзе добры ўраджай.

Па 9-й гадзіне студэнты зноў множаць і замацоўваюць веду. Некалькі ваякаў выбыла са строю: пайшлі ці ў тэатр, ці ў лазню, ці на лекцыю якога-небудзь з правадыроў новых дум, новых людзей... Той, хто астаўся, чым далей, тым больш слабее, паддаецца, лістуе кнігу — ці далёка канец, ёрзае на месцы... Кніжка перамагае.

— Чакайце, то ж я забыўся закурыць!

— Я прапаную курцам кінуць курыць. Час і партыя патрабуюць дужых, здаровых...

— Прапазіцыя прынімаецца.

— Але не выпаўняецца...

— Гніляк! Са старога матэрыялу ты злеплены.

— Не са старога, а з ужыткаванага: стаптаўся на франтах, перагарэў на сходках.

— Амерыку адкрыў.

— Не ляжаў і я на печцы.

— Таварышы, ёсць новая прапазіцыя: спыніць спрэчкі і не рабіць таго другому, што табе не міла.

Праходзіць гадзіна-другая напружанай працы мазгоў.

— Хлопцы, хто баіцца сівых валасоў — далучайцеся да мяне.

— Уношу дабаўленне: і хто хоча чытаць газеты.

— Уношу папраўку: не хоча, а мусіць!

— Рана яшчэ!

— Лекцыі важней!

— На галасаванне!

Большасцю галасоў парашылі спыніць заняткі і прыступіць да чытання газет.

— Наміхадзэ, жані! Твая чарга.

— Толькі, душа мой, не перакладай на сваю мову.

— Велыколэпно!

Пасля кожнага артыкула маленькі абмен думак і вывад. Не марудзяць, бо ўжо позна. Пад канец

чытання некаторыя распрануліся і ляжаць ужо ў ложках.

Апошні кладзецца Кульман.

— Кульман, чаму ты заўсёды распранаешся да Адама?

— Адным выстралам забіваю трох зайцаў.

— Ну?!

— Ашчаднасць бялізны, гігіенічнасць і збаўленне ад рознай гнюсі.

— Худыя ж, брат, твае зайцы.

Маўчанка.

— Худыя, але затое тры. А вось я да гэтага часу не магу здагадацца, чаму ты купіў сабе сарочку горшую, як мая, а заплаціў даражэй?

— Бо чырвоная. Што гэта ў цябе на грудзях?

— Памятка калчакоўцаў — выразалі зорку, але нашыя перашкодзілі... Зарубцавалася.

— Усё гэта адходзіць у даўнасць...

Гасяць святло. Водблеск электрычнасці з горада, бы зарава далёкага пажару, слаба асвятляе пакой.

І так, дзень працы закончаны. Узышлі яшчэ на адну ўсходку да вяршыні, што хаваецца ў тумане недасягнутага. Але што ім да той далёкай неразгаданасці — яны ведаюць, што ім трэба дайсці да вядомай усходкі, з якой яны настолькі ўзмацуюцца, што змогуць будаваць фабрыкі і заводы, самалёты, навучацца браць з зямлі ў колькі сот разоў болей, як ёй даецца, навучацца разганяць хмары на небе і на зямлі; яны ведаюць, што адступлення няма, бо за імі валам валіць гушча, натоўп «цёмных» і «быдла» па-колішняму, а па-цяперашняму — тварцы, змагары, волаты. Яны што ні рабілі — завяршалі, з кім ні змагаліся — перамагалі. Іх авангард, перамогшы багоў, цароў, усе франты і напасці, перамогшы дзень навукі, адпачывае ў пакоі № 184.

## Цюхцялей

Вёска Рубяжэвічы ішла адзіным фронтам проціў вызыску і ўціску польскіх паноў. Вышчарбіўся з фронту толькі адзін Цюхцялей, ды не то што вышчарбіўся, а, хутчэй, блытаўся пад нагамі,

Цюхцялей — гэта мянушка аднаго дзецюка, які сам па сабе зусім не заслужыў, каб на ім, хлебапсую, затрымоўваць вашу ўвагу.

Але справа ў тым, што гэткіх асоб, канчаткова нядатных да класавай барацьбы, цяпер на стаптанай і згвалчанай Заходняй Беларусі, бадай, зусім мала, амаль няма, не раўнуючы, як зуброў у Белавежскай пушчы.

Так што Цюхцялея як асаблівую рэдкасць трэба было б на добры лад вадзіць па свеце ды за грошы паказваць.

Старэнькага яго бацьку і малодшага брата-камсамольца ў астрог запяклі, апустадомілі, аблаташылі сядзібу за падаткі, яго самога не раз паліцыя папярыла да дзірак у скурцы, а ён табе нават пальцам у боце не паківае, а на ўсё адказвае:

— Ат, Бог Бацька калі не дапусціць, дык свіння не з'есць.

А далей пойдзе пераплятаць посную гутарку сваімі лозунгамі: знаць не знаю, ведаць не ведаю; з кута ў кут — вечар тут; вышэй пят не падскочыш; з вады лёд, з лёду вада і г. д.

Аддана праводзіў сваю тактыку ў жыцці — даўжэй паспаць. Тады, кажа, чалавек не бядуе і не грэшыць; сон — гэта лепшая радасць у жыцці і лепшая плата за працу.

Колькі ўжо яго вясковыя хлопцы ні муштравалі, ні школілі (здаецца, пень і той бы навучыўся), а з Цюхцялея толку, як з казла малака.

Пачнуць, бывала, яму даводзіць аб неабходнасці змагацца з прыгнятальнікамі, бо інакш знебыткуешся, неахайнасцю заплывеш, бы тая лужа цвіллю зялёнай, што нас ніхто не паратуе, калі не мы самі, што вызваленне — у рэвалюцыі, — адным словам,

шмат каму гэткая гутарка, бы аладкі з тукам есці. Ну, а Цюхцялей у самым баявым месцы засне сном праўдніка.

Э, ды што казаць! Не толькі хлопцы, а і магутная, жорсткая вызваленчая барацьба замучанай ад вызыску і здзеку краіны, барацьба, якая камячыла і валтузіла Цюхцялея ў сваіх няшчадных абдымках,— і ўсё тыя ж вынікі: як з казла малака.

Дык нічога дзіўнага, што вёска Рубяжэвічы цярпела дадзелага Цюхцялея, як бародаўку на носе, калі яшчэ не горш. Хай табе Рубяжэвічы не вывесяць калі чырвоны сцяг, хоць бы і былі важкія перашкоды, як суседнія вёскі давай, кпінуючы, выторківаць:

— Ну і цюхцялейская вёска гэтыя Рубяжэвічы!

А горшай, брат, паняверы, як гэта, у нашыя часы і не прыдумаеш.

Наняў раз Цюхцялея купец з мястэчка, каб пафурманіў яму ў горад. Але дзеля таго, што ў дарозе цяпер не так ужо і бяспечна, асабліва для купцоў і ім падобных, дык нагаварыў паехаць паліцыянта.

Аднак у лесе сустрэў іх чалавек, наставіў рэвальвер і пачаў вытрасаць кішэні. У часе гэтай «рэвізіі» купец улучыў момант і схапіў ззаду «рэвізора». На дапамогу скочыў і паліцыянт. Пачалі тузацца. Лясны чалавек быў дужы, як мядзведзь, аднак і паны не здаваліся.

У часе, калі яны ходаліся, Цюхцялей выняў торбачку з ядой і давай закладаць хлеб з салам за абедзве шчакі.

Звалі яго на помач і гразілі паны, зваў і стукаўся да яго класавых пачуццяў і лясны чалавек — усё адлятала як гарох ад сценкі. Цюхцялей коса лупаў вачмі ў іх бок і спакойна жаваў.

На шчасце, лясны чалавек спрытна вырваўся і нырнуў у лясны гушчар.

У мінулыя старыя часы ад гэтага Цюхцялея дык быў бы адзін ратунак: жанілі б, гада, і канцы тут у ваду. Сяк-так стаў бы чалавекам.

А паспрабуй жа ў нас цяпер жаніцца — гэта значыць, трэба падзяліцца. А што дзяліць, калі шнур

далонь прыкрые? Не гэткія, як Цюхцялей, дзецюкі, і то старэюць, не жэнячыся.

Зямелькі няма — жыцця няма, радасці няма. Вось як у нас злыбедна.

Адна ў вёсцы Рубяжэвічы была думка, адна надзея, адзін ратунак: адправіць Цюхцялея на рэпарацыю ў турму. Там пасядзіць трохі — жыва наламаюць, бальшавіком стане, у людзі выйдзе. Хлопцы, што вярнуліся з турмы, дык вунь якія сталі — правадыры, вёска ганарыцца імі.

А гэта зрабіць, як вокам міргнуць.

І трэба было зрабіць, бо няслава вёскі Рубяжэвічы пагражаюча расла і магла далей-болей ацюхцялеіць усю вёску.

І вось на кірмашы ў мястэчку нехта пад распіску перадаў Цюхцялею нейкі пачак, даў таксама на гасцінца пачак папярос і сказаў, каб уручаны пачак ён занёс да жонкі войта.

Трапілася так, што Цюхцялей папаў на паліцэйскі пастарунак, дзе ў яго адабралі пачак, у якім аказалася камуністычная літаратура.

Цюхцялей спрачаўся і не даваў ім:

— Пайшлі вы к чорту, я пад распіску ўзяў і павінен здаць, каму сказана.

Такое змаганне Цюхцялея і ён сам, як такі, збянтэжыла паліцыю, і яна ўжо хацела яго выпусціць. Аднак пасля парашылі адправіць у горад у турму.

Дарэмна радаваліся Рубяжэвічы, што здалі Цюхцялея ва «універсітэт» Заходняй Беларусі. Па дарозе ў турму на грэблі наскочылі партызаны і забілі паліцыянта, які праводзіў Цюхцялея.

— Чакайце, куды ж гэта вы? — узмаліўся Цюхцялей да партызанаў, калі тыя рушылі ў кусты.— Што ж вы гэта, каб вам заяц полы абарваў, якую ж гэта вы трасцу зрабілі? Выходзіць, што я паліцыянта забіў, чэрці вы балотныя?!.

— Але ж, так і выходзіць,— адказалі тыя.

— Дык мяне ж расстраляюць?

— Ды ўжо ж, расстраляюць.

— Дык што мне рабіць?

— Хадзі з намі ў партызанку.

І Цюхцялей пайшоў.

Цюхцялей стаў партызанам, але дзеля таго, што ён баяўся стрэльбы, як чорт крыжа, дык прыходзілася яму большасцю кухарыць.

А часамі бывала і так, што калі яго таварышы былі ў адлучцы, дык Цюхцялей ухітраўся спытлявaць усю ежу і пакінуць усіх галоднымі.

Не раз пагроза галоднай смерці і поўнае прыгод і небяспек партызанскае жыццё змушалі Цюхцялея на самыя рызыкоўныя выступленні, якія яму, бадай, заўсёды добра ўдаваліся. Цюхцялей памалу загараўся барацьбой, рабіў больш смелыя і рашучыя крокі ў жыцці.

Аднак стаць барацьбітом Цюхцялею не давялося. Выпала раз яму ноччу вартаваць. Узлез ён на верхавіну бярозы на ўскрайку лесу. Пад раніцу заснуў цюхцялееўскім сном і зваліўся дадолу ды, мабыць, звякнуўся аб камень, бо таварышы знайшлі яго нежывым.

# Паэзія



## Салдацкая песня

Я салдат малады,
Я дзяцюк хоць куды,
І без меры я дуж.
Звацъ мяне — беларус.

Эх, як стане у рад
Малайцоў гэткіх шмат!
Усе вольны яны,
Беларусі сыны.

Дык як стануць, пайдуць,
Дзе стогн, крыўда жывуць,
Кажы смела тады:
Больш не будзе бяды!

Гэй, салдацкая моц,
І удзень, і уноч
Настарожы ты будзь,
Каб ісці, дзе стогн чуць!

Хай з салдацкіх грудзей
Па зямельцы усей
Сказ імчыць, як страла:
Беларусі хвала!

* * *

Працуй, Беларусь,
На хвалу для людзей.
Кажы, Беларусь,
Сваю праўду смялей.

Удар, Беларусь,
У вечавы гулкі звон.
Ўзары, Беларусь,
Свой забыты загон.

Гэй, скінь, Беларусь,
Ярмо цьмы прошлых лет!
Жыві, Беларусь,
Каб жылі воля, свет!

## Мінуўшчына

Быў калісь слаўны час, калі звон вечавы
Зычны покліч свой слаў за замчышча равы,
Слаў да княскіх харом, да убогіх хацін,
Ён на веча склікаў сярод грозных хвілін.
І люд вольны ішоў. І ждаў Полацк гасцей,
Князь ждаў гнеў ці хвалу. Дудар граў весялей.

Не гулі віхры, гром, не шумеў зелен бор,
То судзіла суды і давала прастор
Вольным думкам сваім веча верных сыноў
Крывічанскай зямлі, веча шчасных гадоў.

— Князя-злыдня прагнаць. Між дружыны ёсць муж,
Слаўны добрай душой, і на мудрасць ён дуж.
— Гаспадарыць яму! Князем выбраць яго! —
Такі сказ край пачуў, пачуў з веча таго.

Полацк знаў, што рабіў, бо калі жмудзь з лясоў
Запалоніла край, што быў згінуць гатоў,
Вось тады не мячом Полацк край ратаваў,—
Моцай веды сваёй Вільню ён паканаў.
З дзікіх, цёмных лясоў вывеў ворага ён,
У рукі светач ім даў, даў ім правы закон.

* * *

Калісь на сонца я глядзеў.
Я, смелы, сонцам быць хацеў.
І слёзы паплылі з вачэй;
І плямы чорныя іржой
Ляглі на неба, на людзей...
І жахануўся я ў час той.
Жыццё, людзей хачу любіць,—
Хай сонца на мяне глядзіць!

* * *

У гразь утоптана ляжыш,
Зыходзіш кроўю з свежых ран.
Няволі паніжэння крыж
І непрагляднасці туман —
Крыніцы страшных мук Тваіх,
Мук затаёных і нямых.
І так між вечнай цемнаты
Ты ад праступнай нематы
Гібееш на шляху разбойным.
А цені талакою збройнай
Згушчаюць цемру безадказна
І гоняць табалой працяжнай
У небыццё нявінных, закаваных
Дзяцей Тваіх, па Тваіх ранах.
І топчуць матчынае цела
Яны, сіроты, ацямнелыя...

Крыкні жа голасам мільёнаў!
Хай здрыганецца ноч ад стогнаў,
Ад вечаў, кузняў пойдуць рэхі!
Хай схамянуцца Твае дзеці
І асвяцяць слязьмі уцехі
Тваё зняважанае цела.
Хай згінем мы і ўсё на свеце,
Толькі дай голас, мая Русь Бела!

* * *

Няўжо я шчасце калі сустракаў,
Няўжо яго у будучыні бачу,
Што без развагі слёзам волю даў
І ўсё кляну жыццёвую няўдачу.
Не, я знаю, што шчасця няма.
Хоць шукаць яго будзем да смерці...
Ахутаюць зямлю холад і цьма...
Але дух Беларусі, паверце,
Будзе жыць,
Сонцам быць!
Бо было халадней і цямней,
Як гібеў ён вякі між людзей.

* * *

Эх, няхайная старонка,
Недарада, папрашайка,
Пустазвонная гамонка,
Недакончаная байка!

Каб цябе сем год бунтарскі
Шал вёў аж на верх Гальготы,
Каб памёршы — уваскрэсла,
З'ела блін, надзела боты.

Каб радоў пазнала мукі:
Сваю праўду каб радзіла.
Каб за гэту праўду многіх
Смерць мне вечнасць пасуліла.

* * *

Мукі — церні, яд;
Боль пячэ, бы жар;
Кроў, душу даю —
Як ахвяру, дар
Не за Твой абшар,

Гаспадарскі лад,
А за моц сваю,
Тайну тайн Тваю,
Праўду сельскіх хат.

* * *

Ідзе ў цьме,
Ў пакрыўджанай грамадзе.
Яднаючы ў паток веснавы
Дзяцей катаваных рабоў,
Ідзе праз галовы змей,
Ідзе праз кроў,
Праз руіны, равы —
З мальбой і гневам
Кіпучым, святым.
...З пажарышч узнімаецца ахвярны дым.
«Мы доўга цярпелі, цярпець больш не будзем...»
— Братка, а можа, мы блудзім?

Заскомлілі цені, смоўжы і маскі:
— Ай, стойце, каравыя хамы!
Вы топчаце шчапы нашы, краскі.
Вы глушыце ўрачыстыя гамы
У чэсць сытага супакою.

— О, Божа, не карай нас вайною!

Напралом, наперад ідзе,
Як крыга па мутнай вадзе.
Хвалююцца белыя світкі,
Змываючы каінаў грэх брыдкі,
Выкідваючы на бераг трэскі — разбіткі
Ад карабля дзяржаўнага ката...

«Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець...»

— Ціха ты, квактуха чубата.
Бачыш, вунь за вуглом цікуецца,
Адзеўшыся за нашага брата,
І ўсё з панам таргуецца
І вярзе: «Дажджом і мы свайго свята!»
— Здрада! Здрада!
— Прадажнасць! Сувязь адступніка-гада
З трупам блудніцы прадажнай,
Родам з шляхты лішне важнай.

Ух, як жа сівер лютуе,
Як ледзяніць... Няўжо пранячуе
Ён з намі ў труднай дарозе?
Няўжо ў трывозе,
Як у попеле шэрым,
Згасне іскра надзеі і веры?
Няўжо над кнеямі свежымі,
Над злітымі крывёю межамі
Будзе каркаць толькі крумкач,
Будзе на варце стаяць буржуй?
— Беларусь, не плач!
— Беларусь, не журбуй!
— Чуеш, Твой баян вяшчуе,
Чуеш, Твой яздак бунтуе
Вёскі, вёскі, гарады.
Дзе шчыт яго чырванее,
Дык стары там маладзее,
А сталее малады.

«Мы дружна ўстанем з касамі, з сярпамі,
Прагонім зямлі палачоў...»

Устаюць, устаюць, гудуць раямі.
Ударнымі хвалямі шырацъ круг берагоў
Аж за Дзвінск, за Палескія разлогі,
Пад Смаленск, пад Буг, руйнуючы астрогі.
Ха-ха-ха! А вунь наш прыганяты
З воўчым норавам, з доўгімі рукамі,
Прагавітымі вачамі
Пры парозе нашай Хаты,

Нашага Вялікадня і Спаса
Стаіць вінаваты
І узіраецца ласа
На нашае свята.

* * *

Беларусь мая мужыцкая,
Шматпакутная, непачатая,
Зварухніся, моц крывіцкая,—
Слава наша ты крылатая.

Беларусь мая юнацкая,
Шалам дзікая, ўся бунтарская,
Парві пута Ты чужацкае,
Будзь дзяржаўная, гаспадарская.

Беларусь мая несмяротная,
Кветка белая, маці родная,
Ўсёй істотай сваёй Табе шчасця хачу,
Аб ім сню, летучу,
На дне бур, між віхроў ўсё шукаю...

Не найду. Не прычакаю.
Я згару ў барацьбе...
О, зайздруй маёй судзьбе!

* * *

Не тужыце, беларусы,— сон то моц.
Са сном ноч
Сустрачаюць сонца, сонца.
Гляньце, па усёй старонцы
Пад дыханнем вясны-кралі
Краска дзіўная усходзе,—
Цешцеся такой прыгодзе,
Цешцеся, бо ноч праспалі.
Хай уцеха дасць гарт сталі.

* * *

Рассвяткуйся, неба, выбухні зарніцай,
Памажы сярмяжным шумна весяліцца,
Бо з зямелькі-маці мае нарадзіцца
У кашульцы шчаснай Беларусь сінявока.

Даставай жа, Юр'я, ключы залатыя,
Расчыняй пакоі яснавеснавыя.
Падмятай жа, Пётра, з хмар пакоі тыя,
Яірам пасып ад Дняпра да Беластока.

А Ілля на нечысць з стралой перуновай
Няхай папалюе па старонцы новай.
Загад гэткі кажа рабачай вясковы,
Бацька Нараджонай, ён жа і пострах Цмока.

## Адраджэнне

Бач, світанне напрадвесні,
Ўсюды гоман, льюцца песні,
Ўсход шырэе, цемра тае...
Эх, жыццё, святло буяе!
«Вераб'я» танцуе сэрца.
Верашчака у талерцы.
Со смеху жывот трасецца,—
Слуцкі пояс красой ўецца.
Го! Ка мне не прыступіцца:
Урок — наўцёк, ціпун баіцца,
Вораг лашчыцца, сябрыцца.
Бо, наеўшыся аладак,
Новы ўводжу я парадак.
Дрэнь — жыццё, жыццё старое,
Неўдалое і худое.
У дрыгву яго з імпэтам
Чабулдыхнуць перад светам.

Толькі камень прывяжыце,
Стопудовы,— паспяшыце,
Хай барзджэй на дно балота
Ляжа гэтая няцнота.

* * *

Ты расцеш, як дзень світаннем,
З верай, харaством, пяяннем,
Бо люблю Цябе я.
Што нам ноч і панства пана!..
Наша моц непаканана,
Бо любоў нас грэе.
Для мільёнаў я надзея,
Сонца прада мной бляднее,
Бо люблю Цябе я.

## Белая музыка

Ты, муза, народу працай пачэснаю
З паху квяцістага саду вясной,
З сонечных косаў, кудзелі нябеснае,
Водгулля славы дзяржаўнай, старой
Выткала з слуцкім узорам надзіва
Мне самалётны дыван асаблівы.

Рой матылькоў, ось бы краскі лятучыя,
Крылкамі кволымі між сінявы
Ледзь-ледзь чапаюць за струны пявучыя,
Што аб'ядналі ў хаўрус векавы
З добрым Дажбогам Край грэчкі і руты.
Гуслі чароўныя, сэрцам пачуты!

Папараці-кветкай смела здабыў я сам
Скарб нечапаны, дзе тоіцца чар:

Поўдзень Спажы між машынай і лотасам:
Мова матчыная — вечнасці дар;
Трон працы творчай, красы-багавіцы;
Музыкі, калёраў, паху — крыніцы.

Гук аксамітны, гармонія чулая,
Гучная хваля і покліч вясны,
Рад з вамі новаму, слаўлю мінулае,
Далі няпройдзенай рояцца сны.
Чую песнь крылляў, то водгук Прыходу...
П'ю моц ліліеямі, п'ю асалоду.

* * *

Хто душой і шчырым сэрцам,
Хто так родны край кахае?
Пекным чынам, цёплым словам
Хто ў бядзе нас суцяшае?

Хто нас вучыць мовы, песень,
Долі моліць са слязамі,
Беражэ пры першых кроках
І душой заўсёды з намі?

Хто ж, як пчолка, любіць працу,
Чыстату душы і цела?
Хто парадкам дыванамі
Хату здобіць так умела?

Хто прыпевак стварыў столькі?
Хто ёсць гэткі слаўны геній —
Так балесна адчуць жаласць
Пры хаўтурах ў галашэнні.

А хто церпіць столькі ліха
Ад бурлівых падзей веку,
Ад таго, што Край забраны
Гіне сярод цемры, здзеку?

Хто надзея, гордасць наша,
Праўды нашай каляіна?
Хто натхніў стварыць верш гэты?
Беларуская жанчына.

## Куплеты па часе

### АСТРОЖНІК

У мурах цесных, як у гранцы,
З волі чорта трутнем стаўся...
Ляжыць сярод чада ражкі,
Хоць не збойца, не пракраўся.
За акном варона крача,
Што не можа быць іначай.
А за крэпкімі дзвярамі
Цэрбер бразгае ключамі.
Папаў на зуб дэфензіве,
Бо зуб меў хтось *цяпер* «дужы».
Ў самаго ж не пападае
Зуб на зуб ад страху, сцюжы.
За акном варона крача...
Есць ён поліўку з гароху,
Абяцанкі быць свабодным;
А яго ядуць плюгаўствы
І здзек над сваім, над родным.
За акном варона крача...
Што за месяцамі гэтак
Пакутуе ён, нябожа?
А за тое, што калісьці
Напракудзіць часам можа.
За акном варона крача...
Гэта ўсё смяшныя жарты,
Ды каму яны здаліся?..
Ў горкай долі смех патрэбен,
І каб дурні не звяліся...
За акном варона крача...

## Снег

Гляджу праз акно з густою кратай —
Там снегу багата, багата,
Там шэрае неба застыла
I снег мяце, сыпе, віруе...
Як сэрца за шчасцем сумуе!
Як воля мне дорага, міла!
Хоць там за акном з густою кратай
Так снегу багата, багата...

## «Лявоніха»

Рунь, пралескі доўга лучыў стары снег,
А як сонца напужала, дык пабег
Ў лес схавацiся да свята Саракоў.
Пасля травень маем вымеце у роў.

Шум і гам пад рукі Оха узялі,
З печы весела на прызбы павялі.
А на выгане бушуюць бугаі.
Лескавік русалку соча у гаі.

Не сцярпеў нябесны Юр'я ды ураз
Падцягнуў падол свой ёмка пад паяс,
Весялушку Лялю крута падхапіў
I па лузе з ёй «Лявоніхай» паплыў.

## Да маладых

Беларус малады, што гальчэеш, бядак?!
Паўстань, выйдзі з хваль ніў залацістых;
Зварухні, скліч, з'яднай як ты гэткіх ваяк,
Чые рукі ў значках мазалістых.

І нясіце моц пушч, разгул бур веснавых,
Праўд і песень нягаданых, новых.
Узарыце мяжу між сваіх і чужых,—
Знайма вольных, працоўных, здаровых.

Юнакі-сілачы, вызваляйце Зямлю
Ад паганых рук старага свету —
Ўжо спрахнеў гэты свет,— хай жа тлусціць раллю;
Быць хоць раз ураджайнаму лету.

Многа ёсць злыбяды, ліхадзеіць туга,
Дармаед сваяволіць ў бясправе,
Пухне з роскашы пан, прадаў душу слуга...
Эх, няўжо ж гінуць нам у няславе?!

Не! Яшчэ сонца ёсць, руніць поле вясной,
Льдом адвечным вада не скавана,
Ёсць яшчэ узлёт дум грамады маладой,
Што у працы цяжкой гартавана.

Дык дарогу шырэй, недалюдкі, брыда!
Дык дрыжы, хто няпраўдай жыць хоча!
З песняй помсты ідзе маладых грамада.
Маладое жыццё нам прароча.

Іх прызвала жыццё, іх, зямелькі сыноў,
Надзяліла іх неба натхненнем.
І ўсе поплеч ідуць з усялякіх краёў,
Ўсе сярмяжнікі, волаты, геніі.

## Роспач

О, беспатольная, бел-чыстая,
З ліхадзеямі нерашучая —
Аб Табе да зямелькі камяністае
Прыпадаю ад болі пякучае.
Б'юся як рыба аб лёд,—
Кроў, слёзы, пот...

То ж адабралі, глумяць Жалейку.
Крывавым штыком распаловілі
Безабаронную, працоўную Сямейку.
З падваротні сытым назласловілі
Пра гора ціхае, жабрачае;
Пра хараство юначае;
Пра заімшэлую Вялікую Руіну.
А кругом каркаюць, што не ўваскросшы згінеш,
Што мову матчыну
Ў забыццё кінеш.
А кругом дужыя, ляскаючы клыкамі,
Рвуць сквапна цела кускамі —
Няміга, Люблін і Рыга —
Калі скрыша іх вясны нашай крыга!
Ах, ясі Ты праклёныя кусочкі.
Нахадзілася з сваёй хаты ўпрочкі.
Настаялася ў пераможцаў пры парозе.
Намадзелася нявіннай у астрозе.
Начулася гідкіх нагавораў.
Пакалечыла душу аб нораў
Прагавітых прыблуд-ліхадзеяў.
Спахмурнела ад грозных падзеяў.

Як балюча цягучая ноч роспачы, ґора.
Бы ліпкае павуцінне, аплутала змора.
Рабскі жах, нявера душы набалелай
Точаць корань Руні і цяжарацць думу.
Па Краіне працы і задзірванелай
Значан след крывавы ўладарнага Глуму.
Славу здратавалі!
Замест неба — клетка, каваная з сталі.
А замест світання — зарыва пажараў...
Ах, годзі жа, годзі ахвяраў!
Ах, раніца-краля і вечар-багач,
Усцішце жальбу, стогн і плач
Дзіцяці ад глебы, плач сіраціны
Без Імені, Долі, Айчыны.

У немач кінула адвечная пакора.
Не ўтопіш у слёзах Ты гора.

Ах, калі ж узойдзеш без прынукі
На гальготу адраджэнскага Руху?!
Ах, калі ж працерпіш тыя мукі,
Што дадуць незалежнасць Твайму Духу?!

## Вы і мы

Вашы сэрцы, бы апенькі,
На карчы жыцця грыбеюць.
У бястайных душах зрэнькі
Цвіллю лужы зелянеюць.
Вы — начных прывідаў цені.
Вам скон дня збаўленнем сніцца,—
Плюйце ж, кідайце камені
На усход — там дзень крыліцца.
Што ж, цвікі падносьце катам,
Укрыжуйце церняваных.
...Аж падойдзе к буднім хатам
Дзень Вялік, вясной прыбраны.
Сцебане Бог бліскавіцай
Ды прыб'е пыл дажджавіцай.
Дудне Ілля на дудзе.
Па краіне галасістай
Радасць узрасце квяціста,
Радасць Нам, Агню, Вадзе.
Нас ёсць тройца. Мы змест Слова,
Вечны рух, жыцця аснова,
Згучнасць, вечнасці закон
Ды нутра зямелькі тон.

## Паліцыянт у клопаце

Што такое, panie tego,
Робіцца на свеце?!
Калі гэтак далей будзе,
Можна звар'яцеці.

Як сыр ў масле я купаўся,
Пікнуць не пасмелі.
А цяпер дык, panie tego,
На карак усселі.
То ж народ! Пазнаць не можна!
Перш быў так пакорны,
А цяпер усенародна
Лаюць — груган чорны,
Панскі найміт, крывасмокта...
І горш выдумляюць.
Пужнуць хочаш — дык законы
Пад нос выстаўляюць.
Кажуць, што пан з паноў — Скульскі,
І то быў пабіты!
Мяне ж, гузіка, агрызка,
З'ядуць тут, і квіта.
Не, пры гэтым беззаконні,
Без нагайкі, сілы
Тут, на крэсах, panie tego,
І жыццё няміла.

## Куплеты па часе

Каб не латалі мы латы,
Каб абшарнік-прыганяты
З лістапада пятай даты
Пачуў пострах з простай хаты,

Дык, жанкі, мужчыны, чуйце,
За *шаснаццаць* галасуйце!

Каб не грабілі, не білі,
Па астрогах не гнаілі,
Абяцанкай не кармілі,
Зямлі нашай не дзялілі,

Дык, жанкі, мужчыны, чуйце,
За *шаснаццаць* галасуйце!

Каб лясы — красу, багацце,
Гордасць Беларусі-маці
Не пасмелі зністажаці,
Каб не мерзнуць нам у хаце,

Дык, жанкі, мужчыны, чуйце,
За *шаснаццаць* галасуйце!

Каб паны не руйнавалі
Тое, што мы збудавалі,—
Новых школ не зачынялі,
Мову нашу паважалі,

Дык, жанкі, мужчыны, чуйце,
За *шаснаццаць* галасуйце!

Каб пазбавіцца эндэцыі,
Пяты нумар кінуць ў смецце,
Пусціць з ветрам нумар трэці,
Каб не праклінаді дзеці,

Дык, жанкі, мужчыны, чуйце,
За *шаснаццаць* галасуйце!

## Розумам дайшоў

— Ух, бы медзвядзя асіліў!
Бы гару сапхнуў з дарогі.
Чуеш, жоначка, Марыля,
Сцёр я чорту злому рогі:
Каб быць вольным беларусам,
Прынясці карысць для краю,
Скінуць здзекі і прымусы,
За шаснаццаць кінуць раю.
— Найшоў дзіва,— кажа жонка,—
Без цябе даўно я знаю!
Мне аб тым сказала Пронка.
Нават номер я ўжо маю.

— Эх, вы, бабы, недарады!
А калі вам вораг скажа
На пагібель, дзеля здрады,
Дык вы згодзіцесь ураз жа?
Не, цяперкі так няможна —
Шмат ёсць фальшу, ашуканства.
Трэба быць нам асцярожна,
Каб не скочыць у падданства.
Трэба сэрцам чутка чуці
І душой ўсё наскрозь бачыць.
Трэба розум зварухнуці,
Разважаць, пытаць, тлумачыць.
За шаснаццаць голас даці —
Гэта мала, то не наўда,—
За яго трэ мурам стаці,
Бо ён наша доля, праўда!

* * *

Год стары знямог. Пройдзем праз парог
К Новаму мы Году.
Хай жа гэты Год добры умалот
І між людзьмі згоду
Прынясе ён нам ды хай будзе сам
Крывічам світаннем.
Хай у гэты Год мы, вялік народ,
Злучымся і станем
Шчыльнаю сцяной за край родны свой!

* * *

Здратавана рунь. Плач галодных дзетак.
Лядай глядзіць сад. Скрозь пакосы кветак.
Мучальнікаў кроў. Матак роспач, ночы слёзы.
Пажарышчы сёл. Бежанцаў абозы.

Крыж нясе любоў. Радасць церні раняць.
Праўду ратаеў немачай паганяць.
Грабаром жыцця воля паднявольна.
Будзе, ёсць, было: доля беспатольна.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Вецер у сцяну ночы злой задрагаў.
Вецер здзьмухануў пыл тугі са сцягаў.
Певень запяяў. Дзень сабраў ўсе росы.
Гук загаманіў гудам шматгалосым.

Выклікала з пушч сонца залатое
На абшары ніў вечна маладое —
Для жывых жыццё нова засвітала,
То, што не было, златацветам стала.

* * *

Схамяніцеся, годзе гібець нам рабамі,
Як адзін, аднадумна да адзінае мэты —
Да волі, зямлі і асветы!
Чынам закончым, што пачалі, славамі,
Зруйнуем — збудуем сваімі рукамі!

* * *

Згінуў час, калі ад веку мы ўсе спалі.
Ўжо для нас навекі пропадам прапалі
Мары, жудзь няволі-твані Беларусі.
Вольнай будзь! І ўжо да вольнай я малюся.

Як не так?! Даўно пагас іх панавання
Задыяк. Хай чырвань захаду загляне
Ў шкло вакон іх фабрык, скутых забастоўкай
Доўгіх дзён. Агонь надзеліць бляск-абноўкай...

Ай-ю-га! Лепш сцеражыся, недавера
І туга, бо пад маёй сярмяжкай шэрай

Сэрца ўраз з уцехі выбухнуць гатова.
Слаўны час — то ж целам стала наша слова!

То ж няма ні сцен кітайскіх, меж крывавых;
І дарма на мапе нам шукаць дзяржавы
Status quo,— ўзарвалі перамогай духа
Іх лагво. Нас навучыла завіруха...
Дзякуй ёй! Русь Белую мы незалежнай,
Веснавой знайшлі ў душы сваёй бязбрэжнай.
Мы — гарой!

## Песня паўстанца

Б'ём мы пана чым папала,
Абы гаду тут не жыць.
Каб слядоў яго не стала,
Песняй трэба такжа біць.
Біць ушчэнт чужынца-пана,
Біць паслужнікаў благіх,
А іх логава пагана
Запаліць з бакоў усіх.
Тож пладзіліся вякамі,
Кроў блакітна, бела косць,
Лезлі з Польшчы павукамі,—
Не міне іх наша злосць.
Будзем біцца мы з панамі,
Каб адбіць ахвоту ім
Грунт араці мужыкамі,
Край наш польшчыць, зваць сваім.
Хай не хопіць нам аружжа,
Хай не хопіць ў песні слоў —
Ненавісці маем дужа,
Хопіць сіл, паб'ём паноў!

# Імкненне

Вякі вякоў прайшлі ад нарадзін.
А колькі ж імянін!
Апошнія спраўлялі пралетары.
Тады зямлю аблізвалі пажары,
А геніяў, волатаў бліскучых
Спраўляліся хаўтуры.
А перагной старой культуры
Быў звалены у кучы,
І тлусціўся аблог.
А Бог
Уцёк з зямлі. А неба —
Бы дзірка ў мосце трэба.
А ўсе працаўнікі Зямлі
На фабрыках, раллі,
Насіўшыя найменні
«Міліёны»,
Што за працу мелі
Каменне
І елі
Няволю, здзекі, забабоны,
Паўсталі, выраслі, запелі,
Яшчэ больш есці захацелі.
Галодны волат — волат працы —
Ён грозны, дуж, ён мсцівы,
Пайшоў раскідываць палацы,
Шукаючы нажывы.
— Хоць раз пад'есці б да сыці...
І быў ён спрыцен:
За рогі зрэпіў сваю мэту,
Каля пажару ўсяго свету
Пёк на штыку буржуя-пана.
Ад перамогі, болю раны
Ён трыумфуе, яму п'яна.
Тады рабочыя, сяляне
Устанавілі уладанне
Працы
заўсёды,
ўсюды,
ўсім

І часам тым
Рашылі між машын
Урэшце жыць без імянін,
А звацца заўсёды,
ўсюды,
ўсім
людзі.

. . . . . . . . . . . . .

Ніхто не ведае, што будзе.
А будзе тое, што мы хочам;
Інакш бы вочы
Таго ж дакучлівага «хочаш»
Як у прадсмертніка блукалі —
Жудка, без мэты і без далі.

. . . . . . . . . . . . .

Ахарошылася зямля ўраджаямі,
Пажарышчы і руіны
Захінула нівамі, гаямі.
Загулі гарады і машыны.
Молат выкаваў шчасце сталёвае.
Серп нажаў сыці аж з коптурам.
Усё сучаснае стала здаровае.
Гора там,
Пад прымусам моцы рабочае,
Уступіла пасад неахвоча
Дабрадзею шчодраму новаму,
Дабрабыту здароваму.
Тады мудрасць натхненнем мільёнаў
Уздыхнула, ўзрасла, сяўцом сонца
Стала для вуліц, загонаў,
Наперад бясконца
Павяла ў бязмежнасць часу, прасторы,
Хвалюючы морамі зораў,
Дробячы дроб электронаў.
Як бліскучым ланцэтам,
З быцця перад светам
Дабыла плод жыццядаўчы,
Адперла ключом усёзнаўчым.

У законе натуры,
У шуме-музыцы машын
Заклік усім, усім —
Да штурму, да буры,
Да нябытых часін!

## Вайна вайне

(Песня інваліда)

Вайна смяротным рухам-махам
Куе працоўным кайданы.
Апалены крывавым жахам,
Рву путы вашыя, паны.
З вайны жывяцца і сыцеюць
Паны, ваўкі і груганнё.
Ад нас крыжы магіл гусцеюць,
Нас душыць голад, насланнё.
Вайна, што турмы для народаў
Будуе нашай цемнатой,
Мне сцерла цела і уроду
Сваёй жалезнаю пятой.
Сабе не міл, людзям дакука.
Скрып кастыля — то крык душы.
Грызе боль, гора, смокча мука...
Эх, што тут слёзна мне тужыць!
Надыдзе час, ён немінучы,
Аб'явім мы вайну вайне.
Тады і мой кастыль скрыпучы
Па карку панскім разане.
За кроў мільёнаў, за пажары,
За крыўду чорную калек
Чырвонай помстай так ударым,
Што прахам пойдзе панства, здзек!

## У дэфензіве

Палачы, акупанты, фашысты,
Здраду хочаце вырваць з жыццём.
Мае раны пад вашым біццём
Загамоняць больш цвёрда, вагніста,
Што выдам братоў палачом.
Выдумляць горшы здзек, катаванне
Не патрэбны турботы для вас.
Што мне боль, калі ў гэты я час
Палыхаю жаданнем паўстання
Шматмільённых прыгнечаных мас!
Хоць вы сэрца на часткі парвіце,—
Ў кожнай частцы жыць буду, каб мсціць.
Помсты нашай нічым не згасіць!
Блізкі час, калі мы бліскавіцай
Тут запалім часы навальніц.

## Тут і там

Ой, шмат на свеце бед сплыло.
Сабраць іх разам — горай, мусіць,
Ніколі так бы не было,
Як у Заходняй Беларусі.
    Герб панскі, белы іх арол
    У лапы зрэпіў знак праўлення:
    Нагайку, путы — то для сёл
    І для рабочых на глумленне.
Там молат — вольнай працы знак,
А серп пажне таму, хто сее.
Мазоль — грамадскасці адзнак.
Жыццё цвіце і багацее.
    Тут пан загнаў наш творчы дух
    На глум вільготнага падполля
    І скарыстаў наш кожны рух,
    Каб збольшыць роскаш, самаволле.
А там рабочы, селянін
Будуюць гмах культуры новай.

А праца ўсіх людзей, машын
Ёсць для Рэспублікі аснова.
Тут Беларусь жыве, каб мсціць
Крывавай панскае навале.
Тут толькі руйнаваць і біць,
Пакуль нас трупам не паклалі.
Там Беларусь-красуня ўсім
Сама парадак свой наводзіць.
Савецкі лад у краі тым,
Там Адраджэнне наша ўсходзіць.
Браты, цярпець даволі нам!
Хто жыў — да бою, да змагання
За лад, які існуе там,
За Беларусі аб'яднанне!

## Прабуджэнне

Вецер у сцяну ночы злой задрагаў.
Вецер здзьмухануў пыл начны са сцягаў.
Певень запяяў. Дзень сабраў усе росы.
Гук загаманіў гудам шматгалосым.

Выклікала з пушч сонца залатое
На абшары ніў вечна маладое.
Чырванню яно зацвіло яскрава.
Хто праснуўся — тым барацьба і слава!

## Марш ратаёў

Гэй, ратаі, мы маем моц кайданы рваць! —
Стаў неўмагату панскі вызыск, здзек.
Дык, бунтары вясковых гонь, працоўна раць,
З боем, сілай браць, грабленае век!

Шум грамады, бразг кос, сярпоў узносяць сцяг —
Хоча наш аблог коласам звінець.
Даспей удар, красуй паход, расці размах.
Краска цаліны гіне ў баразне.

Чырвоны рух па гарадах, як гром, віхор.
Жах трасе палац, помста выйшла з хат.
На збор гудкі гудуць у даль нізін і гор.
Песня, кліч, праклён. Бунт дае загад.

Гэй, ратаі, сярмяжны люд усёй зямлі,
Больш мы не рабы, час ярмо скідаць!
На барацьбу мы, змагары ад ніў, раллі,
Па савецкі лад, па зямельку-маць!

## Вынеслі раз пастанову

Вынеслі раз пастанову
Даць святочную абнову
Для батрачкі Беларусі.
Апраналі так і гэтак
  На манер яе суседак —
  То завяліка, то душыць.
  Клікнулі краўцоў з усходу,
Навярнула іх з заходу —
Дагадзіць ніхто не можа.
  Ўрэшце ніваю-тканінай
  Беларусь, красу дзяўчыну,
  Селянін сам упрыгожыў.
Зноў рашылі дабрадзеі
Выдаць замуж нашу жнею
За багатага суседа.
  Панічы таўкліся хмарай,
  А працоўніца ім жара:
  — Не пайду за дармаеда.
А купец-брухач з усходу,
Шляхціц-махціц аж з заходу
Фігу з'елі такжа жвава.
  Бо рабочы быў ёй мілы.
  З ім навек саюз зрабіла
  Дзеля шчасця, добрай славы.

* * *

Кахаю Беларусь сучасную, не выснену,
Рабочым сэрцам, ратая душой.
Кахаю творчым дзелам, а не мысленна,
Кладу падмур мазольнаю рукой.

Кахаю радасным каханнем будаўнічага,
Што кінуў цераз пропасць мост-праход.
Кахаю гордасцю я пагляду мужычага
На свой аруд, дзе з верхам умалот.

Кахаю моцай, бляскам току электрычнага,
Што сонцам-чарай апраменіць край,
Калі і паляшук задзівіць энергічнасцю
І акупантам загрыміць: «Аддай!»

Кахаю палкасцю агонь-каня сталёвага,
Што нетрам і аблогам дзень і ноч
Разводзіць творчы рух, жыццё адумысловае,
Наперад, напралом імчыць наўскоч.

Кахаю дзействам спорным я нутра фабрычнага
Машынаў-дабрадзеек, сакатух.
І ненавіджу больш узрыва вулканічнага
Я Беларусь як служку панскіх слуг.

## Бура ноччу

Грукоча гром, віхор бушуе,
Маланкі твораць дзіва, казку —
То гэта бура так вячуе,
А ўся прырода банкетуе,
Надзеўшы чорны плашч і маску.

Адкіну я закон, запрэты
З размаху ў вір бурлівы ўскочу.
Хачу там пець жыццю куплеты.
Барзджэй пад'едзь, Іллі карэта...
Эх, як люблю я буру ноччу!

## Наша радасць

Сярод той злыбяды,
Акупанцкай жуды
Радасць ёсць і для нашага брата.
Калі ноччу падчас
Рухам пэўным раз-раз
Раскапаеш падлогу лапатай.
Паглядзеўшы убок,
Беражліва пачок
Вынімаеш, як нейкую святасць,
І любоўнай рукой
Пачак гладзіш ты той,
А на твары рашучасць, заўзятасць.
Пасля месяца свет
Памагае як след
Часць да часці сабраць аднастволку,
Прыдаць бляск, абнавіць,
Прыласкаць, палюбіць —
Эх, змагарскіх лятункаў тут колькі!
Але трэба ізноў
Далей вока паноў
Захаваць сваю радасць і сілу,—
Хай ляжыць, не тужыць,
Будзе партыі кліч —
Паваюем тады люба-міла.

## О мудрасць!

О мудрасць людская,
Стой, не ідзі!
Глядзі:
Тваю сцежку пропасць глытае
Чорным смехам сваім...
Ты — збаўленне людзей.
Схамяніся ж барзджэй!
Нясі кару ўсім тым,
Хто зямельку атрутай абліў,

Хто яе зневажаў і глуміў,
І зняволіў цябе, і маной абкруціў!..
Годзе стогнаў, жальбы,
Безуцешнай мальбы.
Мудрасць — воля табе!
Настаў час твой цяпер —
Вер у моц сваю, вер.
Схамяніся ж барзджэй,
Будзь зямельцы усей
Ўладаром і богам красы, чыстаты.
Моцай праўды сваёй
Цемру збі з высаты,
Распылі назаўжды ты парадак стары!
І знішчай і твары!
Ты — збаўленне людзей,
Ты змагайся усей
Сваёй сілай, агнём —
Ноччу і днём!
Бо змаганне — збаўленне тваё!
Йдзі з жыццём — за жыццё!
Сонцам, праменем ясным
Забагуй
Між сонц чорных сучасных...
О мудрасць людская, ратуй!

* * *

Грамада валіла валам:
Заклік-правадыр,
Па дарозе разбракала
Ўдоўжкі ды ушыр.
Хвалявалася на сходзе
Мора-табала.
Гэта свята у народзе:
Воля ажыла!
Вечаваў сход дужа-мала,—
Выбраў калектыў:
Талака каб памагала,
Кожны з працы жыў.

Звод на злодзеяў часіны!
А з павераў кпіць.
Каб кармілі нас машыны,
Трэ машынай быць.
Усю зямельку абзагоніць,
Горы з месц крануць,
Акіяны разгамоняць,
Дна і тоні ждуць.
Усе за ўсіх усюды гурмам —
Нішчыць і тварыць.
Бой для цьмы, пагібель турмам,
Светач хай гарыць!

## Покліч

Адраджайцесь, народы,
На смерць безгалоўю.
Ўзарыце вы межы,
Залітыя кроўю.
Хай грэх Каіна змые
Пот працы супольнай,
Барацьбой дух гартуйце,
А думкам — лёт вольны!
Талакой памагайце
Ў час труднай прыгоды.
Сцяг нясіце са сказам:
— Братайцесь, народы!

## Буслы

У садочку пры дарозе,
З часоў даўніх на бярозе
Буслы завяліся.

Вельмі было дарагое
Ім сваё гняздо старое —
Навек з ім зжыліся;

Але людзі захацелі,
Каб то буслы пераселі
    На другі бок саду;

Для таго слуп укапалі,
Барану прымацавалі,
    Розную прыладу.

Але буслы больш цанілі
Гняздо, што дзяды зрабілі,—
    На ім засталіся.

Лепш, мілей свая руіна,
Чымся пекная чужына...
Беларус! Свой родны край
    На чужыя не мяняй!

## Мініяцюры

### ЛЁН

Нікне ночка, сон,
Зоркі пайшлі ўпрочкі...
Хісткі стройны лён
Раскрыў сіні вочкі.

### НА КАСЬБУ

З касой вострай, з песняй зычнай
Іду сонца сустракаць.
Пяюць пеўні. Луг расісты —
След далёка мой відаць.

## МЕЛАНХОЛІЯ

Дзень пануры, дзень шэры.
Ўсё хтось стукае у дзверы:
Стук! Стук! — чую раз у раз,—
Гэта лезе благі час.

## ЗІМА

Там, дзе грэчка красавала,
Тоўстым пластам снег ляжыць;
Дзе зязюля кукавала —
Вые воўк, мароз трашчыць.

## ПЭЎНА ШТО

Каля вольхі віўся хмель,
Абнімаючы камель;
Каб не зімка, не мароз,
Ён бы вольху перарос.

## ЮНАЦТВА

Хоць мароз — маланкі ў вочах,
Моц каўшом вясна ліецць,—
Сэрца радаснае хоча
Песняй розум разагрэць.

## СІНЬ

І вабіць, і суліць надзею
Прасторная сіняя даль.
Іду — не ісці я не смею:
Сініць
васілёк, даль
і сталь...

* * *

Цяпер іх сіла — наша кроў,
Чырвоніць мур, цвіце на гонях.
Яны нам сэрцы рвуць з грудзёў,
Прыкладам б'юць — друзгочуць скроні.

На трэсках вырубленых пушч
Сляды расстрэляных паўстанцаў.
Пакору ад працоўных гушч
З жыццём вымушваюць пазнанцы.

Хутчэй ударыць бы па іх
З усім размахам нашай сілы!
Хутчэй дажддаць часоў нам тых,
Калі б удар наш — ім магіла.

Зацялі губы да крыві,
Нутро сасмягла дамаганнем:
«Бі акупанта, з корнем рві!»
Здзек страшны іх, ды горш — чаканне.

Што ж, акупант, бушуй пакуль,—
А мецъ мы будзем перамогу,
На вас усіх нам хопіць куль.
На помсту нашу — вас нямнога.

## Гутарка мужыка з панам

— Быдла, хам ты, совбандыта,
Мала знаць цябе набіта.
Ведай, што Рэч Паспаліта
Не тваё, свіння, карыта.
Я тут пан, цалуй мне боты,
Бо бізун дадасць ахвоты.
Як не выплаціш падаткі,
Забяру твае манаткі,
Сам да «татавае хаткі»
Пойдзеш, гад, за беспарадкі.

— Ціха, ціха, ягамосцю,
Бо магу не здзержыць злосці.
Вы, няпрошаныя госці,
Сталі, як у горле косці.
Знай, сагнуць мяне не ўдасца —
Страсяне цябе перш трасца.
Кроў маю, кроў рабачая,
Ты па краю разліваеш,
А з крыві тэй узрастае
Чырвань-краска веснавая.
Беражыся ж нашай сілы —
З сала пана будзе мыла!

## Прataліна

Запрапасціў ад вясны
Юр'я цюхцялей,
Запрапасціў ён ключы,
Ды ўсе залатыя.
Вёска ў крык: «Ай-яй-ей,
З'елі адсып семянны,
Пуні тож пустыя».
І з авечкамі бяда:
Пусціш к вадапою —
Расплывуцца, бы вада,
У хлеў ні нагою.
Стаднік Буры трацячок,
Хоць бы рад саломе,
Да Субосі-ялаўкі
Загародку ломе.
Рой пчаліны у вуллі
Шумна мітынгуе!
Завірухі загулі,
Селянін гаруе.
Хмар хмарней, чарней раллі,
Па суседзях стогне:
— Ці вясну дажджом калі?
А суседзі — ох, не!
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

З рэвалюцыйным парадам
Праз парог вадаспадам
Рух наступае,
Перамагае
Перашкоды к маю.
Друзгоча на дрэнь
Халодныя люстры.
А злы, як змей,
Бы вар — кіпень,
Як полымя, шустры.
— Шатруй,
вей,
пей!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

І Юр'я, празваны галодным,
Бы воўк той, зрабіўся лагодным.
(Знаць, нават нябеснай уставай
Прызнана учынкам нягодным
Пярэчыць красе маладжавай.)
Дык юр заюрыў гэтым Юр'ем,
Нябёсам ён кінуў: а чур вам!
І ў шумна-вясёлым патоку
Растаяў і знік з відавоку.

## Няволя, змаганне, перамога

### I

Ноч падзяліла... Светач дзе? Жыва!
Шоўтаем... Слізка... Балота ці кроў?
Сыкаюць цені... Абоймы... Тужліва
Дбайце аб волі. Волі!
Хрыпат братоў...
Душаць...
Людзі ці зверы? —
Сэрца гвалтоўна б'ецца у дзверы,
Жалезныя дзверы жыцця,—
Волі! Волі!
Свету б праменьчык хаця!

Так не было і не будзе ніколі.
Ланцуг-спавіяч з адчаю зубамі
Грызуць... Скрогат, стагнанне...
Пры катаванні для мук тамаванне
Робяць святымі славамі:
«Жыві, Беларусь — святліца працоўных!»
Ах, колькі ж ёсць мук невымоўных!

## II

Агнём сваёй помсты
Мы цемру запалім,
Тугу, безнадзейнасць
Развеем, расплавім.
  Агонь у нявольных
  Руках суддзя строгі:
  У попел заменіць
  Кайданы, астрогі.
Агонь не давалі
Багі-ліхадзеі.
Цяпер хай лагво іх
У попел сатлее.
  Агонь сонца-бацька,
  З агню маць-зямелька,
  Агонь — вось сусвету,
  Ён смерць-збавіцелька.
Хай Жыжа укусіць
За карак злой ночы.
А полымя сушыць
Заплаканы вочы.
  Агонь, ганец гонкі,
  Раскрыўшы заслоны,
  Пакажа, як скача
  Ён, жвавы, чырвоны.
Ён, музыка помсты,
Пяе і бушуе.
Пылай жа агнісцей,
Хто скуты — пачуе!

### III

Настане час, як рэха творчай спорнай працы
Акордамі атуліць зямлю-маць.
І задрыжыць зямля ў захопленні юначым,
Аркестр касмічны годзе фальшаваць.

Настане час — аб гэтым кажа мудрасць краскі,
Пчала мядком пахучым вабіць нас.
Туды нас кліча сонца, спелай нівы ласкі,
Барацьбіты за волю, гэны час.

# Публіцыстыка



# Маленькі фельетон

*Пісьмо ў рэдакцыю*

Паважаная рэдакцыя!

Далучаючы пры гэтым карэспандэнцыю, прашу не адмовіць надрукаваць яе. Хай свет дазнаецца, што не так ужо наша вёска забыта Богам і людзьмі, як гэта некаторым здаецца.

У маёй роднай вёсцы Ахратуй, што належыць да сучаснай Польшчы, а перш да «Srodcowej Litwy», а яшчэ перш да «Съверо-Западного края», а калісь, у лепшыя часы, да Беларуска-Літоўскага княства, жыў сабе гаротны чалавек па найменню Беларус, а па-польску — бальшавік, а па-бальшавіцку — контррэвалюцыянер.

І больш ён быў Гаротнік, як Беларус, бо беларускіх газет не атрымліваў (іх палілі на пошце), не біўся, калі прыблуды якіясь абдзёрлі яго, як ліпку, сярод белага дня на шырокім шляху, калі дзялілі яго Бацькаўшчыну, калі прадавалі Белавежскую пушчу, калі закрывалі школы, кааператывы, калі надзялялі уланаў яго зямелькай, калі без яго склікалі розныя канферэнцыі і шм. што інш. Здаецца, у такога чалавека і ворага не павінна быць. А тым часам ёсць — у асобе паліцыянта, які жыве ў суседнім мястэчку Страхадчына. Прыйшоўшы да Гаротніка, паліцыянт кажа: «Ты выглядаеш на чалавека, які надумаў выпісаць беларускую газету». І давай яго кумячыць чым папала, прыгаворваючы: «Ты — бальшавік, паўстанец; у цябе пад ногцямі чорна — ты закапваеш у зямлю аружжа і літаратуру; у цябе вочы сінія, бо ты небу на мяне жалішся. Ты ў рай Леніна запісаўся

Адамам — вось мы цябе туды і адправім». Але не было ўжо каго адпраўляць, бо душа Гаротніка паляцела ў нябесны рай і сказала там Богу: «Божа, паддзі газы ў сваю лямпу, бо там надта сцюдзёна і цёмна».

P. S. Не выводжу маралі, бо карэспандэнцыя і без таго ўжо падобна на байку, а пры тым лягчэй ваўка пераканаць у вялікім назначэнні вегетарыянства, як... і так далей.

З пашанай *Сучасны.*

## Барацьба за незалежнасць у Ірландыі

Ірландыя, так як і Беларусь, з'яўляецца старонкай выключна земляробчай. З даўніх часоў вядзе яна барацьбу з Англіяй за сваю незалежнасць. І ў нашыя часы па ўсім свеце разбягаюцца водгукі крывавых падзей у Ірландыі. Англія пад напорам адчайных выступленняў ірландцаў робіць час ад часу ўступкі. Так яшчэ ў 60-х гадах Ірландыя атрымала палітычную роўнасць, а ў 1902 годзе ўся зямля перайшла ва ўласнасць працоўнага сялянства. Такім чынам, абшарнікі-англічане згубілі назаўсёды сваё шкоднае панаванне ў краі. Па апошняй умове з Англіяй Ірландыя атрымала большыя правы, чым Канада, і фактычна лічыцца цяпер рэспублікай у федэрацыі з Англіяй. Але барацьба не ўціхае, а наадварот, прымае больш запальчывы характар. Некаторыя тлумачаць гэта сучаснай класавай барацьбой, але гэта не тое. Праўда, былі і ў Дубліне дробныя выступленні рабочай партыі «J.W.W.», якая па ідэалогіі блізкая да бальшавікоў, але на фоне агульнай барацьбы зусім не выдзяляецца. Прычыны трэба шукаць у іншым.

Ірландцы, як і беларусы, перанеслі страшныя мукі даўгавечнай няволі, здзек над родным, крыўда глыбока запала ў душу народа, і хоць гістарычныя злачынствы пераможцаў даўно перайшлі ў гісторыю, аднак памяць аб іх жыве ў народзе. Нездарма ірландскі гімн

пачынаецца словамі: «Хто баіцца казаць аб 1798 годзе?» У названым годзе ірландскае паўстанне было з небывалай дзікасцю падаўлена англічанамі. У 1846 г., дзякуючы несумленнай чужацкай гаспадарцы, край перажыў страшны голад, у часе якога елі торф, гной, гліну...

Цяпер, калі ірландскі народ дабіўся таго, што ўжо можа «людзьмі звацца», калі ён набірае грамадскага выхавання, дабіўся свайго культурнага бытавання, дык яго ўсё больш абурае несправядлівае мінулае, ён рашуча адкідае залежнасць ад мачыхі яго бацькаўшчыны — Англіі, ён не хоча жыць пад адной страхой з катам іхніх барацьбітоў за незалежнасць.

## Пісьмо ў рэдакцыю

Паважаны Пан Рэдактар!

Надоечы «Gazeta Wileńska» змясціла артыкул аб Віленскім Саюзе Кааператываў, поўны прызвычаенай гэтай газеце бяссільнай злосці і фальшывых закідаў. Аўтар гэтага артыкула называе паважанага беларускага грамадзяніна Станіслава Чыжэўскага «збеларушаным расейцам», якіх нібыта «ёсць многа ў беларускім руху».

Беларускае грамадзянства звычайна праходзіць моўчкі міма падобных лаянак, бо яно не мае ні ахвоты, ні часу адказваць на ўсякую лухту.

Аднак самая глухая фальш, калі яна часта паўтараецца, робіцца ў вачах людской табалы падобнай да праўды.

І я лічу на гэты раз абавязкам беларускага грамадзяніна напісаць у «Беларускім Звоне», што «Gazeta Wileńska» перабірае сваю мерку, гаворачы аб гр. Чыжэўскім.

Гр. Чыжэўскі не толькі вядомы на ўвесь край кааператар,— ён вядомы беларускі пісьменнік, каталік па рэлігіі, і прызываць яго «збеларушаным расейцам» проста смешна. Хай гэта ведае «Gazeta Wileńska».

14.IX.1922 г. *Л. Родзевіч*

# Неадкладная справа

Сярод нашых пісьменнікаў, якія знаходзяцца ў Заходняй Беларусі, часта ўзнікаюць думкі, што нам патрэбен вельмі тоўсты беларускі часопіс-месячнік ці квартальнік. Ідэю гэтую падтрымлівае і шырокае кола прыхільнікаў беларускага друку.

Калі аналагічныя думкі нараджаюцца ў некалькіх асоб адначасова, значыць, час наспеў, думку трэба рэалізаваць. Трэба зазначыць, што ў нас для выдання беларускага месячніка ёсць грунт, ёсць магчымасць і спачуванне да гэтай справы.

Тут трэба мець на ўвазе цярплівасць, ахвярнасць, зацікаўленасць чытачоў-беларусаў. Не зважаючы на тое, што беларускія газеты чуць не сістэматычна закрываюцца пасля дзесятка нумароў, праз колькі нумароў канфіскуюцца, нішчацца на поштах, гмінах,— усё-такі лік падпісчыкаў павялічваецца, патрэба ў беларускім друкаваным слове ўзрастае. У рэдакцыю нашай газеты прыходзіць шмат пісем з запытаннямі: ці не выходзяць якія-небудзь іншыя беларускія часопісы і газеты, ці няма якіх навінак літаратурных.

З другога боку, мы чуем, што ў нашых пісьменнікаў ляжыць пад спудам шмат рукапісаў, чуем нараканне, што няма дзе друкавацца, няма крытыкі, няма кузні, дзе б кавалася грамадская думка, набіралася пругкасці арыентацыя ў сучасным літаратурна-навуковым і грамадска-палітычным жыцці.

Адгэтуль вывад, што нам неабходна, неадкладна трэба прыступіць да выдання адпаведнага часопіса з прыблізна такімі аддзеламі:

*Краснае пісьменства.* У гэтым аддзеле змяшчаліся б выдатнейшыя творы беларускіх паэтаў, белетрыстаў і пераклады на беларускую мову з шэдэўраў сусветнай літаратуры. Пры гэтым трэба звярнуць увагу на тое, каб як можна больш адкрыць дарогу для маладых, пачынаючых мастакоў, якія выходзяць з беларускай працоўнай гушчы.

*Навуковы.* У навуковай, але даступнай форме даць шырокаму чытачу асвятленне ўсіх найбольш важных праблем сучаснага навуковага жыцця.

*Грамадска-палітычны.* Увесці чытача ў курс галоўных пытанняў і задач палітыкі, эканомікі, дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва Беларусі і гаспадарстваў другіх народаў.

*Літаратурна-крытычны.* Павінен мець сваім заданнем перагляд старых крытэрыяў і метадаў з пралетарскага пункту гледжання, каб захаваць беларускую літаратуру ад буржуазнага зместу і аджыўшых форм. Навукова-крытычны агляд напрамкаў і школ у мастацтве. Мабілізацыя грамадскай увагі на хараство выдатнейшых твораў сучаснасці незалежна ад літаратурных напрамкаў.

*Бібліяграфічны.* Пастаянна даваць сістэматычны агляд найбольш важных і цікавых з'яў літаратуры ў галінах навукі, мастацтва, палітыкі, эканомікі.

*Хроніка і інфармацыя.* Даваць найнавейшую інфармацыю — агляд міжнароднага і ўнутранага жыцця, хроніку літаратурнага і навуковага жыцця. Падтрымліваць цесную сувязь з чытачамі.

Часопіс павінен быць беспартыйным, павінен адкрыць свае старонкі для ўсіх, хто захоча палажыць цагліну ў культурнае і дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі.

Часопіс павінен аб'яднаць усіх пісьменнікаў, супрацоўнікаў і чытачоў і гэтым калектывам будавацца і развівацца і дбаць аб тым, каб ён стаў трыбунай для выдатнейшых мастацкіх твораў і нашай публіцыстыкі. У ім павінна выявіцца шуканне новага зместу, новых форм, ён павінен абагаціць беларускі слоўнік. Патрэбна сур'ёзная папулярызацыя навукі на беларускай мове — правесці ў жыццё, каб такім чынам паслужыць прычынай яе развіцця.

Часопіс павінен задаволіць літаратурныя патрэбы шырокіх колаў беларускіх чытачоў, выкрышталізоўваць іх сацыяльныя і нацыянальныя імкненні.

Усходняя Беларусь шчаслівейшая — там ужо бадай год, як выходзіць часопіс «Полымя». Часопіс, нягледзячы на строга камуністычны адбітак, усё-такі захаваў сваю беларускую самабытнасць і выяўляе радасную сялянскую бадзёрасць духу. Вялікая заслуга месячніка ў тым, што, бадай, няма ў ім радка,

якога б не зразумеў беларускі рабочы, селянін і вучнёуская моладзь.

У нас у Вільні ад нейкага часу беларуская акадэмічная моладзь з энтузіязмам рыхтуецца да выдання тоўстага месячніка. Хай спорыцца і красуе іхняя праца, хай паслужыць добрым пачаткам для здзяйснення выказанай вышэй думкі.

## М. Чарот (М. Кудзелька)

Паміж шматлікіх беларускіх песняроў, якімі ў апошнія гады абрадзінілася Усходняя Беларусь, асаблівай таленавітасцю вызначаецца М. Чарот (М. Кудзелька).

Як і ўсе новыя пралетарскія красадзеі, М. Чарот з'яўляецца песняром працы, выразіцелем дум і імкненняў свайго працоўнага народа, з гушчы якога і сам выходзіць. У яго паэзіі вее свежасцю народных матываў, чуюцца новыя, небывалыя ноткі ў нашай паэзіі і ярка выражана мясцовая беларуская каларытнасць.

М. Чарот, як ніхто іншы, выяўляе самабытнасць беларускага духу.

Па будове і лёгкасці верша паэт дасягае высокай дасканаласці і чароўнай мілагучнасці.

Мы, аддзеленыя гранічнай мяжой, на жаль, не маем магчымасці поўнасцю карыстацца багаццем роднага мастацтва. Для азнаямлення заходніх беларусаў з творамі М. Чарота змяшчаем яго верш, надрукаваны ў беларускім месячніку «Полымя», які выходзіць у Мінску.

### ЧЫРВОНЫЯ ВЯСНЯНКІ

**1**

Зазвінелі рэчкі крыгамі;
Сонца чэрпае праменем лужы.
Калёсамі вуліца скрыгае...
Жураўлі па-над вёскаю кружаць.

Прывіталі высь блакітную
Спевы жаўрыка ў белым тумане.
Балота пушыцца ракітаю;
Лес шуміць, спатыкаючы ранне.

Сенажаць прайсці прыгожа нам —
Паміж зелені выплылі кветкі...
Каровамі выган стрыножаны,
Рвуць рагамі куп'ё, пералеткі.

Зашумела поле хвалямі,
Мітусеннем выплыўшай руні.
Вясну закліканнем хвалім мы,
Не змаўкаюць гучлівыя струны.

2

Паглядзі: на полі вораным
След праложан калясом.
Селянін ідзе не зморaным —
Корміць глебу ён аўсом.

І з сяўні за жменяй жменяю...
Шум насення, як дажджа.
Хоць загон блішчыць каменнямі,
Верыць — будзе ураджай.

Ён палетак свой узорамі
Барануе, рве дзірван.
За канём ідзе разораю.
Над сваёю працай пан.

Яго шнур спавіт быў межамі...
На чужынца пот ён ліў —
Цяпер з думкай вольнай, свежаю
Ходзіць з песняй па раллі.

3

Заводаў грук і гучны гоман
Пранёсся з ветрам па палёх.

Залом тут болей не заломан...
Дым фабрык коўдраю разлёг.

Імчыцца раць сталёвых коней,
Капыт-калёс чувацьіх звон.
Араты, не ўзараўшы гоняў,
Глядзіць, вачам не верыць ён.

Жывыя коні рвуць у полі,
Пужліва вушы узнялі,
Нібы спазналі ўсе, што болей
Сталёвых коней на зямлі.

Гудзе гудок. Паўзуць машыны
У шыр і даль палёў, балот.
І людзі ў новую краіну
Сягоння робяць пералёт.

4

Змрокам ціхім спеў салаўіны...
Гай шапоча кустам альховым...
Ён прыехаў — рыцар машыны —
Кахацца з дзяўчынай вясковай.

Пасля кросен з беленькім тварам...
Спадабае хлопец рабочы...
Сэрца спуджана лічыць удары,
Паўнюткі агню яе вочы.

Прыхіліўшыся к грудзям, кажа
Ён дзяўчыне слодычы словы,
Доўгіх косаў злотная пража
Спавіла іх разам галовы.

Зазвінела даль адгалосам,
Спевам гучным аб новым шчасці.
Срэбны конь па небу пранёсся,
На зямлю ён хоча ўпасці...

Напісаў М. Чарот за апошнія два-тры гады даволі многа. Выдадзены зборнік яго вершаў, рэвалюцыйная паэма «Босыя на вогнішчы», музыкальная п'еса «На Купалле», некалькі жартаў, а таксама шчодра рассыпана вершаў па розных беларускіх часопісах.

Вялікую славу прыдбаў паэт паэмай «Босыя на вогнішчы» і п'есай «На Купалле», якая ўжо да сарака разоў ставілася на сцэне Беларускага Дзяржаўнага Тэатра ў Мінску.

М. Чарот карыстаецца вялікай папулярнасцю на Бацькаўшчыне. Народ адразу адчуў і палюбіў свайго паэта. Аб яго творах чытаюцца лекцыі, ладзяцца літаратурныя вечары, закладаюцца школы і гурткі, якія носяць яго імя.

Усё гэта сведчыць аб пышным росквіце беларускай культуры, якая ўрэшце знайшла грунт і адпаведныя, спрыяючыя абставіны для свайго развіцця.

## Пасол Сяргей Баран

Пасол С. Баран быў выбраны па беларускай Гарадзенскай акрузе. У нядаўна адбыўшымся Беластоцкім працэсе абвінавачваўся ва ўдзеле ў паўстанчай арганізацыі, маючай на мэце збройнай сілай аддзяліць ад Польшчы беларускія землі і ўтварыць з іх Беларускую Рэспубліку.

Суд вынес прыгавор, засуджваючы С. Барана на 6 гадоў катаргі. Знакаміты адвакат і волат слова Т. Урублеўскі, які бараніў С. Барана, лічачы прыгавор несправядлівым, падаў усю справу на разгляд апеляцыйнага суда. Чым справа кончыцца — цяжка ўгадаць, бо ніхто, напрыклад, не думаў, што С. Баран будзе засуджаны па Беластоцкім працэсе, кожны з беларусаў бачыў у ім змагара на культурна-прасветнай ніве, і ўсім вядома, што ён да ніякай вайсковай арганізацыі не належаў.

Цяпер С. Баран сядзіць у Беластоцкім астрозе, арыштаваны паліцыяй, хоць яго як пасла Сойм

яшчэ не выдаў. У абарону свайго сябра выступіў са спешнай прапазіцыяй Беларускі Пасольскі Клуб, у якой адзначае пагвалчэнне канстытуцыі зробленым арыштам пасла Барана. Сойм прызнаў спешнасць прапазіцыі і адаслаў на разгляд камісіі.

У асобе С. Барана беларускія выбаршчыкі згубілі свайго шчырага абаронцу і дарадчыка, разумеючага патрэбы працоўнага сялянства, з якога і сам С. Баран выйшаў. Нарадзіўся С. Баран у сялянскай сям'і ў 1894 г. у Горніцкай воласці Гарадзенскага павета. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Па прафесіі вучыцель. Гарадзеншчына добра яго знае па выдатнай працы на беларускай ніве — там ён, бадай, першы кінуў кліч да адраджэння Бацькаўшчыны. Як старшыня Беларускага Камітэта ў Гародні працаваў шмат дзеля развіцця беларускай школьнай справы і каапірацыі, за што зносіў праследаванні з боку ўлады і не раз быў арыштаваны. Пасля закрыцця Камітэта, а разам з ім і закрыцця беларускіх кааператываў і школ, С. Баран пачаў працаваць у Камітэце Помачы пацярпеўшым ад вайны, дзе быў абраны старшынёй.

Як энергічны і выдатны дзеяч С. Баран вядомы не толькі на Бацькаўшчыне. Амерыканская газета ў Чыкага «Свободная Россия» так піша аб С. Барану: «С. Баран выявіў сябе як таленавіты арганізатар, чалавек з жалезнымі нервамі і моцнай воляй. Сярод сялянства і грамадскіх працаўнікоў ён карыстаецца вялікай папулярнасцю».

## «Крэсы» трывожаць

Заборчая палітыка ўсіх польскіх дыпламатаў і дзікая гаспадарка ўсіх папярэдніх урадаў на т. зв. «крэсах» пачынае вызываць адрыжку нават у сучасных паноў палажэння блізнят х'ена-пястоўцаў.

Не хочацца ім пажынаць тое, што пасеялі,— горкія плады, папраўдзе, не плады, а яшчэ толькі красачкі.

Хоць убойлівы быў крэсовы конь, але неяк ехала на ім польскае панства. І вось, мабыць, гэты конь ці знядужаў, ці занараві́ўся, але ездакі прадбачаць, што ён хутка, у паўдарозе да х'ена-пястоўскага раю, стане. Гэта іх не на жарт перапудзіла — «крэсы» іх пачынаюць трывожыць, і, як кажуць, што калі трывога, дык тады да Бога. Так і паны з «Rzeczypospolitej» пачынаюць каяцца — mea culpa.

У № 104 «Rzeczypospolitej» у адным з артыкулаў Ян Радзяёўскі загутарыў небывалым тонам для гэтай эндэцкай газеты.

То ж мы, кажа, зусім забыліся, што Kresy Wschodnie зусім не ёсць аднолітая цэласнасць, што паміж Віленшчынай, Палессем і Валынню вялікая пропасць як па складу нацыянальнаму, так і па варунках эканамічных ды грамадска-палітычных імкненнях.

А што, калі гэтыя «крэсы» ды параўнаць яшчэ з Macierzą! Ха! То ж яны выдаюцца «czemś dalekim i niepewnym».

А мы, прызнаецца пан Радзяёўскі, дагэтуль нічога і не ведалі і так там напракудзілі, што «на шмат гадоў разбудзілі нянавісць мясцовай люднасці сялянскай».

То ж мы, каецца далей гэты панок, насадзілі туды такую адміністрацыю, якая горш за былую царскую. А тым часам яна павінна была рэпрэзентаваць сярод мясцовых нацыянальнасцей заходнюю, польскую, культуру. А якая ж бесталач у праўных адносінах! Хаатычнасць розных «przepisów» і «ustaw» служыць добрым пажыўленнем для закутных брахунцоў. Усё вышэйсказанае і неразважнае асадніцтва, і ненармальнае становішча зямельнага пытання варожа настройвае насельніцтва «крэсаў» да польскай улады.

Адно, што задавальняе пана Радзяёўскага,— гэта школьная справа, якая на «крэсах усходніх» стаіць «przyzwoicie». Але мушу расчараваць пана і ў гэтым, бо ў польскіх школах на вёсках вучаць людзі, якім яшчэ самім трэба шмат вучыцца, каб пасля дзяцей вучыць. Апрача таго, польскіх школ не так і многа, а якія ёсць — дык пустуюць, бо бацькі дзяцей не пасылаюць, каб захаваць іх ад калечання душы чужой

мовай і панскай ідэалогіяй. Школ жа меншасцей бадай зусім няма.

І вось побач з усім гэтым той жа аўтар рашуча заяўляе, што яшчэ не ўсе «крэсы» да Польшчы далучаны, што няма вялікай Польшчы без «крэсаў усходніх». Дык чаго ж тады нападаць на адміністрацыю, якая выконвае праграму польскага імперыялізму, якая ідзе пад клічам паноў Скульскіх: «Беларусаў праз 50 гадоў не будзе!» Нашто закладаць «Towarzstwo opieki nad Kresami» з мэтай пазнаёміць тыя ж «крэсы» з Польшчай і яе пажаданнямі і мэтамі?

Дзякуем, паночкі! Мы ўжо добра ведаем вашыя пажаданні, век будзем памятаць вашую апеку і сытыя па горла вашымі абяцанкамі. Не па дабраце сваёй вы інакш загаварылі, а прыйдзе час, што інакш будзеце змушаны рабіць. Прыйдзе час, калі польскі працоўны люд стане побач з беларускімі рабачаямі ў абарону сваіх агульных інтарэсаў. Толькі яны, працоўныя, наладзяць мірнае сужыццё народаў і агульны дабрабыт. Яны вырашаць проста, па-сямейнаму, без канферэнцый і праліцця крыві ўсе цяперашнія заблытаныя пытанні, вырашаць іх на карысць роду людскога і засудзяць датыхчасовых вінаваўцаў крыўд і нянавісці.

Так, пане Радзяёўскі, бяды вам сваёй не абысці і не аб'ехаць.

## Заклік да аб'яднання работнікаў гарадоў і вёсак

Фашызм у Польшчы знайшоў для сябе добры грунт і, учарэпіўшыся прагавітымі карэннямі ў цела маладой рэспублікі, наважваецца заглушыць сваім ценем кожную праяву жыцця, непажаданую яму. Фашызм у Польшчы ў гэты час дужа разбрак ад шавінізму і клерыкалізму. І тады, як мадзьярскі, італьянскі і балгарскі фашызм дабіўся ўлады аружнай сілай, то тут, у Польшчы, ён дарогай парламентарнай змог запанаваць краем. Гэта доказ яго моцы.

Дабраўшыся да ўлады, фашысты пастараюцца выкарыстаць усе магчымасці, каб задаволіць свае

класавыя інтарэсы. Ужо ў Сойме пасыпаліся розныя рэакцыйныя законапраекты — фашысты разгортваюць сваю праграму. І калі яны не сустрэнуць арганізаванага адпору з боку пралетарскіх мас, дык рэакцыя запануе як ніколі.

Ужо цяпер беларускаму селяніну жывецца так цяжка, як, бадай, ніколі так не жылося. Непамерны рост дарагоўлі і падаткі кідаюць сялянства ў страшэнную нэндзу. Гэтая эканамічная разруха найбольш адчуваецца сялянствам. Рост цэн на фабрычныя тавары заўсёды ідзе наперадзе і ў шмат вышэйшых памерах у параўнанні з ростам цэн на збожжа і іншыя прадукты, за якія малазямельны селянін можа купіць патрэбныя яму тавары. Пры гэтым аплата працы фабрычным работнікам значна больш дапасавана да дарагоўлі ў параўнанні з работнікамі-земляробамі. Аднак гарадскія работнікі як больш арганізаваныя і больш свядомыя ўжо выступілі на барацьбу супраць польскіх фашыстаў, выступілі ў абарону сваіх інтарэсаў. У Лодзі, Чэнстахове і іншых прамысловых пунктах рабочыя шляхам забастовак дабіліся паляпшэння свайго быту. Вядома, заспакоіліся яны ненадоўга, бо дарагоўля расце днямі і лік беспрацоўных павялічваецца, бо некаторыя прадпрыемствы таксама не вытрымліваюць дарагоўлю і банкрутуюць. Трэба чакаць новай хвалі забастовак, новых выступленняў працоўных мас за свае правы.

Малазямельныя і беззямельныя работнікі павінны таксама дамагацца сваіх правоў, не чакаючы, што нехта дапаможа. Панскі ўрад і х'ена-пястоўская большасць у Сойме пастараюцца абысці вас дзеля сваёй карысці. Сваім зямельным пактам гэтая большасць ужо б'е вас па самым балючым месцы — зямельным пытанні, а калі вы будзеце маўчаць, дык апетыты гэтых паноў яшчэ больш узрастуць.

Не адкладаючы надалей і не спадзеючыся на нікога, малазямельныя і беззямельныя сяляне павінны дружна выступіць разам з рабочымі гарадоў за паляпшэнне свайго быту, за свае жыццёвыя, як зямля і хлеб, патрэбы. Трэба памятаць адно, што ні рабочыя без

сялян, ні сяляне без рабочых не даб'юцца сваіх правоў. Толькі супольнымі сіламі, толькі аб'яднаўшыся ў вялікую сусветную грамаду працоўных, дружным выступленнем можна асіліць ворага.

Цяпер аб'яднанне работнікаў гарадоў і вёсак патрэбна, можа, як ніколі, бо фашызм арганізавана, адкрыта і рашуча, бадай, ніколі так не выступаў супраць працоўных, бо працоўныя гарадоў і вёсак ніколі не перажывалі такога эканамічнага заняпаду.

## Паны-пілсудчыкі і справа беларускай асветы

> Хоть ты и в новой коже,
> Но сердце у тебя всё то же...
>
> *І. Крылоў*

Захапіўшы чужыя землі, на якіх існуюць толькі польскія маёнткі ды дзе-нідзе спольшчаныя каталіцкія беларускія вёскі, панская Польшча павяла на іх палітыку самай суровай паланізацыі. У кожнай галіне жыцця на «ўсходніх крэсах», г. зн. у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, моцна адчуваецца гэтая спецыфічная панска-польская тэндэнцыя навязаць пальшчызну ўсюды і ва ўсім.

Асабліва гэта кідаецца ў вочы, калі мы зірнём у галіну асветы.

Цяпер у Польшчы на абшарах усёй Заходняй Беларусі маецца 24 беларускія і 42 беларуска-польскія пачатковыя школы. Школы гэтыя толькі па назве беларускія ці беларуска-польскія. Выкладчыкамі ў іх з'яўляюцца палякі, і не мясцовыя, а адкуль-небудзь з Галіцыі ці Познані, якія зусім не ведаюць беларускай мовы.

Так прадставіў становішча беларускай школы ў Польшчы не хто іншы, як вядомы нам Янка Станкевіч, выступіўшы з прамовай па школьным пытанні ў Сойме. Яго мы не можам абвінаваціць ва ўмысным непрыхільным да польскай дзяржаўнасці падыходзе

да справы. Усім вядома, што Я. Станкевіч здружыўся і ўвайшоў у цесны кантакт з пілсудчыкамі і санацыйнымі польскімі элементамі, якія прыкідваюцца нібыта прыяцелямі беларусаў і быццам гатовы нават задаволіць некаторыя балючыя патрэбы шырокіх беларускіх народных мас.

Нам вядомы ўсе гэтыя прыгожыя і ў той самы час зусім нерэальныя ў польскім жыцці пункты канстытуцыі, якія гавораць аб поўным раўнапраўі ўсіх нацменшасцей Польшчы. Мы ведаем і прыгожыя абяцанкі ў розных адозвах і дэкларацыях польскіх урадаў, а найбольш самога маршала Пілсудскага, які на справе не выканаў у адносінах да беларусаў яшчэ ніводнай з сваіх абяцанак. Факты нам даказваюць, што ўсялякія панскія абяцанкі з'яўляюцца толькі сродкам разбіць беларускую грамадскую думку на паасобныя групы, якія ва ўзаемнай барацьбе аслабляюць адзіны беларускі фронт. Нялёгка панам разбіваць гэты фронт, бо ён, урэшце, усё ж такі застаецца аднalітым. Аднак часовы поспех і яны, бывае, маюць. Розныя ласыя на панскія грошы авантурнікі з беларускага боку ўжо не раз наладжвалі хаўрус з панамі-пілсудчыкамі і завяралі беларускае грамадзянства ў прыхільнасці да яго паноў-пілсудчыкаў. Цяпер, пасля шматразовых няўдач, апошнюю, відаць, спробу ўзяў на сябе пасол Сойма Я. Станкевіч. Ён знаходзіцца ў цесным кантакце з «беспартыйным блокам супрацоўніцтва з урадам Пілсудскага».

І вось мы бачым, што як бы ў адказ на выступленне Я. Станкевіча ў Сойме па школьным беларускім пытанні польскія паслы і сенатары з «беспартыйнага блоку» ад Віленшчыны і Наваградчыны, арганізаваныя, між іншым, у «Віленска-Наваградскае кола» «беспартыйнага блока», сабраліся 4 ліпеня гэтага года ў Вільні і пасля дыскусіі па дакладах сенатара В. Абрамовіча і пасла К. Акуліча прынялі наступныя пастановы:

З мэтаю ўрэгулявання спраў беларускага школьніцтва «калі лічыць патрэбным і неабходным» вось што:

1) Удзяржаўленне беларускага школьніцтва ў межах аб'ектыўна абаснаваных сцверджанымі патрэбамі беларускай люднасці.

2) Змена закона ад 31 ліпеня 1924 г., уключаючы некаторыя пастановы аб арганізацыі школьніцтва, у кірунку ўмажлівення выконвання першага яго пункта (аб так званых дэкларацыях, якія бацькі беларускіх дзяцей павінны выдаваць былі інспектару школ), а таксама спынення на грунце школьніцтва нацыяналістычнай барацьбы, дзеля чаго трэба спыніць, між іншым, школьныя плебісцыты і утраквістычную сістэму (выкладанне на дзвюх мовах).

3) Утварэнне ў пачатку наступнага школьнага года дзяржаўнай беларускай семінарыі для настаўнікаў у Вільні.

4) Да часу ўдзяржаўлення прыватных беларускіх гімназій у Вільні і Наваградку трэба даць ім і інтэрнатам пры іх фінансавую дапамогу ў той ці іншай форме.

5) Ад пачатку надыходзячага школьнага года даць гэтым гімназіям дзяржаўныя правы.

6) У выпадку, калі беларускія гімназіі ў Вільні і Наваградку будуць прыняты на дзяржаўнае ўтрыманне, прыватныя беларускія гімназіі ў Радашковічах і Клецку павінны быць перароблены на дзяржаўныя сямікласныя пачатковыя школы або школы прафесійныя.

7) Утварэнне пры Віленскім універсітэце кафедры або лектараў беларусазнаўства.

8) Утварэнне пры Віленскім школьным куратарыуме аддзела беларускага школьніцтва, а таксама камісіі для апрацоўкі і выдання падручнікаў для беларускіх школ з удзелам прадстаўнікоў беларускага асветніцкага руху.

9) Выдзяленне матэрыяльнай дапамогі беларускаму музею ў Вільні.

10) Увядзенне ў паўночна-ўсходніх ваяводствах школьнага самакіравання на ўзор школьнага самаўраду ў цэнтральных ваяводствах.

Вось пастановы паслоў і сенатараў «беспартыйнага блока», невядома для каго пісаныя і невядома каго і да чаго абавязваючыя. Ад моманту напісання

гэтых пастаноў «Віленска-Наваградскім колам» «беспартыйнага блока» да правядзення іх у жыццё можа прайсці не адзін дзесятак гадоў, хоць паны-пілсудчыкі і «хацелі б», каб усе іх пастановы былі праведзены ў жыццё ўжо гэтай восенню. Яны, аднак, самі добра ведаюць, што свядома падманваюць масы, бо ўсе падобныя пастановы могуць быць праведзены ў жыццё толькі шляхам соймавага заканадаўства. Сойм жа збярэцца не раней як восенню, і яму тады будзе не да пастановы «Віленска-Наваградскага кола».

Такім чынам, зусім ясна, што словы іх пастаноў былі сказаны на вецер, так сабе, каб перацягнуць на свой бок даверлівыя масы нашых заходніх братоў.

У гэтай хлуслівай і ганебнай палітыцы паноўпілсудчыкаў дапамагае ім і п. Янка Станкевіч, замяніўшы сваёй фігурай ужо здадзеных у архіў паноў Паўлюкевічаў, Умястоўскіх, Вернікоўскіх і інш.

З другога боку, трэба дзівіцца «велікадушшу» паноў-пілсудчыкаў.

Падумаць толькі, што яны даюць беларускаму народу! І дзяржаўленне існуючых беларускіх гімназій, і кафедру беларусазнаўства, і грашовыя дапамогі, і правы на пачатковую беларускую школу. Падумаеш, якая гэта надзвычайная панская ласка для беларускага народа, які ў Заходняй Беларусі складае аграмадную большасць і які павінен быў бы дыктаваць панам, як і што ім патрэбна! На ўзор таго, як гэта робіцца ў нас, дзе няма нацыянальнага і культурнаасветнага прыгнёту, бо няма і паноў.

Мы знарок спыніліся на пастановах «Віленска-Наваградскага кола» «беспартыйнага блока» пілсудчыкаў, каб яшчэ раз на прыкладзе паказаць, як стаіць у Польшчы беларуская культурна-асветная справа, як яна фальшыва там усплыве часам на паверхню, але не дзеля таго, каб яе хоць часткова вырашыць, а проста каб яшчэ раз падмануць беларускія масы. А сярод беларусаў усё-такі знаходзяцца людзі, якія пападаюцца на закінуты кручок.

# Лісты



# Леапольд Родзевіч — Уладзіміру Жылку

25.XI.1922 г.

Паважаны Дружа!

Чытаў, перачытваў, не верыў і не разумеў. Панасіў колькі дзён, перадумаў і згадзіўся з Самім. Добра. Я ўсё зраблю, каб Сам мог вярнуцца, але мая рада не рыпацца з чыста практычных развag. Сіла ў тым, што тут голадна і сцюдзёна. Блага. А тым часам, можа, і работа разгорнецца. Праўда, і цяпер пісаніны і друкавання ёсць, мабыць, як ніколі ў Вільні не было, і Самога супрацоўніцтва-кіраўніцтва пажадана і патрэбна.

Але ўсё-ткі не варта. Ну, хоць з месяцаў 2—3 пачакаць, каб улегліся паслявыбарныя рэпрэсіі. [...]

«Гвалту, гвалту...» надрукую з часам.

Ох, як мне хочацца затачыцца ў нейкую дзірку і ўздыхнуць свабодна, пабыць сам з сабой і палетуцець! Страшэнна паважаю адзіноцтва.

Часу няма,
Бывай здароў.
Зіма-зіма —
Ні гу-гу дроў.

Але, я ж перакладаю «Иванов Павел», во да чаго дажыўся. Цьфу! Прышлі «Крымскія санеты» і «Дэман» — экспрэсам.

За ўсё плачу.

Той самы *Л. Р.*

P. S. Перайшоў на другую кватэру і нічога не напісаў, і ўся карэспандэнцыя вяртаецца. Так людзі пры сваім розуме не робяць. Закахаўся?..

25.XII.1922 г.

Добры Дружа!

Стрывай, браце! Глядзіце, каб я толькі ў вас не апынуўся. Ад імя многіх я зацікаўлены прысутнасцю ў Вільні Самога, а ўсё-ткі паўтараю — стрывай! Застрэліўся Калаур, шмат яго папер папала не туды, куды трэба, быў арыштаваны Дыліс... І цяпер яшчэ адзін сядзіць. Ваша прозвішча ізноў усплыло. Прызываўся ў Вільні яшчэ адзін 1901 год! Спагадаю Вам, што чужына цяжка пераносіцца. Але раз так выпала — стрывай! Гарт душы. І нам тут несамавіта. Хутка будзеце аб усім праінфармаваны.

А што мала пішу — дык мала часу маю. У мяне дзверы не зачыняюцца ад народа. Выбары разварушылі вёску. Няма арганізацыйнага асяродку. Паслы адарваны ад народа. І сялянства сярод поля апынулася. Нервуецца, узровень павышаецца і — прарвецца. А куды??? Па-старому адзін вяду «Будучыну». Каб мець магчымасць працаваць, сяджу начамі да 3—5 гадзін. Не ўмею гуртаваць людзей. Ды яно зусім натуральна: кволы арганізм, адзічэлы дух, цяга да ціхай задумы...

Канфіскавалі № 2 «Будучыны», маю вялікі клопат, вядома як чалавек, які ўзяўся не за сваю справу, але трагізм — мушу. За рэцэнзію «Б»[1] дзякуй — кавырнулі глыбока. Ад Вашых яркіх, іскрыстых думак я прышчурыўся, і мне прыкра стаяць у іх святле, бо не заслужыў. Канчэўскі таксама напісаў рэцэнзію. [...]

Ну што ж, шмат ёсць аб чым чыркануць, але... самі разумееце, чаму маўчу. [...]

Вы ўсё-ткі надта не раскісайце, а бей, барабан, бой!

Вось не разумею аднаго — чаму Вам у Прагу не паехаць?

Ваш апошні верш пойдзе ў гэтым нумары, з папярэднім устрымліваюся, бо, як мне здаецца, дык

---

[1] Маецца на ўвазе рэцэнзія У. Жылкі на зборнік вершаў «Беларусь» Л. Родзевіча (Вільня, 1922).

дужа ўжо мова штучная, робленая, але буду яго яшчэ чытаць.

Дык жа кланяйцеся ўсім змагальнікам, а Вам цісну моцненька руку.

*Л.*

3.III.1923 г.

Паважаны Таварыш!

Пішу коратка, бо часу не маю, а адказаць хачу.

Усё, аб чым просіш, будзе споўнена, толькі цярплівасці. Аб грашах змоўкні. Паэму хуценька адшліфуй — і ў «Новае жыццё». Адаб'ю асобнай кніжкай.

У мяне з газетай вялікі скандал і перапалох; трывога таксама прысутнічае, але з боку акупантаў. [...]

Пішы часцей.

Як зрабіць з тваім артыкулам аб маёй «Беларусі»? Хацеў бы яе пусціць, разумеецца, не дзеля таго, што аба мне гаворыцца. «Савецкая Беларусь» жарнула таксама рэцэнзію, даволі храбра лашчуць, як на буржуазнага паэта.

Навін малавата.

Пакуль усяго, паклон усім. Трымайцеся.

Ваш *Л. Родзевіч.*

14.IV.1923 г.

Здароў, Дружа!

На маўчанне абое мы хварэем — не адзін я, а пры тым надакучыла пісаць наогул, ды і няма чым падзяліцца... Праследуюць — інквізіцыя. Друкарню зачынілі, карэспандэнцыя пералюстроўваецца самым бессаромным чынам, па пятах ходзяць, канфіскоўваюць, а сярод нас вясна выбірае ахвяры: Канчэўскі сягоння-заўтра згасне, я чуць ківаюся — блага. Колькі ж, урэшце, нашаму адраджэнню трэба яшчэ ахвяр?!

Літаратура, мастацтва, кажаш... А я скажу, што ўсё гэта шкоднае глупства, атрута сутнасці жыцця. Ці ў нас ёсць нешта самабытнае, здаровае, згучнае з прыродай?.. Усё забіта, апаганена літаратурай. Расліна пры штучным святле замірае, дык згінем і мы, мудрагелі, ад дэмакратызацыі веды, ад гэтай вашай літаратуры і мастацтва. А паспрабуйце вы адняць гэтыя праклятыя рэчы — і яшчэ страшней стане, бо пачуеш на сабе моц спадчыны тысячных пакаленняў, бяспомачнасць, бязмэтнасць, зразумееш бяззубую злосць, бурныя пратэст. Але на ўсе гэтыя бунты і вышчэрванне смерці, як сарочка вар'ята, супакойвае, жудасна так супакойвае думка аб вечнасці і бязмежнасці — драбнееш, гінеш.

Бывайце. *Л. Р.*

IV.1923 г.

Дарагі Дружа!

Моцны, браце, маеш дух, калі жартуеш у час, як кроў з горла ідзе. Добры ты хлопец — маю да цябе асабістую цягу-пашаноту. Але ўсё-ткі, літаратурны конь, чапляйся за жыццё: творчасць тады патрэбная, магчымая, прыгожая і карысная, калі яна родзіцца ад здаровага бацькі (ён) і музыкальнай, у разуменні Блока, маці (яго душы). А нашы душы скрыпучыя, набалеўшыя — надлом пачуцця. Яны могуць быць цацкамі-ўцехамі бяскроўных, выпешчаных касметыкай ручак нейкай какаіністыкі ці якой іншай недарэчнасці, але не мазольных, пружыністых, з водарам ніў рук сінявокай напаўдзікай беларускай нацыі. Рэзка і глыбока адчуваю кантраст усяго таго, што мы творым, з істасцю духа нашага сялянства.

Прадвяшчаю новае ў нашай літаратуры, інтуітыўна адчуваю.

Вось перабілі мне пісаніну розныя крукі з бліскучымі гузікамі — стэрарызавалі яны мяне. [...]

А добра было б, сапраўды, закахацца! За рэцэпт дзякую, часамі памагае. [...]

Ну, а паэму чаму не прысылаеце?

Уздыхні, браце, глыбока, тужліва — Канчэўскі памёр. Вялікая страта. Не апішаш, не аплачаш. А тым часам навокал мілая патульная вясна. Мне пагражае высяленне...

Не забывайцеся.

Няма атмасферы, дзе можна было б крышталізавацца, узлятаць, палаць, ну і ўсё такое.

Ваш *Лявон.*

8.V.1923 г.

Дык вось жа, браце, папраў, што знойдзеш патрэбным, і, можа, надрукуюць асобнай кніжыцай. № 10 сканфіскаваны — прышлю. Пасылаю пробкі паперы і вокладкі — смакуй.

Пішыце, і як здароўе? Трудна нам працаваць.

Бывай.

Ці атрымаў «Савецкую Беларусь»? Дык болей прышлю, калі атрымаў.

*Л. Родзевіч.*

9.VI.1923 г.

Даражэнькі!

Выдалі, называецца! Столькі часу, грошай, старанняў, лаянак са Знамяроўскім, і паперу даў такую, як у «Строме», калі не лепшую, і раптам: трах — канфіскавалі!

Пракляцце!

Што яны вырабляюць, дык гэта трудна сабе ўразумець. Каб чалавек чалавеку мог так шкодзіць злосна?! Хай жа на людзей сыдзе існасць Сусвету, уяўленне брацкага, любоўнага сужыцця!

Жадаю Лукішак як збаўлення, так замучаны акружаючай няпраўдай, духоўнай барацьбой, устрымліваннем узрыву пачуццяў, азлабленнем.

Супакою!

Хоць смерць, абы ўсцішыцца, дух перавесці, уздыхнуць...

Ідуць подлыя гіенскія канфіскаты, безупынныя, беспардонныя...

Пасылаю верш[1] з канфіскаванага нумару, якога выйшла ўсяго тры экземпляры.

Паклон ад усіх усім.

Пішы, браце, як жыў-здароў. Тваe рукапісы, верш і аб «Беларусі» перадаў у «Моладзь Беларусі», але думаю, што тамака змарнуюцца, бо матэрыяламі кіруе Леўчык — мусіць, адбяру і Табе прышлю.

Бывай.

*Л. Родзевіч.*

Т-шу Ул. Жылку

Колькі разоў пісаў, а ты маўчыш. Пішы па такому адрасу: Масква, Петравярыгскі, № 10, Белсектар, мне. Напішаш — шмат цікавага табе разбаю.

Жыву сягонняшнім днём. Смакую і паважаю марксізм. Паглядай, браце, і ты ў гэты бок. Ці шмат творыш? Як здароўе?

Я нічога і нікому: надакучыла, ды і часу няма. А пакуль бывай здароў, даражэнькі. На Каляды збіраюся ў Мінск дахаты.

*Л. Родзевіч.*

6.III.1925 г.

Дарагі Дружа!

Пішу табе з Вільні, аб чым, пэўна, ужо ведаеш ад Міколы А. Дачуўся я тут, што Тваё здароўе несамавітае, што маеш намер перабрацца на Бацькаўшчыну. Згодзен, што гэта прынясе аздараўленне душы і целу. Дык вось жа, браце, рабі ўсю гэту музыку праз Прагу — накручвай Міколу, а як што ўдасца зрабіць, дык напішы сюды да мяне — памагу, чым змагу.

[1] Верш, які ўпамінае Л. Родзевіч, пад назвай «Наш светагляд» быў змешчаны ў газеце «Наша жыццё» ад 30 мая 1923 г. і прысвячаўся падпольшчыцы В. Маслоўскай.

У нас справы не найгорш, але шкада, што не ўсё.

Задумаў напісаць вялізную рэч, вельмі сур'ёзна і з захапленнем да яе адношуся, грунтоўна абмазгоўваю яе ідэалагічную падставу. Бяда толькі, што пры маіх варунках нічартусенькі не зробіш, а ў варунках гэтых, мабыць, загібею.

Пакуль будзь здароў. З Дубоўкам аб табе часта былі гутаркі. Мілы ён хлопец.

*Л. Р.*

# Каментарыі

У гэтым выданні прадстаўлена па магчымасці амаль усё лепшае з пісьменніцкай спадчыны Леапольда Родзевіча.

Правапіс і пунктуацыя прыведзены ў адпаведнасць з існуючымі нормамі. Творы ў раздзелах размешчаны ў храналагічным парадку. Звесткі аб часе напісання твора, крыніцы яго першай публікацыі, а таксама аб месцы і часе першай пастаноўкі (для п'ес) у тых выпадках, калі яны адсутнічаюць, апушчаны.

## ДРАМАТУРГІЯ

*Блуднікі (с. 40)*

Друкуецца па кн.: «Беларуская дакастрычніцкая драматургія». Мінск, 1978. Упершыню — у зб.: «Беларускае мастацтва». Мінск, 1960. Датуецца 1912 г.

*Марцовы снег (с. 73)*

Друкуецца па кн.: «Беларуская дакастрычніцкая драматургія». Мінск, 1978. Упершыню — у газ. «Наша ніва», 1914, № 11—12 пад крыпт. Л. Р. Датуецца 1914 г.

*Пакрыўджаныя (с. 75)*

Друкуецца па кн.: «Беларуская дакастрычніцкая драматургія». Мінск, 1978. Упершыню надрукавана асобным выданнем: Леапольд Родзевіч. «Пакрыўджаныя». Мінск, 1921. Датуецца 1916 г.

*Драбніца жыцця (с. 112)*

Друкуецца па газ. «Беларусь», 1920, 18 чэрв., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца 1916 г.

*Збянтэжаны Саўка (с. 115)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Сцэнічныя творы». Вільня: выдавецтва Ул. Знамяроўскага, 1921, дзе ўпершыню апублікавана. П'еса ставілася БДТ-1 (1922), шматлікімі

прафесійнымі і аматарскімі калектывамі па ўсёй Беларусі і за яе межамі (Латвія, Польшча). Датуецца 1918 г.

*Пасланец (с. 124)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Сцэнічныя творы». Вільня: выдавецтва Ул. Знамяроўскага, 1921. Упершыню — у газ. «Беларусь», 1920, 16 сак. П'еса была пастаўлена БДТ-1 (1922), самадзейнымі беларускімі тэатральнымі калектывамі ў Латвіі (20-я гг.). Датуецца 1918 г.

*Конскі партрэт (с. 131)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Сцэнічныя творы». Вільня: выдавецтва Ул. Знамяроўскага, 1921, дзе ўпершыню апублікавана. П'еса ставілася БДТ-1 (1920—1923), Віцебскім абласным драматычным тэатрам імя Я. Коласа (другая палова 1970-х гг.). Датуецца 1920 г.

*У кавалёвай хаце (с. 141)*

Друкуецца па кн.: «Беларускі тэатр». П'есы. Сш. № I. Вільня: выдавецтва Ул. Знамяроўскага, 1920, дзе ўпершыню апублікавана. Пастаўлена калектывам У. Галубка (1923). Датуецца 1920 г.

*Стараста (с. 151)*

Друкуецца па кн.: «Беларускі тэатр». П'есы. Сш. № I. Вільня: выдавецтва Ул. Знамяроўскага, 1920, дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца 1920 г.

*Блуднікі (с. 154)*

Друкуецца па газ. «Беларусь», 1920, 11 сак., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца 1920 г.

*На шляху да сонца (с. 159)*

Друкуецца па газ. «Беларусь», 1920, 17, 18 чэрв., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*Сказ аб гуслях (с. 168)*

Друкуецца па газ. «Беларусь», 1920, 20 чэрв., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*Досвіткі (с. 174)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 23, 28 верас., дзе ўпершыню апублікавана пад псеўд. Лявон Жыцень. Датуецца годам апублікавання.

*На Каляды (с. 186)*

Друкуецца па газ. «Наша будучына», 1922, 25 снеж., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*П. С. Х. (с. 196)*

Упершыню надрукавана асобным выданнем: Сучасны. «П. С. Х.». Фацэція на 1-ну дзею. Вільня: выданне Беларускага грамадзянскага сабрання, 1923, адкуль і перадрукоўваецца. Гэтая п'еса Л. Родзевіча на конкурсе, аб'яўленым Беларускім грамадзянскім сабраннем у Вільні, заняла адно з першых месцаў і была рэкамендавана да выдання, што і здзейснілася. Маючую адбыцца пастаноўку п'есы забаранілі польскія ўлады. Датуецца годам апублікавання.

*Кавалі (с. 210)*

Друкуецца па кн.: «Заходняя Беларусь»: Зборнік грамадскае мыслі, навукі, літаратуры, мастацтва Заходняй Беларусі. Кн. I. Вільня: выданне Беларускага выдавецкага таварыства, 1924, дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

## ПРОЗА

*На рацэ зімой (с. 214)*

Друкуецца па газ. «Беларусь», 1920, 6, 8 чэрв., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*Разбітая ваза (с. 224)*

Друкуецца па газ. «Беларусь», 1920, 8, 9 чэрв., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*Беларуская казка («Я быў яшчэ падшпаркам...») (с. 228)*

Друкуецца па газ. «Беларусь», 1920, 23 чэрв., дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*Змярканне (с. 231)*

Друкуецца па часоп. «Рунь», 1920, № 9—10, дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*Заклік (с. 235)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 28 верас., дзе ўпершыню апублікавана пад крыпт. Л. Р. Датуецца годам апублікавання.

*Як Лявон Недарада дарадзіў сваёй бядзе (с. 237)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, № 18, дзе ўпершыню апублікавана пад псеўд. Лявон Жыцень. Датуецца годам апублікавання.

*Беларуская казка («Жыла сабе бедная ўдава...») (с. 244)*

Друкуецца па газ. «Наша будучына», 1923, 1 лют., дзе ўпершыню апублікавана пад псеўд. Р. Юргілевіч. Датуецца годам апублікавання.

*Марксісцкі аршын (с. 250)*

Друкуецца па часоп. «Полымя», 1924, № 1, дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*Пакой № 184 (с. 256)*

Друкуецца па кн.: «Змаганне»: часопіс Цэнтральнага бюро беларускіх студэнцкіх зямляцтваў у Маскве. Сш. № І. Мінск: выданне Белтрэстдруку, 1924, дзе ўпершыню апублікавана. Датуецца годам апублікавання.

*«Цюхцялей» (с. 263)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Рэвалюцыйным шляхам», Мінск: Дзяржвыд, 1928. Упершыню — у газ. «Чырвоны сейбіт», 1927, № 8—9 пад псеўд. А. Замежны. Датуецца 1927 г.

## ПАЭЗІЯ

*Салдацкая песня (с. 266)*

Друкуецца па кн.: Анталогія беларускай паэзіі: У 3-х т. Мінск: Маст. літ., 1993. Т. І. Упершыню — у газ. «Наша ніва», 1914, 5 снеж. пад крыпт. Л. Р. Датуецца 1914 г.

*Працуй, Беларусь... (с. 266)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922. Датуецца 1917 г.

*Мінуўшчына (с. 267)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца 1917 г.

*«Калісь на сонца я глядзеў...» (с. 270)*

Друкуецца па газ. «Наша будучына», 1919, 25 снеж., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Р. Юргілевіч. Датуецца годам апублікавання.

*«У гразь утоптана ляжыш...» (с. 270)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Няўжо я шчасце калі сустракаў...» (с. 271)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Эх, няхайная старонка...» (с. 271)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Мукі — церні, яд...» (с. 271)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Ідзе ў цьме...» (с. 272)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Беларусь мая мужыцкая...» (с. 274)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Не тужыце, беларусы,— сон то моц...» (с. 274)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Рассвяткуйся, неба, выбухні зарніцай...» (с. 275)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*Адраджэнне (с. 275)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Ты расцеш, як дзень світаннем...» (с. 276)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*Белая музыка (с. 276)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «Беларусь». Вільня, 1922, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Хто душой і шчырым сэрцам...» (с. 277)*

Друкуецца па кн.: «Сцягі і паходні». Мінск: Беларусь, 1966. Упершыню — у газ. «Беларускі звон», 1922, 17 лют. Датуецца 1922 г.

*Куплеты па часе (Астрожнік) (с. 278)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 17 лют., дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*Снег (с. 279)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 18 сак., дзе ўпершыню апублікаваны пад крыпт. Л. Р. Датуецца годам апублікавання.

*«Лявоніха» (с. 279)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 12 крас., дзе ўпершыню апублікаваны пад крыпт. Л. Р. Датуецца годам апублікавання.

*Да маладых (с. 279)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 13 мая, дзе ўпершыню апублікаваны пад крыпт. Л. Р. Датуецца годам апублікавання.

*Роспач (с. 280)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 4 ліп., дзе ўпершыню апублікаваны пад крыпт. Л. Р.. Датуецца годам апублікавання.

*Вы і Мы (с. 282)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 21 ліп., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Сучасны. Датуецца годам апублікавання.

*Паліцыянт у клопаце (с. 282)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 13 кастр., дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*Куплеты па часе («Каб не латалі мы латы...») (с. 283)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 14 кастр., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Сучасны. Датуецца годам апублікавання.

*Розумам дайшоў (с. 284)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 1 лістап., дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*«Год стары знямог...» (с. 285)*

Друкуецца па газ. «Наша будучына», 1922, 25 снеж., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Сучасны. Датуецца годам апублікавання.

*«Здратавана рунь. Плач галодных дзетак...» (с. 285)*

Друкуецца па газ. «Наша будучына», 1923, 13 студз., дзе ўпершыню апублікаваны пад крыпт. Л. Р. Датуецца годам апублікавання.

*«Схамяніцеся, годзе гібець нам рабамі...» (с. 286)*

Друкуецца па газ. «Наш сцяг», 1923, 10 жн., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Сучасны. Датуецца годам апублікавання.

*«Згінуў час, калі адвеку мы ўсе спалі...» (с. 286)*

Друкуецца па кн.: «Заходняя Беларусь»: Зборнік грамадскае мыслі, навукі, літаратуры, мастацтва Заходняй Беларусі. Кн. I. Вільня: выданне Беларускага выдавецкага таварыства, 1924. Датуецца годам апублікавання.

*Песня паўстанца (с. 287)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Упершыню — у газ. «Чырвоны сцяг», 1924, № 2. Датуецца годам апублікавання.

*Імкненне (с. 288)*

Друкуецца па кн.: «Змаганне». Часопіс Цэнтральнага бюро беларускіх студэнцкіх зямляцтваў у Маскве. Сш. першы.

Мінск: выданне Белтрэстдруку, 1924. Датуецца годам апублікавання.

*Вайна вайне (песня інваліда) (с. 290)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Упершыню — у газ. «Чырвоны сцяг», 1926, № 7. Датуецца годам апублікавання.

*У дэфензіве (с. 291)*

Перадрукоўваецца з часоп. «Чырвоны сейбіт», 1927, № 6—7. Упершыню — у газ. «Савецкая Беларусь», 1927, 26 студз. пад псеўд. Ан. Замежны.

*Тут і там (с. 291)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Датуецца годам апублікавання.

*Прабуджэнне (с. 292)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Датуецца годам апублікавання.

*Марш ратаёў (с. 292)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Датуецца годам апублікавання.

*Вынеслі раз пастанову (с. 293)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Датуецца годам апублікавання.

*«Кахаю Беларусь сучасную, не выснену...» (с. 294)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Датуецца годам апублікавання.

*Бура ноччу (с. 294)*

Друкуецца па кн.: Родзевіч Л. «На паняволеных гонях». Вільня: выданне ЦК КПЗБ, 1928. Датуецца годам апублікавання.

*Наша радасць (с. 295)*

Друкуецца па газ. «Літ. і мастацтва», 1933, 1 мая, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*О мудрасць! (с. 295)*

Друкуецца па кн.: «Сцягі і паходні». Мінск: Беларусь, 1965.

*«Грамада валіла валам...» (с. 296)*

Друкуецца па кн.: «Сцягі і паходні». Мінск: Беларусь, 1965.

*Покліч (с. 297)*

Друкуецца па кн.: «Сцягі і паходні». Мінск: Беларусь, 1965.

*Буслы (с. 297)*

Друкуецца па кн.: «Сцягі і паходні». Мінск: Беларусь, 1965.

*Мініяцюры (с. 298)*

Друкуецца па кн.: «Сцягі і паходні». Мінск: Беларусь, 1965.

*«Цяпер іх сіла — наша кроў...» (с. 300)*

Друкуецца па кн.: «Сцягі і паходні». Мінск: Беларусь, 1965.

*Гутарка мужыка з панам (с. 300)*

Друкуецца па кн.: «Ростані волі»: З заходнебеларускай паэзіі. Мінск: Маст. літ., 1990.

*Праталіна (с. 301)*

Друкуецца па кн.: «Ростані волі»: З заходнебеларускай паэзіі. Мінск: Маст. літ., 1990.

*Няволя, змаганне, перамога (с. 302)*

Друкуецца па кн.: «Ростані волі»: З заходнебеларускай паэзіі. Мінск: Маст. літ., 1990.

## ПУБЛІЦЫСТЫКА

*Маленькі фельетон. Пісьмо ў рэдакцыю (с. 306).*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, № 8, дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Сучасны. Датуецца годам апублікавання.

*Барацьба за незалежнасць у Ірландыі (с. 307)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, 25 жн., дзе ўпершыню апублікаваны пад крыпт. Р. Датуецца годам апублікавання.

*Пісьмо ў рэдакцыю (с. 308)*

Друкуецца па газ. «Беларускі звон», 1922, № 19, дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*Неадкладная справа (с. 309)*

Друкуецца па газ. «Новае жыццё», 1923, 3 сак., дзе ўпершыню апублікаваны. Датуецца годам апублікавання.

*М. Чарот (М. Кудзелька) (с. 311)*

Друкуецца па газ. «Наш сцяг», 1923, 5 чэрв., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Р. Юргілевіч. Датуецца годам апублікавання.

*Пасол Сяргей Баран (с. 314)*

Друкуецца па газ. «Наш сцяг», 1923, 4 ліп., дзе ўпершыню апублікаваны пад крыпт. Р. Ю. Датуецца годам апублікавання.

*«Крэсы» трывожаць (с. 315)*

Друкуецца па газ. «Наш сцяг». 1923, 11 ліп., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Р. Юргілевіч. Датуецца годам апублікавання.

*Заклік да аб'яднання работнікаў гарадоў і вёсак (с. 317)*

Друкуецца па газ. «Наш сцяг», 1923, 5 жн., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Юргілевіч. Датуецца годам апублікавання.

*Паны-пілсудчыкі і справа беларускай асветы (с. 319)*

Друкуецца па газ. «Савецкая Беларусь», 1928, 20 ліп., дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўд. Замежны. Датуецца годам апублікавання.

## ЛІСТЫ

Усе змешчаныя ў гэтым выданні лісты Л. Родзевіча да У. Жылкі былі ўпершыню апублікаваны У. Калеснікам у зб.: «Беларуская літаратура і літаратуразнаўства». Вып. 2. Мінск: выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1974, адкуль і перадрукоўваюцца.

# Змест

З кагорты адраджэнцаў. *Віктар Яцухна* ............. 5

Ігра́ каласістая. *Эскіз. Іван Пташнікаў* ............. 22

## ДРАМАТУРГІЯ

Блуднікі. *Драма ў трох дзеях* ............. 40
Марцовы снег. *Драматычны абразок* ............. 73
Пакрыўджаныя. *Драма ў чатырох дзеях* ............. 75
Драбніца жыцця ............. 112
Збянтэжаны Саўка. *Жарт у адной дзеі* ............. 115
Пасланец. *Жарт у адной дзеі* ............. 124
Конскі партрэт. *Жарт у адной дзеі* ............. 131
У кавалёвай хаце. *Драматычны абразок у адной дзеі* ... 141
Стараста. *Жарт* ............. 151
Блуднікі ............. 154
На шляху да сонца ............. 159
Сказ аб гуслях ............. 168
Досвіткі. *Драматычныя сцэны* ............. 174
На Каляды ............. 186
П. С. Х. *Фацэція на адну дзею* ............. 196
Кавалі. *Сцэнічны абразок* ............. 210

## ПРОЗА

На рацэ зімой ............. 214
Разбітая ваза ............. 224
Беларуская казка *(«Я быў яшчэ падшпаркам...»)* ..... 228
Змярканне. *Фантазія* ............. 231
Заклік ............. 235
Як Лявон Недарада дарадзіў сваёй бядзе ............. 237
Беларуская казка *(«Жыла сабе бедная ўдава...»)* .... 244

Марксісцкі аршын . . . . . . . . 250
Пакой № 184 . . . . . . . . 256
Цюхцялей . . . . . . . . 263

## ПАЭЗІЯ

Салдацкая песня . . . . . . . . 268
«Працуй, Беларусь...» . . . . . . . . 268
Мінуўшчына . . . . . . . . 269
«Калісь на сонца я глядзеў...» . . . . . . . . 270
«У гразь утоптана ляжыш...» . . . . . . . . 270
«Няўжо я шчасце калі сустракаў...» . . . . . . . . 271
«Эх, няхайная старонка...» . . . . . . . . 271
«Мукі — церні, яд...» . . . . . . . . 271
«Ідзе ў цьме...» . . . . . . . . 272
«Беларусь мая мужыцкая...» . . . . . . . . 274
«Не тужыце, беларусы,— сон то моц...» . . . . . . . . 274
«Рассвяткуйся, неба, выбухні зарніцай...» . . . . . . . . 275
Адраджэнне . . . . . . . . 275
«Ты расцеш, як дзень світаннем...» . . . . . . . . 276
Белая музыка . . . . . . . . 276
«Хто душой і шчырым сэрцам...» . . . . . . . . 277
Куплеты па часе (Астрожнік) . . . . . . . . 278
Снег . . . . . . . . 279
«Лявоніха» . . . . . . . . 279
Да маладых . . . . . . . . 279
Роспач . . . . . . . . 280
Вы і мы . . . . . . . . 282
Паліцыянт у клопаце . . . . . . . . 282
Куплеты па часе («Каб не латалі мы латы...») . . . . . . . . 283
Розумам дайшоў . . . . . . . . 284
«Год стары знямог...» . . . . . . . . 285
«Здратавана рунь. Плач галодных дзетак...» . . . . . . . . 285
«Схамяніцеся, годзе гібець нам рабамі...» . . . . . . . . 286
«Згінуў час, калі ад веку мы ўсе спалі...» . . . . . . . . 286
Песня паўстанца . . . . . . . . 287
Імкненне . . . . . . . . 288
Вайна вайне (песня інваліда) . . . . . . . . 290
У дэфензіве . . . . . . . . 291
Тут і там . . . . . . . . 291
Прабуджэнне . . . . . . . . 292

Марш ратаёў ........ 292
Вынеслі раз пастанову ........ 293
«Кахаю Беларусь сучасную, не выснену...» ........ 294
Бура ноччу ........ 294
Наша радасць ........ 295
О мудрасць! ........ 295
«Грамада валіла валам...» ........ 296
Покліч ........ 297
Буслы ........ 297
Мініяцюры ........ 298
«Цяпер іх сіла — наша кроў...» ........ 300
Гутарка мужыка з панам ........ 300
Праталіна ........ 301
Няволя, змаганне, перамога ........ 302

## ПУБЛІЦЫСТЫКА

Маленькі фельетон. *Пісьмо ў рэдакцыю* ........ 306
Барацьба за незалежнасць у Ірландыі ........ 307
Пісьмо ў рэдакцыю ........ 308
Неадкладная справа ........ 309
М. Чарот (М. Кудзелька) ........ 311
Пасол Сяргей Баран ........ 314
«Крэсы» трывожаць ........ 315
Заклік да аб'яднання работнікаў гарадоў і вёсак ........ 317
Паны-пілсудчыкі і справа беларускай асветы ........ 319

## ЛІСТЫ

Леапольд Родзевіч — Уладзіміру Жылку ........ 324

**Каментарыі** ........ 331

Р60

**Родзевіч, Л. І.**

Творы: драматургія, проза, паэзія, публіцыстыка, лісты / Леапольд Родзевіч ; уклад., прадм., камент. В. Яцухны.— Мінск : Маст. літ., 2008.— 343 с.

ISBN 978-985-02-1025-8.

Леапольд Родзевіч (1895—1938) пражыў нядоўгае, але насычанае падзеямі жыццё, шмат зрабіў дзеля духоўнага і культурнага ўзбагачэння нашага народа, дзеля нацыянальнага адраджэння.

Пасля сябе ён пакінуў немалую літаратурную спадчыну. У гэтую кнігу ўвайшло ўсё лепшае, што не страціла ні актуальнасці, ні мастацкай пераканаўчасці.

У такім аб'ёме творы Леапольда Родзевіча выдаюцца ўпершыню.

**УДК 821.161.3-8**
**ББК 84(4Бен)**

Літаратурна-мастацкае выданне

**РОДЗЕВІЧ**
Леапольд Іванавіч

**ТВОРЫ**

*Драматургія, проза, паэзія, публіцыстыка, лісты*

Рэдактар *І. П. Дабрыян*
Мастак *Г. В. Кандрацьева*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Барай*
Тэхнічны рэдактар *Л. І. Астрэйка*
Стылістычныя рэдактары *Л. Г. Ганчарэнка, Я. А. Бебель, Л. А. Дзядзюля*

Падпісана да друку 27.05.08. Фармат 84×108$^1/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура BalticaC. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 18,06. Улік.-выд. арк. 15,65. Тыраж 2000 экз. Заказ 1886.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0056778 ад 17.02.2004.
220004, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня».
225409, Баранавічы, вул. Савецкая, 80.

ISBN 978-985-02-1025-8

9 789850 210258